Міхась Зарэмба

# Арэхавы Спас



Міхась Зарэмба

# АРЭХАВЫ СПАС



МІХАСЬ ЗАРЭМБА

# Арэхавы Спас

АПОВЕСЦІ
АПАВЯДАННІ

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1997

ББК 84(4Беи)6
З34
УДК 882.6-31/32

*Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту*

Мастак В. В. ДУДАРЭНКА

8820600000—038
З——————29—95
М 307(03) — 97
ISBN 985-05-0028-X

© М. М. Зарэмба, 1997
© Афармленне. В. В. Дударэнка, 1997



# АПОВЕСЦІ





## МАЛІНАВАЯ ШКАТУЛКА

### 1

Алег спазняўся на трэніроўку. Хацеў адпрасіцца з апошняга ўрока алгебры, але Бірута Яфімаўна нават і слухаць не пажадала: кантрольная ж! А яшчэ ўпікнула:

— Ты, Алейнікаў, выбірай: альбо — школа, альбо — футбол. Ці, можа, у Італію збіраешся, як твой аднафамілец? А раптам праз пяць гадоў закрыюць граніцу, што тады будзеш рабіць? Думаю, лёс твайго брата цябе не спакушае...

Сказала, нібы апякла крапівой. Алег ледзьве стрымаўся, каб уседзець за партай і не адказаць якой-небудзь грубасцю.

«І чаго яна дакарае братам? Хіба ён вінаваты? Яго ж падставілі, прымусілі ўзяць віну на сябе...»

Алег сядзеў на кантрольнай як на іголках. Рашыў два прыклады, на трэці не хапіла часу. Здаў сшытак, схапіў сумку і — да дзвярэй. Бірута Яфімаўна быццам знямела, праводзячы вучня дакорлівым позіркам. Маўляў, дабегаешся, сваё атрымаеш...

Быў волкі, туманны дзень. Раніцай выпаў мокры снег, але да паўдня затрымаўся толькі на клумбах ды газонах. Асфальт блішчэў, як пасля дажджу. Алег выскачыў на школьны двор і напрамкі — да дзіркі ў металічнай агародзкы. Спяшаўся, па баках не азіраўся. І раптам наскочыў на Пончыка. І міма не прабяжыш, і назад не павернеш. Каго не чакаў — таго не чакаў...

Ды Пончык, напэўна ж, пільнаваў, не проста так ля школы ашываўся і цыгарэтны дым глытаў. Такую сустрэчу выпадковай не назавеш, а прыемнай тым больш.

У Пончыка — круглы, азызлы твар, заплылыя вочкі, нос — свінячым пятачком, а шыя — як у бегемота. І ўвесь ён тоўсты, амаль квадратны. Нізкалобую галаву прыкрывае адзідасаўскі «пеўнік», а на пакатых плячах — сіняя куртка-варонка з белай мехавой падкладкай.

— Маё — з кістачкай,— пыхкнуў дымам Пончык.— Цісні на тармазы!

— Я на трэніроўку, спазняюся.— Алег паспрабаваў прайсці міма, але Пончык паспеў затрымаць яго за плячо.

— Хвіліначку, справа ёсць. Вестачку ад твайго братана Вадзіка атрымалі. Табе прывет...

— Што?! — Алега як токам ударыла.

— Ага, перадалі запісачку. У ёй да цябе просьба...

— Якая?

— Не ведаю... Алік прасіў, каб ты вечарам, у сем, да нашага фантана падруліў. Там і даведаешся... Нешта пра малінавую шкатулачку... Толькі не забудзь, рандэву роўна ў сем, сам ведаеш, Алік не любіць, калі яго прымушаюць чакаць.

Апошнія словы Алег пачуў ужо ля агароджы. Нырнуў у дзірку, паслізнуўся, ледзьве ўтрымаўся на нагах і пабег, адчуваючы спіною калючы Пончыкаў позірк. Нібы той узяў яго на мушку.

«Вестачка ад Вадзіка... Маліналвая шкатулка... Рандэву з Алікам...»

Толькі калі зачыніліся дзверы ліфта, Алег суняў дрыжыкі, якія ахапілі яго пасля сустрэчы з Пончыкам. Думалася, усё засталося ў мінулым, як нейкі кашмарны сон, але вось жа зноў ажыло, вярнулася, напомніла пра сябе з'едлівым галаском вядомага на вуліцы Падлеснай прахіндзея і фарцоўшчыка Роміка Коцікава.

Дома Алег затрымаўся хвілін пяць, не больш. Хуценька нацягнуў спартыўны касцюм, заскочыў на кухню, каб перахапіць хлеба з варанай каўбасой і запіць кампотам. Сумку з кедамі і майкай закінуў на левае плячо, шчоўкнуў аўтаматычным замком дзвярэй і нават не стаў чакаць ліфт. З трэцяга паверха ён часцей за ўсё спускаўся па бакавой лесвіцы, а тут жа яшчэ такая спешка.

Выбег з пад'езда, і вярэдлівыя думкі пра сустрэчу з Пончыкам зноў накінуліся на яго злосным роем. І не адагнаць іх, і не ўцячы.

«Як Вадзік перадаў вестачку? І чаму ён успомніў пра

малінавую шкатулку? Прасіў жа нікому пра яе ні слова, маўляў, яна для яго даражэй за жыццё...»

А тут нават Пончык пра шкатулку заікнуўся, ды горш тое, што пра шкатулку даведаўся Алік Кажан — адпеты крымінальнік і рэцыдывіст, кароль вуліцы Падлеснай. Колькі ўжо ён па калоніях і турмах ашываўся, мусіць, з малалецтва?! На волі доўга не гуляў, турма для яго была родным домам.

І вось Алегу трэба ісці да фантана ў парку, на сустрэчу з гнюсным мафіёзнікам. Яшчэ год назад пасля суда Алег пакляўся адпомсціць за брата... Ды што клятва?! Хіба ён, трынаццацігадовы, зможа даць бой мацёраму ваўкалаку? З ім жа ні суды, ні міліцыя ніяк не справяцца: усё доказаў не хапае, у Аліка заўсёды знаходзіцца алібі. А калі і прышчэмяць дамушніку хвост, дык ён праз гады тры-чатыры зноў з'яўляецца на вуліцы Падлеснай. У яго і адвакаты вопытныя, і суддзі нейкія занадта гуманныя... Паважаюць Аліка, ён жа злодзей у законе. А закон, як вядома, для такіх няпісаны...

Тралейбусны прыпынак быў на супрацьлеглым баку вуліцы, але ж трэба яшчэ бегчы да пешаходнага перахода са святлафорам. А там яшчэ чырвонае загарыцца... Гэта ж колькі секунд прамільгне? Тут якраз тралейбус паказаўся з-за павароту. Калі кіравацьда святлафора, можна не паспець. Потым чакай, пакуль наступная «двойка» пад'едзе. А сёння ж асаблівая трэніроўка: Аляксандр Мікалаевіч будзе вызначаць каманду на гарадскі фінал. Таму спазняцца ў футбольны манеж ніяк нельга. Хаця месца цэнтральнага нападаючага Алегу Алейнікаву, можна сказаць, забраніравана, але ж кантрольная гульня — галоўны экзамен. Ды і трэнер ва ўсім любіць дысцыпліну: і на футбольным полі, і каля яго.

Узрушаны сустрэчай з Пончыкам, Алег нават не звярнуў увагу на рэфрыжэратар, які стаяў каля тратуара і закрываў левую паласу дарогі. Ён спазняўся, яму трэба было паспець да тралейбуса, што пад'язджаў да прыпынку.

Алег кінуўся напрасткі, паміж рэфрыжэратарам і белай «Ладай», якая толькі што прыпаркавалася да абочыны, засаджанай маладзенькімі каштанамі.

«Як наша»,— падумаў ён пра легкавушку, забыўшыся на ўсялякую асцярожнасць.

Ды калі б не Пончыкава навіна, хіба ж Алег ляцеў на скрут галавы? І спыніўся б, і агледзеўся... А тут яшчэ гэты слотны дзень і мокры асфальт...

Ён заўважыў «Волгу» занадта позна. На ўсю вуліцу

завішчалі тармазы, зусім побач мільгануў збялелы, перакошаны твар вадзіцеля ў ветравым шкле. Алег амаль з-пад самага капота сігануў на другі бок дарогі за белую лінію. І не паспеў зірнуць направа: на яго ляцеў грузавік, які размінаўся з тралейбусам.

— А-а-а! — толькі крыкнуў Алег.

Моцны ўдар зваліў яго на асфальт і юзам кінуў да абочыны. Спартыўная сумка адляцела на сярэдзіну дарогі. Скрыгат тармазоў, аўтамабільныя сігналы ўзвіліся над вуліцай пранізлівай сірэнай. Вадзіцель грузавіка паспеў у апошняе імгненне вывернуць руль, каб не наехаць на Алега, і ўрэзаўся ў тралейбус. Зазвінела пабітае шкло, залямантавалі пасажыры.

Першы да Алега падбег вадзіцель «Волгі», тут жа на дапамогу паспяшаліся прахожыя. Акрываўленага і беспрытомнага хлапчука асцярожна паднялі на рукі і панеслі да «Волгі».

— Пад самыя колы кінуўся,— узрушана казаў вадзіцель грузавіка, перабіваючы гнеўную водпаведзь маладжавай жанчыны — вадзіцеля тралейбуса.— Я ж мог яго задавіць. Бегаюць пустапасам... Вось жа побач пераход...

— Маліце Бога, каб застаўся жывы,— пачулася ў натоўпе.— У судзе «пустапасам» не апраўдаецеся... А што для іх пераход? Яны спяшаюцца, ім няма калі...

«Волга» павезла Алега ў бальніцу, а на месцы здарэння яшчэ доўга тоўпіліся людзі, распытвалі, абмяркоўвалі, дакаралі бацькоў, дзеці якіх парушаюць правілы дарожнага руху.

— Якія бацькі — такія і дзеці! — сказала вадзіцель тралейбуса і пайшла да міліцыянераў, што пад'ехалі на «уазіку» з мігалкай. За ёй пайшоў і вадзіцель грузавіка.

— Вось цяпер і разбірайцеся, хто з вас вінаваты,— паляцела з натоўпу.— Няма чаго ўсё звальваць на бацькоў. Ды яны са сваімі дзецьмі бачацца толькі вечарам. І ім ужо не да правілаў дарожнага руху.

— Ага, толькі б па тэліку «Поле цудаў» паглядзець, а астатняе — трын-трава...

## 2

— Табе яшчэ пашанцавала,— сказала медыцынская сястра, калі везла Алега на калясцы ў палату.— Косці зрастуцца, будзеш бегаць. І сінякі знікнуць... А мог жа і калекам застацца, і, не дай Божа, адправіцца на той свет.

Не шкадуеце вы ні сябе, ні сваіх бацькоў...

Бальнічны калідор быў доўгі і нейкі змрочны. Алег пасля ўсяго перажытага пачуваўся амаль што ў паўзабыцці. Ён затуманеным позіркам глядзеў на сваю правую нагу, якую аж да калена ахопліваў белы гіпсавы бот, і ледзьве стрымліваў слёзы адчаю і незразумелай крыўды.

«Вось табе і трэніроўка, і гарадскі фінал! Што скажа Аляксандр Мікалаевіч? А мама з татам?» — нават боль у назе не адваджваў вярэдлівыя думкі. І зноў, нібы з туману, выплываў азызлы Пончыкаў твар, які напамінаў пра рандэву з Кажаном.

«Няхай пачакае! — Алег нават усцешыўся: цяпер сустрэча з дамушнікам не адбудзецца, і яму не давядзецца даставаць малінавую шкатулку з тайніка.— Вось толькі чаму Вадзік расказаў пра шкатулку? Хто яго прымусіў?»

У палаце стаялі чатыры ложкі, а вольны быў якраз ля дзвярэй. Сястра дапамагла Алегу перабрацца з каляскі на ложак, пад загіпсаваную нагу паклала згорнутую коўдру і, адыходзячы, сказала:

— Абвыкайся, знаёмся, кампанія ў цябе вясёлая. Пазванілі ў тваю школу, папрасілі паведаміць бацькам. Хутка чакай іх з гасцінцамі.

Ён зусім не адрэагаваў на гэтыя словы, нават не сказаў «дзякуй». Бо як толькі галава дакранулася да падушкі, імгненна праваліўся ў сон, трывожны і хваравіты. І ўсё ў гэтым сне было нейкае вельмі ўжо знаёмае, нібы кадры фільма, які глядзіш другі ці трэці раз...

...І ўбачыў сябе Алег за рулём бацькавай «Лады». Побач — бацька, на заднім сядзенні — маці з Вадзімам і старэйшай сястрой Святланай. Калі Святлана прыехала? Яна ж са сваім мужам-афіцэрам дзесьці за палярным кругам кукуе. У Польшчы пяць гадоў у ваенным гарадку жылі, а адтуль — на поўнач, да белых мядзведзяў.

А Вадзім як заявіўся? Ён жа мінулай восенню трапіў за калючы дрот на тры гады. І гэта не армейская служба — адтуль не пускаюць дадому на пабыўку, нават на пісьмы ліміт. І што ў тых пісьмах крамольнага?

Алег спрытна рулюе, ён ужо добра ўмее вадзіць «Ладу». Тут няма нічога дзіўнага. Бацька навучыў, нават шасцігадоваму дазваляў кіраваць. Тады ў іх быў старэнькі «Масквічок». Вось на вясковай бязлюднай дарозе і адбываліся вясёлыя ўрокі. Алег яшчэ да руля не даставаў, даводзілася ўзлазіць на бацькавы калені. Спачатку ён трымаўся за руль, як тапелец за выратавальнае кола. Але потым асмялеў і ўжо сам прасіўся на бацькавы калені. І адпіхваў

яго рукі ад руля, калі ён спрабаваў падсобіць сыну.

— Гляньце, гляньце! — радаваўся бацька.— Мае гены! У Алежкі шафёрская хватка!

Імчыць «Лада», сям'я Алейнікаў кіруе да дзеда з бабай, гэта сорак кіламетраў ад горада. Дзядулева новая як звон хата стаіць на беразе возера, побач з сасновым лесам. Уваходзіны былі два гады назад. Асабліва радаваўся Алегаў бацька:

— Цудоўная дачная мясцінка! Лічы, дзед, што нам вельмі пашэнціла. І мне цяпер не трэба за трыста кіламетраў гойсаць. Колькі бензіну на дым пусціў...

— Эх, сынок, сынок,— чамусьці не радаваўся дзядуля.— Ды калі б не гэтая бяда, хіба ж мы з бабуляй паехалі за блізкі свет з роднай Сасноўкі... Усё кінулі-рынулі: і садок, і сядзібу, і магілкі...

— Дзіўны ты, дзед, тут дзякаваць Богу трэба, што так усё наладзілася... Дом вунь які — сапраўдная хароміна! Пра такі я і марыць не мог.

— За што дзякаваць, сынок?! За што-о-о?!

— За даведку, за бэры! — успыхнуў бацька.— За тое, што ты жывы з вайны вярнуўся...

— На горы людскім у рай не заедзеш.

— Пляваць я хацеў на той рай, мне сёння трэба жыць, сёння! І дом гэты мы заслужылі сумленнай працай, і не наша віна, што ўзарваўся той Чарнобыль... А для чаго я цэлы месяц у самы пекле на МАЗе кантаваўся, добраахвотна атруту глытаў? Хопіць нам прыбядняцца, хадзіць з працягнутай рукой. Прывучылі нас да рабскай пакорлівасці, вось і жывём як мышы пад венікам.

Тым і закончылася іх размова, пра яе можна было б і не ўспамінаць, але потым Алег неаднойчы чуў ад бацькі:

— Ну і дзівак наш дзед! Яму нейкай задрыпанай Сасноўкі шкада, глухамань лясную, магілкі... Яму ў рай хочацца... Ды вось жа наш рай — церам-церамок на беразе возера. Не тое, што там — струхлелая хацінка...

...І ў сне, калі селі ў «Ладу», бацька сказаў: «Гайда ў дзядулеў-бабулін рай!»

Выехалі на бетонку, «Лада» набрала хуткасць, а з-за павароту насустрач — чырвоны рэфрыжэратар. Раптам ён віхлянуў на левы бок і перагарадзіў шашу. Сутыкненне немінучае: тут ужо ні аб'ехаць, ні затармазіць. Алег закрычаў, але не пачуў свайго голасу. І што за насланнё?! За рулём рэфрыжэратара ён убачыў Кажана, побач з ім у кабіне — Пончык. Рагочуць, выскаляюцца. У Аліка на твары

шрам ад вуха да рота і верхнія зубы залатыя. Павыбіваў, і «кароль» зарабляе на арэхі.

У самае апошняе імгненне перад ударам «Лада» ўзляцела ў паветра.

— Малайчынка Алежка! — усклікнуў бацька.— Мая школа!

Адчуванне раптоўнай бязважкасці перахапіла дыханне і рэзкай сударгай ірванула загіпсаваную нагу. Ад пякучага болю Алег аж застагнаў і прачнуўся, з цяжкасцю выбавіўшыся з нейкага хваравітага забыцця.

— Сынок, што з табою, сынок?! — пачуў ён ціхі матчын голас і расплюшчыў вочы.

Маці нахілілася над ложкам і пакутлівым позіркам углядалася ў сынаў твар, на якім цямнеўся крывавы пісяг.

— Як жа так, сынок? Вельмі баліць?

— Не-е-е, не вельмі,— амаль прашаптаў Алег.

— Мне пазванілі са школы... Вось я і адпрасілася з дзяжурства. Ляцела, свету белага не бачыла... Сказалі, што ты трапіў у аварыю...

На Алегаў лоб упала матчына слязінка, і яго ўсяго аж скаланула, працяўшы загіпсаваную нагу новым рэзкім болем. Ён зажмурыўся, зніякавеў, але ўсё ж нягучна сказаў:

— Мама, не трэба, я не адзін...

Яму было няёмка выслухоўваць матчыны шкадаванні ў прысутнасці сведкаў, а тут яшчэ слёзы... Ён адчуваў, што палата прыслухоўваецца да іх размовы, і Алегу не хацелася, каб яго ўявілі мамчыным сынком. Гэта быў той самы пераломны трынаццацігадовы ўзрост, калі любая праява бацькоўскай заклапочанасці сустракаецца ў «штыкі». Маўляў, мяне не трэба апякаць, вадзіць за ручку, я не нейкі там плаксівы смаркач...

— Тата толькі праз тыдзень вернецца,— маці ўсё ж адолела сваю разгубленасць, пастаралася стрымаць слёзы, якія, вядома ж, не маглі падбадзёрыць сына, вывесці яго са стану пакутлівых перажыванняў.— Не пашанцавала табе, Алежка, не пашанцавала. А як цяпер са школай?

— Не хвалюйцеся, школа ад нас нікуды не ўцячэ,— раптам пачуўся разважлівы голас з суседняга ложка.— Будзем мы — будзе і школа.

— Куды ўжо тут, дзеткі, уцякаць, дабегаліся,— зноў уздыхнула Алегава маці і агледзела палату, у якой усе ложкі былі абсталяваны рознымі металічнымі прыстасаваннямі.

— Нічога, яшчэ пабегаем! — бадзёра адклікнуўся ўсё той жа голас.— І паплаваем, і палётаем... І Алегу вашаму

не дадзім сумаваць. У нас кампанія вясёлая, акрабаты-цыркачы.

— З табой, Юра, не засумуеш,— у размову ўключылася нянечка, дабрадушная і круглатварая, якая толькі што зайшла ў палату.— Гэта ж трэба дадумацца: палез з балкона на балкон на чацвёртым паверсе, сябрук-сусед параіў... Добра яшчэ, што на куст зваліўся і толькі руку зламаў... А калі б галавою аб асфальт?

— Я, цёця Фруза, не першы раз пералазіў, а тут паслізнуўся...

— Вось і далазіўся. Дзвярэй для вас мала...

— Французскі замок зашчоўкнуўся, а мне трэба было збірацца ў школу.

— Усе вы спяшаецеся,— даволі сурова заўважыла нянечка.— Вунь Слава таксама спяшаўся і апынуўся пад трамваем... Як яму цяпер без нагі? Гора нам з вамі, гора... А вы, мама, не турбуйцеся, вашага сыночка дагледзім, не пакрыўдзім.

— Дзякую вам, хто ж мог падумаць... Як пачула, свету белага не бачыла, ляцела, нават гасцінцаў не паспела купіць,— нібы апраўдвалася Алегава маці.

— Ці ж яны разумеюць нашы турботы?

— Няпраўда, цёця Фруза, не такія ўжо мы ветрагоны. З кім чаго не здараецца? І на роўнай дарозе можна спатыкнуцца.

«Ну і гаварунчык,— амаль раздражнёна падумаў Алег пра свайго суседа.— З чацвёртага паверха зваліўся, а яшчэ жартуе».

Алег ляжаў на спіне, не варушыўся, баючыся развярэдзіць загіпсаваную нагу. Ён не бачыў жартаўніка, голас якога далятаў з-за ўзгалоўя.

Цётка Фруза абышла палату, пацікавілася самаадчуваннем кожнага хворага, а заадно разліла з белага чайніка какаву ў шклянкі, што стаялі на тумбачках.

Алег таксама выпіў какаву, дапамагла маці, падтрымала за плечы, хаця ён мог абысціся і без падтрымкі. Толькі не стаў пярэчыць, каб не прыцягваць увагу свайго суседа. А той па-ранейшаму быў гаваркі і вясёлы, нібы яму ў чымсьці раптам вельмі пашанцавала. А хіба не?

Нарэшце Алегава маці схамянулася, паднялася з табурэткі, што стаяла побач з сынавым ложкам, сказала:

— Схаджу ў гастраном куплю соку ці напітку.

— Я нічога не хачу, не трэба,— запярэчыў Алег.

Яму і сапраўды нічога не хацелася. Ды і дзе тут будзеш думаць пра розныя сокі-прысмакі пасля ўсяго, што здары-

лася? Вось так нечакана апынуцца ў бальнічнай палаце, загіпсавацца і развітацца з футболам не на адзін дзень... Праўда, Алега ўсцешвала тое, што здарэнне на вуліцы выбавіла яго ад нежаданай сустрэчы з мафіёзным Алікам. «Няхай пачакае ля фантана, прывык, каб перад ім бегалі на дыбачках»,— думаў Алег.

Толькі чаму Вадзім расказаў пра малінавую шкатулку? Што здарылася з ім? Зноў трывожныя думкі-трызненні, зноў невядомасць...

## 3

Калі за Алегавай маці і цёцяй Фрузай зачыніліся дзверы палаты, Юра саскочыў з ложка і падышоў да Алега...

— Слухай, як тваё прозвішча?

— Алейнікаў,— адказаў Алег, з цікаўнасцю пазіраючы на чарнявага хлапчука з загіпсаванай рукою, якая вісела на шырокай бінтавай падвязцы.

— Алейнікаў?! — абрадавана перапытаў Юра.— А я пачуў тваё прозвішча, калі сястра прывезла цябе ў палату, і вушам сваім не паверыў. Такое супадзенне!

— Ты чаго? — Раптоўная ўзрушанасць суседа здзівіла Алега. Ён бачыў яго ўпершыню, хаця голас падаўся знаёмым.

— Я пра цябе ўсё ведаю,— весела падміргнуў Гаварунчык.

— Так ужо і «ўсё»? — Алег зрабіў выгляд, што словы гэтыя — няўдалы жарт.

— Кінь, не прытварайся. У мяне камп'ютэрная памяць на імёны і прозвішчы. Ты вучышся ў дзесятай школе, і брата твайго клічуць Вадзімам. Праўда? А бацька твой працуе шафёрам, возіць замежныя грузы і ездзіць за граніцу.

— Нічога я не прытвараюся,— Алег з прыкрасцю зразумеў, што ён трапіў на кручок, быццам наіўны пячкур. Вось дык сустрэча!

Толькі Алега чакаў новы сюрпрыз, яшчэ больш нечаканы і ашаламляльны. У такое і паверыць амаль немагчыма. Нібы нейкі іншапланетны розум вылічыў гэтае знаёмства: аднаго скінуў з чацвёртага паверха, другога прымусіў перабягаць вуліцу перад «Волгай»...

Юра прысеў на табурэтку, нахіліўся да Алега і таямнічым голасам паведаміў:

— Ведаеш, мой бацька расследаваў тую справу, ён і пра твайго брата расказваў...

— Твой бацька?! — Алег скалануўся, забыўшыся на сваю загіпсаваную нагу, і аж войкнуў ад рэзкага болю.— Няўжо?

Гаварунчык памаўчаў, адказаў не адразу, быццам цешыўся Алегавай разгубленасцю. Ён перавёў позірк на дзверы, потым — на акно, за якім ужо згусціўся змрок, агледзеў суседнія ложкі і толькі тады таямніча прашаптаў:

— Мой бацька — следчы. Яму давяраюць расследаваць самыя таемныя злачынствы. Ты чуў пра банду Мезіна?

— Не-е...

— Ты што?! Пра яе ва ўсіх газетах пісалі. Мезін працаваў міліцыянерам у Жлобіне, а начамі рабаваў людзей і нават забіваў іх... Яго банду доўга не маглі выкрыць. Накіравалі ў Жлобін спецыяльную следчую групу, у яе ўключылі і майго бацьку. Група некалькі месяцаў палявала за звяругамі. Хто мог падумаць, што важак банды ходзіць у міліцэйскай форме? І ўсё ж высачылі пярэваратня, злавілі і прывезлі ў Мінскую турму,— Юра расказваў горача, гаварыў прыглушана, амаль паўшэптам, нібы асцерагаўся, што нехта падслухае яго вельмі важныя сакрэты.

Алег слухаў з нейкім асаблівым узрушэннем, усё яшчэ знаходзячыся пад гіпнозам нечаканай навіны: дзіўны выпадак звёў яго ў адной бальнічнай палаце з сынам следчага, які дапытваў брата Вадзіма. Няўжо праўда? Хочаш — вер, а хочаш — не.

— А які гэта быў лоўкі і каварны бандыт! — працягваў Юра.— Бацька казаў, што Мезін дасканала валодаў баявымі прыёмамі каратэ, страляў з любой зброі, умеў кіраваць любымі машынамі і матацыкламі. Не чалавек, а сапраўдны вядзьмак. Ён і з турмы ўцёк.

— Уцёк, з турмы?! — здзіўлена перапытаў Алег.— Можа, дапамаглі?

— Не, ніхто яму не дапамагаў... Ён сам сярод белага дня абдурыў варту. Спрытнюга, нібы нячысцік-невідзімка. У Жлобін вярнуўся, схаваўся, думаў адсядзецца... Зноў высачылі бандзюка, акружылі логава, апасаліся, што будзе адстрэльвацца... Мой бацька быў у той засадзе, расказваў пра аблаву. На досвітку ўзялі Мезіна, арыштавалі без стрэлаў. Уцяміў бандыт, што з ім цацкацца не будуць, прашыюць аўтаматнымі чэргамі.

— Цацкаюцца, яшчэ як цацкаюцца,— не вытрымаў Алег.— Невінаватых саджаюць, а мафіёзнікі на волі гуляюць.

— Ты гэта пра каго? — Гаварунчык злёгку ўзмахнуў загіпсаванай рукой.— Мезіна судзілі, прыгаварылі да рас-

стрэлу. Прасіўся, каб памілавалі, каяўся...

— І памілуюць, і даруюць. У каго грошы, той і музыку заказвае,— успомніў Алег любімую бацькаву прымаўку.

— Якія грошы, якая музыка? — раздражнёна спытаў Юра.— Мезіна ніхто не памілуе, яму ўжо не да музыкі.

— А хіба адзін такі Мезін у міліцэйскай форме? Бяруць хабар, выручаюць злачынцаў... І следчыя, і пракуроры, і суддзі...

— Адкуль ты ўзяў? Гэта ж выдумка несусветная! Наслухаўся розных плётак,— Юра глядзеў на Алега амаль што з непрыязнасцю.— Можа, твой брат такое нагаварыў?

— Ты лепш у свайго бацькі спытай, як ён майго брата дапытваў,— і не хацеў Алег нават думаць пра гэта, але вось жа не змаўчаў, не ўтрымаўся і яшчэ прыпомніў: — Следчы ўгаварыў Вадзіма прызнацца, абяцаў змякчыць яго віну. І змякчыў... На тры гады ў калонію адправілі...

— Што заслужыў, тое і атрымаў,— чмыхнуў Гаварунчык.— І чаго не хапала твайму брату? Джынсаў, красовак, відзіка? У чужыя кватэры залазілі, рабавалі, машыны кралі... Вунь колькі месяцаў міліцыя не магла натрапіць на след зладзейскай шайкі. І твайго брата доўга лавілі...

— А чаму завадатара шайкі выпусцілі на волю? Ці, можа, ён адкупіўся?

— Не ведаю, мне бацька не расказваў. Следчы толькі збірае факты і доказы, а потым перадае іх у суд. Гэта суддзі вызначаюць: хто вінаваты, а хто — не.

— Вызначылі! — крыўдліва сказаў Алег.— Мафіёзніка Аліка Кажана апраўдалі. А ён кіёск паставіў, на вуліцы адкрыта гандлюе крадзенымі жвачкамі, шакаладам ды красоўкамі з курткамі. Усё імпартнае, замежнае... Чаму тады следчыя не заўважаюць злодзеяў-спекулянтаў?

— Што следчыя? — насцярожыўся Гаварунчык.— Бізнес ёсць бізнес... Цяпер кожны можа гандляваць. А не так, як твой брат...

— Ты майго брата не чапай.— Алег растрывожыўся яшчэ больш, хаця яго голас па-ранейшаму быў ціхі і нават прыглушаны.— Вадзім захварэў, яму патрэбны былі дэфіцытныя лекі. Нават тата не мог купіць тыя лекі за граніцай. А Кажан дастаў, у яго ўсюды знаёмыя... Вось Кажан і забрытаў Вадзіма...

— Хваробу да справы не прышыеш,— Юра сказаў як адрэзаў.— Трэба было галавой думаць... Позна пасля бойкі махаць кулакамі.

Новы боль, больш рашучы, працяў Алега навылёт, калі ён, забыўшыся, таргануў сваю загіпсаваную нагу. І аж

застагнаў. Стогн прымусіў Гаварунчыка замоўкнуць і падняцца з табурэткі.

— Баліць? Гэта спачатку так, першыя дні... Мне другі раз рабілі аперацыю, пад наркозам. Стальную спіцу ўставілі ў руку. Складаны перелом... Каб толькі косці правільна зрасліся...

Юра адразу ж пераключыўся на новую тэму, быццам і не было той гнятлівай гаворкі, амаль спрэчкі пра следства, брата Вадзіма і прахіндзея Кажана.

Толькі Алег больш не слухаў свайго гаваркога суседа: боль у назе не заціхаў, прыпякаў гарачым жалезам. Гэта быў нейкі раптоўны прыступ, які нельга было прыглушыць нават самым адчайным намаганнем сілы волі. Сцяцца, сціснуць зубы і вытрымаць... Але якія ж гэта пакутлівыя імгненні! Хоць плач, хоць крычы...

Алег умеў трываць, умеў пераносіць розныя болькі-балячкі. Ды колькі іх надаралася ў кожным матчы ці нават на той жа трэніроўцы! І сінякоў, і гузакоў... І кроў з носа, і мігатлівыя бліскаўкі ў вачах. Футбол ёсць футбол, а ў ім Алег пачувае сябе быццам рыба ў вадзе. Хоць часам і дастаецца яму на арэхі — за напорыстасць і азартную гульню. Трэнер Аляксандр Мікалаевіч цэніць Алегаву баявітасць на футбольным полі, верыць у яго футбольны лёс. І раптам гэты няшчасны выпадак...

Боль не сціхаў, нібы нага трапіла ў паляўнічую пастку, сталёвыя абцугі якой усё сціскаліся і сціскаліся. Толькі б вытрываць, толькі б не закрычаць...

І ён трываў, ён маўчаў, як маўчаў і тады, калі следчы выпытваў у яго Вадзімаву тайну. Хітрыў, угаворваў, абяцаў выратаваць Вадзіма... Алег не клюнуў на прыманку следчага і не выдаў свайго брата. Хаця і не дапамог, не выручыў. Ды і што ён мог зрабіць, што перайначыць у іх сямейнай бядзе?

Вось жа мінула пасля суда амаль паўгода, і ўсе тыя пакуты-перажыванні з-за Вадзіма, думалася, адляцелі, расталі разам з асеннім лісцем і студзеньскімі сняжынкамі. І жылі чаканнем вяртання, адлічваючы дзень за днём, тыдзень за тыднем.

А тут раптам гэтае нечаканае суседства ў бальнічнай палаце і размова з сынам следчага, якая разварэдзіла думкі-ўспаміны, ажывіла падзеі дзён блізкіх і далёкіх. Як і сённяшняя сустрэча з Пончыкам, і яго шматзначнае паведамленне пра Вадзімаву запіску і малінавую шкатулку. Так звязваюцца факты ў адзін ланцужок, і доўжыцца ён

у трывожнай невядомасці. Звяно за звяном, учынак за ўчынкам. І быццам на двух полюсах — браты Алег і Вадзім.

## 4

Яны зусім розныя — і знешне і характарамі. Спакойны, разважлівы — Алег, і рэзкі, гарачы — Вадзім. Адзін — чарнявы, круглатвары, з ямачкай на падбародку, другі — бялявы, хударлявы, з тонкімі рысамі твару. Алег заўсёды гатовы выслухаць, памяркоўна разважыць, знайсці кампраміс, Вадзім не прымае пярэчанняў, не саступае нават у драбязе, не любіць прайграваць. І за словам не лазіць у кішэнь.

Алег больш падобны на маці, асабліва вялікімі, колеру спелай ажыны, вачамі, а ў Вадзіма ярчэй праявілася падабенства з бацькам: пранізлівы позірк зеленаватых вачэй, нос з гарбінкай, чорная радзімка на правай шчацэ.

Вадзімава гарачнасць, мусіць, і прывяла да бяды. А можа, зусім і не яна... Ды хто мог бы прадбачыць (Глобы ці Ванга?) такі яго лёс: скалечаны, жорсткі, бясслаўны? Хаця не — слава ў Вадзіма была: на ўсю школу, мікраraён, а потым і на ўвесь горад... І асабліва было зябка і няўтульна ад яе халодных промняў брату Алегу: тут і дакорлівыя позіркі знаёмых бабулек у двары, і маўклівая спагада аднакласнікаў, і зларадны шэпт школьных пляткарак. Гэта ж не тое, што быць братам алімпійскага чэмпіёна ці знакамітага эстраднага спевака...

Напачатку нічога не прадказвала сцюжнай непагадзі ў сям'і Алейнікавых. Ды і што мог утварыць шасцігадовы хлапчук? Ну, узяў раптам Вадзік чужую цацку ў садзіку; ну, адабраў у нейкай там плаксы цукерку; ну, расквасіў свайму крыўдзіцелю нос... Звычайныя дзетсадаўскія здарэнні, але бацька не дараваў сыну ніводнай правіннасці, не апраўдваў ніводнага яго свавольства. Праўда, маці старалася ўладжваць сынавы канфлікты сама, каб пра іх не ведаў бацька, маўляў, вельмі ўжо ён строгі ў ацэнцы Вадзікавых нявінных учынкаў. Ды і якая ўзаемасувязь паміж гэтымі ўчынкамі і тым, што Вадзіма прывяло на лаўку падсудных?

У першым класе Вадзіка запісалі ў секцыю па плаванні, і ён ахвотна наведваў тры разы на тыдзень дзіцячы басейн «Блакітная хваля». Спачатку вучыўся плаваць у «лягушатніку» з дапамогай пробкавых кругоў, і толькі праз паўгода іх групу пусцілі ў 25-метровы басейн. Вадзім

плаваў з ахвотай, асвойваў розныя стылі: кроль, брас, батэрфляй... Яму падабалася трымацца на вадзе і пад вадой, развіваць хуткасць, выпрабоўваць сябе. І, здавалася, ніштo не зможа разлучыць яго з плаваннем.

Але трэнеры «Блакітнай хвалі» бачылі ў юных плыўцах толькі будучых рэкардсменаў і чэмпіёнаў. І ўжо праз тры гады напружаных трэніровак трэба было здаваць экзамен на спартыўную сталасць. Галоўнае — хуткасць, дзесятыя і сотыя долі секунды, адваяваныя на воднай дарожцы ў сапернікаў. Хто вытрымаў тэмп, не сышоў з дыстанцыі, уклаўся ў нарматыў. Адбіралі перспектыўных і самых вынослівых. І без усялякіх паблажак і спачуванняў.

Вось гэты экзамен і зачыніў дзверы «Блакітнай хвалі» перад Вадзімам. Ён змог, што мог, а трэба было, як кажуць, скочыць вышэй галавы.

Толькі чаму абавязкова чэмпіёнства, чаму нельга плаваць проста так, для самога сябе? Вадзімаў бацька хадзіў у «Блакітную хвалю», спрабаваў пераканаць трэнера, толькі ўсё дарэмна.

— У нас спартыўная секцыя, нам патрэбны вынікі. Купіце абанемент для сына ў звычайны басейн,— адказваў той.

Вадзім страшна перажываў, ён не хацеў хадзіць у звычайны басейн, ён марыў спаборнічаць. І гэта быў для яго вельмі балючы ўдар: да слёз і з пякучай крыўдай. Ды ўжо нічога нельга было змяніць...

Потым у Вадзіма былі іншыя захапленні: футбол, шахматы, каратэ. З футболам Вадзім развітаўся яшчэ ў пятым класе (надакучыла быць запасным). А ў шахматах ён дайшоў да першага разраду, удзельнічаў у гарадскіх турнірах. І раптам — пройгрыш за пройгрышам, нават другаразраднікі іншы раз ставілі Вадзіму мат... І дзе тут ужо будзеш скардзіцца на жорсткасць лёсу і несправядлівасць спартыўных трэнераў? Вось і фініш, вось і фінал...

Зусім выпадкова Вадзім трапіў у спартыўны клуб «Алімпія», які размяшчаўся ў падвале дзевяціпавярховага дома ў суседнім двары. А там якраз набіралі новую групу каратыстаў. Прыглянуўся ён трэнеру сваёй кемлівасцю і адменнай рэакцыяй, стаў наведваць трэніроўкі.

Кожны вечар Вадзім прападаў у клубе, адпрацоўваў тэхніку абароны і атакі, да знямогі, да сёмага поту. Яго не палохалі каварныя ўдары і хітрыя прыёмы, ён мужна пераносіў боль, яму падабалася перамагаць. І даказваць сваю перавагу над аднагодкамі, заваёўваць аўтарытэт.

У Вадзіма з'явілася новая кампанія, якую спачатку

аб'ядноўвала адно захапленне — каратэ. І хто мог падумаць, што менавіта з адзінаборства каратыстаў у «Алімпіі» пачнецца ўсё тое змрочнае, бядотнае і безнадзейнае?..

Якраз жа тады бацька паехаў у чарнобыльскую зону, дзе працаваў на самазвале амаль паўгода. Былі ў яго кароткатэрміновыя адгулы, але дома ён доўга не затрымліваўся: трэба было рыхтавацца да наваселля дзеда з бабуляй.

Тое, што Вадзім пачаў позна заяўляцца дадому, ён тлумачыў трэніроўкамі ў «Алімпіі». І гэта тлумачэнне крыху супакойвала маці, хаця і не пазбаўляла трывогі. Кожны раз яна папярэджвала сына:

— Глядзі, не затрымлівайся позна, ведаеш, колькі цяпер развялося бандзюкоў. Яшчэ нарвешся на маньяка.

— Не хвалюйся, мама, усё будзе добра, і не такі страшны чорт, якім яго малююць...

Алег тады вучыўся ў чацвёртым класе і не звяртаў асаблівай увагі на познія братавы трэніроўкі. Ды і што з таго? Тут жа зусім побач, за пяць хвілін можна дабегчы дадому ад «Алімпіі». А маньяк, дзікія злачынствы якога бударажаць увесь горад, паляваў толькі за дзяўчынкамі...

Гром сярод яснага неба грымнуў познім вясновым вечарам. Пазванілі з міліцыі, паведамілі, што Вадзім Алейнікаў знаходзіцца ў апорным пункце, назвалі адрас. Бацька якраз быў у чарнобыльскай камандзіроўцы, і на званок паспяшалася маці, спалоханая і разгубленая:

— Ну вось, прадчувала маё сэрца...

Алегу добра запомніўся той вечар, калі маці прывяла Вадзіма дадому. Асабліва ўразіў братаў выгляд: забінтаваная галава, крывавы фінгал пад вокам, распухлая ніжняя губа.

— І што ж гэта ты надумаўся? Цябе ж маглі забіць, знявечыць... Горачка ты маё, гора! А калі б міліцыя не падаспела?!

— Яны першыя на нас напалі,— апраўдваўся Вадзім.— Мы іх не чапалі, міма ішлі...

І слёзы, і ціхае галашэнне, каб суседзі за сцяной не пачулі, каб не вынеслі ганьбу з кватэры... Цяжкія, пакутлівыя хвіліны мацярынскай роспачы.

— Вось прыедзе бацька, ён з табой пагаворыць, ён табе купіць магнітафон...

— Не патрэбны мне ваш магнітафон, абыдуся, сам куплю! — Вадзім не вытрымаў, узарваўся.

Яму маг даўно спакою не даваў, а бацька ўсё абяцаў, але кожны раз адкладваў. Цяпер, зразумела, пра пакупку

можна і не заікацца. Ды калі б толькі гэта выратавала Вадзіма ад непазбежнай бацькавай праборкі...

Назаўтра Вадзім не пайшоў у школу: яго твар расквеціў вялізны сіняк, вока заплыло страшным крывападцёкам. Вось гэта быў партрэт! Алег, адыходзячы на заняткі, усё ж не вытрымаў, спытаў:

— Вадзік, табе было страшна і балюча?

— Нічога, не на таго натрапілі,— ледзь прамовіў пасінелымі вуснамі брат.— Я таму-сяму паказаў дзе ракі зімуюць... Больш не палезуць...

У школе толькі і было размоў пра вячэрняе пабоішча. Добра яшчэ, што нікога не забілі, міліцыя дубінкамі ўціхамірвала... І сярод самых адчайных байцоў называлі прозвішча сямікласніка Вадзіма Алейнікава. Расказвалі і пра некаторыя (адкуль толькі даведаліся?) падрабязнасці бойкі. Алейнікаў перабіў нунчаком аднаму хлопцу пераносіцу, і яго адпусцілі з міліцыі пад распіску. А дырэктар Мацільда Феліксаўна вунь як узрушылася, нават гразілася выключыць хулігана са школы, бо за ім і раней прыкмячаліся розныя вольнасці. Гэта ўсё Вадзімава гарачнасць: што не так — адразу ж кідаецца ў бойку. Нават старэйшым спуску не дае.

Праз некалькі дзён вярнуўся з камандзіроўкі бацька. Пра сынавы прыгоды ён даведаўся яшчэ ў аўтапарку ад свайго начальства. Там ужо было паведамленне са школы, маўляў, трэба прыняць строгія меры...

— Што будзем рабіць, Ігнатавіч? — спытаў дырэктар.— Мы вось прэмію табе выдзелілі за чарнобыльскую вахту, а тут гэтыя сынавы штучкі-дручкі... Проста не верыцца, што ў цябе такі сын-забіяка...

— Я і сам не веру,— няўпэўнена адказаў бацька, зноў і зноў перачытваючы паведамленне са школы.— Я разбяруся!

— Абавязкова разбярыся, а я ў школу пазваню, каб хлопца, чаго добрага, не ўпяклі ў калонію.

— Якая калонія, не дай Бог!

— І не давядзі Гасподзь! — дадаў дырэктар.

Бацька заявіўся дадому ўзрушаны і знерваваны. Вадзім якраз збіраўся на трэніроўку. Яны сутыкнуліся ля самых дзвярэй. Бацька ў прыцемку калідорнага святла ўсё ж заўважыў Вадзімаў сіняк, які за чатыры дні не паспеў страціць сваю першапачатковую маляўнічасць, а толькі набыў жаўтаватыя адценні. І барвовую драпіну праз усю шчаку нельга было не прыкмеціць.

— Што гэта з табой?

Нечаканае бацькава з'яўленне збянтэжыла Вадзіма, але ён адразу ж знайшоў праўдападобны адказ:

— У гандбол гулялі, мне падножку паставілі, а я з усяго разгону...

— Гандбол, падножка? — з'едліва перапытаў бацька.

— Аб штангу ўдарыўся,— Вадзім адчуў у бацькавым голасе нейкую падазронасць.

Больш ужо бацька не мог трываць, спакойна выслухоўваць сынаву ману. Ды калі б не было той размовы з дырэктарам аўтапарка і паперы са школы... А тут яшчэ міліцэйскія сведчанні аб дзікай бойцы паміж дзвюма вулічнымі групоўкамі. Вось жа нешта не падзялілі, уз'юшыліся, як азвярэлі... І сярод іх — зусім яшчэ зялёны хлапчук Вадзім Алейнікаў.

— І хто цябе навучыў так складна маніць? — гульня ў кошкі-мышкі закончылася, бацькаў голас напяўся, пасуравеў.— Што ж гэта ты ганьбіш мяне перад людзьмі? Я за рулём гарбачуся, радыёнукліды глытаю, гастрыты нажываю, а ты?!

— Ніхто мяне не вучыў,— буркнуў Вадзім.

— Самавучка?! Самастойны ўжо?..

Бацька больш нічога не сказаў, як папярхнуўся. Ён рашуча адчыніў дзверы, узяў сына сваёй дужай рукой за шкірку і выставіў яго ў калідор.

— Вон, недавярак! Каб вочы мае не бачылі цябе! Во-о-он! — І моцна стукнуў дзвярыма, ажно люстра цененька зазвінела ў зале.

Алег сядзеў за сталом, рыхтаваў урокі і ўсё добра чуў. І аж злякнуўся ад удару дзвярыма. Такім яшчэ Алег не бачыў бацьку, заўсёды памяркоўнага, усмешлівага. Ён нават не пацікавіўся Алегавымі школьнымі справамі, хаця быў у камандзіроўцы амаль месяц. А ўсё хадзіў з пакоя ў пакой, сам з сабою размаўляў, маці якраз у другую змену працавала.

— Вось табе і падзяка, вось табе і радасць... Круцішся, стараешся, са скуры вылузваешся... Ды прападзі яно ўсё пропадам! На сваю галаву выгадаваў, давыстрэнчваўся... І што гэта за свет? Чарнобыль, усюды Чарнобыль...

У той вечар Вадзім не прыйшоў дадому, не вярнуўся і апоўначы. Маці ўзняла пярэпалах, абзваніла Вадзімавых аднакласнікаў, але ніхто нічога не ведаў.

— Гэта ўсё з-за цябе, не мог спакойна пагаварыць з сынам,— маці дакарала бацьку.— Яшчэ, барані Божа, утворыць што-небудзь з гарачкі...

— Я вінаваты, вядома, я! Я навучыў яго хуліганскім

штучкам, я даў яму ў рукі нунчак, я падштурхнуў яго ў бойку,— бацька кіпеў, нерваваўся, ледзьве стрымліваўся, каб не закрычаць, не грукнуць кулаком па стале.— Усё — я!

— Не, не ты, у цябе на гэта часу няма... Ты і дзяцей сваіх толькі зрэдку бачыш, па святах. Яны без бацькі растуць...

— Дык вунь як заспявала! Значыць, я, па-твойму, кашу сена сабакам?! У бомжы падаўся? А кааператыўная кватэра, а машына, а дываны-паласы?.. Яны што, па шчупаковым загадзе для вас з'явіліся?

— Зноў ты пра сваё,— з горыччу прамовіла маці.— Не разумееш мяне, і я зусім не вінавачу цябе... Тут сына шукаць трэба, ратаваць...

— Я адратую яго, я ўстаўлю яму мазгі, дзесятаму закажа! — гразіўся бацька.

Потым ён званіў у міліцыю, дапытваўся, тлумачыў, ды адказ быў несуцяшальны: у нас Вадзім Алейнікаў не значыцца, а за сваім сынам самі сачыце.

Ужо недзе каля дванаццаці ночы маці з бацькам пайшлі на пошукі. Агледзелі ў сваім пад'ездзе кожную лесвічную пляцоўку дзевяціпавярховага дома, абышлі двор, пакружылі па вуліцы, завярнулі да клуба «Алімпія». Гэта былі гнятлівыя, на высокім нервовым напружанні хвіліны чакання. Маці ўсё яшчэ верыла, што Вадзім вернецца, што ён затрымаўся па нейкай вельмі важнай прычыне і вось-вось з'явіцца дадому. А можа, ён ужо вярнуўся, можа, яны размінуліся?

Маці паспяшалася да тэлефоннай будкі, хуценька пакруціла дыск аўтамата, і калі Алег сонным голасам не пацвердзіў яе патаемную здагадку, яна з адчаем зразумела: шукаць Вадзіма дарэмна, ён дзесьці ў надзейнай схованцы. І хто мог прадбачыць, што гэтая схованка абернецца для сям'і Алейнікавых вялікай бядой? Ды калі б ведаць, калі б прадбачыць... І ці не бацькава «вон!» падштурхнула Вадзіма да той схованкі?

Бяссонная ноч, матчыны слёзы, бацькава маўклівасць, якую зрэдку перапыняў яго разгублены вокліч: «Што ж гэта ты нарабіў, пустадомак?! » І незразумела было Алегу: ці бацька гаворыць пра Вадзіма, ці дакарае сябе...

Раніцай, калі Алег сабраўся ў школу і стаяў ужо ў прыхожай, цененька зацілікаў тэлефон. Званок у яго асаблівы, як свісток. Алег быў побач і адразу ж падняў трубку, хаця з кухні ўжо паспяшалася ўстрывожаная маці.

— Алег? — спытаў глухі, незнаёмы голас.— Пакліч бацьку.— Сказаў, як загадаў.

— Тату клічуць,— Алег зазірнуў у заплаканыя матчыны вочы.

— Хто кліча?

— Не ведаю,— прыкрываючы трубку даланёй, адказаў Алег.

Ён затрымаўся ў прыхожай яшчэ з хвілінку, засяроджана зашнуроўваючы свае адзідасаўскія красоўкі, каб хоць крышку падслухаць тэлефонную размову бацькі. Можа, з яе адкрыецца таямніца братавага знікнення?

— Што-о-о?! — раптам ускліккнуў бацька.— Што-о-о?! Але тут жа яго голас зрабіўся нейкім сцішэлым і памяркоўным, быццам і не было гэтага раптоўнага ўзрушэння, маўляў, выйшла памылка.

— Добра, добра... Я разумею... Я згодны...

Краем вока Алег бачыў збялелы бацькаў твар, дрыжачую руку, якая трымала тэлефонную трубку, і адчуваў, што адбываецца нешта дрэннае і нават небяспечнае, што бацькава памяркоўнасць выклікана нейкай вельмі непрыемнай навіной. Але ж усё гэта, магчыма, і не тычыцца Вадзіма, можа, у бацькі здарылася штосьці на рабоце?

Так Алег і пабег у школу — заставаліся лічаныя хвіліны да пачатку першага ўрока. Ён быў вельмі заінтрыгаваны загадкавай бацькавай размовай і яго раптоўным узрушэннем. І ніяк не мог даўмецца, зразумець: чаму Вадзім не начаваў дома, што яго напалохала, няўжо бацькава прачуханка? Сам жа вінаваты: у бойку ўвязаўся, трапіў у міліцыю, вунь якія непрыемнасці бацькам... І чаго яшчэ фанабэрыцца?

А школа гула, узбуджана абмяркоўвала надзвычайнае начное здарэнне. Нейкія злыдні ўкінулі ў акно кабінета дырэктара Мацільды Феліксаўны (ён знаходзіцца на першым паверсе) бутэльку з гаручай сумессю. Згарэў дыван на падлозе, абгарэлі крэслы, стол, шторы і фіранкі на вокнах, пачарнелі сцены. Жахлівае відовішча! Як толькі яшчэ не ўспыхнула ўся школа?!

Першага ўрока не было. Ды хіба ўседзіш спакойна за партай пасля такога нечуванага здарэння? Выказваліся розныя здагадкі і меркаванні, гучала абурэнне злачыннай выхадкай нейкіх недавяркаў... Два міліцыянеры ўважліва агледзелі ўчастак школьнага двара насупраць дырэктарскага кабінета, доўга распытвалі настаўнікаў і вучняў, але якіх-небудзь слядоў ці доказаў, звязаных з пажарам, не выявілі. Ва ўсім — тайна і невядомасць.

І толькі летась, амаль праз тры гады тайнае стала яўным. Алег на свае вушы пачуў у судзе і пра загадкавы ранішні тэлефонны званок, і пра падпал дырэктарскага кабінета. Усё звязалася ў адзін вузел у абвінаваўчым заключэнні і паказаннях сведак. Тут ужо сказаў свае слова і Алегаў бацька. А вось жа ўсе тыя тры гады маўчаў, не адважваўся выкрыць мафіёзнікаў, баяўся расплаты і за сына Вадзіма непакоіўся...

...Голас у тэлефоннай трубцы быў сухі і катэгарычны:

— Слухай, бацька, Вадзім у нас, з ім поўны ажур. Раім не рыпацца і не бегчы да ментаў... Мы не паважаем стукачоў і сексотаў! Уразумеў?! Вадзім — клёвы малец, цяпер ён наш... А што мы не жартуем, можаш даведацца ў дырэктаркі... Схадзі ў школу, у яе сёння якраз добры настрой, там і пабалакаеце па душах. Вадзіма пакіньце ў спакоі... Не мудрыце! Аб нашай размове — ні гуку. Усё, канец сувязі.

Праз дзень бацька зноў паехаў у чарнобыльскую зону, і Вадзім вярнуўся дадому. Быццам нічога і не здарылася: ён нікуды не ўцякаў, не хаваўся, а ў школе не было пажару. Толькі сказаў Алегу:

— Калі хто цябе будзе крыўдзіць, шапні мне... Цяпер у нас сіла, любому звернем рогі.

## 5

Не спіцца, ные нага. У палаце ціха і вусцішна, але зрэдку чуюцца санлівыя прыцмокванні, войканні і нават стогны. Толькі гаварлівы сусед, мусіць, пачувае сябе без усялякіх перажыванняў: з яго ложка не далятае ні гуку. Як выключылі святло ў палаце, дык адразу і замоўк. Нагаварыўся, набалаболіў...

А ў Алега — бяссонніца. Упершыню апынуўся ў бальнічнай палаце, ды яшчэ з пераломам нагі. Магло быць і горш... І ніяк не заціхае ў ягоных вушах вісклівы скрыгат аўтамабільных тармазоў. А заплюшчыць вочы і бачыць: грузавік ляціць проста на яго, вось-вось ударыць. І Пончык тут як тут, гугнявіць: «Вадзім запіску прыслаў... Алік цябе чакае...»

Алег не зажмурваецца, у палаце — прыцемак, яго разбаўляе матавае святло, што ліецца ў палату з калідора праз зашклёны прамавугольнік над дзвярыма. А вакно быццам зашторана — ніякага прасвету. Ды і адкуль з'явіцца той прасвет? На вуліцы, напэўна ж, па-ранейшаму слязіцца вясновая макрэдзь з туманам. Як раніцай і днём,

калі Алег спяшаўся са школы на трэніроўку. Вось і паспеў...

Усё ж нарэшце Алег пачынае драмаць. Мінае хвіліна, другая, і раптам, нібы праз сон, ён чуе нейкія падазроныя гукі. Зусім побач, ля ўзгалоўя свайго ложка. Алег паварочваецца і ў прыцемку бачыць, што нехта шнарыць у яго тумбачцы.

— Ты чаго? — паўшэптам пытаецца Алег.

Але невядомы не адказвае на пытанне і працягвае свае пошукі.

— Шакаладка ў верхняй шуфлядцы,— ціха падказвае Алег.

Чамусьці яму здаецца, што невядомы шукае якраз шакаладку, якую прынесла маці, калі хадзіла ў гастраном. Цукеркі і яблыкі яна раздала хлапчукам, а шакаладны батончык у замежнай абгортцы аддала сыну.

Усе дзякавалі Алегавай маці за пачастунак, а гаварлівы Юра сказаў, пазіраючы на шакаладку, якая ляжала на Алегавай тумбачцы:

— Замежная, мусіць, вельмі смачная.

— Больш не было ў мяне грошай,— нібы апраўдвалася маці,— самі ведаеце, якія цяпер цэны...

— Што вы, што вы! — усклікнуў Юра.— У мяне ад шакалада алергія. Я больш бананы люблю.

«А можа, гэта аматар бананаў?» — падумаў Алег і ўжо больш гучна пацікавіўся: — Юра, ты што шукаеш?

Толькі і на гэты раз не пачуў адказу. Нібы які сон, трызненне: ты гаворыш, а твой голас глухне, раствараецца ў беспаветранай прасторы. Хоць крычы — не дакрычышся.

— Слухай, а твой бацька бярэ хабар.— Алег сказаў спакойна, быццам разважаючы.— Ён жа ўзяў трохлітровы слоік мёду з дзедавай пасекі, абяцаў выручыць Вадзіма. І не выручыў... А ты каштаваў наш мядок?

І чаму Алег успомніў пра мёд менавіта цяпер, ноччу? Праўда, гэты мёд не даваў яму спакою яшчэ днём, калі ён даведаўся, што размаўляе з сынам следчага, які вёў справу брата Вадзіма. Але ж не сказаў, устрымаўся...

— Ну, як наш мядок, салодкі?

Зноў ніякага адказу, толькі Алег пачуў, як асцярожна рыпнуў суседаў ложак — і ўсё. Цішыня, спакой, таямнічы прыцемак. А можа, яму прымроіліся гэтыя падазроныя начныя гукі? Ці прысніліся? І ніхто не шнарыў у яго тумбачцы... Вось дык загадка: сам сабе не паверыш.

Праз колькі хвілін мёдавая падначка ўсё ж падзейнічала. Юра не вытрымаў, злез з ложка і вобмацкам падышоў

да Алега, прысеў збоку, памаўчаў, потым шэптам спытаў:

— Спіш?

— Заснеш тут,— незадаволена буркнуў Алег.

— Прабач, гэта я ў поцемку пераблытаў,— вінавата ўздыхнуў Юра.— Я сваю тумбачку шукаў... У мяне такое... Не магу заснуць, пакуль не пажую што-небудзь...

— Лячыцца трэба...

— Якое лячэнне? І гіпнозам спрабавалі, і кадзіравалі... Не памагае. Нават Чумаку паказвалі...

— Ну і што?

— Усё дарэмна... Са мной загадка, нейкая патаемнасць. Іншы раз магу такое выкінуць — проста жах! Вунь летась здарылася, пра мяне і ў газеце пісалі...

— Няўжо? — Алег пытаўся, як падначваў. Цікава, куды ж завядуць гэтага Гаварунчыка начныя фантазіі?

Юра крыху памаўчаў, быццам збіраючыся паведаміць несусветную навіну, прыслухаўся да прыцемку ў палаце, кашлянуў і толькі тады працягваў:

— Пайшоў я аднойчы на рыбалку, наш дом непадалёку ад вялізнага вадасховішча. Сеў ля зацішнай завадзі, закінуў вуду. Была раніца, сонца яшчэ толькі паказалася. Сяджу, назіраю за паплаўком...

— І раптам...

— Што «раптам»? — перапытаў Юра.

— Я чакаю, калі ты скажаш «раптам»,— ледзьве не хіхікнуў Алег.

— Не перабівай,— ён не заўважыў Алегавай насмешкі.— «Раптам» не было, я тады нічога не адчуў і не ўбачыў. А можа, прыдрамаў? Гэта загадка і таямніца. Мяне шукалі пяць дзён, нават думалі, што я ўтапіўся. Ляжыць вуда на беразе, тут жа мае кеды, якія я разуў, калі прыйшоў да вадасховішча, а мой і след прастыў... Вадалазы на дно апускаліся, усё навокал агледзелі, нават выцягнулі нейкага даўняга тапельца з шылам у сэрцы.

— Дык які ж ён тапелец, калі з шылам?

— Ну, вядома ж, злачынства, у забітага да ног была прывязана пудовая гіра. Бацька расказваў, што па той гіры адшукалі злачынцаў, нейкіх рэкеціраў-культурыстаў...

— А як цябе адшукалі? — не вытрымаў Алег.— І дзе ты хаваўся пяць дзён?

— Я не хаваўся, я некуды лётаў...

— Ты што — лунацік?

— Ніякі я не лунацік. Мяне хтосьці забраў з берага... Ну-у... неяк зачараваў, я і... паляцеў...

— Можа, цябе іншапланецяне зачаравалі? Пасадзілі на

сваю талерку і павезлі,— з'яхіднічаў Алег.

— Можа, і яны,— згадзіўся Юра.— Таямніца ў тым, што сам я не заўважыў свайго знікнення. Мяне шукалі пяць дзён, мой фотаздымак паказвалі па тэлебачанні... Міліцыя аб'явіла пошук, бацька ўсіх падняў на ногі, а я быццам нікуды і не знікаў. На пяты дзень раніцай я зноў апынуўся на беразе вадасховішча... Сяджу сабе, на ваду пазіраю, вось толькі ні вуды, ні кедаў...

— Слухай, а я чытаў пра аднаго хлопца з-пад Пінска, які таксама пайшоў на рыбалку і знік. Праўда, ён вярнуўся праз дзесяць дзён і сёе-тое расказваў...

— Не верыш, думаеш, выдумляю?

— Не, не выдумляеш, а вешаеш лапшу,— Алег сказаў цвёрда, нават катэгарычна.— Вунь колькі цяпер гэтых лунацікаў-іншапланетнікаў. Вычмураюцца, лётаюць, знікаюць, а потым байкі баюць... Бачыце, да іх падляцелі, іх ахмурылі,—пасадзілі ў блакітны шар і павезлі ў далёкія космасы... Аматары сенсацый! Выдумшчыкі-спекулянты...

— Не верыш,— сумна сказаў Юра.— Дарма, я не баю байку... Ты спытай у майго бацькі, ён прыйдзе заўтра да мяне. Ты спытай...

— І пра мёд спытаць? — нібы хто пацягнуў Алега за язык.

— Што — мёд, што — мёд?! — зазлаваў Юра.— Мой бацька не такі, ты не ведаеш яго.

— Ага, не ведаю, але ж ён не адмовіўся ад мёду, узяў.

— Паклёп, усе злачынцы паклёпнічаюць на следчага... Вядома, ён жа выводзіць іх на чыстую ваду, ён жа іх выкрывае... Вось яны і плявузгаюць, што ўсё можна купіць-прадаць...

— І купляецца, і прадаецца,— стаяў на сваім Алег.

— Няпраўда! Вунь мой бацька вёў справу дырэктара магазіна. Дык ведаеш, колькі яму прапаноўвалі, каб ён выгарадзіў дырэктара?

— Мільён?

— Не, два мільёны...

— І не ўзяў?

— Не. Дружкі дырэктара скрутак з грашыма ў бацькавым кабінеце пакінулі. А бацька тыя грошы перадаў пракурору. Пра гэта ў газеце пісалі...

— Мала што ў газеце можна напісаць, папера вытрымае,— Алег стаяў на сваім, довады сына следчага не пераконвалі яго. Ён ніяк не мог паверыць у тое, што следчы, які ўзяў слоік мёду, адмовіўся ад двух мільёнаў рублёў. Тут

нешта не так, не звязваюцца канцы з канцамі. Ды і навошта іх звязваць?

— Пачакай, я дакажу табе заўтра, дакажу! — Больш Юра нічога не сказаў, лёг на свой ложак і заціх, нібы адразу ж заснуў.

Толькі Алегу па-ранейшаму не спалася. Думалася пра гэтую дзівосную размову з сынам следчага: і пра яго начное жаданне «пажаваць», і пра таямнічае пяцідзённае знікненне, і пра два мільёны... Хіба ва ўсё гэта можна паверыць? Алегам паволі авалодвала калючае адчуванне трывогі: няўжо заўтра ён сустрэнецца са следчым, тым самым, які дапытваў яго, заблытваў markрознымі каверзнымі пытаннямі, збіраў факты супраць брата Вадзіма?.. І ён, Алег, прагаварыўся, сказаў лішняе, быццам выдаў брата... І яго паказанні потым гучалі на судзе, сведчылі ў абвінаваўчым заключэнні, а ён не мог іх абвергнуць, даказаць, што нагаварыў на брата, яго запалохаў следчы...

Хаця, вядома ж, наўмыснага запалохвання не было. І допыт вёўся ў прысутнасці Алегавай маці. Але ўжо адно тое, што Алег так нечакана-негадана апынуўся ў цесным змрочным кабінеце, насупраць строгага следчага, з'явілася для яго самым цяжкім выпрабаваннем. А як павінен адчуваць сябе дванаццацігадовы хлапчук, калі яму заяўляюць, што ён дапамог злачынцам і быў у іх наводчыкам? І не адгаварыцца, і не апраўдацца, маўляў, нічога не ведаў аб хітрым падвоху зламыснікаў... Ды калі б не брат Вадзім, не яго просьба... Яна ж была такой простай і не выклікала ніякіх падазрэнняў. Тады не выклікала... Толькі потым, у кабінеце следчага, усё праяснілася, адкрыла свой патаемны сэнс. І падзеі таго страшнага надвячорка, і яшчэ ранейшыя...

## 6

— Ты ведаеш Додзіка Красоўскага? — аднойчы спытаў Вадзім.

— А хіба ты не ведаеш? — здзівіўся Алег.— Ён жа ў суседнім пад'ездзе жыве, на трэцім паверсе. У шостым «Е» вучыцца. Ён кожны дзень белага дога выгульвае.

— А-а-а, дык гэта Додзік? — прыжмурыў светлае вока Вадзім.— Чарнявы такі, фірмовы... Я не ведаў яго прозвішча. Яны ж нядаўна пасяліліся ў нашым доме. А дог у Додзіка адмысловы, не тое што нейкія там куртатыя таксачкі.

Алег падышоў да акна, паглядзеў з трэцяга паверха ўніз:

— Вунь іх «Мерседэс». Вось гэта аўтамабіль!

— Тачка файная, жывуць жа людзі! Не тое што татава «Лада»,— Вадзім таксама падышоў да акна.— Додзік, як і ты, шасцікласнік.

— Ён — у «Е», а я — у «Б».

— Вось бы табе з ім падружыцца,— задумліва прамовіў Вадзім.

— Чаго дружыцца? — паглядзеў на брата Алег.— Ведаеш, які гэта задавака?..

— Яшчэ б не задавацца,— чмыхнуў Вадзім.— У іх, мусіць, куры не клююць «бабак», калі на «Мерседэсе» катаюцца.

— У Додзіка ёсць японскі плэер і калькулятар карэйскі, ён ходзіць з імі ў школу.

— Не, з такім фраерам трэба абавязкова падружыцца,— рашуча сказаў Вадзім.— У яго, напэўна ж, дома ёсць розныя відзікі-шмідзікі, і касеты штатаўскія... Ну як, Алежка, возьмем Додзіка на абардаж? Гэта ж такі смачны блін!

— Ды ну яго, гэтага Додзіка! — адмахнуўся Алег.

— Паслухай, не гарачыся. Мне таксама гэты буржуйчык да фені... А вось паглядзець бы ў яго відзік... Калі Додзікаў пахан на «Мерседэсе» катаецца, то, напэўна ж, і касеткі там... адзідасаўскія. Падумай над маёй ідэйкай, добра?

Мінуў дзень, другі, мінуў тыдзень. Алег нават забыўся на братаву просьбу, а Вадзім больш не напамінаў, нібы і не было той размовы. І тут адзін выпадак надарыўся, як у кіно. Быццам хто спецыяльна падстроіў, падмеркаваў і запрагназіраваў сітуацыю... А можа, гэта была самая звычайная выпадковасць?

Вяртаўся Алег з трэніроўкі праз скверык, было яшчэ даволі рана, і сонца свяціла. І вось на зацішнай алейцы ў засені зялёных каштанаў ён наткнуўся на трох акселератаў, якія абступілі нейкага школьніка і штосьці ў яго патрабавалі. Падышоў Алег бліжэй і раптам у тым школьніку пазнаў Додзіка Красоўскага. Заўважыў яго збялелы твар і лязо нажа, якім адзін акселерат кратаў Додзікава вуха. А ў таго ад страху і мову адняло: ні крыкнуць і ні пікнуць. І, здаецца, Додзік паслухмяна здымаў ужо са сваіх плячэй шыкоўную куртачку.

Халадок прабег па Алегавай спіне, і сэрца неяк трывожна затахкала. Якія нахабнікі, сярод белага дня, трое — на аднаго, ды яшчэ з нажом! Прайсці міма, не звярнуць

увагу, падалей ад бяды? І тут чамусьці ўспомнілася Вадзімава зацікаўленасць Додзікам Красоўскім, яго відзікамі ды касетамі. Ну, калі і не падружыцца з Додзікам, то можна пазнаёміцца бліжэй. І сітуацыя для знаёмства вунь якая выключная! Хаця і вельмі рызыкоўная.

Алег любіў рызыку, і не толькі на футбольным полі. Праўда, ён заўсёды стараўся не ўвязвацца ў розныя хлапечыя канфлікты. А некалькі прыёмчыкаў каратэ, якім навучыў Вадзім, трымаў у сакрэце для самаабароны.

Нечакана Алег пазнаў аднаго з акселератаў: цыбатага, прышчавага, з гладка паголенай патыліцай. Ён бачыў яго з Вадзімам, яны вучацца ў адным вучылішчы. А яшчэ цыбаты запомніўся Алегу завушніцай-крыжыкам на левым вуху. Ну і фрукт!

— Адпусціце, гэта мой аднакласнік,— зманіў Алег, гледзячы ў бясколерныя вочы прышчавага.

Той, што пагражаў Додзіку нажом, адразу ж вызекрыўся:

— Шмакадзяўка, жыць надакучыла?! Ды я зараз з цябе выпушчу кішкі!

— Успакойся, блін,— прышчавы, відаць, пазнаў Алега.— Трэба ўважыць просьбу пацана. Цаню дружбу аднакласнікаў.

— Пляваў я на гэтую дружбу! Мне наступілі на мазоль!

— Замоўкні,— прыгразіў прышчавы і схапіў руку псіха каля запясця, калі ён узмахнуў нажом перад Алегам.— Я каму сказаў, баец мясакамбіната? Усё, пажартавалі — і хопіць. Ліняем!

Додзік стаяў як скамянелы. Ні крывінкі ў твары, ні руху, ні голасу. І куртачку паспеў зняць з адной рукі. Калі злавесныя постаці акселератаў зніклі за дрэвамі, ён жаласліва ўсхліпнуў:

— Сволачы, дэбілы...

— Нічога, супакойся. Добра, што я падаспеў,— Алег перакінуў сваю спартыўную сумку з левага пляча на правае.— І не трэба хадзіць па глухіх алеях... Цяпер гэтых жмурыкаў — як мух на звалцы. Распладзіліся...

— Я тут заўсёды хаджу, з музычнай школы,— дрыготкім голасам сказаў Додзік.

— Вось і дахадзіўся, ім твая куртачка прыглянулася, фірмовая. Ды яшчэ скураная...

— Дэбілы! Іх страляць трэба, як шалёных сабак.— Додзік, здаецца, ачуньваў ад нервовага стрэсу, і яго круглыя шчокі крыху заружавеліся. Ён усцягнуў сваю карычневую куртачку на плечы, зашмаргнуў замок-маланку.

— Трэба страляць,— згадзіўся Алег.

— Дзякуй, ты мяне выратаваў,— Додзік паглядзеў на Алега з прыязнасцю.— Ды калі б я прыйшоў дадому без курткі, ведаеш, што было б мне?

— А калі б яны пырнулі цябе нажом?.. Няўжо і тады атрымаў бы на арэхі?

— Не-е ведаю, можа, і не атрымаў...

— Пайшлі, а то яшчэ перадумаюць і вернуцца,— сказаў Алег і зрушыў з месца.

— Пайшлі,— згадзіўся Додзік і пашкандыбаў побач з Алегам. Ступаў ён неяк няўпэўнена, з перасцярогай, мусіць, усё яшчэ не акрыяў ад спуду.

Праз колькі хвілін маўчання, калі яны выйшлі з алеі і завярнулі да гастранома, Додзік азваўся першы і прапанаваў:

— Давай зойдзем да мяне, паглядзім мульцікі. Можам і на камп'ютэры пагуляць.

— Толькі нядоўга, трэба яшчэ рабіць урокі,— адразу згадзіўся Алег — зноў нейкім таямнічым званочкам напомніла пра сябе Вадзімава просьба. А тут яшчэ напамінак пра камп'ютэр. Дзе ўжо адмовішся ад такой спакусы?

Вунь у школе абсталяваны камп'ютэрны клас, але там гаспадарацъ старшакласнікі, яны вывучаюць інфарматыку. А малодшым да тых дысплеяў і не падступіцца, маўляў, яшчэ паспееце, у вас усё наперадзе...

— Наша кватэра на сігналізацыі,— паведаміў Додзік, адчыняючы двайныя дзверы.— Цяпер нам ніякія дамушнікі не страшныя. Ды і Граф любому чужаку перагрызе глотку. Ты не бойся, ён у нас вялікі разумнік, усё разумее, вось толькі не размаўляе.

Алег адчуў сябе даволі няўтульна (не дапамагла і Додзікава рэкамендацыя), калі ў прыхожай да яго падышоў цыбаты, паджары дог і запытальна ўтаропіўся асалавелымі вачамі. Паглядзеў і паволі адступіў убок, маўляў, праходзь.

—Быў бы са мной Граф, ён паказаў бы дэбілам. Адно маё слова — і ніякіх ножыкаў-сцізорыкаў.

— Слаўны сабачка, і як вы з ім? — Алег апусціў сваю сумку на паркетную падлогу, пачаў расшнуроўваць красоўкі.

— Без праблем, ён у нас атрымлівае розныя прысмакі з мясакамбіната, свежанькія.

— Свежанькія? — перапытаў Алег, пазіраючы на галінастыя ласіныя рогі, якія віселі ў яго над галавой. Усё ў прыхожай выглядала неяк незвычайна, а сцены былі

аздобленыя фоташпалерамі з выглядам на сіняе мора і залацістыя асеннія горы.

— Ага. Мама загадвае прадуктовым магазінам, тата — будаўнічым кааператывам. У нас поўны ажур.— Додзік хваліўся з гордасцю, адчуваючы сябе на вышыні. Здарэнне ў скверыку, мусіць, цяпер не турбавала яго. Дома ён быў быццам у крэпасці, і яму хацелася расказаць і паказаць свайму выратавальніку шыкоўнасць іхняй кватэры.

Паказваць было што: тэлевізар «Соні» і двухкасетнік «Шарп», маленькі «Шыляліс» і японскую электронную гульню... У Алега вочы разбягаліся ад усёй гэтай сучаснай апаратуры.

«Вось дык жывуць!» — думаў ён, міжволі ўспамінаючы набытак іх сям'і: магнітафон «Вясна» і каляровы «Гарызонт». Бацька ўсё на новую «Ладу» збіраў грошы, таму розныя пакупкі былі забаронены. Вадзім прыносіў аднойчы відэамагнітафон, калі бацька быў у ад'ездзе, і цэлую ноч глядзеў нейкія жахі-забойствы. Алег быў прыладкаваўся ля тэлевізара, але маці прагнала спаць. І Вадзіма яшчэ паўшчувала, маўляў, такія замежныя фільмы — страшная бязглуздзіца і хвароба. Але Вадзім нават не зварухнуўся на матчыны словы, ён быў загіпнатызаваны падзеямі, што адбываліся на блакітным экране. Алег ведаў самую вялікую братаву мару: мець свой відэамагнітафон.

«Начынка» Додзікавага пакоя проста ашаламіла Алега. Усе сцены завешвалі каляровыя партрэты Рэмба, Сталоне, Мадонны, Джэксана... У цэнтры гэтай галерэі быў партрэт Кабзона. Додзік перахапіў Алегаў позірк і сказаў:

— Бачыш, з аўтографам. Іосіф гасцяваў у нас, яны з маім татам даўнія знаёмыя. Народны артыст! Падараваў нам асабістую відэакасету са сваім канцэртам.

— «Дарагому Лёнечку ад Юзіка! Няхай нам свеціць наша зорка!» — прачытаў Алег размашысты подпіс жоўтым фламастэрам.

— Можа, Дыснея паглядзім? — спытаў Додзік.

— Давай лепш пагуляем,— Алег паказаў на камп'ютэр, які стаяў на стале побач з «Шылялісам». Дыснееўскія мульцікі ён кожную нядзелю і па сваім тэлевізары бачыць, а тут — камп'ютэр!

— Умееш?

— Не-е, я толькі ў школе назіраў, а самому не даводзілася.

— Добра, я пакажу табе,— чамусьці ўзрадаваўся Додзік.— Вось толькі загружу праграму.

Алег сеў на канапу ля піяніна, а Додзік адразу ж узяўся

за справу. Падключыў чорны провад да разеткі, злучыў яго з магнітафонам, шчоўкнуў уключальнікам тэлевізара, і тут жа пачулася нейкае зумклівае гудзенне, а на экране з'явіўся сіні квадрат.

— Грузіцца «Байт».— Додзік не хаваў свайго задавальнення. Яго чарнявы твар, які зусім нядаўна быў белы, выпраменьваў ружовую лагоду і супакоенасць.— Класная машынка, яна падабаецца мне больш чым відзікі. Тут думаць трэба, шурупіць мазгамі. У кібернетыцы без гэтага нельга.

Спачатку на экране з'явіліся лічбы, радок за радком, потым пайшла карцінка.

— Зараз будзем ваяваць,— аб'явіў Додзік, і яго пальцы ўпэўнена забегалі па клавішах кам'ютэра.— Вайна робатаў. Робаты знішчылі людзей, якія стварылі іх, а цяпер ваююць паміж сабой. Пакуль не знішчаць адзін аднаго... Такая праграма ў робатаў. І няма нікога, хто мог бы спыніць яе. Галоўнае — не прамахнуцца, апярэдзіць праціўніка. Лазерная зброя дзейнічае імгненна.

— Лоўка страляеш! — пахваліў Алег, захапіўшыся баявымі дзеяннямі жалезных воінаў на экране.— І хто навучыў цябе?

— Старэйшы брат, ён радыётэхнічны інстытут закончыў. Цяпер ён за граніцай, там у нас сваякі. І тата з мамай збіраліся ехаць, але пакуль перадумалі... Кажуць, і тут можна жыць, калі маеш галаву на плячах.

«Задавака, яшчэ які задавака!» — Алег адчуваў нейкую непрыязнасць да самаўпэўненага і фанабэрыстага хлапчука, з якім звёў яго дзіўны выпадак у скверыку. Але камп'ютэрная гульня суцішвала гэтае калючае адчуванне, і ён з нецярпеннем чакаў той момант, калі Додзік нарэшце дазволіць яму дакрануцца да клавішаў. Гэта ж так цікава!

Нечакана зазваніў тэлефон, ён стаяў у Додзікавым пакоі на тумбачцы ля канапы.

— Падай слухаўку,— папрасіў Додзік і ўзняў за спіну руку, працягваючы сачыць за экранам.

Ён так і размаўляў: левай рукой трымаў чырвоную трубку, а правай быццам іграў на клавішах, праўда, цяпер не зусім упэўнена і смела.

— Добра, мамуля! Не хвалюйся, я абедаў. Графу даваў булёнчык з ныркамі, з'еў і аблізаўся... Я зараз, мамуля!

Додзік перадаў Алегу тэлефонную трубку, у якой ужо чуліся кароткія гудкі, і расчаравана сказаў:

— Прабач, але трэба выключацца. Званіла маці, час

весці Графа на прагулку. Давай заўтра сустрэнемся пасля школы.

— Не магу, у мяне трэніроўка,— Алег падняўся з канапы з выглядам пакрыўджанага, маўляў, знайшоў адгаворку, каб толькі неяк адчапіцца.

— Разумееш, у Графа строгі рэжым, яго нельга парушаць.

— Ладна ўжо, як-небудзь іншым разам,— згадзіўся Алег.— Можа, паслязаўтра...

— Добра, я буду чакаць.

На тым і дамовіліся, хаця другі Алегаў візіт да Красоўскіх адбыўся толькі праз некалькі дзён. А ў той жа дзень, вечарам, у кватэру Алейнікавых пазваніў Додзікаў бацька. Алег сам падняў тэлефонную трубку.

— Я вельмі-вельмі ўдзячны табе, малайчына! Додзік усё расказаў, ты здорава выручыў нашага сына. Дружы з Додзікам, ён у нас слаўны малец! Мы яшчэ ўбачымся, я сёе-тое падрыхтую для цябе, Красоўскія не застаюцца ў даўгу. Будзь здароў, рыцар!

Так Алег Алейнікаў атрымаў доступ у кватэру Красоўскіх, якая была з двайнымі дубовымі дзвярыма і сакрэтнай сігналізацыяй унутранай аховы. І галоўнае — камп'ютэр. Неўзабаве Додзік навучыў Алега розным прамудрасцям камп'ютэрнай гульні, хаця навука гэтая была не такая простая... Але ж захапляючая! І ўжо адно тое, што Алег дакранаўся пальцамі да клавішаў камп'ютэра, а на экране «Шыляліса» з'яўляліся каляровыя кадры замежнага баевіка, заварожвала яго радасным утрапеннем. Ну... быццам бы асабісты гол, забіты ў рашаючым фінальным матчы.

А тут раптам Вадзім напомніў пра сваю просьбу:

— Што з Додзікам, ёсць кантакт?

І Алег расказаў пра здарэнне ў скверыку.

— Куртачку хацелі занықаць! — зарагатаў Вадзім.— І ты выратаваў Додзіка? Адзін супраць траіх?

— Там быў твой знаёмы,— успомніў Алег.

— Знаёмы?! Ага — Гарох! — не пераставаў смяяцца брат.— Ды ў мяне гэтых знаёмых — як жвачак ў кіёсках! Братва — яшчэ тая, палец у рот не кладзі — адкусяць! Фокуснікі-напарстачнікі! Шарык — злева, шарык — справа... Лоўкасць рук — і ніякага махлярства!

— Якія ж гэта напарстачнікі, калі нажом пагражаюць і куртку адбіраюць? — Алега здзіўляла Вадзімава вясёласць.— Добрыя ў цябе дружкі, нічога не скажаш...

— Куртка, відаць, замежная, няхай не фарсіць,— Вадзім не звярнуў увагу на «дружкоў», а толькі ўдакладніў: —

Нож у іх проста так, для понту... А Додзіку пашанцавала, што ты аб'явіўся ў тым скверыку. Гарох страшна не любіць буржуйскіх сынкоў, ён гэтага Додзіка мог бы пусціць у адных трусах. Экспрапрыятар!

Нарэшце Вадзім адсмяяўся і ўжо сур'ёзна спытаў:

— Ну і як, аддзячыў цябе Додзік за паратунак?

— Шакаладам частаваў, а яго бацька падараваў трохколерную кітайскую ручку,— пахваліўся Алег.

— Не густа... Маглі б што-небудзь больш каштоўнае адваліць, не пабяднелі б...

— Додзік навучыў мяне гуляць на камп'ютэры, гэта ж так цікава! А колькі ў іх рознай апаратуры! Нават у кухні стаіць тэлевізар, і кінакамера ёсць.

— Ну-у?! Вось гэта... начынка! — вочы ў Вадзіма загарэліся, ён аж забегаў па пакоі.— Клюнула рыбка, пара і падсякаць! Правільна сказаў адзін басурман: «Вучыцеся лавіць рыбу!» Мудры пахан, прафесар... А тут таксама вялізная рыбіна!

— Ты чаго? — яшчэ больш здзівіўся Алег. І што так узрушыла брата? — Якая рыбіна?

— Рыбіна? — перапытаў Вадзім, спыняючыся ля акна і зазіраючы ў двор.— Гэта я пра рыбалку ўспомніў... Мы ў мінулую нядзелю ездзілі на дзедава возера, ведаеш, якія там ляшчы?! Я ледзьве выцягнуў аднаго, добра, што Гарох падсачыкам падхапіў. А юшка якая была — смаката!

Вось тут і зразумей брата: ён заўсёды такі. Будзе пра адно гаварыць, і тут жа пераскочыць на іншае. То распытваў пра Додзіка, то раптам успомніў пра рыбалку... Нездарма маці часта ўздыхае: «І ў каго ўдаўся наш узвейвецер? Ой, бяда-гора...»

Але на гэты раз Вадзім зноў вярнуўся да размовы пра Додзіка, мусіць, гэтае пытанне сядзела ў ім калючай стрэмкай. І ён спытаў:

— Тэлевізары-камп'ютэры? І не баяцца свяціцца? Вунь цяпер як чысцяць кватэры багачоў...

— У іх сігналізацыя і дзверы двайныя, дубовыя,— паведаміў Алег.

— Глядзі ты — сігналізацыя і дубовыя дзверы!— усклікнуў Вадзім.

— А дог Граф? Гэта такі ваўкадаў! Ад аднаго позірку нямееш... Я папрасіў Додзіка, каб ён зачыняў дога ў яго пакоі, калі прыходжу да іх. Не магу прывыкнуць, хаця Граф не кінецца на чалавека без каманды. Разумны сабака...

— Правільна, што зачыняеце Графа, з такім трэба

быць асцярожным,— заўважыў Вадзім.— Вельмі правільна!

— Я, калі іду да Додзіка, званю яму загадзя, ён і зачыняе дога.

— Бачыш, які Додзік кампанейскі, а ты яшчэ не хацеў знаёміцца з ім,— сказаў Вадзім, плюхнуўся ў мяккае крэсла і зарагатаў.— Додзік-калабродзік! Дружы, Алежка, з ім, дружы!

— Выскаляка ты,— чамусьці пакрыўдзіўся Алег і выйшаў у прыхожую. Вадзімаў рогат здаўся яму абразлівым і здзеклівым. І пашкадаваў, што расказаў брату пра здарэнне ў скверыку і пра кватэру Красоўскіх. Бач, яшчэ пасміхаецца, нібы ён, Алег, зрабіў штосьці дурное і несусветна бяздумнае...

## 7

Потым настаў той ціхі надвячорак. Алег усё ніяк не мог рашыць алгебраічную задачу, а Вадзім раз-пораз напамінаў яму:

— Чаму не ідзеш да Додзіка, ён жа чакае цябе?

— Рашу задачу і пайду.

— Потым зробіш,— не адставаў брат.

Ён быў нечым узрушаны, яму не сядзелася на месцы ні хвіліны. То падыходзіў да акна і ўважліва назіраў за дваром, то выходзіў у прыхожую, званіў па тэлефоне, з кімсьці размаўляў. Хаця размовы той было — словы два-тры, не больш. Дзіўна тое, што звычайна Вадзім заяўляўся дадому, каб паабедаць ці па якой яшчэ пільнай патрэбе, а так — клуб «Алімпія» і штодзённыя бадзянні з кампаніяй. А калі паступіў у вучылішча, то і абедаць стаў у сталовай вучылішча. Ды хто яго ведае, чым ён там займаўся, як праводзіў вольны ад заняткаў час...

А тут ад самага абеду не выходзіў з кватэры. Можа, чакаў каго-небудзь са сваіх дружкоў. Таму і прыспешваў Алега.

Нарэшце Алег задаволена абвясціў:

— Усё, рашыў!

— Віншую! — абрадаваўся Вадзім, які ўжо гатовы быў сілком выправадзіць брата з-за стала.— Звані хутчэй Додзіку.

— Паспею, не гарыць,— братава назойлівасць злавала Алега. Але ж хіба будзеш пярэчыць Вадзіму? Можна і пстрычку атрымаць, а яны ў яго вунь якія балючыя, з адцяжкай.

— Іду, чакай. Не забудзь зачыніць Графа.

— Зачыню, не бойся.

Алег паклаў трубку і пачаў абувацца.

— Ага, няхай зачыняе свайго ваўкадава,— сказаў Вадзім, які выйшаў у прыхожую за Алегам.— Глядзі там, пагуляйце, я пакуль буду дома.

Як толькі за Алегам зачыніліся дзверы, Вадзім кінуўся да акна. Хуценька адчыніў фортку і высунуў у яе руку з чырвоным гальштукам. Узмахнуў адзін раз, другі і захаваўся за штору, назіраючы за дваром. Ён бачыў, як з пад'езда выйшаў Алег і павярнуў каля клумбы налева, прыкмеціў таксама, як ад белага «Жыгуля» аддзяліліся трое джынсавых хлопцаў і пасунуліся за братам. І калі б хто паглядзеў у гэты момант на Вадзімаў твар, то жахнуўся б — ён быў вельмі падобны на фантамасаўскую маску, белую, амаль мярцвяцкую...

Яны прапусцілі Алега ў ліфт першым, і адзін з іх далікатна спытаў:

— Табе, хлопчык, на які паверх?

— На трэці.

— Ого, і нам на трэці! У якую кватэру, калі не сакрэт?

— У дзесятую.

— А нам — у адзінаццатую.

— Суседзі,— гыкнуў той, што стаяў побач, і Алег адчуў, як на яго патыхнула вінным перагарам.

Ліфт спыніўся, і яны зноў прапусцілі Алега наперад.

— Праходзь, хлопчык, мы не спяшаемся і табе раім не спяшацца. Цішэй едзеш — далей будзеш...

У хлопцаў былі вялізныя спартыўныя сумкі, ды і самі яны выглядалі атлетамі з магутнымі біцэпсамі.

«Культурысты»,— падумаў Алег і ў прыцемку калідора вобмацкам адшукаў кнопку званка.

Яны стаялі побач, спыніліся ля дзвярэй суседняй кватэры.

— Вось жа жмінды, хоць бы лямпачку ўключылі святлейшую,— сказаў адзін.

— На запалках эканомяць, а на «Шарпах» трацяць,— гмыкнуў другі.

— Філосафы! — не вытрымаў трэці.— Глядзіце, каб самі не трапілі ў паласатыя эканамісты.

— Ціпун табе на язык,— сыкнуў першы.

Нарэшце шчоўкнуў адзін замок, другі, і Додзік адчыніў дзверы, прыглядаючыся ў змрок калідора:

— Заходзь.

І тут здарылася нешта страшнае і неверагоднае. Ад

нечаканасці Алег нават не паспеў ускрыкнуць. Не падаў голасу і Додзік. Нападзенне было раптоўнае, разлічанае на дзесятыя долі секунды. Апошняе, што запомнілася Алегу,— гэта едкі непрыемны пах, які патыхнуў яму ў вочы і нос...

Налётчыкі загрузілі ў свае вялізныя сумкі ўсё, што можна было панесці, нават пакваліліся на Додзікаў камп'ютэр. Ім ніхто не перашкодзіў: сігналізацыя была адключана, беспрытомныя хлапчукі ляжалі ў прыхожай на дывановай дарожцы. І толькі Граф, адчуваючы прысутнасць чужых людзей у кватэры, злосна гыркаў у сваім пакоі. Ды каго мог зацікавіць яго брэх? Вунь колькі гарадскіх сабак днямі гаўкаюць у кватэрах, чакаючы сваіх гаспадароў!

Додзікаў бацька сутыкнуўся са спартсменамі (так яму падалося) у пад'ездзе ля ліфта. Спяшаўся дадому, штосьці яго трывожыла, але ён саступіў убок, каб даць дарогу хлопцам з цяжкімі вялізнымі сумкамі. Нават падумаў: «Мацакі, такія могуць горы звярнуць».

Пазваніў раз, пачакаў, потым зноў націснуў на кнопку званка і, не дачакаўшыся голасу сына, які звычайна пытаўся з-за дзвярэй, палез у кішэню сваёй скуранкі за ключамі. Адшукваючы ў прыцемку замочную шчыліну, міжвольна націснуў локцем на чорны дэрмацін, і дзверы раптам паволі прыадчыніліся.

Бацькава здранцвенне працягвалася імгненне, не больш. Ён ускочыў у прыхожую, убачыў Додзіка з Алегам, закрычаў, нема і адчайна, а потым кінуўся па лесвіцы да выхада.

— Тут трое... з сумкамі! — выдыхнуў бабулькам, якія сядзелі на лавачцы ля пад'езда.

— Яны ў белыя «Жыгулі» селі,— адказалі бабулькі.— Вельмі спяшаліся. Вунь туды паехалі...

Бацька нават памкнуўся быў да свайго «Мерседэса», які прыпаркаваўся на краі шырокай дваровай пляцоўкі каля жалезнага гаража. Але праз два крокі спыніўся, з адчаем махнуў рукой і пабег назад, у кватэру.

Вадзім увесь гэты час стаяў ля акна, назіраў за дваром, а ягоны твар быў нейкі момант збялелы і застыглы. Але ён імгненна ажывіўся, зарадаваўся, як толькі ўбачыў хлопцаў з нагружанымі сумкамі, нават зларадна прашаптаў:

— Ну вось, і спёкся папуас!

І яшчэ больш павесялеў, калі заўважыў Додзікавага бацьку, які спачатку кінуўся да свайго «Мерседэса», але тут жа рвануў назад.

— Лаві вецер у полі! — і аж прысвіснуў.

Ён задаволена падумаў пра свайго брата Алега: хіба без яго маглі б яны знайсці ключы да двайных дзвярэй з сігналізацыяй кватэры кааператара Красоўскага? Так усё складна атрымалася — вышэйшы клас! Алег нічога і не западозрыў...

Толькі як ён там, мусіць, напалохаўся? Вадзім прасіў налётчыкаў абысціся з хлапчукамі далікатна, не за чужога, за роднага брата прасіў, бо добра ведаў звычкі гэтых касталомаў. Паспрабуй разбудзіць у іх звера — пакуль кроў не ўбачаць, не адступяцца. Вадзіма запэўнілі:

— Не бойся, наш наркоз дзейнічае імгненна, і чмыхнуць не паспеюць салажонкі!

Аперацыя прайшла быццам па заказу: зlінялі з шыкоўнай апаратурай і ніякіх слядоў не пакінулі. Додзік з Алегам не маглі нічога ўспомніць: як усё здарылася, які знешні выгляд дамушнікаў? Апрытомнелі хлапчукі, а ў памяці — чыстая старонка. Додзікаў бацька нерваваўся, даказваў міліцыянерам: ён апазнае тых спартсменаў на вочнай стаўцы, ён не забудзе іх фізіяноміі і праз сто гадоў. Яму было перажыванняў, хаця суцешвала адно — добра яшчэ, што з сынам так усё абышлося, а магло быць і горш... Ад гэтых дамушнікаў усяго можна чакаць: са свету зжывуць — і вокам не паспееш міргнуць.

Пасля кватэры Красоўскіх каманда Аліка Кажана зрабіла яшчэ некалькі ўдалых налётаў, у якіх удзельнічаў і Вадзім. Праўда, спачатку яны больш месяца, як кажуць, «ляжалі на дне», пакуль не пераканаліся, што следства зайшло ў тупік. Ды, здаецца, тую апаратуру ніхто сур'ёзна і не шукаў. А што яе шукаць? Не «Мерседэс» жа ўкралі...

І ўсё ж Додзікаў бацька дачакаўся сваёй вочнай стаўкі, хоць і не так хутка, але дачакаўся...

Ужо і ўсялякую надзею згубіў, а тут нечаканая выпадковасць. Вось жа бывае ў жыцці! Пацягнула следства за адну нітачку, як раптам цэлы клубок разматаўся. А незайздросную ролю «нітачкі» выпадак наканаваў Вадзіму. Не ўтрымаўся, страціў пільнасць — тут і трапіўся на кручок...

Захацелася Вадзіму шыкануць, пафарсіць крадзеным магнітафонам, дастаў двухкасетнік са схованкі і паехаў з сябрукамі-пэтэвушнікамі ў вёску, на дзедаў хутар. З бітламі ды попсамі, з моднымі запісамі замежных спевакоў ды ансамбляў.

Вычмураліся, кайфавалі, частаваліся дзедавай медавухай — агледзелі трохлітровы слоік у кладоўцы, тайком у лясок занеслі, аддзячылі дзеду за гасціннасць...

Потым Вадзімавым дружкам захацелася вострых адчуванняў, галівудаўскіх прыгод. Прыкмецілі парачку, якая на «жыгулёнку» падруліла на бераг возера,— быў спякотны летні дзень. Калі хлопец з дзяўчынаю па пясчанай сцяжынцы спусціліся да вады, прышчавы пэтэвушнік, той самы, які «прыструніў» у скверыку Додзіка Красоўскага, прапанаваў:

— Давайце пакатаемся!

— А хіба яны пазычаць нам тачку? — засумняваўся Вадзім.

— Пазычаць! — пагрозліва сказаў Гарох.— Мы любому буржую пакажам кузькіну дулю! Няхай яшчэ моляць Бога, што я сёння добры... А хто сядзе за руль?

— Я ўмею кіраваць,— ажывіўся Вадзім.

Разгарачаныя чэрвеньскім сонцам і духмянай медавухай, яны вылезлі са сваёй схованкі і паволі пайшлі да возера, дзе стаялі бэжавыя «Жыгулі». Вадзімаў магнітафон голасам Талькова паціху спяваў пра Амерыку з Еўропай... Цяпер іх мог спыніць бадай што толькі міліцэйскі свісток.

Гаспадар «Жыгулёў» зрабіў вялікую прамашку: ключ запальвання пакінуў у машыне, не закрыў дзверцы, мусіць, уявіў сябе на бязлюдным рабінзонаўскім востраве. Ён заплыў далекавата ад берага, калі заўважыў ля сваіх «Жыгулёў» чатырох хлопцаў. Затрывожыўся, штосьці крыкнуў сваёй спадарожніцы, якая стаяла ў вадзе і цешылася акаляючай лагоднасцю. Яна азірнулася — і аж знямела: незнаёмцы садзіліся ў іх легкавушку. І закрычала, і памкнулася была з вады, але тут жа спынілася, збялелая і знямелая, усім сваім выглядам прыспешваючы плыўца, які імклівым спуртам набліжаўся да берага.

Вадзім нерваваўся і ніяк не мог завесці матор. Яго падганялі, штурхалі ў спіну, пакрыквалі:

— Хутчэй, чаго капаешся? Бачыш, галяк бяжыць!

— Няхай бяжыць,— заспакоіў Гарох,— я асабіста перагавару з ім...

Ён разваліўся на пярэднім сядзенні побач з Вадзімам і з блазенскай усмешкай назіраў за гаспадаром «Жыгулёў», які апантана адольваў узгорысты бераг возера. І толькі дзяўчына ўсё ніяк не магла скрануцца з месца: на яе, відаць, дзейнічаў гіпноз блізкай бяды.

Нарэшце рухавік чмыхнуў, загудзеў, што выклікала ў Вадзімавых дружкоў дзікія воклічы захаплення:

— Газуй! Рвём кіпці, бліны!

«Жыгуль» зрабіў рэзкі рывок, нібы наравісты стаеннік, якога сцебанулі пугай, і раптам спыніўся. Матор заглух.

Вадзім ажно засігналіў з прыкрасці: уцячы ўжо не было ніякай надзеі.

— Усё, прыехалі,— зларадна сказаў Гарох і адчыніў дзверцы.— Пайшлі, пакалякаем з галяком, можа, ён пакатае нас. А ты, Алей, яшчэ пастажыруйся ў бацькі, іншым разам парулюеш.

Двое пэтэвушнікаў палезлі з машыны за прышчавым, толькі Вадзім затрымаўся на нейкую хвілінку за рулём. Ён ніяк не мог дараваць сабе, што падвёў кампанію і цяпер трэба разбірацца з гаспадаром «Жыгулёў».

Хлопец, высокі і мускулісты, закіпеў гневам. Яго, разгарачанага бегам, не астудзілі ні ваяўнічы выгляд Гароха, ні колькасная перавага праціўніка. Ён скочыў да Вадзіма, які ўсё яшчэ сядзеў за рулём, схапіў яго за руку і рэзкім рыўком выцягнуў з машыны.

— Ты што ж гэта, гніда, сабе дазваляеш?!

Сіла ў хлопца была неймаверная: Вадзім кульнуўся на зямлю і на спіне юзам праехаў па жухлай траве. Прышчавы з пэтэвушнікамі кінуліся на дапамогу. Вадзім, раз'ятраны нечаканым кідком, ускочыў на ногі і заняў баявую стойку. Вось-вось павінна была разгарэцца бойка.

— Сашка-а, не трэб-а-а, Са-а-шка-а!

Гэта крычала дзяўчына і бегла да месца сутычкі.

— Людзі-і, дапа-ма-а-жы-ы-це-е! Банды-ты-ы!

Роспачныя крыкі пачуў Вадзімаў дзед, які вяртаўся з рыбалкі. Ён з'явіўся якраз у той момант, калі яго ўнук зрыхтаваўся да атакі.

— Стойце, спыніцеся! — Дзед, невысокі, хударлявы, з тэлескапічнай вудай у руках, апынуўся паміж Вадзімам і хлопцам, у якога на шыі сонечным зайчыкам блішчэў залаты крыжык.— Пабойцеся Бога! Што тут у вас?

— Ды вось, я пайшоў купацца, а яны ў маю машыну залезлі,— хлопец насцярожана азіраўся, чакаючы нападзення з боку Вадзімавых дружкоў.— Якое нахабства!

— Што ж гэта вы, хлопчыкі, надумаліся? Вадзім, няўжо і ты?! Як жа так? — Ён спрабаваў зазірнуць унуку ў вочы, але той адводзіў позірк убок.— Я вас сустрэў, як самых дарагіх гасцей, а вы?!

— Мы проста... пажартавалі,— нарэшце прамямліў прышчавы.

— Сашка, паехалі хутчэй адсюль,— дзяўчына пасмялела, убачыўшы, што небяспека мінула.— Хопіць, пакупаліся...

Калі «Жыгулі» вырулілі на дарогу, Вадзім успомніў пра свой магнітафон, які пакінуў у машыне на заднім сядзенні.

Запомніліся яму і словы хлопца, калі ён садзіўся за руль:

— Я гэта так не пакіну, вы яшчэ адкажаце за свае дурацкія жартачкі.

Міліцэйскі «варанок» прымчаў на дзедаў хутар праз паўгадзіны. Размораную чацвёрку знайшлі на беразе возера. Прыструнілі, запісалі прозвішчы, адрасы, за сваіх гасцей паручыўся Вадзімаў дзед. А магнітафон не аддалі, узялі як рэчавы доказ. Зацікавіліся: адкуль у пэтэвушнікаў шыкоўны японскі апарат?

Так міліцыя трапіла на след: нумар канфіскаванага магнітафона супаў з нумарам, які значыўся ў спісе крадзеных рэчаў з кватэры Красоўскіх. Паведамілі Красоўскаму, ён і прызнаў свой магнітафон, а потым прад'явіў на яго пашпарт замежнай фірмы.

...Вось тады і выклікалі Алега разам з маці да следчага, вопытнага і асцярожнага юрыста. Ён адразу ж ухапіўся за нітачку, калі даведаўся, што злодзеі ўвайшлі ў кватэру Красоўскіх разам з братам Вадзіма Алейнікава. А тое, што Вадзім упарта заяўляў, маўляў, купіў магнітафон па дзяшоўцы ў незнаёмага, не магло прымусіць следчага адмовіцца ад сваёй версіі.

Следчы далікатна распытваў Алега пра яго дружбу з Додзікам Красоўскім, пра розныя школьныя дробязі, спытаў пра футбол, а потым нечакана заўважыў:

— Брат Вадзім цікавіўся тваім сяброўствам з Додзікам Красоўскім?

— Цікавіўся. Ён хацеў паглядзець відзікі,— адказаў Алег.— Вадзім папрасіў, каб я падружыўся з Додзікам.

— Ну вось, нарэшце,— шматзначна вымавіў следчы і нават заўсміхаўся, але тут жа схаваў сваю ўсмешку ў чорнай барадзе, якая абрамляла яго твар да самых вушэй. Галава следчага была амаль што лысая, і толькі вузкая пасмачка валасоў, нібы прыклееная, прыліпла над высокім ілбом.

Алег адразу ж, як толькі ў першы раз убачыў следчага, адчуў да яго непрыязнасць: і да чорнай барады, і да маленькіх вочак, што пранізліва глядзелі з-пад густых чорных броваў, і да вузкай пасмачкі, што надавала выгляду следчага нейкую дзівакаватасць і фальшывасць.

— Кажаш... папрасіў? — нібы перапытаў следчы і тут жа працягваў: — Та-ак, з гэтымі відзікамі цяпер сапраўдны бум... Проста ачмурэнне... І хто толькі іх прыдумаў? А што паказваюць? Гнюснасць, распусту, азвярэнне... Садыстаў, маньякаў, насільнікаў... Вось жа выпусцілі джына з бутэлькі! Камусьці гэта выгадна, хтосьці на гэтым грэе рукі... Усё

разваліць, зняславіць, збэсціць і не пакінуць нічога светлага, чыстага, святога. Усё — анафеме!

Следчы напускаў туману, гаварыў пра відзікі, нібы яго ўжо зусім не турбавалі магнітафон з кватэры Красоўскіх і розныя там падазрэнні да Вадзіма Алейнікава. І Алега ніколькі не насцярожыла ўдакладненне следчага адносна братавай просьбы і дружбы з Додзікам Красоўскім. Ды ўся тая даўняя гісторыя з рабаўніцтвам кватэры Красоўскіх уяўлялася Алегу нейкім дзівотным і страшным сном, у якім ён апынуўся па чыстай выпадковасці.

— І мой сын «захварэў» на гэтыя відзікі,— цяпер следчы звяртаўся да Алегавай маці.— Вось жа купіў на сваю галаву... Касеты недзе дастае, гатовы цэлымі начамі глядзець. І ўсё — вампіры-вурдалакі... Як зараза якая...

— Мы самі вінаватыя: распускаем сваіх дзяцей, стараемся не адстаць ад моды,— не вытрымала маці.— Вось нам і падзяка, і неаплатны доўг...

— Чаму наша віна? — не пагадзіўся следчы.— Купіць — не ўкрасці. Кожны павінен жыць па закону, а ў нас што творыцца? Ды і што нашы законы? Шырма для прастачкоў, маўляў, не ўкрадзі, не змахлюй, жыві праведнікам... А тыя ж заканадаўцы — першыя жулікі. Дарвуцца да ўлады — і шыкуюць, і правакуюць злачынствы. А нам тут вышуквай, збірай неабвержныя факты, дабівайся прызнання.

Следчы перавёў позірк на Алега, разгладзіў сваю бараду, нібы наважваючыся сказаць штосьці вельмі важнае, даўно прыхаванае, якое павінна адразу ж абяззброіць паддопытнага, прымусіць яго прызнацца ва ўсіх сваіх грахах.

— І з Графам брат папрасіў? — нечакана спытаў следчы.

— Што з Графам? — не зразумеў Алег.

— Ну-у-у... зачыніць яго ў пакоі, каб раптам каго не глымануў.

— Не-е, я сам... Додзік заўсёды зачыняў дога, калі я прыходзіў. Граф не любіць чужых.

— Малайчына,— сказаў следчы, хаця нельга было зразумець, каго ён пахваліў: Додзіка ці Графа.

Алег губляўся ў здагадках: куды хіліць гэты барадаты, да чаго дакапваецца? І чаму следчага цікавіць яго знаёмства з Додзікам? Якая тут сувязь з тым бандыцкім нападзеннем? Ён жа тады пра ўсё расказаў, нічога не ўтаіў. Як ехаў з незнаёмымі ў ліфце, як пазваніў у дзверы Красоўскіх, а потым — нібы раптоўны скачок у бездань. І якія яшчэ тут могуць быць падазрэнні?

— Такая ў мяне служба,— уздыхнуў следчы, зноў звяртаючыся да Алегавай маці.— І не хацеў бы я засмучаць вас, трывожыць, і не трэба было мне звяртаць увагу на гэты злашчасны магнітафон, а даводзіцца. Прафесійны доўг: выкрыць удзельнікаў аднаго злачынства, каб папярэдзіць новае.

— Але што зрабіў мой Алежка? Ён жа і сам пацярпеў ад бандытаў, добра яшчэ, што застаўся жывы,— голас маці дрыжэў, поўніўся трывожным хваляваннем.

— Ваш Алежка сам нічога крамольнага не зрабіў, хаця і адчыніў дзверы кватэры Красоўскіх злодзеям. Усё было вельмі тонка прадумана, я сказаў бы — на высокім дэтэктыўным узроўні. Алег нічога не ведаў, яго проста скарысталі... замест ключа. І якога! Не дапамаглі Красоўскаму ні двайныя дзверы, ні сігналізацыя, ні дог Граф... Прыкра, што брат падставіў брата, можна сказаць, прадаў за двухкасетнік. Ды такія ўжо зладзейскія законы... Бачыце, Вадзім угаворваў Алега, каб ён падружыўся з сынам Красоўскага. Гэта ўжо факт!

Вось тут усё і пачалося, і пайшло-паехала... І пацягнулася нітачка, якая прывяла следства ў клуб «Алімпія». А там — вочная стаўка Красоўскага са спартсменамі-дамушнікамі, і новыя ўцёкі Вадзіма з дому, яго боязь бацькавага гневу.

Спачатку Алег не мог паверыць у гэтую фантасмагорыю, не мог прыняць доказы следчага, якія абвінавачвалі Вадзіма, пазбаўлялі яго ўсялякіх шанцаў на апраўданне. Не лазіў у чужую кватэру, не краў, а вінаваты...

Не верыў Алег, пакуль не пачуў ад самога Вадзіма, калі ён раптам аб'явіўся дадому пасля ўцёкаў, даведаўшыся, што бацька ў чарговай камандзіроўцы.

— Гэта ўсё Кажан прыдумаў, гэта яго сцэнарый. Я не мог адмовіцца... Паспрабуй Аліку запярэчыць — сам не будзеш рады. Я быў вінен яму, а даўжкі трэба аддаваць, ды яшчэ з працэнтамі.

## 8

Толькі далёка за поўнач Алег зябыўся чуйным, нездаровым сном. Першы начлег у бальнічнай палаце, а тут яшчэ гэтае нечаканае знаёмства з сынам следчага, які вёў справу брата Вадзіма і прынёс у іх сям'ю столькі перажыванняў і слёз. Але чаму следчы? Хіба ён вінаваты, што Вадзім звязаўся з шайкай Кажана і ніяк не можа развязаць

той хітры вузел? Вунь нават у калоніі даймаюць, мусіць, напамінаюць пра даўгі з працэнтамі. Віжуюць, не адпускаюць...

Баліць, ные нага. І гэты боль адразу ж нагадвае Алегу аб учарашнім здарэнні. Ён толькі што прачнуўся, пачуўшы лагодны голас нянечкі Фрузы:

— Ну як, хлопчыкі, спалася-начавалася? Як пачувае сябе наш навічок?

— На пяць з плюсам,— за ўсіх адказаў Юра.— І навічок спаў як пшаніцу прадаўшы.

— Ага, пшаніцу,— ехідна заўважыў хлопец, ложак якога стаяў каля акна.— Усю ноч прадавалі...

— Няўжо? — здзівілася нянечка.

— Няпраўда, гэта яму прыснілася,— запярэчыў Гаварунчык.

— І злодзеі-бандыты, і шакаладка замежная,— паднačыў усё той жа ехідны голас.

— А яшчэ — трамвай! — парыраваў Юра.

— Хопіць, хлопчыкі, не паважаю злюкаў,— сказала цёця Фруза і аб'явіла: — Будзем рыхтавацца да сняданку. А з табой, Алег, мне трэба прагуляцца.

— Куды?

— Недалёчка, пакажу дарогу, толькі спачатку навучымся хадзіць,— нянечка паставіла мыліцы да Алегавага ложка.— Гэта вельмі проста, зробіш два-тры крокі і пабяжыш наперагонкі.

— Глядзіце, яшчэ ўцячэ з бальніцы,— не вытрымаў Юра.

Нянечка дапамагла Алегу спусціць з ложка загіпсаваную нагу, падтрымала яго за плечы, пакуль ён прыладжваўся да мыліц, асцерагаючыся аступіцца, падбадзёрыла:

— Смялей, смялей... Тут няма чаго баяцца, вось бы на вуліцы былі такімі абачлівымі.

Спачатку Алег падскочыў на адной назе, нібы паспрабаваў пераадолець нябачную перашкоду, але ўжо другі крок зрабіў з дапамогай мыліц, моцна апіраючыся на іх дзвюма рукамі. І яшчэ раз, і яшчэ — проста да дзвярэй.

— Вось і добра, вось і малайчына,— пахвальвала цёця Фруза, назіраючы за Алегам.— Запігсаваную нагу трымай вышэй, яе трэба берагаць. Мусіць жа, баліць?

— Не-е,— няўпэўнена адказаў Алег, хаця вярэдлівы боль мацнеў у гіпсавым боце з кожным крокам. Але ён трываў, не скардзіўся, яму было вельмі важна не выклікаць на сябе Юравы кпіны і насмешкі. Ды і астатнія хлапчукі,

напэўна ж, сочаць за ім, асабліва той, што скардзіўся на бяссоніцу.

Толькі Алегавы перасцярогі былі дарэмнымі: Юра ўжо ішоў побач і прапаноўваў свае паслугі.

— Цёця Фруза, давайце я правяду навічка, у вас і так хапае клопатаў.

Нянечка адразу ж згадзілася:

— Дзякуй, Юрка, ты выручыш мяне. Глядзіце, асцярожна, не спяшайцеся.

— На сняданне паспеем,— з усмешкай адказаў Юра, адчыняючы дзверы перад Алегам.— Тут жа недалёка.

У калідоры, доўгім і змрочным, калі яны павярнулі налева, Алег спытаў:

— Мы куды? На перавязку?

— Якую «перавязку»?! — Юра зрабіў красамоўны жэст сваёй загіпсаванай рукой.— У туалет.

Крокі на мыліцах даваліся Алегу з цяжкасцю, і ён спыніўся, нават крыху сумеўся:

— Я не хачу, мне не трэба праважатыя.

— Кінь, не аднеквайся,— запярэчыў Юра.— Цёцю Фрузу трэба слухацца, яна ва ўсім любіць парадак. Добра яшчэ, што цябе не прывязалі на расцяжку. Ведаеш, як няёмка на ложку... хадзіць у туалет. Вунь адзін хлапец ляжаў без ног. Яны ўсёй сям'ёй на сваёй тачцы пад тралер заехалі. Ён адзін застаўся жывы... Яму ногі патрушчыла... Вось гэта бяда! Хлапец толькі два дні ў нашай палаце быў, а як пакутаваў! А мы з табой — шчасліўчыкі, у нас — дробязь. Мы яшчэ пагуляем у футбол.

«Ну вось, сеў на свайго канька»,— падумаў Алег і зрушыў з месца. Ён ужо ноччу пераканаўся, што Гаварунчыку лепш не пярэчыць, што любая нязгода можа выклікаць новую хвалю Юравых доказаў ці апраўданняў. І не адмахнешся ад яго, як ад надакучлівага камара. І не пашлеш туды, дзе зімуюць ракі...

Юра,— танклявы, даўганогі, у сінім спартыўным касцюме з шырокімі белымі лампасамі,— выглядаў побач з нізкарослым, камлюкаватым Алегам, які ўгнуўшыся, скакаў па калідоры на мыліцах, значна старэйшым за свае трынаццаць гадоў. Акселерат — нічога не скажаш. Хаця вось жа на Алега гэтая акселерацыя нікольк не падзейнічала. Дзіўна, брат Вадзім вунь як выцягнуўся, што той баскетбаліст, а ў Алега — ніякага зруху, і футбол не дапамагае.

Калі вярталіся ў палату, Юра нечакана сказаў:

— Прабач за начную прыгоду: такое бывае са мной... Ад шакаладу ў мяне аскома. Мне кожны дзень прыносяць,

кажуць, што косці хутчэй зрастаюцца...

— Нічога страшнага,— адказаў Алег, каб хоць неяк перапыніць свайго праважатага.— Вось толькі нас, здаецца, падслухоўвалі...

— А-а-а, гэта ў аднарукага бяссонніца, яму ўсё не дае спакою трамвай. Разявака! Бег, спатыкнуўся, упаў...

Яны спыніліся яшчэ раз: першая прагулка на мыліцах знясільвала Алега. Нямелі рукі, торгала загіпсаваную нагу. Хацелася хутчэй дабрацца да ложка, суцішыцца.

Па калідоры шпарка ішоў мужчына ў белым халаце, параўняўшыся, затрымаў хаду, спытаў у Юры:

— Як рука?

— Нармальна, можна збірацца дадому.

— Не спяшайся, трэба зрабіць здымак,— сказаў і тут жа павярнуўся да Алега:

— Навічок?

— Ага,— чамусьці пачырванеў Алег.

— Учора пасля абеду прывезлі,— удакладніў Юра.— Дарогу перабягаў, спяшаўся на трэніроўку.

— Вось бачыце, да чаго прыводзіць спешка... Пасля сняданку зайду ў вашу палату.

Як толькі мужчына ў белым халаце адышоў на некалькі крокаў, Юра ціхім голасам паведаміў:

— Галоўны ўрач, рабіў мне другую аперацыю. Прафесар. Калі б не ён, я мог бы застацца без рукі. У мяне ж вельмі складаны пералом.

«Цяпер давядзецца слухаць новую байку»,— падумаў Алег і намерыўся рушыць наперад, але Гаварунчык спыніў яго загіпсаванай рукой, якую падтрымлівала шырокая марлевая падвязка.

— Чакай, нам трэба вызваліць твайго брата,— сказаў з таямнічай перасцярогай, азіраючыся ў пусты калідор.— Я ўзяўся праводзіць цябе, каб пагаварыць сам-насам. Лішнія сведкі нам не патрэбны.

— Як вызваліць? — Алег пераконваўся ўсё больш і больш: выпадак звёў яго з вялікім дзіваком і невыносным балаболам.— Жартуеш?

— Не, не жартую. Я папрашу майго бацьку, каб ён параіўся з кім трэба. У яго сувязі, сябры-юрысты... Няхай перагледзяць справу твайго брата.

— Так і перагледзяць,— усумніўся Алег.— Суд прыняў рашэнне, і яго ўжо ніхто не адменіць. Твой жа бацька збіраў факты, дапытваў, каб абвінаваціць майго брата. Вадзіма падставілі і запалохалі, а мафіёзнікі засталіся на

волі. Фарцуюць ды крадзеным у сваім кіёску гандлююць... У іх таксама сувязі — і яшчэ якія!

— Ты не ведаеш майго бацьку,— запярэчыў Юра.— Ён справядлівы, ён абавязкова дакапаецца да праўды.

— Ужо дакапаўся! — амаль гнеўна сказаў Алег і рашуча налёг на мыліцы. Больш слухаць сына следчага ён не хацеў. Ды і што карыснага прынясе гэтая размова?

Пакуль падышлі да дзвярэй палаты, Юра ўсё ж паспеў выказацца:

— Я перагавару з бацькам, ён разбярэцца... І няма чаго баяцца гэтых крымінальнікаў. Вунь колькі пагрозаў было майму бацьку: і званілі, і запіскі падкідвалі, аднойчы нават нажом пырнулі ў пад'ездзе. Не запалохалі! Ён любога бандыта можа скруціць у бараноў рог. Валодае прыёмамі баявога самба і мяне сяму-таму навучыў... Неяк трое жмурыкаў з нашай школы хацелі прыжучыць мяне, дык я паказаў ім фігу з макам... Цяпер і блізка не падыходзяць, апякліся. Кожны павінен умець пастаяць за сябе — і не толькі за сябе.

Ужо ля самых дзвярэй палаты, калі Юра ўзяўся за ручку, ён папярэдзіў:

— Пра нашу размову нікому не расказвай.

— Каму расказваць? — спытаўся Алег.— Дарэмна ўсё гэта: пераліваць з пустога ў парожняе...

— Бабка яшчэ надвае варажыла, вось пабачыш! Бацька хутка будзе, ён прыязджае да мяне кожную раніцу.

«Хвалько і пустамалот,— падумаў Алег, калі нарэшце дайшоў да свайго ложка і з палёгкай апусціўся на спружыністы матрац.— Ну і няхай вычмураецца, мне ад гэтага ні холадна, ні горача. Паглядзім, што ён скажа бацьку... Цікава, а ці ўспомніць пра мядок?»

Неўзабаве цёця Фруза прынесла сняданак: талерку маннай кашы, кубак чаю і акраец батона з маслам. Апетыту амаль не было, але Алег прымусіў сябе з'есці сваю порцыю начыста, каб не звяртаць увагу нянечкі. Яна, забіраючы посуд з Алегавай тумбачкі, адно заўважыла:

— Малайчына, пойдзеш на папраўку.

Потым у палату завітаў галоўны ўрач. Абышоў усіх хворых, больш за іншых затрымаўся каля Алега: разглядаў рэнтгенаўскі здымак, які прынесла медсястра, распытваў пра самаадчуванне, раіў не залежвацца, рухаць пальцамі загіпсаванай нагі. У размову ўмешваўся Юра, даваў свае парады. Было бачна, што ў яго з галоўным урачом наладзіліся ледзьве не панібрацкія адносіны.

«Адкуль такая павага?» — думаў Алег.

І ўсё ж ні сняданак, ні візіт галоўнага ўрача не маглі прытушыць насцярожанасць, з якой Алег чакаў сустрэчы са следчым. Нічога добрага, акрамя непрыемных успамінаў, яна не магла прынесці, не кажучы ўжо пра перагляд Вадзімавай судовай справы. А тут яшчэ настырнасць Гаварунчыка: яму б толькі пабалабоніць ды пафіскаліць, павыхваляцца сваёй фантазіяй ды бацькавым суперменствам... Вось жа пашанцавала Алегу з гэтым суседствам! Быццам хто наўмысна падстроіў-наваражыў.

Алег адразу ж пазнаў следчага, хоць пасля іх апошняй сустрэчы-допыту мінула нямала часу. Ды і як было не пазнаць усё тую ж чорную бараду і вузкую пасмачку валасоў, што ляпілася на шырокай лысіне? На плячах следчага вісеў белы халат, а ў правай руцэ ён трымаў поліэтыленавы пакет. Алег міжволі прыкрыў твар далонёй і затаіўся ў чаканні трывожнай размовы. «А можа, Гаварунчык яшчэ перадумае і прамаўчыць пра Вадзіма? — ён ухапіўся за выратавальную саломінку. Але тут жа падумаў пра сябе з дакорам.— Сам вінаваты, не трэба было адкрывацца, распісваць Вадзімаву бяду... Знайшоў абаронцу!»

— Добрай раніцы, казакі-разбойнікі! — Следчы крыху картавіў, і літара «р» у яго атрымлівалася нейкай невыразнай, грасіруючай. Гэты картавы голас напомніў Алегу мінулагоднія допыты, хітрыя пытанні следчага, якімі той стараўся заблытаць свайго паддопытнага. Каб выведаць, разгаварыць, дабіцца прызнання.

Ён прайшоў каля Алега, нават і вокам не павёў на навічка, відаць, спяшаўся, бо адразу ж заявіў свайму сыну:

— Прабач, Юрык, сёння не магу расседжвацца: у горадзе зноў аб'явіўся маньяк. На вуліцы Мендзялеева сярод белага дня знікла дзесяцігадовая дзяўчынка. Ужо два дні ідзе пошук, ну нейкае вар'яцтва... Усіх паднялі на ногі — і ніякіх слядоў. Маці дзяўчынкі ў бяспамяцтве, страшэнна пакутуе... І колькі ж у нас расплодзілася гэтых міхасевічаўчыкацілаў! Проста жах...

— А чаму вы цацкаецеся з імі? — Юра перапыніў бацьку.— Псіхіятрам паказваеце, робіце вочныя стаўкі... Іх жа трэба знішчаць, як шалёных вурдалакаў, без суда і следства!

— Нельга, Юрык, без суда, усё па закону.

— Які закон?! — яшчэ больш узгарэўся Юра.— Вунь трое прыдуркаў здзекваліся над пяцігадовым хлопчыкам, потым забілі яго каменем... І што суд? У калонію адправілі, пашкадавалі непаўналетніх забойцаў... Хай жывуць, выйдуць з турмы і яшчэ не тое ўтвораць.

— Я згодны з табой, Юрык, згодны. Не хвалюйся, ты ж ведаеш мае адносіны да розных там недавяркаў... Ды калі б мая воля!

Слухаў Алег размову бацькі з сынам, і чамусьці яму рабілася ніякавата, нібы ён сам меў якое дачыненне да тых страшных здарэнняў. Ды і як ва ўсім гэтым разабрацца? І адкуль толькі з'яўляюцца страшыдлы-маньякі? Вунь Алег глядзеў у Додзіка Красоўскага па відзіку адзін «жахлівец», дык потым некалькі дзён хадзіў нібы хворы — усё блюзніўся крывавы вурдалак. Такое лепш не бачыць і не сніць...

— Тут яблыкі і шакаладка,— следчы зашамацеў поліэтыленавым пакетам,— пачастуеш, Юрык, хлопцаў, а я пабягу. Сам міністр даручыў мне ўзначаліць групу па пошуку маньяка. Знайсці іголку ў стозе сена... У дошку разбіцца, але злавіць вампіра і пасадзіць на ланцуг!

Следчы пайшоў да дзвярэй, падаўся за ім і Юра.

«Мусіць, пра нашу размову хоча паведаміць,— падумаў Алег.— Сакрэтнічае, каб ніхто не пачуў. Добра, што следчы спяшаецца, цяпер яму не да Вадзіма. І дарма ўся гэтая Юрава задума... Дзівацтва — і толькі!»

Пачутае пра маньяка ўзрушыла Алега, напомніла нядаўняе дзікае здарэнне, калі таксама сярод белага дня знік дванаццацігадовы хлопчык: пайшоў ва універмаг і не вярнуўся дадому. Колькі дзён яго шукалі, пакуль не знайшлі ў падвале, зусім у другім баку горада... А забойцаў не злавілі, быццам якая нячыстая сіла знявечыла хлопчыка. Вялікую грашовую суму абяцалі таму, хто навядзе на след злачынцаў,— і нічога не дапамагло.

Нервовы цік таргануў загіпсаваную нагу, і Алег ледзьве не ўскрыкнуў ад рэзкага болю, які каторы ўжо раз напомніў аб учарашнім здарэнні, а да ўсяго — сустрэчу з Пончыкам. І неабходнасць спаткання з Алікам Кажаном, несусветным прахіндзеем. Няхай цяпер пабегае-пашукае, прывык, што перад ім усе ходзяць на дыбачках...

Падумалася пра ўчарашняе, як раптам адчыніліся дзверы палаты (ён чакаў, што вярнуўся Юра), і Алег убачыў свайго трэнера Аляксандра Мікалаевіча. І новая стрэмка, і адчуванне асабістай віны: падвёў каманду перад гарадскім фіналам і трэнера падвёў, які ўскладаў на яго, Алега Алейнікава, вялікія надзеі.

Трэнер зрабіў два крокі і спыніўся: у адной руцэ трымаў белы халат, у другой — папяровы пакет. Ён не ведаў, куды ісці, азіраўся, стараючыся разгледзецца ў нязвыклай бальнічнай абстаноўцы. Алег схамянуўся, хуценька сеў на ложку і паклікаў:

— Я тут, Аляксандр Мікалаевіч.

— Алежка, што ж гэта ты?! — у голасе трэнера пачуліся не то шкадаванне, не то дакор. Ён падышоў да Алегавага ложка і ўтаропіўся ў загіпсаваную нагу.— А я спачатку не паверыў тваёй маме... Учора позна вечарам дазваніўся, хацеў нават адчытаць цябе за прагул. А тут такое... Я быў у галоўнага ўрача, слава Богу, нічога страшнага... Табе, Алежка, яшчэ пашанцавала. Вунь толькі што ў прыёмны пакой прынеслі на насілках дзяўчынку — адзін жах! Стаяла на скрыжаванні ля святлафора, а тут вялізнае кола ад мазаўскага прычэпа адарвалася... І прама на дзяўчынку...

— Трэба было схавацца за святлафор,— азваўся Алег.

— Цяпер позна хавацца,— трэнер паклаў свой папяровы пакет на Алегаву тумбачку.— Частуйся мандарынамі, набірайся моцы.

— Дзякуй, Аляксандр Мікалаевіч, не трэба было купляць, мне мама ўчора прынесла гасцінцаў.

— А гэта ўжо ты дарэмна, я магу і пакрыўдзіцца,— трэнер усміхнуўся.— Цяпер табе патрэбны вітаміны, каб хутчэй папраўляўся. Ты ж ведаеш, я не люблю сачкоў...

— Прабачце, я не думаў, што так атрымаецца,— вінавата адказаў Алег.— Як толькі здымуць гіпс, прыйду на трэніроўку.

— Ну-у... ты не вельмі спяшайся, футбол — не шахматы. Думаю, хлопцы пазмагаюцца ў фінале. Пакуль на тваё месца паставім Андрэя Пышніка. Ён учора нечакана заявіўся, быццам ведаў, што з табою здарыцца бяда.

— Андрэй? — здзівіўся Алег.— Дык ён жа...

— Перадумаў, сказаў, што вярнуўся, каб пагуляць у фінале. Я яшчэ вагаўся, а тут з табой такое здарэнне... Лепшай замены нам у паўабароне не знайсці.

— Вядома, Андрэя ж запрасілі ў дынамаўскі клуб,— напомніў Алег, нібы пацвярджаючы правільнасць трэнерскага выбару.

— Учора ўсе стараліся, а як стаяў у варотах Мішуня! «Мёртвыя» мячы браў, нават выцягваў з «дзевяткі».

Візіт трэнера падбадзёрыў Алега, надаў яму ўпэўненасці і веры ў хуткае выздараўленне. Хаця, зразумела, перелом нагі — не нейкая там ангіна, якую можна вылечыць чаем з малінай ці рознымі зёлкамі. З гіпсам, напэўна ж, давядзецца паняньчыцца не адзін тыдзень, а на мыліцах не пабяжыш на футбольнае поле. Даскакаўся-дабегаўся...

Аляксандр Мікалаевіч каля пятнаццаці хвілін прабыў у палаце — і ўсё ж змог развеяць Алегавы сумненні-перажыванні. А на адыход сказаў:

— Трымайся, заўтра наведаемся да цябе ўсёй камандай. Дзяжурныя тут строгія, кажуць, трэба прыходзіць пасля семнаццаці. Цяпер ледзьве прапусцілі мяне. Добра яшчэ, што адзін урач прызнаў былога футбаліста... Вось так, Алежка!

Як толькі трэнер выйшаў з палаты, Юра адразу ж падсеў да Алега.

— Не сярдуй, я не паспеў расказаць пра твайго брата. Бацька вельмі спяшаўся на аператыўную нараду. Чуў, у горадзе аб'явіўся яшчэ адзін маньяк?

— Чуў, не глухі,— ціха адказаў Алег і тут жа дадаў: — Прашу, не чапайце Вадзіма, яму ўжо ніхто не паможа... Мафіёзнікі, калі даведаюцца, са свету белага зжывуць. У іх рукі доўгія, яны і да суда гразіліся...

— Чаго баяцца? Мой бацька не такія вузлы разблытваў, нават злодзеяў у законе выводзіў на чыстую ваду! — Сказаў і тут жа прыкрыў даланёй свой шчарбаты рот, маўляў, сакрэт ёсць сакрэт, хаця ў палаце больш нікога не было. Але Юрава асцярожнасць аказалася недарэмнай.

Тут жа дзверы палаты паволі адчыніліся, і раптам Алег (ці не галюцынацыя?!) убачыў блудлівую фізіяномію Пончыка. Не, ён спачатку не паверыў сваім вачам: ці мала на свеце бывае двайнікоў, вельмі падобных адзін на аднаго, не кажучы ўжо пра блізнят? І гэты круглы, сыты твар з маленькімі вочкамі, і гэтая ліслівая ўсмешка падаліся Алегу нейкай нерэальнай фантасмагорыяй, бязглуздым сном.

Толькі гэта быў не сон. Ужо ў наступнае імгненне Алег з адчаем і пакутлівым страхам зразумеў, што Кажаноў ад'ютант адшукаў яго і ў бальнічнай палаце. Вось вам і «доўгая рука»! Вынюхалі, даведаліся, знайшлі... І не схаваешся ад іх, і не знікнеш воблакам-невідзімкам.

Алег кінуўся на падушку і прытварыўся спячым, але было позна. Пончык задаволена чмыхнуў, прычыніў за сабой дзверы і з выглядам пераможцы тэлевізійнага фіналу «Поля цудаў» накіраваўся да крайняга ложка. Юра, адчуўшы штосьці нядобрае, адступіў убок і з трывогай назіраў за незнаёмцам-таўстуном. А тут яшчэ як на тое ў палаце нікога няма — быў час ранішніх працэдур. Хоць бы цёця Фруза прыйшла, яна не любіць, калі наведвальнікі надакучаюць хворым.

— Зрабі ласку, пацан, ідзі праветрыся,— загадаў Пончык Юру.— У мяне з братанам сямейная размова, вельмі далікатная.

Юра не стаў пярэчыць, нават з ахвотаю пагадзіўся:

— Добра, я зараз, толькі доўга не размаўляйце. Бачыце, вашаму братану патрэбны спакой.

— Не затрымаюся, блінок, не загаваруся.— Пончык сеў на табурэтку.— Размова ў нас будзе кароткая, хопіць гуляць у кошкі-мышкі.

Алег ляжаў, не варушыўся, нават затаіў дыханне, нібы спадзяваўся засцерагчыся ад Пончыкавых пытанняў. І якая бура прынесла яго ў бальніцу? Няўжо з-за таго пісьма з калоніі?

— Што ж гэта ты, Алей, надумаўся? — з прытворнай жаласлівасцю ўздыхнуў Пончык.— А каб ты, не дай Бог, узляцеў на неба? Ведаеш, Алік вельмі расхваляваўся, калі не дачакаўся цябе ў скверыку. Ну і гневаўся! Давялося турбаваць тваю мамачку сярод ночы, распытваць... Вадзіма трэба ратаваць, а ты сачкуеш-хітруеш... Ішоў, упаў, ачнуўся — гіпс!

Пончык задаволена захіхікаў, узяў з тумбачкі жоўты мандарын, паспешліва аблупіў яго, адламаў дольку і са смакам зацмокаў:

— Няблага ты тут, Алей, уладкаваўся, вітамінчыкамі ласуешся, лафа!

Слухаць такое Алегу — быццам горкія пілюлі глытаць. А што зробіш? Не плюнеш жа ў гэтую задаволеную сытую фізіяномію?.. Яго ж прыслаў сам Алік Кажан! Вось каму трэба за кратамі сядзець, а ён на волі. І вычмураецца, і раскашуецца... Няўжо яму ніхто не абломіць рогі?

— Будзь ласкавы, Алей, перапыні свой курортны кайф, яшчэ выспішся. Я тут Вадзімаву цыдулку прынёс, трэба расшыфраваць яе. Разумееш, Алік даручыў, а ён, як табе вядома, не любіць жарцікаў-макарцікаў. Паспяшаемся, у мяне часу вобмаль, змарнаваўся, пакуль прабіраўся да цябе. Давялося хітраваць-мудраваць... Ну і строгасці тут у вас, як у зоне.

Усё ж нарэшце Алег адолеў сваё здранцвенне і падняў галаву ад падушкі. Ён сеў, перасунуў да краю ложка загіпсаваную нагу і, нягледзячы на Пончыка, працягнуў руку за тонкім папяровым квадрацікам. Разгарнуў цыдулку і ўважліва прыгледзеўся да няроўных радкоў, накрэмзаных сінім алоўкам. Так, гэта быў Вадзімаў почырк, гэта была яго запіска.

«Алег, аддай А. К. шкатулку, тую самую. Абавязкова! Яна выратуе мяне. Інакш мне не жыць. Вадзім».

Ён перачытаў братаву запіску, затрымаў свой позірк на

словах: «...мне не жыць». І адчуў калючы халадок, які дыхнуў у яго твар разам са з'едлівым пытаннем:

— Ну як, усё зразумела?

— Не, не ўсё,— разгублена адказаў Алег.

## 9

Тое, што браты Алейнікавы дапамаглі злодзеям абабраць кватэру Красоўскіх, узбударажыла школу не менш, чым пажар у кабінеце дырэктара Мацільды Феліксаўны. Асабліва было пераживанняў у Алега. І каму дакажаш, што цябе абдурылі, падставілі? І хто — родны брат! Шукай прастачкоў... Дамовіліся, усё дакладна разлічылі, абабралі кватэру Красоўскіх сярод белага дня... Вось жа пайшлі напралом, не збаяліся ні сігналізацыі, ні двайных дзвярэй, ні сабакі Графа.

Ну, з пэтэвушнікам Вадзімам Алейнікавым усё ясна, за ім даўно ідзе нядобрая слава, яго імя значыцца ў картатэцы міліцэйскай інспекцыі. І да бойкі гарачы, і на руку нячысты, з блатнякамі водзіцца. Яшчэ ў школе праславіўся... А вось як Алег уліп у гэтую гісторыю? Старанны ў вучобе, далікатны ў паводзінах, захоплены футболам... Яго заўсёды ставілі ў прыклад Вадзіму, раілі раўняцца на малодшага брата. І раптам такая навіна!

Няўжо за старэйшым братам пайшоў? Захацелася лёгкай нажывы, асляпіла раскоша кватэры старшыні будаўнічага кааператыва? А тут Додзік пусціў пагалоску, маўляў, з іх кватэры яшчэ да нападзення банды знікла замежная відэакасета. І цяпер ён упэўнены, што гэта пастараўся Алег Алейнікаў. Паспрабуй апраўдацца, даказаць сваю невінаватасць, калі табе не вераць і факты супроць цябе... А тут яшчэ розныя выдумкі-здагадкі: штосьці, дзесьці, ад кагосьці... Было — не было, а размоў — аж пад завязку. Нават усю сям'ю Алейнікавых запісалі ў банду.

У кабінеце дырэктара школы, куды Алег прыйшоў разам з бацькам, ён адразу ж адчуў сябе вельмі няўтульна. Мацільда Феліксаўна, завуч Ангеліна Вітальеўна, класная Валянціна Пятроўна і жанчына ў міліцэйскай форме занадта падазрона ўзіраліся ў яго невысокую постаць, аглядалі з ног да галавы, нібы хацелі адшукаць у ім нейкую загану. Упершыню, здаецца, Алег мусіў быць у такім незайздросным становішчы. Нават той нядаўні выклік да следчага ўяўляўся яму ў гэты момант звычайнай неспадзяванкай.

Алег спыніўся пасярод кабінета, насупраць стала, і не падымаў вачэй ад чырвонай дывановай дарожкі, якая па-

крывала паркетную падлогу. Бацька прысеў збоку, каля акна, мусіць, таго самага, праз якое ў дырэктарскі кабінет заляцела бутэлька з гаручай сумессю, і нервова перабіраў у руках звязку ключоў. Выгляд у яго быў суровы і ўзбуджаны: запрашэнне ў школу абяцала непрыемную і нервозную размову.

— І як гэта мы дакаціліся да такога жыцця, Рыгор Ігнатавіч? — даволі памяркоўна спытала дырэктар.— Проста ў галаве не ўкладваецца! Вадзіма не дагледзелі, а тут і малодшага праваронілі, праспалі. Ганьба ўсім нам!

— Чаму «праспалі»? — успыхнуў бацька, нават дыпламатычнае дырэктарскае «мы» не астудзіла яго гарачнасць.— Ды я суткамі кручу руль, ліквідоўваю, дастаўляю, выводжу... Чарнобыльскіх бэраў вунь колькі наглытаўся... Тыднямі дома не бываю, а цяпер вось загранічныя камандзіроўкі. Мне што, сыноў вазіць у кабіне грузавіка?

— Гэта ўжо вашы праблемы, Рыгор Ігнатавіч,— паранейшаму памяркоўна сказала Мацільда Феліксаўна, але тут жа паправілася: — І не толькі вашы... Хаця я ўпэўнена, многае і самае галоўнае ў выхаванні дзяцей залежыць ад сям'і. Яблыка ад яблыні...

— Ведаеце, не заўсёды так,— уступіла ў размову жанчына-міліцыянер.— Вунь сям'я Хараждекавых: бацька і маці п'яніцы, а дзеці ў іх — сапраўдныя анёлы. І ўважлівыя, і працавітыя, і сумленныя.

— Гэта як каму пашанцуе,— уздыхнула завуч Ангеліна Вітальеўна.— І сям'я, і школа, і айцы святыя не дапамогуць, калі д'ябал паселіцца ў душы. Загадка прыроды — трагедыя людзей. Чорная магія, сатанізм...

— Ды што магія! — не вытрымала і класная Валянціна Пятроўна.— Вунь артыкул у газеце: народнага суддзю пасадзілі ў турму. Звязаўся з крымінальнікамі, хабарнічаў, мафіёзнікаў выручаў, стаў мільянерам... Як жа так — суддзя-злодзей?! Хто яго дапусціў да ўлады? Цяпер жа ў нас зялёная вуліца розным казнакрадам ды прайдзісветам. Выкрываем мінулыя злачынствы, каб пладзіць новыя. Няўжо мы дажыліся да апакаліпсіса сумлення? Гэта ж як канец свету...

— Валянціна Пятроўна, не трэба драматызаваць наша жыццё-быццё,— схамянулася ў сваім мяккім дырэктарскім крэсле Мацільда Феліксаўна.— У нас тут не суд і не дыскусійны клуб... Я вось хачу спытаць у Алега, праясніць няпростую сітуацыю. Вельмі няпростую... Я ж не магу не верыць і такому паважанаму і аўтарытэтнаму чалавеку, як Леанід Раманавіч Красоўскі. Дарэчы, ён зараз павінен

прыйсці ў школу разам з сынам, мы таксама запрасілі іх на нашу сустрэчу.

— Што ж вы хочаце праясняць?! — раптам запальчыва ўсклікнуў Алегаў бацька.— Для чаго гэты спектакль? А я веру свайму сыну: не браў ён нічога ў Красоўскіх! Мала што могуць выдумаць... І не раўняйце Алега з Вадзімам!

— Спакайней, Рыгор Ігнатавіч, спакайней,— у голасе дырэктара пачуліся строгія ноткі.— І я веру вам. Але што нам рабіць з заявай, у якой гаворыцца аб крадзяжы відэакасеты вашым сынам Алегам? Не чуткі нейкія, а пісьмовы дакумент. І я не хачу, каб ім займаліся праваахоўныя органы.

Больш ужо Алег не мог маўчаць, нават бацькава заступніцтва не суцішыла яго крыўду і неўразуменне: як жа можна слухаць такое?

— Няпраўда! Я нічога не браў у Красоўскіх... Яны хлусяць!

Ён нарэшце асмеліўся паглядзець на дырэктара, але халодны бляск яе круглых, у залатой аправе акуляраў прымусіў Алега адвесці свой позірк на дывановую дарожку. Толькі зноў паўтарыў:

— Я нічога не браў...

Раптоўная спазма перахапіла дыханне, і Алег адчуў, што больш ужо не зможа сказаць ніводнага слова. Вось толькі б не заплакаць, не даць волю слязам. Утрымацца з усіх сіл і не раскіснуць. Хаця як жа тут трымацца, калі табе не вераць, калі Красоўскі ў вялікім аўтарытэце ў дырэктара школы. У яго ж вунь якія сувязі — нават з замежнай фірмай. Гэта ж Красоўскі дапамог абсталяваць у школе камп'ютэрны клас, не клас, а сапраўдны цуд. І таму, напэўна ж, Мацільда Феліксаўна ў першую чаргу паверыць Леаніду Раманавічу, а не нейкаму там шасцікласніку, брат якога даўно ўжо хаўруснічае з крымінальнікамі.

Гнятлівае маўчанне перапыніў усхваляваны голас Валянціны Пятроўны. Выгляд у яе быў заклапочаны і трывожны, адчувалася, што яна вельмі перажывае за свайго вучня, які нечакана трапіў у бяду.

— Тут нейкае непаразуменне. Я ведаю Алега ўжо тры гады, ён вучыцца ў маім класе. І мяне заўсёды радавала яго ўважлівасць і паслухмянасць. І шчырасць, і працавітасць. Ну не можа ён пайсці на несумленны ўчынак, не можа! Я гатова паручыцца за Алега, бо веру яму, веру ў яго шчырасць. Мы ўжо гаварылі з Алегам у класе, і ён пакляўся ў сваёй невінаватасці. Але ж нам мала яго чэснага слова,

мы сабраліся, каб прымусіць хлопчыка прызнацца, абвінаваціць невіноўнага... Няўжо мы раптам ператварыліся ў настаўнікаў-робатаў? Як у тым замежным фільме «Клас 1999». Без душы і сэрца...

— Што вы сабе дазваляеце, дарагая Валянціна Пятроўна? Для чаго такія гучныя лозунгі? І дзе вы бачыце робатаў? Гэта ж вам не ўрок гісторыі, на якім можна апавядаць розныя небыліцы пра часы далёкія ды герояў міфічных... І не трэба пра душу і сэрца, калі сярод белага дня ў кватэру ўломваюцца бандыты, а ім дапамагае наш лепшы вучань... Як жа можна такое апраўдваць?

Зазваніў тэлефон, і дырэктар толькі пасля трэцяга званка падняла трубку.

— Слухаю,— і тут жа ветліва-прыязнае: — Добры дзень, Леанід Раманавіч, добры дзень! А мы чакаем вас, сабраліся, чытаем мараль... Што? Не можаце? Вельмі шкада, вельмі шкада... Будзем самі вырашаць, проста так гэты факт нельга пакінуць. Заяву не разглядаць? Так, так... Як скажаце, пярэчыць не будзем. Ведаеце, гонар школы... Мы так вам удзячны!

Мацільда Феліксаўна паклала тэлефонную трубку на чырвоны апарат і нейкі момант моўчкі глядзела на Алега, потым перавяла позірк на яго бацьку, які па-ранейшаму нервова перабіраў у руках звязку ключоў.

— Ну вось, здаецца, і ўсё,— дырэктар вымавіла з палёгкай.— Добра тое, што добра канчаецца... А мы пра робатаў... Леанід Раманавіч не можа з'явіцца ў школу, сустракаецца з нямецкімі бізнесменамі. Ён прасіў не разглядаць яго заяву,— і, ужо звяртаючыся да жанчыны-міліцыянера, дапоўніла: — З відэакасетай праяснілася, там нейкая іншая сітуацыя.

— Вось бачыце, Алег невінаваты! — абрадавалася Валянціна Пятроўна.— І дарма нагаворвалі на яго...

— Па-вашаму, адкрыць дзверы дамушнікам — нявінны жарт? — адчувалася, што дырэктар не падзяляе радасць класнага кіраўніка.— Выгароджваем, апякаем, а потым кусаем локці...

— Тады мы пойдзем,— Алегаў бацька рашуча падняўся з крэсла.— І не будзем кусацца.

— Добра, можаце ісці. А вы, Рыгор Ігнатавіч, не забывайце пра свой святы абавязак: нельга пускаць хлопцаў без нагляду. Час цяпер такі — усё прадаецца і купляецца, нават сумленне.— Мацільда Феліксаўна паднялася з мяккага крэсла і праводзіла Алега з бацькам да дзвярэй халодным бляскам сваіх круглых акуляраў.

Толькі на школьным двары Алег адчуў сябе вальней, нібы нарэшце выратавальная плынь вынесла яго з глыбокага рачнога віру на спакойную паверхню. І ўздыхнуў з палёгкай, і ўсміхнуўся непрыкметна самому сабе, але тут жа спахмурнеў, насупіўся — радавацца яшчэ было рана.

Бацька ішоў побач шырокім крокам, і сын не мог вырвацца наперад, каб застацца сам-насам са сваімі думкамі-перажываннямі, якія навеяла гнятлівая размова ў дырэктарскім кабінеце.

«І чаму Додзік прыдумаў крадзеж відэакасеты? Для чаго яму такая плётка? Але ж вось штосьці змянілася... Ці гэта часовая адтэрміноўка?» — Алег губляўся ў здагадках.

— І трэба ж было табе звязацца з Додзікам? Мала нам бяды з Вадзімам... Праславіліся! Ды калі б толькі гэта... Як быць, што рабіць? — бацькаў голас быў разгублены, нават няшчасны.— Яны ж не адступаюцца, шантажыруюць, патрабуюць... Даведаліся пра мае заграцічныя рэйсы. А тут яшчэ Вадзім... Прадаў душу д'яблу. І каму паскардзішся? Хто нас зразумее? Лёгка сказаць: вучыцеся лавіць рыбу... Усё загублена, нічога душэўнага не засталося... Вунь нават да чаго дагаварыліся, з экрана тэлевізара абвяшчаюць: «Паўлік Матросаў закрыў варожую амбразуру целам свайго бацькі...» Кашчунства, ліхадзейства, святатацтва! Каму гэта выгадна, хто грэе рукі на людскім горы? Усеагульны заечы гіпноз...

Трывожна слухаць Алегу бацькавы словы, вусцішна. Як балючую споведзь чалавека, што трапіў у бязвыхаднае становішча. І не дапамагчы яму, і не выратаваць. Падай руку — самога пацягне ў гэты чорны і страшны вір.

«Хто шантажыруе, што патрабуюць? Ці не Кажан са сваёй бандай?» — Алег зірнуў на бацьку, але ўстрымаўся, прамаўчаў. Ды і што тут распытваць?

І раптам успомніўся адзін загадкавы выпадак... Мільгануў успамін і выхапіў з памяці дзівотнае здарэнне... А якая тут сувязь паміж размовай у дырэктарскім кабінеце, бацькавай трывогай і той паездкай на дзедаў хутар зімовым вечарам? Можа, чыстая выпадковасць, нейкая патаемнасць слоў «заечы гіпноз»? Азарыла — і мільганула знічкай, каб назаўсёды згаснуць у бязмежнай прасторы.

...Запазніліся, выехалі з двара з першымі прыцемкамі. «Лада» лёгка лавіравала па заснежанай вуліцы, абганяючы асцярожныя легкавушкі і марудлівыя тралейбусы, спынялася ля чырвоных святлафораў і, як толькі міргала зялёнае святло, зрывалася з месца. Алег прымасціўся на заднім

сядзенні і чакаў, калі яны нарэшце апынуцца за горадам, бо тады і пачнецца сапраўдная язда: імклівая, з ветрыкам!

Бацька любіў хуткасць, і на Лагойскай шашы з аднабаковым рухам «Лада» быццам узнялася на паветраныя крылы. Праехалі пад мостам, які выводзіў на кальцавую дарогу, мінулі невялічкі дачны пасёлак, густа забудаваны маленькімі двухпавярховымі шпакоўнямі-хаткамі, і паляцелі па шырокай бетонцы.

Бацька трымаўся за руль адной левай рукой і, здавалася, ніколькі не турбаваўся за бяспеку руху. Нібы машына пераключылася на аўтаматычнае кіраванне. Наваколле шарэла, відавочна ахутвалася марозным змрокам, і карусель імклівай гонкі міжволі навявала дрымоту. Тлумны школьны дзень не прайшоў бясследна: Алегу хацелася цішыні і спакою. І бацька не надакучаў роспытамі, адчуваласяся, і ў яго хапіла за дзень вярэдлівых клопатаў.

Але калі параўняліся з новым дачным пасёлкам, бацька парушыў маўчанне:

— Ну вось, райскі гарадок! Двухпавярховыя цагляныя катэджы, з мансардамі і гаражамі... І адкуль гэты шык? Кругом галеча — а тут! Кожны дамок па індывідуальным праекце... Сапраўдныя рыбакі, яны ўмеюць лавіць стронгу... Чарнобыльцы-ліквідатары...

Алег не першы раз праязджаў міма гэтага пасёлка, які рос нібы ў казцы, і таксама здзіўляўся яго незвычайнай прыгажосцю і раскошай. Жывуць жа людзі! Ім усё можна, у іх няма праблем... У прыцемку заснежаны дачны пасёлак выглядаў яшчэ больш прыгожым і велічным, нібы якое незямное паселішча. Фантастыка, цуд?!

А «Лада» імчала далей. Маўчаў бацька, прымружыў вочы Алег. Яшчэ трошкі — і ён быў гатовы паплыць на хвалях лёгкага сну. Цёпла ў машыне, вусцішна, і спакойная музыка, якая лілася з радыёпрыёмніка амаль усю дарогу, навявала рахманы настрой. Вось так бы ехаць і ехаць... Праўда, Алегу больш падабаюцца дзённыя паездкі на дзедаў хутар. Калі зварочвалі з шашы на гравійку (да хутара заставалася дзесяць кіламетраў) і выязджалі за вёску, бацька часцяком дазваляў сыну сесці за руль. А гэта ж вунь якая радасць! Даўно ўжо былі тыя першыя ўрокі, як ён, яшчэ дашкольнік, узбіраўся на бацькавы калені і хапаўся за руль, нібы за выратавальны круг.

Алег усё ж задрамаў і не заўважыў, як «Лада» звярнула з шашы, праехала па асфальтаванай дарозе да вёскі, а за ёй выскачыла на вузкую гравійку, абапал якой высіліся снежныя бар'еры. Яшчэ ўчора нечакана ўсхадзілася завіру-

ха і за паўдня намяла высокія заносы. Гравійку давялося расчышчаць бульдозерам.

Ужо зусім сцямнела, і фары прабівалі марозную цемрадзь яркім промнем, высвечваючы ў мройным паветры іскрыстыя сняжынкі, што мітуслівымі матылькамі зляталіся на святло. Гравійка павярнула на пад'ём, і «Лада» збавіла хуткасць, нібы ўзяла перадышку пасля зацяжной гонкі. За пад'ёмам пайшла роўная дарога, і бацька зноў націснуў на акселератар. Да хутара заставалася кіламетраў пяць...

Алег прахапіўся ад узрушанага бацькавага голасу:

— Глянь, глянь, даўгавухі!

Спачатку Алег нічога не зразумеў: што здарылася, куды глядзець? Быццам раптам трапіў у нейкі таямнічы кругаварот, які ашаломіў, закружыў, панёс. Усё хутчэй і хутчэй...

— Стой, ад мяне не ўцячэш! — крыкнуў бацька.— Сто-о-й!

І тут наперадзе, у яркім святле фараў Алег убачыў маленькі белы камячок, які шпарка каціўся па гравійцы. Зусім побач, метраў пятнаццаць — дваццаць ад «Лады», паміж высокіх снежных бар'ераў. Гэта быў зайчык — беднае, няшчаснае стварэнне, якое раптам трапіла ў гіпнатычны прамень.

— Тата, спыніся, не трэба! — горача ўсклікнуў Алег. Ён бачыў, што «Лада» наганяе зайчыка і звярок не ў сілах спаборнічаць з машынай.

Але бацька быццам не чуў сына, яго захапіў азарт пагоні, ён выціскаў з «Лады» ўсё, на што быў здольны яе рухавік.

— Будзе дзеду з бабай гасцінец! Вось парадуем!

Толькі Алег не мог радавацца: яму зрабілася страшна, нібы яны на поўнай хуткасці ляцелі да абрыву. І не спыніцца, і не павярнуць назад... Адлегласць паміж зайчыкам і «Ладай» паволі скарачалася: гэта была бязлітасная гонка. Хоць бы які паварот, хоць бы якая калдобіна...

— Тата, пашкадуй, та-та-а-а!

Алег захліпнуўся, але ўсё ж асіліў сваё нечаканае зняменне і, як перад скачком у бездань, выкрыкнуў:

— Не забіва-ай-й!

Ён закрыў твар рукамі, сцяўся, ашаломлены жорсткай пагоняй. Яго апанавалі страх і неўразуменне: «Чаму тата не можа спыніцца, чаму?!»

І тут раптам «Ладу» падхапіла нейкая магутная сіла, якая вынесла легкавушку спачатку да левага снежнага бар'ера, а потым крутнула яе направа.

— Трымайся! — выгукнуў бацька.

Круты віраж рэзка кінуў Алега ўбок, ён з размаху ўдарыўся галавою аб бакавое шкло і страціў прытомнасць.

Ачнуўся ад халоднага дотыку мокрай снежкі, якую бацька прыкладаў да лба. Ледзяныя кроплі сцякалі па шчацэ, скочваліся за каўнер,— яму зрабілася вельмі зябка. Алег схамянуўся, расплюшчыў вочы і адразу не змог уцяміць: «Дзе я, што са мной?»

Ён напаўляжаў на заднім сядзенні, а бацька, падтрымліваючы сына за плечы, вінавата апраўдваўся:

— Прабач, сынок, нейкі нячысцік закілзаў... Я ж пажартаваў... Хацеў напалохаць зайца... І трэба ж было яму выскачыць на гравійку! А тут гэты адхон... Добра, што не перакуліліся, гурба выручыла... Баліць? Даруй, сынок, мая віна...

Алег слухаў нібы спрасонку, адчуваючы, як пухліна на лбе расце, наліваецца пякучым болем. Не дапамагаў і бацькаў снежны кампрэс. Толькі Алега турбаваў не гузак, ён усё яшчэ знаходзіўся пад гнятлівым уражаннем ад гэтай дзікунскай пагоні.

— А зайчык? — ледзь чутна спытаў Алег.

— Уцёк! Як на крылах паляцеў! — па-ранейшаму вінавата паведаміў бацька.— Я ўжо хацеў тармазіць... Вось жа гіпноз...

— Выратаваўся!? — навіна падбадзёрыла Алега, крыху суцішыла яго млоснае галавакружэнне.— Няхай жыве!

— Будзе жыць, калі ліса не дагоніць,— пагадзіўся бацька.— Так і бегаем наперагонкі. Гіпноз, заечы гіпноз...

...Той жа ноччу, пасля размовы ў дырэктарскім кабінеце, Алегу прысніўся фантасмагарычны сон. І ён чымсьці напомніў пагоню па зімовай гравійцы. Праўда, там ужо не было зайчыка і не было снежных бар'ераў. А была бетонка... І не «Лада» даганяла сваю ахвяру, а наадварот — за «Ладай» гнаўся «Мерседэс». І за рулём сядзеў не бацька, а Вадзім. Алег, прыгнуўшыся, схаваўся на заднім сядзенні і не бачыў, што дзеецца наўкола. Але ён адчуваў: гонка складваецца не на іх карысць. Ды хіба ўцячэш ад «Мерседэса»? І Вадзімаў разгневаны голас не абяцаў нічога добрага: «Даганяюць, сволачы! Кранты, братанчык, амба! Зашухарыў нас додзік-удодзік... Яму шкада відзік, жмінда буржуйская... На мільёнах спяць, казнакрады праклятыя! Лада-ладачка, выручай!»

І трэба ж было ім увязацца ў гэтыя кошкі-мышкі! А ўсё з-за Вадзіма: «Панасонік» яму спакою не дае, жыць без яго не можа. Вось і Алега абдурыў, нават прыстрашыў: «Калі

мне не паможаш, у акно выскачу, тады яшчэ пашкадуеце...»

Алег згадзіўся, угаварыў Додзіка, маўляў, дай на адзін вечар, брат дастаў файную касету... Мінула колькі часу, а Вадзім нібы і забыўся на сваё абяцанне: вярнуць «Панасонік» на наступны дзень... А там Додзікаў бацька даведаўся пра знікненне відэамагнітафона, падняў шум, Додзіка прыструніў...

І вось гэтая пагоня: Вадзім з Алегам уцякаюць ад Красоўскага. Выследзіў, прыпільнаваў, калі яны выбраліся на дзедаў хутар. А «Панасонік» прыхавалі ў багажніку «Лады»... Толькі не ўцячы ад «Мерседэса», не схавацца... Гіпноз ёсць гіпноз!

«Не-е, таўстапузыя, не на тых натрапілі! — крычыць Вадзім і раптам загадвае: — Трымайся, Алежка, ідзём на таран!..»

Прачнуўся Алег, а ў самога адчуванне, нібы яго прымусілі сігануць уніз з дванаццатага паверха. Аж перахапіла дыханне. Вось дык сон! Ці гэта ўсё адгукнулася Додзікава выдумка пра ўкрадзеную відэакасету? А бацькавы перажыванні? Ён жа цэлы вечар пасля размовы ў кабінеце Мацільды Феліксаўны не знаходзіў сабе месца, маці давёў да слёз, пагражаў нейкіх вырадкаў вывесці на чыстую ваду... Ды што з тых пагрозаў?

Ну, а што з малінавай шкатулкай? Яшчэ адна загадка, як у фантасмагарычным сне з пагоняй... Таямніца за таямніцай... Хто перадаў Вадзімаву запіску з калоніі? Няўжо і там у Кажана свае сувязі? Прыспічыла мафіёзнікам, не могуць пачакаць, нават прыслалі Пончыка ў бальніцу. І што ў шкатулцы? Мусіць жа, нешта вельмі каштоўнае, калі з-за металічнай скрыначкі Вадзіму пагражае небяспека... Вось жа ўзяў віну на сябе, на тры гады пайшоў у калонію, а даўжкі засталіся, не паспеў разлічыцца...

## 10

Вадзіму вельмі не шанцавала, нібы яго зачаравала нейкая нячыстая сіла. Хіба ж ён быў ворагам самому сабе, каб рабіць усё шыварат-навыварат? Быццам наўмысна вышукваў розныя небяспечныя прыгоды, кідаўся ў бяздумныя авантуры, рызыкаваў... Штосьці яму сыходзіла з рук па малалецтве, дзесьці хітраваў, аднекуль ратаваўся ўцёкамі. Ды, як кажуць, збан да пары ваду носіць...

Следства па справе абрабавання кватэры Красоўскіх

яшчэ не закончылася (толькі раскручвалася версія з двухкасетнікам, з якім Вадзім папаўся на дзедавым хутары), а тут новая заварушка. Зноў у сям'і Алейнікавых трывога: знік Вадзім, як скрозь зямлю праваліўся. І дзень яго няма, і два... Пошукі, званкі Вадзімавым сябрам — усё дарэмна.

— Хоць бы бацька не з'ехаў у камандзіроўку,— хвалявалася маці.— Што я магу зрабіць адна? Хіба ж ён слухаецца мяне? Зусім адбіўся ад рук... Толькі б чаго з ім не здарылася... Цяпер жа вунь колькі страхоццяў наўкола!

А тут яшчэ ўчастковы міліцыянер заявіўся, пра Вадзіма пачаў распытваць і ўсё з падазрэннямі, нібы маці ведае пра сынаву схованку.

— Сам сябе ў клетку заганяе,— у голасе ўчастковага пачулася пагроза.— Ён жа ўчора павінен быў даваць паказанні следчаму... Ці яго трэба на ланцуг пасадзіць? Блазнуе хлопец, гуляе з агнём!

Слухаць такое пра брата — быццам самому трапіць у калючую неспадзяванку. А чым дапамагчы маці, што дарадзіць? Алег і ў двары прыслухоўваўся, і да клуба «Алімпія» наведваўся, і па скверыку з фантанам прайшоўся, дзе звычайна Вадзім бавіў час са сваімі дружкамі, але ніякай вестачкі, ніякіх слядоў.

— А можа, ён на хутар паехаў? — выказаў здагадку Алег.— Канікулы ж, і практыка закончылася.

— На хутар? — перапытала маці.— Але ж чаму Вадзім не з'явіўся да следчага? Яму ж нельга нікуды выязджаць, пакуль ідзе следства.

— Мала што, мог забыцца,— няўпэўнена прамовіў Алег.— З'езджу да дзядулі, завязу батарэйкі для транзістара. І пра Вадзіма распытаю...

Вось ужо мінуў тыдзень, калі бацька прывёз Алега з хутара, якраз перад самым сваім ад'ездам у далёкі рэйс. Вельмі не хацелася Алегу пакідаць дзедаў жнівеньскі рай — з духмяным мёдам, раннімі яблыкамі, сакавітымі ягадамі. А рыбалка на возеры!

Толькі давялося вяртацца дадому — зноў жа ў следчага ўзніклі пытанні і да малодшага сына Алейнікавых. Трэба было праясніць сякія-такія дэталі ў справе абрабавання кватэры Красоўскіх. Хаця Алегу і не была прад'яўлена, як Вадзіму, мера стрымання, ён не вярнуўся на хутар пасля допыту ў кабінеце следчага. Ды і як з'язджаць з дому, калі такая бяда з братам Вадзімам? А тут раптам яго таямнічае знікненне... Не ўпершыню знік, але ж на гэты раз не з'явіўся па павестцы да следчага. Вунь нават участковы гразіўся...

Маці пагадзілася з Алегавай прапановай, толькі папярэдзіла:

— Глядзі, доўга не баўся, пераначуеш — і вяртайся... Што я тут адна?

— Добра, заўтра прыеду.

Надвячоркам сышоў Алег з маршрутнага аўтобуса і па сцяжынцы, што пралегла напрасткі па зжатым жытнёвым полі, пашыбаваў да хутара. Ішоў лёгка, нават подбегам, размахваючы палатнянай сумкай, у якую маці паклала круглы бохан раўбіцкага хлеба і дзве сайкі з разынкамі.

Яшчэ на мінулым тыдні тут высокай сцяной стаяла жыта, і прайсці па сцежцы было няпроста: важкія каласы на тоўстых сцяблінках закрывалі вузкі праход, і іх даводзілася расхінаць рукамі, прабівацца наперад з немалымі намаганнямі. І, вядома ж, ніхто не адважваўся залазіць у жытнёвы калідор дажджлівай парою, тады ўжо трэба было ісці абходнай дарогай, каля возера, а гэта, мусіць, далей на які кіламетр.

Сцежка падымалася на ўзгорак, вяла да магутных купчастых бяроз, якія роўнай шарэнгай высіліся на краі поля. І вось ужо з-за густой зялёніны вынырнуў шыферны дах высокага дома з мансардай. Гэта быў сапраўдны прыгажун! Светлы, прасторны, ашаляваны блакітнымі цалёўкамі. І ўсё — справа рук дзеда Ігната! Сам падганяў, гэблікам кожны сучок прыгладжваў. І печ з ляжанкай зладзіў, і камін...

Пашэнціла Алейнікавым, купілі хатку-развалюху, а разам з ёю — стары сад і такія ж учарнелыя прыбудовы. Пуставала сядзіба, і нікому не было да яе клопату. Гаспадар памёр, а ў яго не аказалася нашчадкаў. Вось Алегаў бацька і пад'ехаў да старшыні сельсавета, добрыя людзі параілі... Афармілі куплю-продаж, паспрыялі дакументы ліквідатара.

Так на месцы занядбанай хаткі-развалюхі і ўзняўся церам-церамок. І ўсё дзякуючы ўвішнасці Алегавага бацькі, яго знаёмствам-сувязям і асабліва сяброўскай падтрымцы былога бацькавага аднакласніка, які выбіўся ў вельмі высокія начальнікі. Адмысловы сасновы лес, цэгла, шкло, шыфер... Паспрабуй усё гэта знайсці-купіць, давесці да ладу. Давялося пазавіхацца-пашчыраваць... Дастаўка матэрыялаў — бацькаў клопат, а вось самім будаўніцтвам кіраваў дзед Ігнат. І не толькі кіраваў, а браў у рукі і сякеру, і іншы цяслярскі інструмент. А рукі ў яго яшчэ моцныя, ды і сам ён мацак з мацакоў: мускулісты, загарэлы, абветраны. Увесь час у клопатах, і хвілінкі, здаецца, не можа

пасядзець спакойна. Праўда, іншы раз радыкуліт даймае...

І сад абмаладзілі, і пчолак развялі... І ўсё за нейкія там тры гады. Хаця дзед Ігнат і баба Даша спачатку вельмі не хацелі пакідаць сваю вёску, іх нават не палохалі небяспечныя бэры і каварныя радыёнукліды. Але нарэшце-такі ўгаварылі, перараканалі... Ды і што ўгаворваць, калі ўся вёска трапіла ў зону адсялення. Была Сасноўка, а тут месяц за месяцам пастулова апусцела, як вымерла. Там цяпер толькі бомжы ды марадзёры раскашуюць, нібы перад канцом свету...

— Для ўнукаў, дзядуля, стараемся, для нашчадкаў,— неаднойчы казаў Алегаў бацька дзеду Ігнату.— І саміх сябе трэба пашкадаваць, адзін раз жывём.

Вішнёвай алеяй Алег падышоў да брамы, па абодва бакі якой стаяла жалезная агароджа, і асцярожна бразнуў клямкай драўляных веснічак. Бабуля Даша ў дальнім кутку двара даіла карову Рыжуху, і ў надвячоркавай цішыні даёнка меладычна пазвоньвала: «цур-цур». Чорны Шарык першы ўбачыў госця і, дружалюбна гаўкнуўшы, кінуўся насустрач. Абрадаваўся, хоць і жыў без ланцуга, але з Алегам у яго былі асаблівыя адносіны. І да возера разам бегалі, і ў блізкі лясок наведваліся, і проста сваволілі... А з кім яшчэ пагуляеш на хутары?

— Цішэй, цішэй! — Алег жартаўліва адмахваўся ад Шарыка, які апантана падскокваў уверх, паскугольваў, стараючыся лізнуць хлопца ў твар.

— Прывітанне, бабуля! — даволі гучна крыкнуў Алег, азіраючыся навокал. Яму хацелася адразу ж знайсці адказ на сваё вярэдлівае пытанне: «Дзе Вадзім?»

Бабуля перапыніла дойку, павярнулася на Алегаў голас і радасна ўсклікнула:

— Добры вечар, унучак, якраз на сырадойчык паспеў! Я зараз.

І зноў заспявала даёнка: «цур-цур», «цур-цур». Алег апусціўся на лаўку пад густым кустом бэзу, павесіў на штыкеціну палатняную сумку з хлебам і сайкамі, а Шарык, нарэшце ўгаманіўшыся, прысеў побач і паклаў на Алегавы калені пярэднія лапы. У лагодным сабачым паглядзе хлопчык заўважыў нямое запытанне: «Як справы, сябрук? Можа, што здарылася?»

— Ну і хітрун жа ты! — усміхнуўся Алег.— І нос у цябе халодны, усё віжуеш, вынюхваеш. Мне б твой нюх...

Ён дакрануўся ўказальным пальцам да вільготнага пятачка, адчуў яго прыемную прахалоду, пагладзіў чорную бліскучую Шарыкаву спіну і перавёў позірк на шырокія

вокны, завешаныя цюлевымі фіранкамі. Ва ўсім — далікатная рахманасць і вусцішны спакой, навеяныя задумлівай жніўнай парою. Лагодныя промні заходзячага сонца адбіваліся ў круглым акне мансарды яркім барвянцам. I ў гэтым вячэрнім водсвеце ўгадвалася нейкая загадкавая таямнічасць.

— Ого, хто да нас завітаў! — басавіты голас прымусіў Алега схамянуцца і падняцца з лаўкі.— А мы ўжо тут засумавалі, добра яшчэ, што Шарык улагоджвае нашу адзіноту.

Дзед Ігнат з'явіўся на двары знячэўку, нібы спяшаўся па нейкай вельмі пільнай справе. Ён ішоў з саду і трымаў у руцэ лазовы кошык, напоўнены да ручкі крамянымі яблыкамі. Высокі, белагаловы, крыху сутулаваты, у лёгкай карычневай вятроўцы і мяккіх хатніх пантофлях дзед выглядаў гэткім казачным дабрадзеем.

— Ну, як там у вас, што новенькага? — спытаў, апусціўся на лаўку, запрасіў прысесці і ўнука, працягнуў сакавіты, з матавым адлівам яблык.— Частуйся, Алежка, белы наліў!

Алег узяў яблык, узважыў яго на далоні, але не адкусіў, а спачатку адказаў на дзедава пытанне:

— Нічога асаблівага, тата ў камандзіроўцы.

Ён не стаў распытваць пра Вадзіма, чакаючы, што ўсё праясніцца само сабой. Ды і як тут распытваць? Бацька ж папярэдзіў, каб не расказвалі дзеду з бабай пра Вадзімавы прыгоды. А што зменяць іх хваляванні-перажыванні? Яны ж любую неспадзеўку прымаюць блізка да сэрца, асабліва бабуля Даша. I завохкае, і слязу пусціць...

— У камандзіроўцы? — уздыхнуў дзед Ігнат.— А ў нас тут запарка: і жыта трэба жаць, і садавіну даводзіць да ладу, і з сенам управіцца... Белага дня не хапае... Круцімся з бабай, стараемся... Ды сілы ўжо не тыя... Вунь і баравікі ў лесе з'явіліся, а калі іх збіраць? Хоць бы Вадзім пад'ехаў... Што ён робіць у тым горадзе?

— У яго яшчэ практыка,— зманіў Алег і адразу, каб змяніць гаворку, дадаў: — Я батарэйкі прывёз, для прыёмніка.

Сказаў, пераклаў яблык з правай рукі ў левую і палез у глыбокую кішэню сваёй сіняй балоневай курткі. Дастаў чатыры круглыя прадаўгаватыя элементы, падаў дзеду. Той ажывіўся, павесялеў:

— Вой, малайчынка, усцешыў дзеда! Я ж без апошніх паведамленняў, як без курыва... Не сядзець жа седма ля хатняй радыёкропкі, калі ў садзе-агародзе столькі клопа-

таў. А тут у свеце такое творыцца, страшна падумаць... Раптам аб'явяць канец свету... О-хо-хо, фаросы белавежскія... Нам, старым, няма чаго баяцца, мы сваё аджылі, пазмагаліся, паваявалі... Хаця ўсё ўпустую, дарэмна са шкуры вылузваліся, абдурылі нас... Ды яшчэ пракляты Чарнобыль. А вось як вам, маладым, у жыццё ісці, як прабівацца? У што верыць, на каго раўняцца?

Дзед Ігнат любіць пагаварыць ды паразважаць. У яго маналог і слова не ўставіш... Яму б толькі добрага і памяркоўнага слухача, каб маўчаў, не пярэчыў. Тут ужо і ўнуку можна выказаць свае думкі-перажыванні: хай матае сабе на вус. Іншы раз і Шарыку даводзіцца выслухоўваць дзедавы развагі. А сабаку што? Дай які пачастунак — будзе слухаць, нават не гаўкне.

Толькі баба Даша не вельмі прывячае дзедаву слабінку, маўляў, хопіць пераліваць з пустога ў парожняе. Іншы раз і пакпіць з дзеда:

— Любіш мянціць языком, як тыя дэпутаты ў парламенце. Вось бы цябе, Ігнат, на трыбуну... Ды яшчэ адмяніць рэгламент...

— А што? І выступіў бы, і сказаў... І ў носе не калупаўся б... Хопіць народ абдурваць... Ды што ім народ?! Пра сябе дбаюць, пра свой валляк... Такую краіну на калені паставілі, як ваўкі, ля сваёй ахвяры жыруюць... Фашыст не асіліў, дык самі сябе ўзяліся даканаць, самаеды праклятыя!

Дзеду бабулін кпін яшчэ большы азарт паддае, тут ужо ён гатовы пайсці ў наступ супраць усіх сваіх ворагаў. І такую прачуханку наладзіць — мала не пакажацца. І не пераканаць яго, і не аспрэчыць...

Вось і Алегавы батарэйкі выклікалі дзеда Ігната на споведзь: пацягнулася нітачка з клубочка, такая доўгая і бясконцая. І бяжыць, і разматваецца...

— Нам што? У нас, дзякуй Богу, дастатак... Сынок стараецца, усё сваім мазалём нажыта. Не крадзём, не спекулюем... А колькі чарнобыльскай атруты наглыталіся? Хоць і балюча было пакідаць родную Сасноўку, сэрца крывёй аблівалася, ды давялося ехаць. Усё кінулі-рынулі, як ад чумы ратаваліся. Страшней, чым у вайну... Тут жа вораг-невідзімка, без стрэлаў і выбухаў... І ў ягадцы, і ў грыбочку хаваецца...

Алег адкусіў белы наліў і аж зажмурыўся ад задавальнення. А дзедавы філасофіі яго нікольк і не турбуюць: хай дзед выгаварыцца, паразважае, супакоіцца. Можна і не слухаць яго, а толькі рабіць выгляд. У Алега гэта нядрэнна атрымліваецца, як-ніяк прызвычаіўся, налаўчыўся слухаць

і не чуць. Ды і што слухаць, калі дома з Вадзімам такая бяда?

Але тут бабуля Даша паспяшалася Алегу на выручку. Яна якраз падаіла Рыжуху і з поўнай даёнкай падышла да лаўкі, на якой сядзелі дзед з унукам.

— Пайшлі, унучак, са мной, пап'еш сырадою, адпачнеш з дарогі. Дзедавымі байкамі не будзеш сыты.

— Што табе мае байкі? — зварухнуўся дзед.— Не пашкодзяць, Алежка — кемлівы хлопчык, няхай чуе душэўнае слова... Хто яму яшчэ раскажа? Бацька ў вечных камандзіроўках, маці на штодзённых дзяжурствах... Так і пойдуць самапасам. У горадзе — не ў вёсцы, там дурноты хапае, вунь што ў газетах пішуць. Адны страхоцці! Чуе маё сэрца бяду...

— Цябе паслухаць — дык і на свеце не жыць! Ідзі лепш накасі травы Рыжусе, галодная зусім.

— Вось так заўсёды — і хвілінку нельга пасядзець, як тая пчолка, з раніцы да вечара лётаеш... І яблычкі, і мядок, і смятанка, і паляндвічка... Усё працай, мазалём. Госці высокія прыязджаюць: смакуюць, войкаюць, расхвальваюць. На чужое ўсе ласы... Сынок перад гасцямі вылузваецца, каб дагадзіць, улагодзіць... А тут як той раб...

— Бедненькі, няшчасненькі,— бабуля кпліва зірнула на дзеда.— Не смяшы людзей!

Сказала і пакіравала да веранды.

Алег зняў са штыкеціны сваю палатняную сумку з хлебам і сайкамі, пайшоў за бабуляй. Падняўся з лаўкі і дзед, праўда, яшчэ паспеў адпарыраваць:

— Паглядзеў бы я, як бы вы тут без мяне разжыліся... Яшчэ невядома — хто каго насмяшыў!

Паблажлівая перастрэлка дзеда з бабай ніколькі не закранула Алега: нічога новенькага. І з бацькавымі гасцямі даводзілася сустракацца на хутары. Вельмі ўжо яны любяць парыцца ў дзедавай лазні, якая стаіць ля возера. І дзіўна, і смешна назіраць, як голыя, разгарачаныя дзядзькі кідаюцца з берага ў халодную ваду і дзіка галёкаюць на ўвесь белы свет.

## 11

Алег папрасіўся пераначаваць у пуні на духмяным сене, дзе была зладжана мяккая пасцель. Ён начаваў тут і раней, таму ў яго просьбе не было нічога незвычайнага. Толькі бабуля папярэдзіла:

— Будзе холадна — прыходзь у хату. Мы дзверы не зашчэпім.

Але спачатку Алег не пайшоў на сенавал: быў ціхі, лагодны вечар, і яму захацелася пабыць у садзе. І Шарыка ўзяў за кампанію. Шарыку адно задавальненне, надакучыла аднаму сноўдацца, хутар вартаваць. А сваю службу Шарык нясе спраўна: чужака чуе здаля. І дарма, што не на ланцугу,— голас у яго звонкі, басавіты. Ды і зубы клыкастыя...

Асабліва Шарык не любіць нахабных гулякаў. Неяк адзін захмялелы госць паспрабаваў пабратацца з сабакам, маўляў, ён будзе служыць яму на задніх лапах. І палез да Шарыка з абдымкамі. Дык той так раз'юшыўся, што ледзьве не адкусіў смельчаку нос. Раскрывавіў п'яны твар і яшчэ распаласаваў штаны. Вось вам і ціхоня, дварняк непародзісты.

Сад, заліты матавым месячным святлом, стаяў у задумлівай дрымоце. Побач, у маліннiку, залівіста стракаталі конікі, быццам спаборнічалі паміж сабой: хто каго перастракоча. І такая вусцішнасць наўкола, і такі спакой — нібы якое зачараванне апусцілася на хутарскую сядзібу.

Хлопчык сядзеў на лаўцы пад антонаўкай, гладзіў Шарыка па спіне і ўслухоўваўся ў начную таямнічую цішыню. Быццам чакаў кагосьці.

У густой кроне суседняй яблыні штосьці залапацела, шумнула лісцем, і тут жа пачуўся глухі ўдар аб зямлю.

«Белы наліў упаў»,— падумаў Алег, адчуўшы рукою, як здрыгануўся і насцярожыўся Шарык.

Мінула яшчэ колькі хвілін начной вусцішнасці, якая пaступова прымружвала вочы, навявала дрымоту. Алег наважыўся быў ісці на сенавал, як раптам Шарык ускочыў на ногі і пагрозліва завурчаў. Ціха так, няўпэўнена, быццам сумняваючыся ў верагоднасці сваёй трывогі. Захваляваўся і Алег: у кволым месячным святле ён заўважыў цёмную постаць, што аддзялілася ад агароджы. У Шарыкавым вурчанні з'явіліся пагрозлівыя ноткі, якія вось-вось маглі сарвацца на брэх.

І тут пачулася лёгкае пасвістванне, гэткі даверліва-папераджальны сігнал. Шарык адразу ж замоўк, завіляў хвастом. Цёмная постаць набліжалася, з кожным крокам праяснялася ў месячным святле: гэта быў Вадзім. Алег аж разгубіўся: не чакаў, што сустрэча з братам будзе такой загадкавай і таямнічай.

— Не спіцца? — Вадзім прысеў на лаўку побач з Алегам.— А я чакаў цябе ў пуні. Як там у нас?

— Шукаюць... Следчы цікавіўся...

— Няхай пашукаюць... Я пакуль дзедавымі яблычкамі ды мядком паласуюся. І памідорчыкамі з агурочкамі... Там не дадуць вітамінаў...

— Мама хвалюецца, мяне вось прыслала... Ты ж знік і нічога не сказаў...

— Не паспеў, Алежка, давялося ўцякаць, замятаць сляды... Я тут інкогніта, цішком харчуюся, дзед з бабай не ведаюць... А Шарык са мной у дружбе, не выдасць.

— Як жа цяпер? Можа, павініцца?..

— Павініцца і ў яму зваліцца,— незадаволена чмыхнуў Вадзім.— Мая песенька спета...

Алег прамаўчаў, больш ён не мог нічога сказаць брату: ні пераканаць яго, ні ўсцешыць. Вось жа складаная сітуацыя, безвыходная. І ці можна ў ёй штосьці змяніць, перайначыць?

Зноў белы наліў адарваўся ад галінкі, прашалясцеў лістотай, гулка чмякнуўся вобземлю. Вадзім схамянуўся, прыслухаўся, ён быў быццам наэлектрызаваны асцярогаю і прадчуваннем блізкай небяспекі.

— У мяне да цябе, Алежка, просьба, вельмі сур'ёзная,— нарэшце Вадзім парушыў маўчанне.— Вельмі-вельмі... Мне ўсё роўна доўга не кайфаваць...

Брат зноў замоўк, глуха кашлянуў у кулак, нібы ўсё яшчэ сумняваўся: адкрыць сваю таямніцу ці не. І Алег не дапытваўся, чакаў, узіраючыся ў цёмны начны сад, у якім па-ранейшаму надакучліва стракаталі цвыркуны.

— Усё, баста, чаму быць, таго не мінаваць! — Вадзім сказаў як адрэзаў, нібы толькі што падагуліў нейкую згрызотную размову са сваім субяседнікам.— Сам разумееш, мне паказвацца ў горадзе небяспечна. А тут такая нескладуха... У скверыку ля нашага фантана я схаваў адну рэч... Яе трэба знайсці і забраць...

— Дзе шукаць? — братавы словы ўстрывожылі Алега яшчэ больш.— Чаму ў скверыку, якая рэч?

— Дзе, чаму, якая? — узлаваўся Вадзім.— Ты, братанчык, як той мент, вельмі ўжо дапытлівы.

— Ну і не трэба, сам шукай,— пакрыўдзіўся Алег.

— Не нукай, яшчэ не запрэглі,— паблажліва сказаў брат.— Жартаў не разумееш... Слухай уважліва. Насупраць фантана стаіць каштан са шпакоўняй, а ля каштана — клумба з кветкамі. Вось у той клумбе з левага боку, калі стаць спіной да каштана, я закапаў пакунак у цэлафанавым пакеце. Была нявыкрутка, спяшаўся, за мной гналіся бобікі... А цяпер трэба перахаваць... Галоўнае — не будзь

разявакам, каб ніхто не застукаў. Ну як, братанчык, выручыш?

— Добра,— згадзіўся Алег.— Толькі б знайсці той пакет. А калі яго ўжо адкапалі?

— Кінь дурное! — аж войкнуў Вадзім.— Я жыццём рызыкаваў, каб шкатулачку прыхаваць. Ды яна для мяне...

У скверык з фантанам Алег трапіў апоўдні, на наступны дзень пасля начной размовы з братам у дзедавым садзе. Прайшоў па бязлюднай алеі і нават не спыніўся ля каштана, у густой кроне якога ледзьве віднелася шпакоўня. І на круглую клумбу з яркімі жоўтымі кветкамі Алег кінуў прытворна абыякавы позірк. Супакоіўся — клумба цэлая, без усялякіх слядоў раскопкі. Прайшоў назад, затрымаўся ля фантана, агледзеўся наўкола — нічога падазронага. І ўсё ж не адважыўся падступіцца да клумбы, вырашыў вярнуцца прыцемкамі. Адчуваў сябе трывожна і вусцішна, нібы вось-вось з-за куста пачуецца грозны вокрык і залівіста загучыць пранізлівы свісток.

Абышлося без вокрыкаў і свісткоў. Пакунак у цэлафанавым пакеце ляжаў ля бетоннага бардзюра ў неглыбокай ямцы пад тонкім слоем чарназёму. Ён быў невялічкі, але вельмі важкі, як камень.

Алег хуценька адскочыў ад клумбы, сунуў знаходку пад крысо курткі і подбегам пашыбаваў прэч. За скверыкам пайшоў паволі, але трывога не адступалася, гняла сваёй таямнічай невядомасцю.

«Што ў пакунку, калі ён трапіў да Вадзіма? І для чаго ўсе гэтыя перасцярогі?» — непакоіўся Алег. Ён разумеў, што міжволі стаў саўдзельнікам нейкай згубнай афёры, у якую яго ўцягнуў брат Вадзім. Як і тады, з абрабаваннем кватэры Додзіка Красоўскага. Ды толькі каб на гэтым закончыліся Алегавы перажыванні...

Добра, што нікога не было дома, і Алег даволі доўга кружыў па кватэры, шукаў надзейную схованку. І ў зале, і ў спальні, і на кухні. Нібы вось-вось да Алейнікавых павінны заявіцца з вобыскам. Нарэшце ён залез у кладоўку і прыхаваў небяспечны пакет у бацькавай скрынцы са слясарным начыннем. Схованка на адну ноч. Раніцай Алег адправіцца на хутар і пераправіць туды таямнічую знаходку. Так загадаў Вадзім. Яму ж вельмі патрэбны гэты пакунак. Схаваў, супакоіўся, уключыў тэлевізар: ішоў замежны фільм на восьмым канале.

А тут нечаканы тэлефонны званок і пагрозліва-пракураны голас:

— Перадай свайму братану, каб не блазнаваў. Хопіць

гуляць у кошкі-мышкі. Няхай ідзе з павіннай... Як і дамаўляліся... Скажы, што званіла Жалезная Рука. Глядзі, нікому ні гуку! Інакш, сам разумееш, шмакадзяўка...

Ноччу гэты званок прысніўся Алегу страшным кашмарам, які давёў яго да халоднага поту і гарачых слёз. Прачнуўся ён у начной цішыні і з палёгкай адчуў: жудаснае і пачварнае засталося там, у тым далёкім нерэальным свеце. І як толькі такое можа прысніцца?

Вадзім, прывязаны вяроўкай да тоўстага сука, вісеў уніз галавой на каштане са шпакоўняй, а да яго шыі цягнулася Жалезная Рука з кашчавымі пальцамі. Ды і не пальцамі, а нейкімі слізкімі чарвякамі. Вадзім крычаў, матляўся на вяроўцы, адмахваўся рукамі ад агіднай пачвары, нібы асуджаны на пакутніцкую смерць. І Алег быў бездапаможны: яго самога спавівалі нейкія гутаперчавыя жгуты, падобныя на шчупальцы васьмінога. І не адбіцца ад іх, і не вырвацца на волю...

Калі кашчавая Жалезная Рука дацягнулася да Вадзімавай шыі, Алег прахапіўся з цяжкім стогнам, ачмурэлы і зняможаны. Вось дык насланнё! А можа, гэта зусім і не тэлефонны званок прымроіўся страшным сном? Ці не той амерыканскі жахлівец пра вампіраў, што Алег глядзеў вечарам на восьмым канале, засеў у яго памяці? Маці якраз дзяжурыла ў бальніцы, яна ж працуе медсястрой, і ніхто не забараніў яму ўключаць крывавы фільм.

З-за гэтага канала ў сям'і Алейнікавых было шмат непрыемных хвілін.

Бацька заяўляў катэгарычна:

— Гэта бандыцкі канал! Ён жа паказвае разбой, мардабой ды дзікую распусту. Хіба ж можна такое глядзець дзецям? Я і слухаць не хачу!

Маці старалася змякчыць размову:

— Цяпер жа такі свет... Лепш хай дома глядзяць, чым будуць туляцца па завуголлях. Дома хоць нейкі кантроль...

— Не трэба мне ні завуголляў, ні кантралёраў! Чаму гэта я павінен танцаваць пад дудку блазнюкоў? Дажыліся!

І ўсё ж Вадзім настаяў на сваім. Паехаў бацька ў камандзіроўку, а ён прывёў знаёмага тэлемайстра і тайком падключыў восьмы канал. Якраз незадоўга да здарэння на дзедавым хутары, калі міліцыя канфіскавала ў Вадзіма крадзены магнітафон. Ды спачатку ніхто і не ведаў пра падключэнне, нават Алег. А калі даведаліся, было не да тэлевізара. Ішло следства па справе аграблення кватэры Красоўскіх.

Восьмы канал апошнім часам упадабаў глядзець Алег,

калі, вядома, бацькоў не было дома. І жудасныя кадры, і крывавыя бойкі, а вось жа глядзеў як загіпнатызаваны.

Пасля кашмарнага сну Алег ледзьве дачакаўся раніцы, каб хутчэй адправіцца на аўтастанцыю, замаскіраваўшы ў сваёй палатнянай сумцы злашчасны Вадзімаў пакунак буханкай хлеба і двума кілаграмамі цукру, і яшчэ кніжку «Сыны Вялікай Мядзведзіцы» паклаў зверху, хаця за лета, здаецца, прачытаў усяго некалькі старонак.

На хутары Алега чакала трывожная неспадзеўка. Бабуля Даша сустрэла ўнука са слязамі на вачах.

— Ой, горачка ты наша, гора! Што ж гэта дзеецца на белым свеце?! А як ты, Алежка, у цябе ўсё добра?

— Нармальна,— адразу ж сумеўся Алег. Такой разгубленай і расхваляванай ён яшчэ не бачыў сваю бабулю. Заўсёды памяркоўная, разважлівая, з дабрадушнай усмешкай на загарэлым круглым твары, а тут... Ці не здарылася якое няшчасце?

— Учора ў нас міліцыя была, Вадзіма арыштавалі... Ён жа ў пуні хаваўся, а мы і не ведалі... Проста жах!

Бабуліны словы скаланулі Алега, апалілі твар раптоўнай чырванню. Ён разгублена зірнуў на сваю сумку, зніякавеў: «А калі на хутары засада? Можа, міліцыя ведае пра Вадзімаў пакет?»

Алег насцярожана агледзеўся наўкола, але не заўважыў на двары і ў агародзе нічога падазронага. Ды і Шарык спакойны. Падбег, лізнуў працягнутую руку, нібы прывітаўся, і прысеў ля плота. Ён жа чужынца чуе здаля, а тут і вухам не вядзе.

— І што ўнучак там натварыў? Не можа быць, каб ён зрабіў дрэннае... У нашым родзе ніколі не было прайдзісветаў. Памылка нейкая... Дзед усю ноч не спаў, у горад паехаў, да вас, відаць, размінуўся з табой. Ой-ёй-ёй, як гром з яснага неба,— бабуля замоўкла і прыкрыла вочы даланёй.

І зноў было хваляванняў Алегу: «Што рабіць са знаходкай, хіба раскажаш пра яе бабулі?»

Паўдня марнаваўся, нарэшце вырашыў схаваць знаходку на хутары, да пары да часу, пакуль Вадзім аб'явіцца дома. Схованку агледзеў у пуні, пад застрэшкам, дзе ляжала ўсялякая старызна.

Перш чым схаваць пакунак, Алег разгарнуў поліэтыленавы пакет, дастаў з яго металічную малінавую шкатулку, такую важкую і таямнічую. Нейкі страх авалодаў Алегам, і ён не асмеліўся націснуць на бліскучую кнопку, што знаходзілася на пярэдняй панелі шкатулкі. Нібы трымаў

у руках небяспечны прадмет з сакрэтным выбуховым механізмам.

Вадзім дадому не вярнуўся: не адпусцілі з-пад варты. Было доўгае следства, потым — суд, а там — калонія. Так Алег больш і не перамовіўся з братам, толькі на судзе перакінуўся позіркам, і ўсё.

У тлуме тых нядобрых дзён, сямейных перажыванняў Алег забыўся пра Вадзімаў пакунак. Быццам і не шукаў яго ў клумбе каля каштана са шпакоўняй, і не асцярожнічаў дома і па дарозе на хутар.

Забыўся, а Вадзімава запіска напомніла. Напомніў таўстун Пончык, які заявіўся ў бальніцу па загадзе Аліка Кажана.

## 12

— Ну, блінок, ты і някемлівы! — Пончык пачынаў нервавацца.— Тут жа ўсё ясна напісана: трэба аддаць шкатулку, без усялякіх мыканняў-пыканняў. Родны брат просіць... Яму там, ведаеш, як нясоладка.

— Як я аддам з такой нагой,— сказаў Алег.

— Сам вінаваты, трэба было не лавіць варон,— хіхікнуў Кажаноў пасланец.— А ты адрасок падкажы, мы самі з вусамі — з-пад зямлі дастанем.

— Без мяне не знойдзеце, я і сам тую схованку дрэнна памятаю... Трэба будзе шукаць...

— Не цямні, Алей, калі яшчэ хочаш сустрэцца са сваім братанам на гэтым свеце.

— Я не цямню,— цвёрда адказаў Алег, з надзеяй пазіраючы на дзверы. Хоць бы цёця Фруза хутчэй прыйшла і вытурыла гэтага таўстуна з палаты.

Ды і не мог ён рассакрэціць тую схованку. Не мог адправіць на хутар Кажановых прыхвоснікаў. Каб яны там лазілі, дзядулю з бабуляй шантажыравалі ды па-блатному вычмураліся... Ад вырадкаў што хочаш можна чакаць, у іх няпісаныя законы.

— Ладна, я табе паведаміў, растлумачыў, а ты ўжо памазгуй... Потым локці кусаць будзеш, горкімі слёзкамі ўмывацца... Глядзі, каб і другую нагу не загіпсавалі,— прыгразіў Пончык і павалюхаў да выхада.

Адразу ж у палату ўскочыў Юра, ён, мусіць, чакаў за дзвярыма. І выгляд у яго быў занадта ўзрушаны, быццам толькі што адкрыў вялікую таямніцу.

— Ну і фрукт, ну і зюрзік! — ён гаварыў прыглушаным

голасам, хаця ў палаце нікога не было — усё яшчэ працягваліся ранішнія працэдуры.

Алег прылёг на падушку, размова з Пончыкам устрывожыла як ніколі. Пагроза засела ўнутры калючай стрэмкай. І яшчэ больш разнылася загіпсаваная нага.

— Я адразу скумекаў, што гэта нейкі зюрзік,— сын следчага закілзаў свайго любімага канька-гаварунчыка.— І што яму трэба ад цябе? Я ўсё чуў, дзверы наўмысна не прычыніў. І чаго ён гразіўся?

— Адстань! Не твая справа! — адрэзаў Алег.

Але Юра нават брывом не павёў на Алегавы словы, нібы ён толькі што стаў сведкам нейкай самай чорнай несправядлівасці. І быў гатовы без усялякай перасцярогі кінуцца на дапамогу, заступіцца, прыняць удар на сябе.

— Дзівак! Яны твайго брата ўпяклі ў турму, а цяпер узяліся за цябе... Ім патрэбны ахвяры, каб самім раскашаваць на свабодзе. Хіба не ведаеш, як гэта робіцца? Мне бацька такое расказваў...

— Ну, што ты хвалішся сваім бацькам?! — нарэшце не вытрымаў Алег.— Гэта ж ён упёк Вадзіма ў калонію! Хто дапытваў, віжаваў, рабіў вочныя стаўкі? Хто прадставіў у суд матэрыялы допытаў? Твой бацька, і мяне дапытваў, стараўся заблытаць, каб я каціў бочку на брата.

— Не, ты і сапраўды нейкі прыпылены! — узлаваўся Юра.— Зноў пра сваё! Тут ратавацца трэба, злачынцаў лавіць, а ты пра допыты... Дык няўжо твой брат быў зусім невінаваты? Анёл з крыльцамі, святы ісусік?!

— Нічога ён не анёл... Яго прымусілі пайсці з павіннай, усю віну ўзяць на сябе. На волі верхаводы засталіся, яны вунь у «камках» цыгарэтамі ды «Марсамі» гандлююць. Крадуць і прадаюць.

— Гэта яшчэ даказаць трэба... Думаеш, так проста весці следства, вышукваць факты? Як і твой брат... Лепш узяць віну на сябе, прамаўчаць, але не выдаць сапраўдных злачынцаў. Запалохалі, прыстрашылі крывавай помстай, вось і маўчыце, і дрыжыце, як тыя зайцы... Ды калі ты і твой брат будзеце маўчаць, верхаводы і будуць гандляваць, і на іншамарках катацца.

— Няхай катаюцца,— Юравы аргументы ніколькі не пераканалі Алега. Ды і што з гэтых разважанняў? Хіба яны вызваляць Вадзіма з калоніі? Як і не адправяць туды мафіёзніка Кажана.

— Не, так нельга! — запальчыва сказаў сын следчага з яўным намерам працягваць сваё расследаванне.— Я бацьку раскажу, ён возьме твайго таўстуна за жабры

і ягоную шайку выведзе на чыстую ваду... Як яго прозвішча, дзе жыве бегемот?

Алег не паспеў адказаць, у палату зайшла цёця Фруза. Ды і не мог ён адказаць на Юрава пытанне, бо сам не ведаў адраса Пончыка. І ўздыхнуў з палёгкай — скончылася гняткая размова, хоць можна адпачыць ад занудлівага голасу сына следчага. Цёця Фруза адразу ж паведаміла:

— Пойдзем, Юрачка, да хірурга. Твой бацька званіў галоўнаму, прасіў, каб цябе адпусцілі дадому.

— Дадому? — незадаволена перапытаў Юра, пазіраючы на Алега.

— Ого, табе не хочацца выпісвацца? — усміхнулася цёця Фруза.— У нас цікава, але дома ўсё ж лепш. І не трэба сюды трапляць, лунацікі вы мае няшчасныя. Беражыце свае костачкі, яны спатрэбяцца вам...

— А можа, у мяне яшчэ не зраслася рука? — засумняваўся Юра.

— Зрасцецца, дзіцятка, зрасцецца... Ты толькі будзь асцярожным і больш не лазь па балконах.

— Навука, не палезу,— буркнуў Юра і пайшоў за цёцяй Фрузай. Спыніўся, папрасіў Алега: — Ты адрасок запішы і свой тэлефон. На маёй тумбачцы блакнот і ручка. Я хутка вярнуся.

Сын следчага выпісаўся пасля абеду. Яго забіраў старэйшы брат, спяшаўся, таму зборы былі хуткія. Юра паабяцаў пазваніць Алегу дадому. І запісаў на паперцы свой нумар:

— Патэлефануй, як закончацца твае курорты. А я сёетое разведаю...

У бальніцы Алег знаходзіўся больш тыдня. Нудныя, аднастайныя дні, а таго лячэння — кот наплакаў. Днём яму дазвалялі пахадзіць па доўгім бальнічным калідоры.

— Нельга залежвацца, рух — найлепшы лекар,— казала цёця Фруза.— Галоўнае, каб косці зрасталіся правільна.

І Алег не залежваўся, налаўчыўся скакаць на мыліцах, аж далоні смылелі ад тых падскокаў.

Штодня наведвалася маці, прыходзілі аднакласнікі, распытвалі, расказвалі пра школьныя навіны. Сярод тыдня трэнер Аляксандр Мікалаевіч прывёў у палату амаль усю футбольную каманду. Прынеслі яблыкі, цікавіліся самаадчуваннем, шкадавалі, што ён не можа ўдзельнічаць у гарадскім турніры. Першы матч унічыю згулялі, на апошніх хвілінах прапусцілі гол, а вось каб гуляў Алег...

— Я на трэніроўку спяшаўся,— вінавата сказаў Алег.— Не пашанцавала...

— Не хвалюйся, яшчэ добра, што так...— супакоіў Аляксандр Мікалаевіч.— Хутчэй папраўляйся, а мы пакуль без цябе пазмагаемся. Настрой у нас баявы.

Пайшоў трэнер з хлопцамі, а Алег яшчэ больш замаркоціўся. Уявіліся яму прасторная спартыўная зала і белы футбольны мяч, які вось-вось уляціць у вароты, і звонкія балельшчыцкія воклічы.

Ды ўсе тыя Алегавы перажыванні перакрэсліла з'яўленне ў палаце навічка: яго памясцілі на ложак, які аслабаніў сын следчага. Такое з хлопцам здарылася — проста жах! Ледзьве выратавалі небараку, давялося рабіць некалькі аперацый. Уся бальніца даведалася пра няшчасны выпадак. Маці навічка расказала, яна дзяжурыла ля свайго сына кругласутачна. А колькі было адчаю і болю ў матчыных заплаканых вачах! Алег толькі адзін раз сустрэўся з яе позіркам — і аж злякнуўся. Ды і як такое перажыць? І не толькі перажыць — нават уявіць!

...Бавілі вясковыя хлапчукі свой вольны час на ўзлеску, абагрэтым вясновым сонцам. Дурэлі, вычмураліся, барукаліся. А потым вярталіся дадому паўз бетонныя агромністыя мачты высакавольтнай лініі, якая аж гудзела ад электрычнага напружання. Спыніліся каля круглай высотнай апоры з металічнай лесвіцай. І тут адзін з хлапчукоў наважыўся забрацца наверх, каб пахваліцца сваёй смеласцю.

Верхалаз падымаўся ўсё вышэй і вышэй, а двое яго сябрукоў стаялі ўнізе і весела пакеплівалі:

— Глядзі, не зваліся!

— Баязліўцы, давайце за мной! — чуўся насмешлівы голас з вышыні.

Нарэшце Ваня забраўся на самую верхатуру, дзе так пагрозліва гудзелі тоўстыя бліскучыя правады, па якіх бег ток высокага напружання. Яшчэ адна прыступка, і рукі хлопчыка дацягнуліся да шырокай металічнай пляцоўкі, побач з якой навісалі масіўныя гірлянды фарфоравых ізалятараў.

Нечакана там, наверсе, жахнула яркая ўспышка, нібы водбліск навальнічнай маланкі, пачуўся нейкі рэзкі трэск — і роспачны Ванеў крык пранізаў сонечнае наваколле. Сябрукі ашаломлена знерухомелі, утаропіўшыся на шызае воблака дыму, што злавесным клубком павісла над Ванем.

Гэта быў жудасны кашмар: дзікі і непраўдападобны. Як у самым страшным пачварным «жахліўцу». Ваня курчыўся

ад невыноснага болю, нема крычаў і паволі спаўзаў уніз. Нейкім цудам ён усё яшчэ трымаўся за жалезныя парэнчы лесвіцы, хаця ўжо нічога не адчуваў і не ўсведамляў... Ваня ў беспрытомнасці зваліўся на зямлю і адразу ж заціх. Сябрукі ў страху кінуліся прэч, быццам за імі гналася раз'ятранае крыважэрнае страшыдла.

Праз колькі часу Ваня апрытомнеў — аглушаны і знявечаны высакавольтным разрадам кароткага замыкання. Глянуў на свае рукі — і жахнуўся. Яны былі чорныя, як абгарэлыя.

Спачатку ён паспрабаваў падняцца, але закружылася галава, і хлопчык з ціхім стогнам апусціўся на зямлю. А навокал — цішыня, нібы ўсе гукі растварыліся, знямелі ў той яркай электрычнай успышцы.

Кашмар працягваўся, не ў сне, а наяве. Ваня ўсё ж падняўся, агледзеўся: адзін, зусім адзін... Што рабіць, куды ісці, дзе шукаць паратунак? Ён не пазнаваў знаёмых мясцін, усё яшчэ асляплены вар'яцкай успышкай.

Ваня выбраўся да дарогі праз гадзіну-другую. Яго падабрала легкавушка, якая завезла беспрытомнага хлопчыка ў раённую бальніцу, дзе яму аказалі першую медыцынскую дапамогу. І мала хто верыў, што Ваня акрыяе, вытрымае страшэнныя пакуты і застанецца жывым. І ўсё ж ён вытрымаў, няйначай як з пекла выкараскаўся. Вось толькі застаўся без рук...

Уся гэтая гісторыя вельмі ўзрушыла Алега, нібы ён сам раптам трапіў у электрычную пастку. Убачыў пустыя кароткія рукавы Ваневай салатавай тэніскі — і аж мароз па скуры... Тады ж падумалася: «Чаму тыя двое хлапчукоў, якія былі з Ванем, не паклікалі людзей на дапамогу? Спалохаліся, разгубіліся? Як жа так?! Вось калі б Ваню адразу завезлі ў бальніцу...»

Ды што цяпер разважаць, дапытвацца? Хто даў маху, а хто здрэйфіў... І трэба ж было Ваню ўзбірацца на тую лесвіцу! Сам вінаваты... Хаця, падумаўшы, віну лягчэй знайсці, чым апраўданне. Вось і яму, Алегу, якое апраўданне, як і брату Вадзіму? Толькі хіба можна параўнаць Алегавы прыгоды з Ваневай бядой? Каму шанцуе, каму і не...

І быццам які пераключальнік шчоўкнуў у Алегавай свядомасці. І так стала шкада Ваню — хоць плач. І неспакойна на душы, і вусцішна... А калі Ванева маці пачала карміць сына з лыжкі, нібы немаўля, Алег зусім замаркоціўся. І ў самога быццам даўкі камяк засеў у горле.

Як Ваню жыць без рук? Няўжо вось так маці і будзе карміць яго? І апранаць, і распранаць... Мо ёсць дзе элект-

ронныя пратэзы? Задумаўся Алег, зажмурыўся, як зня-быўся.

Раптам пачуўся бацькаў голас. Алег зніякавеў: ці не здалося-прымроілася?

— Алег Алейнікаў? — перапытала цёця Фруза.— Ды вось жа яго ложак, мусіць, задрамаў.

— Няўжо яшчэ не выспаўся?

Алег адплюшчыў вочы, крыху падняў галаву з падушкі і ўбачыў ля дзвярэй бацьку ў белым халаце. Трывожна затахкала сэрца. Ніколі не думаў і не сніў, што сустрэнецца з бацькам вось так: у бальнічнай палаце і з загіпсаванай нагой. І што адказаць, як апраўдацца?

— Добры дзень, сынок! — ціха сказаў бацька, калі апынуўся побач.— Я вярнуўся з камандзіроўкі, а тут такая навіна! Нібы абухам па галаве... Ну, як ты сябе адчуваеш?

— Нічога, тата, ужо лепш...

— Як гэта здарылася? Я ж заўсёды цябе папярэджваў і Вадзіма таксама: будзьце асцярожнымі на вуліцы, не лавіце варон. Не беражэце вы сябе, не беражэце!

Сказаў і як папярхнуўся: убачыў Ваню, пустыя рукавы яго тэніскі. Цяжка ўздыхнуў: нават з роспаччу. Узрушаным позіркам агледзеў палату, нарэшце прамовіў, звяртаючыся да Ваневай маці:

— Што ж гэта такое?! Бяда за бядой... Колькі турботаў-клопатаў, пакуль у пялёнках гадуюцца. Начамі не спалі, хваробы адганялі, на руках насілі... А тут...

— Як страшны сон, як кашмар! — голас Ваневай маці дрыготкі, са слязой.— А яшчэ кажуць, што ёсць Бог на свеце! Такія пакуты перанесці дзіцяці... У чым яго віна, няўжо нельга абараніць?

— Мама, мы ж дамовіліся, я прашу цябе, не хвалюйся. Я ўсё вытрымаю, я буду жыць! І не трэба пра Бога...

— Добра, маё сонейка, добра! Давай кефірчыку пап'ём, а я потым схаджу на тэлеграф. Трэба дадому пазваніць: як там наш татуля з Волечкай маюцца? Цяжка ім без нас...

Алегаў бацька нейкі момант маўчаў, ніякавата азіраючыся па баках, уражаны Ваневымі словамі, потым асцярожна прысеў на табурэтку, бліжэй да Алегавай падушкі.

— Прадчувала маё сэрца бяду, прадчувала... Нават нейкая абракадабра прыснілася ў дарозе. Нібы ты з Вадзімам катаўся на чужым «Мерседэсе», а потым вас лавілі даішнікі. Я хацеў вас выручыць і не змог... Вось вам і сон... А тут яшчэ на мяжы затрымалі на цэлыя суткі, кантрабанду шукалі. І мой фургон прасвяцілі і ператрэслі, з-за адной дробязі прычапіліся, ледзьве адкупіўся. Цяпер мыт-

нікі раскашуюць, рэкеціры ў законе. У іх свая такса і свае правілы... Ды калі б не Вадзім з яго Кажаном...

Бацька спахапіўся, нібы сказаў нешта лішняе, падняўся з табурэткі, дакрануўся рукою да Алегавай загіпсаванай нагі, спытаў:

— Баліць?

— Пацішэла... Толькі быццам сутарга торгае... Як сходзіць...

— Нажыў, сынок, цацку, давядзецца паняньчыцца. У мяне таксама пералом быў, левай рукі... У валейбол гуляў, паслізнуўся... Два месяцы хадзіў з гіпсам. Потым яшчэ цэлы год рука балела, асабліва калі браўся за рыдлёўку ці сякеру. Я тады на шафёрскіх курсах вучыўся.

Алег слухаў бацьку, а самога чамусьці непакоілі яго словы пра кантрабанду і затрымку на граніцы. Што там здарылася, і чым бацька адкупіўся ад рэкеціраў-мытнікаў.

Вось ужо амаль год Алегаў бацька ездзіць за мяжу, перавозіць каштоўныя грузы на вялізным фургоне. Пасля чарнобыльскіх камандзіровак уладкаваўся ў нейкую важную фірму, дапамог былы аднакласнік, які стаў вяльможным начальнікам. Той самы, што браўся вызваліць Вадзіма, але не вызваліў. Нават да Генеральнага пракурора дайшоў — і ўсё дарэмна. Закон ёсць закон. Але ж чаму тады суды іншы раз апраўдваюць забойцаў, насільнікаў і садыстаў? Таксама на падставе закона. Ды гэта ўжо зусім іншая размова, якая не мае нічога агульнага з бацькавымі паездкамі за мяжу.

Пасля некалькіх замежных рэйсаў дабрабыт сям'і Алейнікавых пачаў прыкметна паляпшацца. У кватэры з'явіліся замежныя рэчы, у тым ліку і японскі двухкасетнік. Тады ж Алег пачуў пра бацькаву мару: сабраць валюту на іншамарку — «Вольву» ці нават «Мерседэс»... А тут гэтае Вадзімава ачмурэнне... І пакупку іншамаркі давялося адкласці. І не на адзін дзень.

Бацька аж тварам пацямнеў ад перажыванняў і сваёй бездапаможнасці. Ён не шкадаваў грошай на новыя знаёмствы, наладжваў гарачыя парылкі ў дзедавай лазні для важных гасцей. І ўсё — марна, нават не памог дзедаў мёд. Суд быў няўмольны — Вадзіма адправілі ў калонію, а Кажановы хаўруснікі засталіся на волі. Сам жа мафіёзнік прыліп да Алейнікавых камаром-крывасмокам і ўсё кружыў вакол іх сям'і, і гудзеў... Абяцаў трымаць нейкую Вадзімаву тайну ў вялікім сакрэце. Маўляў, тры гады ў калоніі — не дзесяць...

«І што яму трэба ад нас, чаго чэпіцца?» — занепакоена думаў Алег.

А Вадзімава пісьмо з калоніі? Зноў жа з Кажаном звязана, у яго і за калючым дротам ёсць свае сувязі. Ён і да бацькавых замежных рэйсаў мае цікаўнасць...

— Слухай, Алежка, я пагавару з дактарамі,— нечакана сказаў бацька.— Чаго ты будзеш тут кантавацца? З гіпсам можна і дома лячыцца. Цяпер у мяне якраз два тыдні адпачынку.

— Добра, тата,— згадзіўся Алег.— Я ўжо на мыліцах навучыўся хадзіць... Вунь аж мазалі ўскочылі на далонях.

— Дамовіліся... Зараз жа іду да галоўнага ўрача,— рашуча заявіў бацька.— Можа, яшчэ сёння цябе выпішуць з бальніцы.

— Шчаслівчык! — уздыхнуў Ваня, калі за Алегавым бацькам зачыніліся дзверы палаты.— Мне вельмі хочацца дадому, і ў школе мяне чакаюць...

Алегу зрабілася не па сабе ад ціхага Ваневага голасу, нібы ён сам быў там, ля высакавольтнай лініі, і не памог Ваню ў тую страшную хваліну. Спалохаўся, разгубіўся, уцёк...

— Пачакай, паправішся,— ніякавата адказаў Алег, усаджваючыся на сваім ложку. Зноў заныла загіпсаваная нага.— Я чытаў пра аднаго спартсмена, які трапіў у аўтамабільную катастрофу. Ён застаўся без ног, але вытрымаў, не здаўся, а потым на двухколцы аб'ехаў увесь зямны шар.

— Што ногі! — запальчыва ўсклікнуў Ваня.— Без ног можна жыць... А вось як без рук? Я ж на баяне іграў, займаўся ў музычнай школе... Цяпер вучуся пісаць зубамі...

— Можа, ёсць дзе пратэзы,— няўпэўнена прамовіў Алег.— Механічныя, з электронікай...

— Рукі робата? — Ледзь прыкметная ўсмешка мільганула на Ваневым бледным вяснушкаватым твары.— Мама ўжо цікавілася: за мяжой робяць пратэзы, толькі патрэбны вельмі вялікія грошы.

Іх размову перапыніла цёця Фруза, якая зайшла ў палату і адразу ж аб'явіла:

— Ну вось, Алег, будзем збірацца дадому, твой тата ўгаварыў галоўнага... Спачатку зробім рэнтгенаўскі здымак, а потым сходзім да хірурга.

Алег апусціў здаровую нагу на падлогу, вобмацкам усунуў яе ў лёгкі тапак і ўзяўся за мыліцы. Зрабіў некалькі падскокаў, азірнуўся на Ваню, які засмучана назіраў за ім, і зноў налёг на мыліцы. А перад вачыма — пустыя рукавы

сіняй тэніскі. Як прывід, як насланнё... Вось бы паглядзець на Кажана ці таго ж Пончыка, калі б яны апынуліся ў такім становішчы...

## 13

На ганку Алег аж зажмурыўся ад яркага вясновага сонца. Адразу ж прыпомніў той пахмурны волкі дзень, калі з ім надарылася бяда. Зажмурыўся і адчуў лёгкае галавакружэнне ад прыемнай свежасці, якой яму так неставала ўсе гэтыя бальнічныя дні. Ён нейкі момант прымерваўся да новых мыліцаў, якія бацька ўзяў у аптэцы напракат, не адважваючыся ступіць на прыступку.

— Давай, Алежка, падстрахую,— сказаў бацька, узяў сына пад пахі і дапамог яму спусціцца па высокіх прыступках на асфальт.

Вось і закончылася яго пустэльніцтва ў шэрым пяціпавярховым будынку з шырокімі вокнамі, доўгімі калідорамі і светлымі палатамі, дзе такі ўстойлівы лекавы пах. І пякучы боль першых дзён, і першыя крокі на мыліцах, і знаёмствы з сынам следчага і бязрукім аднагодкам Ванем... Колькі ўражанняў, колькі перажыванняў! А яшчэ нечаканы візіт Пончыка з яго дамаганнямі і пагрозамі...

Алег ступаў асцярожліва, трымаючы загіпсаваную нагу перад сабой, праз колькі падскокаў спыняўся, каб даць перадышку знямелым рукам. Зацікаўленыя позіркі людзей, што ішлі насустрач, выклікалі ў яго новыя, невядомыя раней адчуванні: ці то пахвальбы, ці то нейкай асаблівай гордасці. Маўляў, стрэляны верабей, пабываў у заварусе...

За масіўнымі чыгуннымі варотамі яны спыніліся, і бацька паказаў рукой направа:

— Вунь наша «Лада», зачакалася нас.

Машына Алейнікавых стаяла воддаль, у цесным стракатым шэрагу легкавушак, прыпаркаваных да тратуара ўздоўж бальнічнай агароджы. І ўсе такія яркія, зіхатлівыя, асабліва фанабэрыстыя іншамаркі.

«Вось і ў нас была б такая, калі б не Вадзім»,— міжволі падумаў Алег, зноў налягаючы на мыліцы.

Нечакана, як з-пад зямлі (Алег глядзеў пад ногі і не заўважыў адкуль), выскачыў Пончык. Расчырванелы, узбуджаны, у чорнай скуранцы наросхрыст. Кінуў нахабным позіркам на Алега і адразу ж звярнуўся да бацькі:

— Тут вас просяць на адну хвілінку, тэт-а-тэт...

— Хто просіць, чаго? — даволі непрыязна спытаў Рыгор Ігнатавіч, з трывогай азіраючыся на сына.

— Зараз убачыце, вельмі пільная справа,— сказаў Пончык і жэстам рукі паказаў на чорны «Мерсэдэс», што стаяў на супрацьлеглым баку вуліцы.

Бацька спахмурнеў яшчэ больш, але не стаў пярэчыць, а толькі сказаў сыну:

— Ідзі паціху да «Лады», я хутка...

Пончык застаўся з Алегам, і калі бацька адышоў на некалькі крокаў, спытаў:

— Ну як, не забыўся на братанаву просьбу?

Алег прамаўчаў, быццам і не пачуў пытання, краем вока назіраючы за бацькам, які праз дарогу кіраваў да «Мерседэса».

— Табою, Алей, вельмі незадаволены, ты гуляеш з агнём,— Пончык шматзначна прысвіснуў.— І брата Вадзіма не шкадуеш... Глядзі, каб не спазніўся... Так і татку твайму можа не паздаровіцца...

І на гэты раз Алег не вымавіў ні слова, адчуваючы ў нечаканым з'яўленні Пончыка нейкі нядобры знак. Вось жа падлавілі момант, падцікавалі... А хто затаіўся ў чорным «Мерседэсе» за дымчатым шклом?

Алег бачыў, як бацька падышоў да «Мерседэса», як перад ім адчыніліся задняя дзверцы і ён залез у машыну. І не разгледзець нічога, і не пачуць... Прадчуванне небяспекі нарастала з кожнай хвілінай чакання. Нават Пончык замоўк і чагосьці насцярожыўся. Алег азірнуўся і ўбачыў трох амонаўцаў, што спыніліся непадалёку. А як забегалі па баках Пончыкавы зладзеяватыя вочкі! Дык вунь якая муха яго ўкусіла! Узяць бы прахіндзея за каршэнь і вывесці на чыстую ваду... Толькі хто возьме, хто выведзе?

Амонаўцы прайшлі міма, гулліва памахваючы чорнымі дубінкамі, і Пончык зноў расслабіўся, павесялеў:

— Табе што, язык прышчамілі ў бальніцы? Тут, Алей, не да жартаў. І ў маўчанку з табой ніхто не будзе гуляць... Гэта не з мячыкам жангліраваць. Як у тым кіно: пёрка пад нырку — і бывай здароў, Іван Пятроў!

Алег стаяў каля сваёй «Лады», абапершыся на мыліцы, і па-ранейшаму не адводзіў позірку ад чорнага «Мерседэса», не звяртаючы ўвагі на Пончыкаў гнусавы голас.

«Вось бы той амонаўскай дубінкай засвяціць яму паміж вачэй — адразу б адстаў»,— падумалася Алегу з нейкай кплівай смяшлівасцю.

Падумаў і ўбачыў бацьку, які вылез з «Мерседэса», штосьці сказаў у прачыненыя дзверцы і, азірнуўшыся па

баках, пашыбаваў напрасткі да стаянкі прыпаркаваных легкавушак.

Пончык таксама ўбачыў Рыгора Ігнатавіча і паспешліва павалюхаў да «Мерседэса», кінуўшы Алегу праз плячо:

— Заўтра наша апошняе рандэву!

Бацька быў усхваляваны і разгублены, а ў вачах — не то гнеў, не то адчай. Ён дапамог сыну сесці на задняе сядзенне, асцярожна пераставіўшы ў салон Алегаву загіпсаваную нагу, мыліцы паклаў збоку. І толькі тады, калі вырулілі на дарогу і «Лада» набрала хуткасць у няспынным патоку вулічнага руху, бацька парушыў маўчанне:

— Трапілі мы, сынок, у пастку... Узялі мёртвай хваткай падлюгі! І за што так пакараў нас Бог? Ды калі б не Вадзім... Хацеў выбавіць сына з бяды, нічога не шкадаваў... Выкарысталі ваўкалакі, падхітравалі... І ўсё ім мала: шантажыруюць, вымагаюць...

«Лада» рэзка затармазіла перад чырвоным святлафорам, і Алег ледзьве паспеў засцерагчыся рукамі ад удару аб высокую спінку пярэдняга сядзення.

— Тата, асцярожна! — не вытрымаў Алег.

— Прабач, Алежка, загаварыўся...

— А мы ад «Мерседэса» ўцячом? — раптам спытаў Алег, калі «Лада» зноў набрала хуткасць пасля чырвонага святлафора.

— Не, сынок, не ўцячом, не тыя цыліндры,— адказаў бацька.— Позна, занадта позна... Цяпер яны ўзялі нас на буксір, рэкеціры праклятыя!

— Няўжо і міліцыя нам не паможа? — Здаецца яшчэ ніколі Алег не бачыў свайго бацьку такім разгубленым і няшчасным.

— Памагла ўжо... Вадзіма адправілі ў калонію, цяпер, мусіць, і мая чарга.

— Ты што, тата, якая чарга?! — запальчыва ўсклікнуў Алег.— У чым твая віна?

— Без віны вінаваты... Ведаеш казку пра мужыка, які прадаў сваю душу д'яблу?

— Чытаў... Толькі пры чым тут д'ябал?

— Эх, сынок, сынок! — выдыхнуў бацька.— Ды калі б ты ведаў пра нашу бяду!

— Яна што — на «Мерседэсе» за намі гоніцца?

— Гоніцца... Цяпер час такі: хто ўсеўся за руль іншамаркі — той і пан... І наганяць, і абганяць!

Алег адчуваў, што бацька не хоча адкрывацца і, вядома ж, расказваць пра сваю сустрэчу ў чорным «Мерседэсе». Ды ўжо адно з'яўленне Пончыка ля бальніцы на многае

намякае... Але здагадка застаецца здагадкай.

А Вадзімава запіска? І што рабіць з таямнічай схованкай на хутары? Прызнацца ва ўсім бацьку? І пра Кажановы пагрозы пахваліцца, з якімі толькі што падступаўся Пончык? Раптам гэта нашкодзіць Вадзіму? Сказаць — не сказаць...

Нарэшце «Лада» завярнула пад арку, праехала паўз ажурную агароджу дзіцячага садка, мінула хлебную краму і па вузкай асфальтаванай дарожцы (двум легкавушкам не размінуцца) пад'ехала да дзевяціпавярховага дома, дзе жылі Алейнікавы. Бацька падруліў да крайняга пад'езда, заглушыў матор і з палёгкай вымавіў:

— Ну вось, прыехалі.

Калі Алег з дапамогай бацькі вылез з машыны і стаў на мыліцы, ён нечакана ўбачыў каля суседняга пад'езда Додзіка Красоўскага, які вывеў свайго паджарага Графа на прагулку. Убачыў — і сумеўся, чамусьці адразу ўспомніўшы Додзікаву выдумку пра відэакасету. І хаця тады ўсё выявілася на Алегаву карысць, і з яго было знята гнюснае падазрэнне, ён па-ранейшаму адчуваў глухую непрыязь да свайго былога сябра. Ды і якое там сяброўства? Проста так: відзікі замежныя і камп'ютэрныя гульні... Колькі часу прайшло, але помніцца, не забываецца. І, мусіць, ніколі не забудзецца...

Алег адвярнуўся, быццам і не заўважыў Додзіка, зрабіў колькі падскокаў на мыліцах да бетонных прыступак, спыніўся ў чаканні бацькі, які паставіў «Ладу» на супрацьлеглым баку дваровай пляцоўкі. А тут якраз з дзвярэй пад'езда выскачыла маці і, расхваляваная, кінулася да сына:

— Прыехаў, Алежка, выпісалі, адпусцілі? Асцярожна, я памагу!

— Не шумі, маці, увесь дом растрывожыш,— падышоў бацька.

Ён узяў Алега пад пахі і дапамог яму адолець бетонныя прыступкі: перанёс сына разам з мыліцамі да дзвярэй. Адчыніў, прапусціў яго ў вузкі калідор, да ліфта. Тут Алег ішоў сам, з перасцярогай налягаючы на мыліцы.

Ужо ў кватэры, калі Алег нарэшце дабраўся да сваёй мяккай канапкі, на якой любіў глядзець тэлевізар, ён адчуў вялікую, аж да галавакружэння, знямогу. Як пасля фінальнага футбольнага матча, калі перамозе аддадзены ўсе сілы, да апошняй кроплі.

Маці ўвіхалася вакол сына, вохкала, амаль са слязамі ў голасе:

— Як ты, Алежка, змарнеў, вунь аж сінякі пад вачыма! Адпачывай, я зараз на кухню... твае любімыя дранікі падсмажу. І дзедаву каўбаску з вяндлінкай... Трэба ж было таму недавярку на цябе наехаць! Аферыст пракляты...

— Не аферыст, а ліхач,— паправіў бацька, які толькі што зайшоў у пакой.— Вось прывёз з Франкфурта сувенірчык, японскі дыктафон. Цікавая штука: любую размову можна запісаць на магнітную стужку.

Алег узрушана зірнуў на бацьку і асцярожна прыняў з яго рук невялічкую прамавугольную каробку ў карычневым скураным футляры.

— Дзякуй, тата! Вой, я такое дзіва яшчэ ніколі не бачыў!

— Мініяцюрны магнітафончык,— сказаў бацька.

Сынава радасць, здаецца, крыху развеяла яго невясёлыя думкі-перажыванні, з якімі ён вёз Алега з бальніцы дадому. Толькі ці надоўга гэтае прасвятленне ў сям'і Алейнікавых?

Вярнулася з кухні маці, паведаміла:

— Я і забылася, сынок, тут табе званілі...

— Хто званіў, са школы?

— Не, незнаёмы хлопчык, назваўся Юрам. Пытаўся пра цябе, абяцаў яшчэ пазваніць...

— А-а-а, мы ў бальніцы пазнаёміліся, у адной палаце ляжалі. Ён раней выпісаўся,— успомніў Алег і тут жа прызнаўся: — Сын следчага, які вёў Вадзімаву справу.

— Сын следчага, таго самага? — ажывіўся бацька.— Няўжо?!

— Ага, той самы! Следчы заходзіў у нашу палату, я адразу пазнаў яго.

— Вось дык сюрпрыз! Гара з гарой не сходзіцца, а чалавек з чалавекам...

— Я у Юры пра мёд пытаўся...

— Пра што? — перапытаў бацька, здзіўлена ўзіраючыся ў сына.

— Пра мёд, які ты даваў следчаму, каб той выручыў Вадзіма.

— Мёд-мядок,— нявесела ўсміхнуўся бацька.— На пачастункі ўсе ласыя: і абяцаюць, і завяраюць...

— А следчы плаціў за мёд? — спытаў Алег.

— Плаціў — не плаціў, каго гэта можа турбаваць?

— Юра даказваў, што яго бацька не бярэ хабару.

— Ніхто не бярэ... Хабар толькі даюць... Ды калі чалавек трапляе ў бяду... па злой волі ці па сваёй дурноце... Не нейкі там прайдзісвет-крымінальнік, шчыпач-макрушнік...

У прыхожай патрабавальна прасігналіў тэлефонны званок, на які адразу ж паспяшаўся бацька. Алег насцярожыўся, праз адчыненыя дзверы залы было чуваць кожнае бацькава слова, загадкавае і трывожнае.

— Я ж казаў, не магу... Разумею... і мяне зразумейце... Што ў маіх сілах... Гэта не тэлефонная размова. Ля фантана? Добра, зараз буду...

Бацька паклаў трубку, цяжка ўздыхнуў, хрыплавата вылаяўся:

— Сволачы!

І тут жа ўсхваляваны голас маці:

— Рыгор, ты куды? Зараз будзем вячэраць... .Сын з бальніцы, сам два тыдні не быў дома... Якія там сакрэты?

— Трэба... Мяне не чакайце, вячэрайце...

— У цябе заўсёды так — дружкі даражэй за сям'ю!

— Якія дружкі, якая сям'я?! — амаль выкрыкнуў бацька і выскачыў за дзверы.

Алег уздрыгнуў ад бацькавага голасу, сцяўся: адчуванне блізкай бяды зноў запаланіла яго думкі. Вось жа вярнуўся з бальніцы дадому, атрымаў ад бацькі такі шыкоўны падарунак, усцешыўся, парадаваўся, тут раптам гэты тэлефонны званок...

Ён стаў на мыліцы, падышоў да акна, прыгледзеўся і паспеў убачыць, як бацькава «Лада» паспешліва завярнула за вугал суседняга дома, з-за высокага даху якога выглядвалі няяркія промні заходзячага сонца. У перадвячэрнім двары было шумна і тлумна: воддаль хлапчукі ганяліся за мячом, насупраць пад'езда ля металічнага гаража дзяўчынкі гулялі ў чахарду, на пясчанай пляцоўцы ля новых арэляў тоўпіўся ладны натоўп дзятвы. Толькі бабулі, што сядзелі на лаўцы пад гонкай бярозкай, здаецца, не праяўлялі асаблівай зацікаўленасці да ўсеагульнага сакавіцкага ачмурэння.

Алег зірнуў налева, дзе стаялі голыя кусты палісадніку, і раптам убачыў Додзікавага паджарага дога. Выгляд у Графа быў грозны і ваяўнічы: ён наступаў на рыжага дваровага ката Бомжа, якога заспеў на вузкай асфальтаванай дарожцы. Бомж жыў у падвале, харчаваўся аб'едкамі, што яму падкідвалі спагадлівыя людзі. Падкармліваў Бомжа тады-сяды і Алег. Якой костачкай ці кавалачкам батона... Кот не быў пераборлівы, еў усё, што давалі. Бомжа ведалі ў двары і малыя, і старыя. А можа, гэта ўжо не першая сустрэча ката з Графам?

Граф наступаў, спрабуючы глымануць Бомжа ашчэранай зяпай, але той не дрэйфіў, заняўшы кругавую абарону.

Дог кружыў вакол ката, хітраваў падлавіць спрыяльны момант для атакі, ды на кожны такі выпад Бомж адказваў гучным шыканнем і пагрозлівымі ўзмахамі сваіх кіпцюрыстых лапаў. Граф незадаволена матляў тупарылай мордай, крыху адступаў, а потым рабіў новы манеўр. Толькі зноў і зноў Бомж сустракаў свайго ворага вочы ў вочы. І шыпеў, і махаў лапамі.

Додзік стаяў ля бэзавага куста і зацікаўлена назіраў за паядынкам у чаканні хуткай развязкі. Ён быў вельмі задаволены яўнай перавагай Графа. З вышыні трэцяга паверха Алег бачыў Додзікаву зларадную ўсмешку, што крывіла яго слімакаваты рот.

«Вось жа недавярак! — усхваляваўся Алег.— Нацкаваў сабаку на ката і яшчэ радуецца! Хоць бы хто заступіўся за Бомжа».

Алег намерыўся адчыніць фортку, каб выгукнуць Додзіку сваё абурэнне, але тут сам Бомж знайшоў-такі паратунак. Калі Граф рабіў левы манеўр, кот крутнуў управа і абхітрыў свайго праціўніка. Пакуль дог разварочваўся, Бомж паспеў сігануць да бярозкі, пад якой сядзелі бабулькі, і вокамгненна апынуўся на выратавальнай вышыні. Граф кінуўся следам, але ўжо было позна.

— Ага, дулю вам з макам! — радасна ўсклікнуў Алег, задаволены спрытнасцю бяздомнага ката.

— Што там, сынок? — у залу ўвайшла маці.

— Та-а-к, Граф паказвае цыркавыя фокусы.

— Ну і псіна, ну і буржуйскае адроддзе! Ён ужо ўвесь двор загадзіў, усё далікатэсамі аб'ядаецца.

— Файны цюцька, у «Мерседэсе» катаецца.— Алег адступіў ад вакна, зноў налёг на мыліцы.

— Пайшлі на кухню, сынок, дранікі ўжо гатовыя. За тыдзень, мусіць, добра-такі прагаладаўся...

— Нічога страшнага, у бальніцы з голаду не паміраюць. А ты ж, мама, кожны дзень падмацункі прыносіла, аж лішняе.

— Ведаю я бальнічнае меню, кормяць дзеля прыліку.

Ужо за сталом маці занепакоена сказала:

— І куды гэта наш бацька паімчаўся? Дома столькі не быў, усё па заграніцах ездзіць, а тут зноў нейкія патаемныя сустрэчы.

Алег прамаўчаў, смакуючы дранікі са смятанай, хаця тэрміновы бацькаў ад'езд трывожыў яго не менш, чым маці. Зноў уявіўся чорны «Мерседэс» з дымчатым шклом, а потым — прыдуркаватая фізіяномія Пончыка, які сустрэў іх ля бальніцы. Таксама на іншамарцы катаецца, служка мафіёзны!

— Як там наш Вадзім? — раптам спытала маці.— Вось дзе горачка-гора! Вунь што пра гэтыя калоніі пішуць... Туды ж трапляюць і садысты, і наркаманы, і забойцы.

— Нічога, мама,— нарэшце азваўся Алег,— Вадзім зможа пастаяць за сябе.

— Каб жа ўсё абышлося ды згінула... Колькі ўжо слёз выплакана, колькі перапакутвана... Глядзі, Алежка, не звязвайся з благімі кампаніямі, яны да дабра не давядуць. Як і Вадзіма, зацягнуць у пастку...

Нейкім сіберным скразняком падзьмула ў Алегаў твар ад гэтых слоў, напомніла пра схованку на хутары. І што сказала б маці, калі б даведалася, што і яе меншы сын не так далёка ад «пасткі»? З кватэрай Красоўскіх так-сяк уладзілася, а тут зноў амаль што саўдзельнік нейкай патаемнай аферы. І ўсё з-за брата Вадзіма...

Зноў меладычна прасігналіў тэлефонны званок, і Алег раптам адчуў, што гэты званок выклікае яго самога. І не памыліўся, бо тут жа пачуў у прачыненыя дзверы кухні матчын голас:

— Алежка, цябе!

Алег (ён ужо добра-такі налаўчыўся без мыліцаў) даскакаў на здаровай назе да тэлефона, абапіраючыся рукою аб сцяну, апусціўся на мяккае крэсла, выпрастаў загіпсаваную нагу проста перад сабою.

— Здароў, Алег, Юра турбуе.

— Прывітанне,— адказаў Алег і разгублена падумаў: «Ну вось, яшчэ яго не хапала... І што яму трэба?»

— Я ўжо званіў табе, ёсць важная навіна... Пакуль ты ў бальніцы адлежваўся, мой бацька сёе-тое разведаў, ён узяўся правесці новае расследаванне.

— Для чаго? Усё роўна назад нічога не вернеш,— сказаў у трубку Алег.

— Не панікуй, вернем! Ты майго бацьку не ведаеш, ён, калі возьмецца за якую справу, не адступіцца. А з тваім братам выйшла нейкае непаразуменне, яго не павінны былі адпраўляць у калонію.

— Твой жа бацька дапамог! — упікнуў Алег.

— Зноў ты за сваё! — у Юравым голасе пачуліся пакрыўджаныя ноткі.— У майго бацькі такая служба, ён павінен весці допыты, выяўляць факты, доказы. Гэта ўжо ў судзе... каго абвінавачваюць, а каго і апраўдваюць.

— Ага, апраўдваюць,— зноў не ўтрымаўся Алег.— Забойцаў выгароджваюць, а невіноўных саджаюць...

— Усялякае бывае,— памяркоўна прамовіў Юра.— А вось мой бацька паехаў у калонію, дзе знаходзіцца твой

брат. Будзе сустракацца з ім... Паслязаўтра ён вяртаецца з камандзіроўкі, тады многае і праясніцца. Чакайце нашага званка.

— Прабач, Юра, я ж не ведаў...

— Нічога, не хвалюйся, усё павінна ўладкавацца. Будзь здароў!

Алег паклаў трубку на рычагі апарата і нейкі момант сядзеў як аглушаны. Навіна, што паведаміў сын следчага, ашаламіла яго сваёй нечаканасцю, нават неверагоднасцю. Няўжо і праўда следчы паехаў у калонію?! І чым завяршыцца гэтая паездка?

## 14

Алег не дачакаўся бацькі, задрамаў перад тэлевізарам, глядзеў нейкі дэтэктыўны фільм. Маці разбудзіла яго, дапамагла ўскласціся на тахту, накрыла лёгкай коўдрай, выключыла святло і асцярожна прычыніла дзверы залы. Алег заснуў беспрабудна, як пад наркозам. Пасля бальнічнага ложка яму вельмі хацелася звыклай дамашняй цішыні і спакою. Нават Юраў званок і трывога за Вадзіма не змаглі адолець яго санлівасць. Ён не чуў, як бацька вярнуўся дадому апоўначы і аб чымсьці ўзрушана размаўляў з маці на кухні. Гэта была слёзная і нервозная размова... Потым бацька памкнуўся разбудзіць Алега, але маўкліва пастаяў ля дзвярэй залы і ціха сказаў сам сабе:

— Ладна, раніцаю высветлім, усё роўна нічога не зменіцца за ноч. Хаця што тут высвятляць?

Яшчэ доўга бацька з маці сядзелі на кухні, штосьці абмяркоўвалі і, здаецца, спрачаліся. Толькі Алег быў далёка ад іх размовы-спрэчкі, бо яго запаланіў нейкі дзіўны, фантасмагарычны сон. І лілося ў акно таямнічае месячнае святло, і кружылі над Алегам нябачныя прывіды-гномы, і заварожвалі сваёй гіпнатычнай загадкавасцю...

...І вось ужо ён у перапоўненай зале з доўгімі радамі крэслаў. Зала змрочная, слаба асветленая, як у глыбокім падзямеллі. Ва ўсім — чаканне нечага страшнага, непазбежнага.

— Устаць, суд ідзе! — пачуўся грозны окліч.

Тут жа ў чорнай сцяне расчыніліся чырвоныя дзверы, і з'явіўся ва ўсім чорным суддзя са сваёй світай. Усеўся вяльможна ў высокае крэсла, нібы на царскі трон, і ўзняў над сваёю галавою асляпляльна яркі залаты скіпетр. Адляцеў пад высокае скляпенне змрок, пасвятлела ў зале.

І Алег (вось жа насланнё!) раптам пазнаў на судзейскім троне Аліка Кажана, а побач з ім — брата Вадзіма і блазнаватага Пончыка. Яны таксама былі ў чорных мантыях.

Алег праціснуўся праз натоўп бліжэй да сцэны, на якой засядалі суддзі, і нечакана на лаўцы падсудных убачыў свайго бацьку, а ля яго — амонаўцаў з дубінкамі. Захваляваўся Алег, узрушыўся: «Як жа так! У чым татава віна? А суддзі хто?! І чаму разам з Кажаном сядзіць Вадзім?»

Кажан зноў пагрозліва ўзмахнуў скіпетрам, і Алег пачуў яго гугнявы голас:

— Падсудны Алейнікаў Рыгор Ігнатавіч заслугоўвае самае суровае пакаранне... Ён вазіў праз граніцу кантрабанду і гандляваў валютай. У яго на хутары знойдзены тайнік з золатам. Алейнікаў браў хабар!

— Няпраўда! — нарэшце не вытрымаў Алег і кінуўся да бацькі.— Усё гэта мана! Тата, не маўчы! Тата, скажы ім! Вадзім, а ты чаму маўчыш?!

— Арыштуйце смаркача! — загадаў Кажан.— Ён таксама злодзей!

Амонаўцы падскочылі да Алега з яўным намерам скруціць хлапчука, але той надзвычай спрытна выслізнуў з-пад рук ахоўнікаў і сігануў праз драўляны бар'ер на сцэну. Ім кіравала нейкая звышнатуральная сіла, нібы толькі што ў яго істоту ўсяліўся дэманічны дух. Алег праставаў да Кажана, не зважаючы на небяспеку. Ён гарэў неадольным жаданнем выказаць патлатаму мафіёзніку, хлусу і нягодніку ўвесь свой праведны гнеў.

Калі Алег апынуўся крокі за тры ад Кажана, насустрач яму кінуўся Вадзім, быццам засцерагаючы Аліка ад нападзення.

— Вадзім! Няўжо ты аслеп?! Гэта ж ніякі не суддзя! Гэта ж гнюсны пярэварацень!

— Тармазі! — шыкнуў Вадзім.— Ты памыляешся... Алік самы чэсны і справядлівы. Ён і мяне выручыў!

— Цябе выручыў, а тату судзіць! — выкрыкнуў Алег.— І гэта па-твойму справядліва?!

Ён паспрабаваў абмінуць брата, але той зноў заступіў дарогу. Якраз падаспелі амонаўцы, акружылі і вось-вось схопяць Алега. Раптам на сцэне з'явіўся следчы з сынам Юрам, а з імі — некалькі міліцыянераў. Алег зразумеў, што прыйшла падмога. І тут жа заўважыў, як Кажан з Пончыкам пабеглі да чырвоных дзвярэй.

— Трымайце прайдзісветаў! — крыкнуў Алег, але ў гэты момант у зале пагасла святло, і ўсё навокал патанула ў непрагляднай цемры.

Прачнуўся Алег, растрывожаны і зняможаны,— аж слёзы на вачах.

«І што ж гэта такое? Ужо і ў сне няма ад іх паратунку... Кажаны праклятыя! Мала ім Вадзіма, за тату ўзяліся... І чаму тата апынуўся на лаўцы падсудных? Вось дык сон...»

Яго ўсяго аж перасмыкнула ад гэтых згрызотных думак, і рэзкі боль працяў загіпсаваную нагу. Хоць плач, хоць крычы... Але ён вытрымаў, прамаўчаў, толькі сціснуў зубы, пакуль боль не адступіўся і памякчэў. Як іншы раз здаралася на футбольным полі. Зваліўся ад удару, скурчыўся, счакаў колькі хвілін, а потым зноў за мячом, зноў у атаку. І не абысціся без сінякоў, фінгалаў, кровападцёкаў. Гульня ёсць гульня, тут ужо не да асцярожных і далікатных рэверансаў. Умей трываць, умей і здачы даваць...

Было далёка за поўнач, а можа, і бліжэй да раніцы, ды Алег усё ніяк не мог заснуць. Ці ён баяўся вяртацца ў сон, каб зноў не сустрэцца з Кажаном і яго мардатым ад'ютантам Пончыкам? Урэшце, што сон? Ад іх жа няма спакою ні ноччу, ні днём. Раскашуюць, вунь і да бацькі дабраліся... Выгадваюць бандзюкі ды на «Мерседэсе» раскатваюцца, а яшчэ Вадзіма марынуюць у калоніі. І ніхто не саб'е ім рогі, нібы і няма на гэтым свеце праўды — святой і чыстай.

Цішыня, навокал — ні гуку, толькі недзе ў суседзяў цяўкнуў спрасонку пакаёвы псючок і замоўк, як падавіўся косткай. І што будзе заўтра? Чым закончыцца паездка следчага ў калонію, што прынясе яго сустрэча з Вадзімам?

Разбудзіла Алега навальніца, грымотная, з яркімі ўспышкамі маланкі. Буйныя кроплі дажджу гучна барабанілі па шыбах, металічным падаконніку, гулкія раскаты грому амаль што не заціхалі ні на хвіліну. На дварэ ўжо добра развіднела, ранішняе святло прабівалася праз квяцістыя шторы, асвятляючы цыферблат насценнага гадзінніка: стрэлкі паказвалі каля шасці.

Нейкі момант Алег услухоўваўся ў музыку навальніцы з заплюшчанымі вачыма, уяўляючы, як там, за акном, віхурыць непагадзь, па тратуары струменяць імклівыя патокі ўспененай вады, і яму здавалася, што гэтай залеве не будзе супынку. Аднойчы вось так яго каманда трапіла пад навальнічны душ на футбольным полі. Вымаклі да нітачкі, але давялі гульню да фінальнага свістка. І выйгралі, і адзіны гол на апошняй хвіліне матча забіў ён, Алег Алейнікаў. Такое хіба забудзецца?! І ўспомніцца ў самы нечаканы момант. Як успомніўся Алегу гэтай навальнічнай раніцай Ваня з бальнічнай палаты. Успомніў і ўявіў пустыя рукавы яго футболкі і сумны позірк пры развітанні...

У прыхожай пачуліся лёгкія крокі, асцярожна адчыніліся дзверы, і Алег убачыў бацьку, які на дыбачках ішоў да шафы. Алег спачатку зажмурыўся, але ўсё ж не вытрымаў:

— Добрай раніцы, тата!

Бацька, быццам заспеты знянацку за нечым патаемным, уздрыгнуў, рэзка павярнуўся, але ўсё ж вымучыў на сваім твары ледзь прыкметную ўсмешку, ступіў бліжэй да канапы:

— Добрай, сынок, добрай! Можа, яшчэ распагодзіцца... Вунь які лівень, першая сёлетняя навальніца.

— Яна і разбудзіла мяне,— сказаў Алег.

— Рана разбудзіла, мусіць, і не выспаўся пасля бальніцы.

— Выспаўся, я рана лёг.

— Ну і добра,— чамусьці ўздыхнуў бацька.

Ён падышоў да акна, адхінуў штору, вызірнуў на вуліцу. Стаяў колькі хвілін, узіраўся ў дажджавую завесу, маўчаў. Потым вярнуўся, прысеў на край канапы, паглядзеў сыну ў вочы.

— Як нага, баліць?

— Не-е, зрэдку ные... Хутчэй бы гіпс знялі, надакучыў.

— Рана яшчэ. Я пытаўся ў галоўнага ўрача, больш месяца давядзецца табе няньчыцца з гэтай лялькай. Кажуць, пры пераломах вельмі памагае прапаліс... Трэба ехаць да дзядулі, яго пчолкі хутка паставяць цябе на ногі.

— А што, можна і паехаць,— згадзіўся Алег.

— Паедзем, сынок, паедзем... Вось толькі адна замінка... Ды калі б адна,— у бацькавым голасе пачуліся і трывога, і роспач.— Бяда ў нас, Алег, бяда... І як гэта ўсё звязалася ў тугі вузел? І не развязаць яго, і не рассекчы.

Раптоўна, нібы ў яркай успышцы маланкі, перад Алегам высвеціліся ўсе яго перажыванні апошніх дзён: і Вадзімава запіска з калоніі, і Пончыкавы пагрозы, і ўчарашні званок Юры, сына следчага... А тайнік на дзедавым хутары?

«Вось табе і прапаліс,— разгублена падумаў Алег.— Нічога не скажаш, марскі вузельчык... Можа, трэба расказаць тату пра ўсё? Хопіць гуляць у маўчанку...»

І бацька быццам прачытаў яго думкі пасля засяроджанага роздуму:

— Я ўчора вечарам бачыўся з Кажаном... Які гэта страшны мярзотнік, наркаман пракляты! У яго ж няма нічога чалавечага — сапраўдны вампір... Жыруе на чужым няшчасці...

— Ён і Вадзіма збіў з панталыку,— заўважыў Алег.

— Вядома, толькі Вадзім і сам вінаваты — трэба мець

свой розум... Ды што розум? Я думаў адкупіцца ад вурдалака, паабяцаў прывезці тое-сёе з-за мяжы, дык ён цяпер патрабуе, яму ўсё мала...

— А пра Вадзімава пісьмо Кажан казаў? — нарэшце не вытрымаў Алег.

— Казаў і яшчэ гразіўся,— уздыхнуў бацька.— Сёння апошні тэрмін, больш яны чакаць не будуць... Мне загадалі перагаварыць з табой: трэба выручаць Вадзіма.

— Хай не вельмі звярэюць,— ажывіўся Алег.— Следчы паехаў у калонію, ён будзе сустракацца з Вадзімам.

— Адкуль ты ўзяў? — здзівіўся бацька, узіраючыся ў бледнаваты твар сына. Новыя раскаты грому быццам пацвердзілі яго здзіўленне.

Спачатку Алег расказаў пра вячэрні званок сына следчага, потым паведаміў і пра схованку на дзедавым хутары. З усімі падрабязнасцямі: як сустрэўся з Вадзімам у дзедавым садзе, калі той хаваўся ад міліцыі, як шукаў пакет у скверы ля фантана, як завёз знаходку на хутар...

Бацька ўважліва слухаў сына, не перапыняў, а калі Алег замоўк, неяк шматзначна сказаў:

— Што ж, тады едзем на хутар! Якраз і ў лазні папарымся, з сухою параю і бярозавым венічкам.

Навальніца праляцела, як і прыляцела: у двары пасвятлела, заціх гром, замоўк барабанны пошчак дажджу. Бацька зноў падышоў да акна, шырэй расхінуў шторы, паглядзеў уніз.

— Памылася наша «Лада»,— сказаў і пайшоў да дзвярэй.— Можаш яшчэ падрамаць, спяшацца не будзем.

Усё ж Алегу не драмалася. Размова з бацькам нікольні не заспакоіла яго, а наадварот: прымусіла яшчэ больш растрывожыцца. І чамусьці асабліва дапякала схованка на дзедавым хутары, дапякала сваёй загадкавай таямнічасцю і тым, што Кажан так цікавіўся ёю, быццам у той шкатулцы быў нейкі вельмі каштоўны скарб. Скарб — гарантыя Вадзімавай бяспекі?

Неўзабаве зазваніў тэлефон. Алег чуў, як з кімсьці размаўляў бацька (праўда, ніводнага слова нельга было разабраць), а потым ён выйшаў з кватэры і адсутнічаў даволі доўга. Маці збіралася на дзяжурства, зайшла ў залу, пацікавілася Алегавым самаадчуваннем, сказала, што падрыхтавала сняданак. А ў самой — выгляд сумны-сумны і вочы нібы пасля бяссонніцы.

— Глядзі, сынок, будзь асцярожны... Мала нам бяды з Вадзімам. Адпачні ў дзядулі, сырадойчыкам падмацуйся і бабулю слухайся.

— Не хвалюйся, мама, усё будзе добра...

— Каб жа толькі Бог дапамог...

Больш маці нічога не сказала, прыкрыла вочы рукою і паспешліва выйшла з залы. І зноў усталявалася напятая, чуйная цішыня, што магла ў любы момант выбухнуць новай неспадзяванкай. А з якой яшчэ навіной вернецца бацька?

Але Рыгор Ігнатавіч заявіўся дадому задумлівы і маўклівы. Нібы і не было ранішняй размовы пра Кажана і схованку на дзедавым хутары. А можа, усё неяк уладзілася і знайшлося памяркоўнае выйсце? Ці проста бацька не жадае адкрывацца да пары да часу? Алегавым думкам было і цесна, і па-ранейшаму неспакойна.

Паснедалі і адразу ж пачалі збірацца ў дарогу. Алег угледзеў на пісьмовым стале стос сваіх падручнікаў, падумаў пра школу і тут жа з палёгкай успомніў: заўтра першы дзень вясновых канікулаў і не трэба турбавацца пра вучобу.

«Толькі якія ў мяне адзнакі за трэцюю чвэрць? І што паставіла Бірута Яфімаўна па кантрольнай? Пазваніць бы каму з аднакласнікаў, ды ладна, пазваню, калі вярнуся з хутара».

Алег узяў з сабою толькі кнігу «Прыгоды Электроніка», якую чытаў у бальніцы. Прыгоды электроннага хлопчыка і яго двайніка Сярожы Сыраежкіна заваражылі Алега сваёй неверагоднай фантастычнасцю. Вось бы і самому знайсці такога памочніка. Тады б паказалі Кажану дзе зімуюць ракі! І Вадзіма змаглі б выручыць...

## 15

Калі выехалі за горад і «Лада» выскачыла на бетонку, абмытую сакавіцкім дажджом, бацька нарэшце парушыў маўчанне:

— Тут, Алежка, такая сітуацыя... Каб ты, калі што, ведаў... Мяне вымусілі, не мая воля... Яны ўсё могуць, а за нас ніхто не заступіцца...

Лагодны настрой, з якім Алег прымасціўся на заднім сядзенні «Лады», паклаўшы побач з сабой мыліцы, імгненна знік, быццам лёгкая імжа пад яркімі промнямі вясновага сонца. Алег насцярожыўся, нават крыху прыўстаў, каб лепш пачуць бацькавы словы, якія падзьмулі на яго калючым скразняком.

— Я не мог адмовіць,— праз колькі хвілін працягваў

бацька.— Кажан заказаў лазню, з сухою параю... Трэба прапаліць да яго прыезду.

— Лазня для Кажана! — усклікнуў Алег.— Ды ён жа цябе судзіў, я бачыў у сне! Ты сядзеў на лаўцы падсудных з наручнікамі!

— На лаўцы падсудных?! З наручнікамі?! — бацька азірнуўся і засмяяўся: — Прарочы сон! І хто суддзі? Няўжо табе прысніўся Кажан?

— Ага, ён! І побач з ім — Вадзім... А яшчэ там быў следчы... Але святло пагасла, і я прачнуўся.

— Вадзім з Кажаном?! — бацька ўжо не смяяўся.— І цябе ён дастаў, блін пракляты!

Стрэлка спідометра паволі набліжалася да ста, «Лада» імкнула наперад з нейкай асаблівай упартасцю, абганяючы ціхаходныя «Масквічы» ды «Запарожцы». За маладымі сасонкамі, што стаялі шчыльнай сцяной уздоўж бетонкі, як па ўзмаху чароўнай палачкі, з'явіліся ўсё тыя ж шыкоўныя катэджы, пра якія аднойчы бацька сказаў:

— Вось дзе буржуйскае гняздо! Шыкуюць прахіндзеі і не баяцца засвяціцца...

У ранішніх сонечных промнях цуда-гарадок зіхацеў сваёй непаўторнай прыгажосцю і фантастычнасцю. «Лада» пралятала міма, і Алег здзіўлена заўважаў, што кожны дамок не падобны адзін на аднаго, нібы намаляваны рукою нейкага знакамітага мастака. Цынкавыя дахі, гатычныя мансарды, фігурныя вокны, шкляныя веранды... І ўсё як на падбор!

— Сволачы! — толькі і сказаў бацька, кінуўшы кароткі позірк на казачны пасёлак.— Бліны пракляныя!

Але тут жа Алег зразумеў, што бацькава лаянка адрасавалася зусім не «буржуйскаму гнязду». Міма іх з правага боку, груба парушаючы правілы дарожнага руху, прамільгнуў чорны «Мерседэс», і так блізка, што Рыгору Ігнатавічу давялося рабіць рэзкі фінт улева.

— Наркоты! — аж скрыгатнуў зубамі бацька.

Алег па інерцыі матлянуўся ўбок і, каб не ўдарыцца галавою аб шкло дзверцаў, схапіўся рукамі за пярэдняе сядзенне. Нейкі момант ён сядзеў як аглушаны, няўцямна ўзіраючыся на дарогу, па якой імчаў невядомы ліхач.

— Ну што, Алежка, напалохаўся? — спытаў бацька пасля хвіліннага маўчання.— Нічога, сынок, трэба трываць, сёння яны каралі, блазнуюць, недавяркі...

«Мерседэс» далёка не ад'язджаў, трымаўся на блізкай адлегласці, быццам гуляў з «Ладай» у кошкі-мышкі. То прытармозіць, падпусціць да сябе метраў на пяць, то зноў

імкліва набярэ хуткасць, маўляў, слабо — не дагоніш!

І тут нарэшце Алег даўмеўся: дык гэта ж той самы чорны «Мерседэс», які ён бачыў учора ля бальніцы і ў якім па запрашэнні Пончыка пабываў бацька. Таямнічая сустрэча за дымчатым шклом, бацькавы ўзрушанасць і трывога... І вось гэтыя дураслівыя даганялкі па бетонцы. Як і тады, на той зімовай дарозе, калі «Лада» гналася за зайцам і, здавалася, адбудзецца штосьці страшнае і непазбежнае... Толькі хто каго даганяў цяпер?

За паваротам, ля белага бярозавага гаю, «Мерседэс» спыніўся, вымушаны быў затармазіць і Алегаў бацька. Заглушыў матор, адшпіліў прывязны чорны рэмень і вылез з машыны. Левыя дзверцы «Мерседэса» адчыніліся, але з яго ніхто не паказаўся. Тут жа пачуўся чыйсьці хрыплы вокліч, і Рыгор Ігнатавіч паспяшаўся па ўзбочыне бетонкі да іншамаркі. Размова была кароткая: пытанне — адказ. Быццам сустрэліся два незнаёмцы і адзін з іх пацікавіўся: які цяпер час?

Алег бачыў, як бацька махнуў рукой і пайшоў да «Лады», а «Мерседэс», крута развярнуўшыся, перасек раздзяляльную паласу аднабаковага руху, ледзьве не сутыкнуўся з сінім фургонам і імкліва панёсся назад, у горад.

«Што здарылася? — занепакоена думаў Алег, з нецярпеннем чакаючы бацьку.— Яшчэ і да хутара не даехалі, а ўжо нейкія дзіўныя выкруты... Няўжо Кажан вычмураецца?»

Бацька сеў за руль, шчоўкнуў замком прывязнога рэменя і з адчаем выдыхнуў:

— Усё, яны даканаюць мяне! Ім усё мала... Пракляты «заечы гіпноз»...

— Трэба заявіць у міліцыю,— няўпэўнена прамовіў Алег, каб хоць крыху заспакоіць бацьку, прыцішыць яго ўзрушанасць.

— Не, сынок, іх ужо нічым не спыніш... А міліцыі факты патрэбны: калі хто каго знявечыць ці адправіць на той свет...

Раптам Рыгор Ігнатавіч закрыў твар рукамі і з нейкім асаблівым надрывам вымавіў:

— Калі ж гэта ўсё кончыцца? Хіба можна так жыць, мучыцца? З Вадзімам бяда, думаў выручыць, а гэтыя недавяркі толькі пацяшаюцца, ім сухой пары падавай ды яшчэ з халодным півам. Вунь панесліся ў горад, за кайфам пеністым. Сёння ў іх свята, дзень нараджэння «караля»...

Нарэшце бацька крыху супакоіўся, адняў рукі ад твару, рашуча ўзяўся за руль, і «Лада» рыўком сарвалася з месца.

І белы бярозавы гай, якім міжволі залюбаваўся Алег, закружыўся ў імклівым карагодзе, усё хутчэй і хутчэй.

Праз колькі хвілін Рыгор Ігнатавіч загаварыў зноў, неяк выбачліва і вінавата:

— У мяне, сынок, адна да цябе просьба... Калі што здарыцца, ведай: я ні ў чым не вінаваты, я не мог інакш. У іх сіла, яны могуць усё... А тут круцішся, падладжваешся, і хто за цябе заступіцца? Усе баяцца звязвацца з мафіёзнікамі... Чарнобыльскае пекла прайшоў, каб вырвацца на замежныя рэйсы. Праўда, не толькі пасведчаннем ліквідатара давялося ўзмахнуць... Усё прадаецца, усё купляецца... Жыць бы цяпер спакойна, працаваць, але ж мёртвай хваткай учапіліся... І Вадзіма трымаюць заложнікам, пагражаюць... Кажан-верхавод, зладзюга ў законе, ад яго нашы беды-няшчасці. Гэта ж шалёны звер з ядам кобры... А як у іх усё завязана-павязана! Як яны шануюць свае аўтарытэты! Вунь аднаго такога ваўкалаку на той свет праводзілі... Спіўся, наркот, пячонка не вытрымала ў трыццаць шэсць гадоў... Дык яго труну неслі на руках да могілак некалькі кіламетраў, кветкамі дарогу пасыпалі. На іншамарках паз'язджаліся падлюгі з усяго свету, наладзілі вядзьмарскі шабаш... А міліцыя хоць бы што, нават брывом не павяла, як жа — хавалі злодзея Мацвея! Дажыліся!

Алег слухаў бацьку, маўчаў, і адчуванне блізкай бяды нарастала ў яго свядомасці снежным комам, які мог у любое імгненне сарвацца з крутой гары. І чаму так усё безнадзейна страшна? Няўжо няма паратунку з гэтай кажановай пасткі?

Нарэшце «Лада» звярнула з бетонкі і выехала на разбітую асфальтаваную дарогу, што вяла да хутара. Калдобіны, запоўненыя дажджавой вадой, вымусілі збавіць хуткасць, машына лавіравала паміж лужынамі, нібы лыжнік-слаламіст.

— Вось так і наша жыццё: ехалі па бетонцы, а звярнулі ўбок — і трапілі ў гразь! І нікому цяпер гэтая дарога не патрэбна,— бацькаў голас гучаў адрывіста і гнеўна.— Брыгада чарнявых наймітаў асфальтавала, а што возьмеш з тых шабашнікаў? Прыгладзілі, замазалі, разлік атрымалі — і будзь здароў, калгас «Светлы шлях»! Такая і трываласць гэтага шабашнага асфальту... Чужакам закон няпісаны: пасля іх — хоць патоп!

Праехалі мост, мінулі вёску, адолелі зацяжны пад'ём, і Алег яшчэ здаля заўважыў дзедаў хутар, асветлены зыркім сакавіцкім сонцам. Дзянёк стаяў, як па заказу:

светлы, чысты і рахманы. Бацька таксама ўбачыў хутар, неяк адразу ажывіўся, нават павесялеў:

— Вясна! Хутка ўжо будзем садзіць-сеяць: бульбачку, агурочкі, памідорчыкі. Трэба падсобіць дзеду з бабай, ім адным не пад сілу весці гаспадарку. Так што, Алег, давай набірайся моцы, як кажуць, станавіся на ногі... На цябе, сынок, у мяне надзея, толькі на цябе!

— Хутчэй бы гіпс знялі,— ніякавата азваўся Алег.

— Знімуць, нідзе не дзенуцца. Дзед з бабай памогуць паправіцца... Прапаліс з мёдам — чарадзейныя лекі, якраз пры пераломах. Будзем мацавацца!

Бабуля Даша як убачыла ўнука на мыліцах, дык і рукамі ўспляснула і загаласіла:

— А, унучачак, мой родненькі, а што ж гэта з табою?! І чаму ж у нас бяда за бядою? Божачка літасцівы, няўжо ты не чуеш маіх малітваў?!

Алег, разгублены і зніякавелы, стаяў на мыліцах пасярод двара і адчуваў сябе вельмі няёмка. Можа, лепш было і не ехаць на хутар, каб не паказвацца бабулі ў такім выглядзе і не вярэдзіць яе хворае сэрца? А што скажа дзед Ігнат, калі ўбачыць Алега? Праўда, ён занядужаў, радыкуліт прыхапіў, таму не выйшаў з хаты сустракаць гасцей. Але як жа мог Алег не паехаць? І быццам водбліск маланкі высвеціў у Алегавай памяці гэткі аспідна-чорны ланцужок непрыемных сустрэч і здарэнняў, што прывёў яго на хутар. Сустрэча з Пончыкам і Вадзімава запіска, няшчасны выпадак на вуліцы і загіпсаваная нага, вяртанне дадому і Кажановы пагрозы... І ўсё нейкім чынам звязалася з таямнічай малінавай шкатулкай, якую ён, Алег, схаваў у дзедавай пуні.

Падбег Шарык, радасна падбрэхваючы. Кінуўся быў, як звычайна, да Алега, але таксама заўважыў мыліцы і, быццам спалохаўшыся іх, спыніўся, а потым раптам неяк дзіўна заскавытаў, нібы заплакаў па-свойму, па-сабачаму.

— Ой бяда, ой бяда! — яшчэ больш слёзна загаласіла бабуля Даша.

— Хопіць, мама, не трэба, тут і так моташна,— амаль з адчаем папрасіў Рыгор Ігнатавіч.— А то зараз усе завыем!

— Маўчу, Рыгорка, маўчу... Пайшлі ў хату, з дзедам паздароўкаецеся і падсілкуецеся з дарогі.

— Пойдзем,— пагадзіўся бацька і тут жа дадаў: — Няхай Алег пакуль пабудзе на двары, падыхае свежым паветрам, у бальніцы зусім змарнеў. Падсілкоўвацца нам яшчэ

рана, снедалі дома. А мне, мама, трэба нанасіць вады ў лазню. Госці прыедуць папарыцца...

— Добра, сынок, глядзі ўжо сам... Можа, і дзедаў радыкуліт прагрэеце...

Бацька з бабуляй Дашай пайшлі ў хату, Алег застаўся на двары. Хараша наўкола, сонечна і зацішна. Сеў на лаўку, мыліцы паклаў побач, зажмурыўся, заслухаўшыся шпачынай песняй, што далятала з саду. Шарык таксама ўлагодзіўся, прылёг каля лаўкі, паклаў сваю чорную пысу на лапы і ўтаропіўся на Алега, нібы прасіў у яго прабачэння за свой дзіўнаваты брэх.

— І чаго ж ты напалохаўся? — спытаў Алег у Шарыка, узіраючыся ў яго зеленаватыя вочы.— Мыліцаў ніколі не бачыў? Гэта не хухры-мухры... Яшчэ добра, што так усё абышлося... Табе тут лафа, жывеш, як на курорце... А ў мяне вунь якая заварушка: хоць кусайся — хоць брашы...

Прыгрэўся Алег на сонейку, суцішыўся, нібы і не было толькі што бабіных слёз і войканняў, нібы ўсе перажыванні нечакана адляцелі разам з лёгкім вясновым ветрыкам. І шпак вунь як залiваецца ля свайго доміка на разгалістай яблыні, радуецца: вярнуўся дадому пасля далёкай зімовай вандроўкі, не заблудзіўся ў чужых краях. З'явіўся аднекуль чырвоны бухматы чмель, закружыў над Шарыкам, і той незадаволена павёў вушамі, пагрозліва завурчэў, гатовы вось-вось кінуцца на свайго дакучніка. Але чмель, мусіць, адчуў небяспеку і знік гэтак жа імкліва, як і прыляцеў. Прачнуўся пасля зімовай спячкі, робіць першыя аблёты ў пошуках жыватворнага нектару.

З дрымотнага стану Алега вывеў бацька, які выйшаў з веранды з двума вёдрамі. Спыніўся, пастаяў у задумлівасці, уздыхнуў:

— Дзядуля наш занядужаў, замучыў яго радыкуліт... Пайду нанашу вады ў лазню. Ну, а як твой тайнік? Можа, трэба памагчы?.. Госці хутка заявяцца...

— Не-е,— аж уздрыгнуў Алег,— я сам...

Лагодны настрой адразу ж развеяўся, адчуванне трывогі вярнулася зумклівым чмяліным гудзеннем. Алег зірнуў на расчыненыя дзверы пуні, і яму раптам здалося, што ў зацененым праёме мільгануў нейкі бялёсы прывід. Быў — не быў?! Глянуў на Шарыка, але той ляжаў заплюшчыўшы вочы, мусіць, драмаў.

Алег падняўся з лаўкі, абапёрся на мыліцы, выставіў перад сабою загіпсаваную нагу, агледзеўся. Шарык таксама падняўся, завіляў хвастом, пацягнуўся і санліва пазяхнуў.

«Ну і гультай!» — падумаў Алег пра сабаку і рушыў да пуні. Прысутнасць Шарыка падбадзёрвала, надавала смеласці. Хаця чаго баяцца цяпер, сярод белага дня? І ўсе гэтыя прывіды — выдумкі палахліўцаў.

Алег асцярожна пераступіў парог пуні і трапіў з сонечнага двара ў густы прыцемак. Прыглядаўся з хвілінудругую, пакуль вочы прывыклі да ценю, і пакіраваў да драўлянай лесвіцы, што стаяла каля лаза на гарышча. Раптам з цёмнага кутка пуні выскачыла курыца і, гучна кудахтаючы, паляцела да дзвярэй. Алег аж злякнуўся ад нечаканасці, быццам гэта была не курыца, а той самы бялёсы прывід.

— Шарык, лаві вядзьмарку! — крыкнуў Алег.

Але Шарык, які сядзеў у дзвярах, відаць, да сваіх курэй адносіўся з павагай, таму нават саступіў убок, прапускаючы на двор белую чубатку.

Алег прысланіў мыліцы да дашчанай сцяны і ўзяўся за круглыя парэнчы лесвіцы, выпрабоўваючы яе моц і ўстойлівасць. Спачатку паставіў здаровую нагу на ніжнюю прыступку, потым асцярожна ступіў загіпсаванай нагой. Пастаяў, прыслухаўся, пакуль не мінула першапачатковая боязь.

Адна прыступка, другая, трэцяя... Алег падымаўся ўверх, набірала вышыню і ягоная трывога, асабліва непакоіла тое, што на хутар павінен заявіцца сам Кажан. Лепш бы не бачыць і не чуць гэтага прайдзісвета-падкалодніка! Лазня яму патрэбна, з сухою параю і піўком... Смоўж агідны!

Алег узабраўся на гарышча і з нейкай раптоўнай палёгкай паваліўся спіной на шархоткае духмянае сена. Ляжаў, спачываў, узіраючыся на маленькае акенца ў франтоне, з якога лілося яркае сонечнае святло, і ўяўляў сябе адзінокім іншапланецянінам. Вось бы ўзняцца на чароўных крылах і паляцець на якую-небудзь невядомую планету, дзе няма мафіёзнікаў-шчыпачоў, рэкеціраў-жулікаў, маньякаў-макрушнікаў. Павінна ж існаваць такая планета, абавязкова павінна... У зорных вышынях, хоць на краі Сусвету, хоць у бязмежнай Галактыцы! Толькі там, напэўна ж, жывуць не людзі, а нейкія больш разумныя і высокаразвітыя істоты: шчырыя, мужныя і сумленныя.

Нарэшце Алег схамянуўся, сеў, агледзеўся: дзе схованка з таямнічай малінавай шкатулкай? Успомніў, што хаваў яе ў левым кутку гарышча, дзе ляжала ўсялякая старызна. Цяпер той куток быў закладзены сенам. А што, калі і старызну і Вадзімаў пакет куды-небудзь выкінулі?

Расхваляваўшыся, ён папоўз у куток і пачаў разграбаць сена, адганяючы ад сябе вярэдлівую думку аб магчымым знікненні шкатулкі. І што ж тады рабіць, дзе яе шукаць? І як апраўдацца перад Кажаном, хіба ён паверыць у нейкія там довады? Тады лепш ад яго ўцякаць хоць на край свету.

Добра-такі запарыўся, аж у носе заказытала ад пылу, пакуль дабраўся да самага падстрэшка. І вельмі ўзрадаваўся, калі пад рукі трапіліся рызманы, тыя самыя, пад якімі схаваў Вадзімаў пакет. Алег сцішыўся, прыслухаўся, быццам асцерагаючыся, што за ім могуць сачыць, але, пераканаўшыся ў сваёй поўнай бяспецы, пачаў шнарыць рукамі ў старызне.

— Ага, ёсць! — узрушана прашаптаў Алег, калі нарэшце яго пальцы намацалі цэлафанавы пакет.— Вось і фінальны свісток!

Ён выбраўся з нары, якую выкапаў у сене, аддыхаўся і ўтаропіўся на сваю знаходку. Яна прыцягвала магнітам, заварожвала таямнічасцю. Некалькі хвілін Алег вагаўся, адганяючы спакуслівае жаданне адгадаць трывожную загадку, але ў рэшце рэшт цікаўнасць перамагла. А сам сябе супакоіў: «Што тут такога: пагляджу і толькі... Ніхто і ведаць не будзе».

Асцярожна развязаў пакет, выняў з яго важкую малінавую шкатулку. Яна адразу ж успыхнула зіхатлівымі зайчыкамі, трапіўшы ў сонечны прамень, што высвечвала акенца ў франтоне. Алег уважліва разглядаў шкатулку, асабліва яго зацікавілі тры лічбы «6», што выдзяляліся на вечку чорным колерам. І чорная ружа побач. Збоку Алег заўважыў маленькую бліскучую кнопку і, крыху развагжыўшы, націснуў на яе ўказальным пальцам. Пачуўся ціхі меладычны звон, і вечка аўтаматычна адчынілася.

Унутры шкатулкі ляжала штосьці загорнутае ў чорны вельвет. Алег ужо не мог спыніцца, не мог прымусіць сябе зачыніць шкатулку, нібы ім кіравала нейкая магічная сіла. Вось жа чарадзейны гіпноз!

Сталёвы холад апёк Алегавы рукі, прымусіў яго жахнуцца, як ад асінага ўкусу. Гэта быў пісталет: кароткаствольны, з гранёнай рукаяткай. Гарачынёй шуганула ў твар, трывожна затахкала сэрца, і аж пацямнела ўваччу... Яшчэ ніколі Алег не трымаў у руках сапраўдную зброю — баявы пісталет, што даводзілася бачыць толькі ў гангстэрскіх «відзіках» і дэтэктыўных фільмах. Яго трэсла быццам у ліхаманцы, ён не мог саўладаць з сабою, заспакоіцца, астыць...

Раптам на двары пачуўся гул машыны, потым загучалі

галасы, злосны брэх Шарыка. І загадны бацькаў вокліч:

— Шарык, у будку! Я каму сказаў, у будку!

Брэх адразу ж заціх, а галасы яшчэ больш развесяліліся. Хтосьці нават падпяваў: «А як маеш грошы...»

Алег хуценька адпоўз да капы сена, захаваўся за ёй і затаіўся, сціскаючы ў руцэ рукаятку пісталета.

І зноў пачуўся гугнявы голас:

— Ой, буксы гарацьі

— Пайшлі ў хату,— запрасіў бацька,— медавухай патушым пажар. Лазня ўжо грэецца, сухая пара будзе адмысловая.

— Цаню тваю ўвішнасць, Грыша, цаню! Мы ў даўгу не застанемся, Вадзіма трэба выручаць... А як з нашай умовай?

— Усё добра, Алег прыехаў са мной, яго тайнік у пуні.

— Ну, ладна, пайшлі тушыць буксы, а потым і з Алегам пакалякаем... Не люблю, калі мяне водзяць за нос.

Алег ляжаў на сене і не ведаў, што рабіць, куды дзецца... Як быць з пісталетам? Няўжо трэба пакласці яго ў шкатулку і зрабіць выгляд: я нічога не знаю — мая хата з краю? І аддаць зброю Кажану, гэтаму прайдзісвету і дамушніку... А ці ведаў Вадзім, што знаходзіцца ў шкатулцы? І дзе ён узяў яе?

Ліхаманка не праходзіла, як і адчуванне безвыходнасці і нейкага калючага страху. Нібы міжвольна апынуўся адзін на адзін з бязлітасным ворагам, што гатовы ў любую хвіліну зрабіць каварны выпад. А хто абароніць, хто кінецца на выручку ў небяспечны момант? Успомніліся сын следчага, бязрукі Ваня, з якімі пазнаёміўся ў бальніцы, і сам следчы, які паехаў у калонію на сустрэчу з Вадзімам... І аднакласнікі, і ігракі футбольнай каманды з трэнерам Аляксандрам Мікалаевічам... Але ж хіба можна спадзявацца на іх падтрымку? Ды і адкуль ім ведаць пра чужую злыбеду?

На двары пачуліся паспешлівыя крокі, якія кіравалі да пуні. І ўжо з дзвярэй прагучаў узрушаны бацькаў голас:

— Алег, дзе ты? Давай хутчэй у хату, Кажан патрабуе! Напіўся, наркот, гразіцца, зусім ашалеў... І што ж гэта такое, хоць лезь у пятлю!

— Я зараз, яшчэ не знайшоў,— чамусьці змяніў Алег і сунуў пісталет у сена, хуценька прыхаваў і шкатулку.

— Паспяшайся, сынок, вылюдак не любіць чакаць,— бацька стаяў каля лесвіцы ўнізе і не збіраўся падымацца на гарышча.— Пабягу ў хату, трэба неяк супакоіць наркота, а то падыме вэрхал.

Бацькава разгубленасць яшчэ больш растрывожыла і

напалохала Алега. І што будзе, калі шкатулка з пісталетам апынецца ў руках раз'юшанага вар'ята? Дзе ж выйсце з гэтай пасткі?

Алег дрыготкімі рукамі дастаў з-пад сена пісталет і ўтаропіўся на страшную знаходку. Кароткі ствол, чорная рукаятка, маленькі спускавы кручок... А калі пісталет зараджаны? І сядзіць у ім смертаносная куля, цікуючы да пары да часу... Каб у нейкі там момант вылецець з утульнага гнязда гільзы і зрабіць свой першы і апошні палёт...

Насцярожаную цішыню сакавіцкага дня раптоўна ўзарвалі грукат, крыкі і раз'ятраны Шарыкаў брэх. На двары тварылася штосьці бязладнае і незразумелае. І ў гэтым дзікім гвалце Алег пачуў роспачны голас бабулі Дашы:

— Спыніцеся! Богам прашу, супакойцеся! Ён жа зусім не вінаваты! Адумай-це-ся-я!

Алегаву свядомасць, нібы перад непазбежным скачком у чорную бездань, працяў пякучы страх: Кажан рваўся ў пуню! Гэта яго, азвярэлага наркота, маліла бабуля Даша. А ў адказ — п'яны крык:

— Колькі ж можна чакаць, я ж папярэджваў! Рукі завяжу марскім вузлом. Прэч з дарогі, шмакадзяўкі!

Алег сцяўся, зніякавеў, не ў сілах рухацца. Ён трымаў пісталет проста перад сабой, а ўказальны палец міжволі апусціўся на спускавы кручок.

Неўзабаве ў праёме лаза паказалася кудлатая Кажанова галава. Чырвоны, як з парылкі, твар, барвовы шрам ад вуха да рота, драпежны бляск залатых зубоў. Сонечны прамень з акенца якраз перамясціўся на праём у лазе і асляпіў Кажана.

— Ну, дзе ты тут, смаркач? Са мной такія жарцікі не праходзяць! Я ўсіх вас пастаўлю на калені! Ты таксама будзеш служыць мне! Як і твой брат, як і твой татка-ліквідатар...

Кажан узняўся над лазам да пояса, але, мусіць, паранейшаму нічога не бачыў, аслеплены сонечным промнем. І тут Алег націснуў на спускавы кручок. Суха трэснуў стрэл, потым яшчэ раз і яшчэ... Кажан нават не войкнуў. Узмахнуўшы рукамі ў паветры, ён няўклюдна рухнуў уніз, быццам з-пад яго ног нечакана выбілі лесвіцу.

— Ну што, паставіў на калені, вурдалак пракляты?! — прашаптаў Алег з раптоўнай палёгкай і быццам скочыў у цёмны вір.— Цяпер мы з табой квіты!

Наступіла звонкая цішыня: ні гуку, ні шолаху... Праз якую хвіліну-другую завыў Шарык. Сабака выў жудасна і безнадзейна, нібы адчуў набліжэнне ваўчынай зграі.



# ...І МЫ ЗАСМЯЯЛІСЯ,
## або Восем урокаў з жыцця шасцікласніка Андрэя Кахуты

### Урок першы:
### ХТО КАГО?

І ці мог я прадбачыць, што так усё павернецца? Вядома, не. Інакш на гэтым сходзе з мяне і слова не выціснулі б. Ды калі вам сказаць праўду, то я заўсёды лічыў за лепшае спачатку сем разоў памераць, а потым ужо адрэзаць...

Дайшоў я да шостага класа, можна сказаць, без усялякіх прыгод. Галоўнае, мяне не трэба было цягнуць за вушы да падручнікаў або ставіць пытанне аб маіх паводзінах на бацькоўскіх сходах. Не, тут быў поўны парадак. І тое, што я хадзіў у выдатніках з першага класа, цяпер нікога не здзіўляла. Маё прозвішча заўсёды ўпаміналася, калі трэба было каго-небудзь прысароміць.

— Бярыце прыклад з Андрэя Кахуты,— казалі прыгнечаным двоечнікам.

Не ведаю, што думалі ў гэты момант тыя, каго ўшчувалі, толькі мне ў такія хвіліны рабілася вельмі няёмка. Я ніяк не мог прызвычаіцца да ліпкай, як смала, пахвалы і паціху пакутаваў, не ведаючы, дзе шукаць збавенне. А тут яшчэ з чыйгосьці злаславага языка зляцела «пяцёрачнік». І я быў не ў сілах зразумець аднаго: чаму наш гультай Стась Чыжык, калі яго называюць двоечнікам, спакойна ўсміхаецца, а я за «пяцёрачніка» гатовы скрозь зямлю праваліцца?

...Ішоў перавыбарчы сход. Выступаў рэдактар нашай гумарыстычнай насценгазеты «Смех, дый годзе» Пеця Мялешка. Гаварыў ён складна, нібы чытаў святочную заметку з першай калонкі сваёй газеты. Толькі святочнага настрою ў яго словах было мала, бо ён наводзіў сур'ёзную крытыку на старасту Зойку Сцешанок.

Зойка маўчала і разгублена азіралася па баках. Але ніхто не адклікаўся на яе ўмольныя позіркі, і гэта пакорлівае маўчанне яшчэ больш падбадзёрвала Мялешку. Якніяк, перавыбарчы сход, і галоўнае, што найбольш турбавала ўсіх,— гэта боязь трапіць у лік кандыдатаў на пасаду старасты. «Толькі не мяне», «толькі не мяне»,— можна было прачытаць у вачах нават самых бойкіх і адважных.

— Наша газета крытыкавала вучком,— бадзёра казаў рэдактар.— У нас сумна, кожны жыве сам па сабе. А хто ўспомніць хоць адзін цікавы збор, экскурсію? Хадзілі адзін раз на ферму і што ўбачылі? Пра гэта лепш у Стася Чыжыка запытаць, як ён бугая раздражніў, а потым усе ўцёкамі ратаваліся.

У класе пачулася ажыўленне. Але Пеця рашуча працягваў:

— Я лічу, што ў першую чаргу вінавата староста Зоя Сцешанок. Мы памыліліся, выбіраючы яе летась. Яна нават не падтрымала мяне, калі я прапанаваў правесці конкурс газеты на лепшы гумарыстычны твор. Сказала, што ў нас няма гумарыстаў.

— А хіба ёсць? — ехідна спытаў Стась Чыжык.

Мялешка нават вокам не міргнуў, мабыць, да свайго выступлення ён падрыхтаваўся загадзя.

— Хто ў нас мае даручэнні? — пытаннем на пытанне адказаў рэдактар.— Бяздзейнічала староста, бяздзейнічаў і клас. Вось мы заўсёды хвалім нашага выдатніка Андрэя Кахуту...

Над маёй галавой нібы пярун стрэліў: я гатовы быў знікнуць, як невідзімка, толькі б не чуць Мялешку. Ён жа калі возьмецца за каго, дык не чакай літасці. Страх, які прынцыповы... Нездарма яму заўсёды давяраюць судзіць сустрэчы КВЗ. Мялешка ніколі не падкіне лішняе ачко «ні вашым, ні нашым...». Ды хіба мне ад гэтага лягчэй?

— Андрэй толькі пра свае пяцёркі і думае.— Мялешка, здаецца, зусім расхваляваўся.— Яго да класных спраў і на ланцугу не зацягнеш.

У класе зноў засмяяліся. І як не пазабавіцца, калі на мяне ўпершыню крытыку наводзяць. Гэта далёка не тое, што чуць словы: «гонар класа», «бярыце прыклад».

Я ўбачыў, што гэтага моманту чакаў не адзін Мялешка. Клас заварушыўся, загудзеў у прадчуванні вясёлага і пацешнага.

Тут на маю бяду класны кіраўнік Юлія Паўлаўна выйшла з класа, і рэдактар паспяшаўся давяршыць разгром.

— Успомніце, як Андрэю даручылі кіраваць аперацыяй па збору макулатуры. А ён адмовіўся. І так заўсёды, нават заметку ў газету ні разу не напісаў.

— Ён жа наша гордасць! — сказаў член рэдкалегіі Косця Селівончык, сябрук Мялешкі.—Мы яго павінны на руках насіць, засцерагаць ад лішніх хваляванняў.

Я раптам адчуў, што майму маўчанню надыходзіць канец. І як можна слухаць Мялешку з Селівончыкам?

— Самі вы што зрабілі для класа? — Я ўскочыў з-за парты, нібы мяне хто сілком за каўнер падняў.— Газету толькі да святаў выпускаеце. А з макулатурай мне не было калі займацца, мама хварэла... Што ў нашым класе нецікава, мы ўсе вінаваты. Нечага звальваць віну на вучком і старасту.— Я не мог спыніцца, быццам ганшчык, які выйшаў на фінішную прамую. Нават не замоўк тады, калі ў клас вярнулася Юлія Паўлаўна.— Перш чым іншых сароміць, трэба на самога сябе паглядзець.

— Правільна,— падтрымала мяне класны кіраўнік.— З гэтага трэба і пачынаць. Толькі каго мы выберам старастам?

У класе ўсталявалася насцярожаная цішыня. Наступіў самы адказны момант: каго? Папраўдзе, я над гэтым зусім не задумваўся, бо для мяне было ўсё роўна, хто зойме месца Зойкі Сцешанок...

І раптам пачуўся голас Пеці Мялешкі:

— Я прапаную кандыдатуру Андрэя Кахуты.

— Ён жа выдатнік і вунь як умее выступаць,— згадзіўся з сябрам Косця Селівончык.

Далей усё адбывалася як у кіно: аднадушнае галасаванне, віншаванні, пажаданні. І вось я — стараста шостага класа «А».

Ноччу мне прысніўся сон: як Мялешка з Селівончыкам з мяне пацяшаліся.

Спачатку яны выпусцілі экстранны нумар «Смех, дый годзе», дзе прапясочвалі мяне на ўсіх чатырох калонках. Наш мастак Света Кароўчанка ўпрыгожыла газету вельмі пацешнай карыкатурай: я запрогся ў калёсы, якія асядлалі мае аднакласнікі, і на карачках спрабаваў скрануць воз з месца... Убачыўшы такую насмешку, я адразу ж кінуўся

да газеты, каб зняць яе са сцяны. Але мяне спыніў дырэктар школы — і я прачнуўся.

Потым я ніяк не мог заснуць, баяўся, што Мялешка з Селівончыкам яшчэ што-небудзь прыдумаюць...

Можаце ўявіць мой выгляд, калі я назаўтра раніцай прыйшоў у школу. Аб многіх несправядлівасцях перадумаў я, падыходзячы да дзвярэй свайго класа.

У калідоры я не заўважыў ні аднаго аднакласніка, а раней жа толькі званок заганяў іх у клас. І гэта адкрыццё яшчэ больш занепакоіла мяне. Азірнуўшыся, я ўзяўся за бліскучую ручку і асцярожна пацягнуў дзверы да сябе, нібы мне трэба было трапіць у падзямелле з хітрай сістэмай міравання.

Усе сядзелі за партамі ціха і смірна, быццам іх збіраліся здымаць у чацвёртай серыі «Няўлоўных мсціўцаў». Як толькі я пераступіў парог, пачулася гучнае:

— Са-лл-ют, ста-ра-ста!

Я няўклюдна крутнуўся ля дзвярэй туды-сюды, але неяк адужаў разгубленасць і пайшоў да свайго месца. Там мяне чакаў яшчэ адзін сюрпрыз: на маёй парце ў шкляным слоіку стаяў букет жоўтых бухматых вяргіняў, а побач ляжаў шырокі аркуш белай паперы са словам «Віншуем!».

З усіх бакоў зляталіся воклічы:

— Слава нашаму старасту!

— Ты наш важак!

Нават цюхцяяваты Лёнік Баркоў натхнёна падтрымаў усеагульны ўздым сваім пісклявым галаскам:

— Мы верым табе...

А на класнай дошцы хтосьці вывеў крэйдай вялікія літары: «Няхай жыве наш староста!»

Гэта ўжо было занадта. У маёй душы імкліва нарастаў пратэст супраць зласлівай змовы, супраць шумнага «цыркавога» прадстаўлення. І калі я спачатку не ведаў, што рабіць, як асіліць сваю сарамлівасць, то цяпер мала-памалу супакойваўся. Я зразумеў, што нельга здавацца без бою, нельга, каб мае праціўнікі святкавалі перамогу. А ў тым, што ўсю гэтую камедыю з віншаваннем прыдумалі Мялешка з Селівончыкам, я чамусьці не сумняваўся...

«Ну што ж, паглядзім, хто каго?» — Я рашуча падняўся з-за парты і выйшаў да настаўніцкага стала.

Аднакласнікі прыціхлі і з расчуленай замілаванасцю ўтаропіліся на мяне.

— Дзякую за кветкі,— сказаў я,— і за віншаванні таксама. Можна было абысціся і без выкрыкаў, я не на Марс злятаў.

Мой незалежны і жартаўлівы настрой здзівіў усіх не менш, чым гэта зрабіла б з'яўленне ў класе Юрыя Нікуліна. Яны разлічвалі на маю разгубленасць, каб насмяяцца ўволю, але я працягваў наступаць.

— За чысцінёй дошкі павінен сачыць дзяжурны.— Я паказаў рукой за сваю спіну.— Сёння застанемся пасля ўрокаў і абмяркуем нашы справы.

— О-го! — не вытрымаў Мялешка.— І мы яшчэ сумняваліся, каго выбіраць?!

— Каму не падабаецца, гаварыце адкрыта, я слухаю. Здаецца, у цябе, Пеця, ёсць што сказаць?

— Ды не-е-е,— я ўпершыню бачыў Мялешку такім памяркоўным.— Я як усе...

— Тады не будзем час марнаваць, хутка званок.— Я вярнуўся да сваёй парты і ўзяў слоік з вяргінямі.— Кветкі паставім на стол, Марыя Аляксандраўна будзе задаволена.

Клас адабральна загудзеў, насмешлівая насцярожанасць знікла, растаяла. І я з радасцю адчуў, што самае небяспечнае засталося ў мінулым, што да мяне прыйшла першая і, бадай, самая важная перамога...

## Урок другі:

## НУ, ПАЧАКАЙ...

На вялікім перапынку я знайшоў у сваім дзённіку запіску. Аўтар пажадаў застацца невядомым і напісаў словы друкаванымі літарамі:

«Будзь напагатове. Супраць цябе рыхтуецца змова. Сёння табе давядзецца вытрымаць першы бой. Не давярай Сцешанок. Трымайся, староста! Твой сябар. Наш пароль: ну, пачакай, заяц!»

Я перачытаў запіску яшчэ раз і асцярожна азірнуўся, але не сустрэў ніводнага падазронага позірку. Аднакласнікам было не да маёй нечаканай трывогі, што раптоўна завалодала маімі думкамі.

Я схаваў запіску ў кішэню і выскачыў у калідор.

Якая змова? Чаму не давяраць Сцешанок? Хто мой сябар? Вось пытанні, што паўсталі перада мной, быццам тры незнаёмцы на цёмнай і вузкай сцежцы. І не абмінуць іх, і не павярнуць назад.

Стаю я ў калідоры, ля фотавітрыны «Нашы выдатнікі», у нерашучасці з нагі на нагу пераступаю. На вітрыну ніякай увагі не звяртаю. Самі разумееце, не да яе цяпер,

калі змова рыхтуецца, калі ў такой сітуацыі апынуўся.

І тут за спіной чую яхідны голас Косці Селівончыка, нашага школьнага гумарыста. А гумарыстам ён стаў не столькі з-за ўмення жартаваць, колькі з-за сваёй фізіяноміі. Яна ў яго занадта пацешная, варта толькі зірнуць на яе, і ўжо міжволі ўсміхнешся. Бачылі ў кіно артыста Савелія Крамарава? Ён заўсёды ў нейкіх смешных ролях выступае. Твар такі прадаўгаваты, зіркаты, і рот заўсёды мух ловіць. Дык наш Селівончык... чыстая копія кінаартыста, дакладней, Косця як дзве кроплі вады падобны на героя ў Крамарава. Таму за Селівончыкам мянушка «Камар» прыліпла.

А можа, ён і ёсць адзін са змоўшчыкаў, пра якіх напісаў невядомы сябар?

Селівончык адразу ж пачаў салаўём залівацца, туман напускаць.

— Сваім партрэцікам любуешся? Ага, ну-ну...— і Селівончыкавы губы распаўзліся ў задаволенай усмешцы.— Ты тут нішто сабе, сімпатычны хлопчык... Такія дзяўчатам падабаюцца. Ведаю, адна па табе вунь як сохне...

Селівончык стараецца, аж са скуры вылузваецца, свае дурнаватыя жартачкі падпускае, бо побач разявакаў ужо цэлы натоўп сабраўся, і Мялешка тут як тут. На чырванашчокім твары рэдактара — сама задаволенасць прыгрэлася, ён замілавана глядзіць на свайго вернага сябрука Косцю Селівончыка.

Я раблю выгляд, што Селівончыкава лухта для мяне нуль без палачкі, што горшага глупства сто гадоў ніхто не бачыў, і наконт дзяўчынак выдумка несусветная. Толькі, мабыць, каб з гонарам выстаяць перад нахабствам, мала адной непрыступнасці. Адным словам, трэба ўмець пастаяць за сябе. А вось гэтага ўмення ў мяне і не аказалася. Пакуль я адшукваў найбольш простыя варыянты свайго выратавання, запал гумару ў Селівончыка знік, нібы паветра з футбольнага мяча, які пасля моцнага ўдару футбаліста напароўся на востры цвік. Але Косця не думаў адступацца, ён бачыў маю збянтэжанасць, і гэтая акалічнасць яшчэ больш будзіла яго не зусім дасціпную фантазію.

— Вось каму шанцуе! — тэатральна ўздыхнуў Селівончык.— І на дошку гонару трапляюць, і ў начальства іх выбіраюць, і сярод дзяўчынак яны на першым месцы.

— Зайздросна? — падкінуў сухой саломы ў агонь Мялешка.— Можа, таксама ў перадавікі захацелася?

— Ну, скажаш: хіба я на такое здольны? Тут патрэбны талент, як у нашага Андрэя. Шкада толькі, што ў яго ёсць адзін мінус.

— Які мінус? — у Мялешкавым голасе прагучала фальшывае здзіўленне.— Ты падумаў, што гаворыш? Хто табе дазволіў розныя выдумкі напускаць?

— Але ж гэта не выдумка,— рашуча запярэчыў рэдактару школьны гумарыст.— Тут чыстай вады праўда... Наш Андрэйка — самы баязлівы ў атрадзе, ну нібы той заяц, якому воўк на хвост наступіў.

— Адкуль ты ўзяў? — Мялешка так і загарэўся раптоўнай цікаўнасцю.

А на мяне нібы гіпноз дзейнічаў. Я стаяў пасярод натоўпу, які весела смакаваў кожны дасціпны жарт маіх праціўнікаў, і не абараняўся.

— Яму хто хоча можа кухталя даць, а ён і не пакрыўдзіцца,— Селівончык дзейнічаў з халодным разлікам.

— Так ужо і кожны?

— Не верыш? Ды я яго сам зараз стукну.— Камар зрабіў ваяўнічы выгляд і ўшчыльную наблізіўся да мяне.

Натоўп заціх, кола вакол нас пашырэла. Такую сцэну і ў кіно не заўсёды ўбачыш, а тут бясплатнае прадстаўленне з удзелам вядомага школьнага гумарыста.

— Ну-у,— Селівончык сціснуў кулакі і прыняў стойку баксёра.— Абараняйся, пяцёрачнік!

Але я і на гэты раз не паддаўся на правакацыю. Я нават усміхнуўся і зняважліва паглядзеў на Селівончыка. Мая абыякавасць вывела яго з раўнавагі. Ён злосна выскаліўся і ўзмахнуў кулаком у паветры, ля самага майго носа. Балельшчыкі задаволена загудзелі, толькі Мялешка раптам сур'ёзна зазначыў:

— Ты, Косцік, падалікатней з Андрэйкам, а то яшчэ пакрыўдзіш старасту. Пажартаваў — і хопіць.

Але Селівончык, здаецца, не пачуў сяброўскай перасцярогі.

— Я яго злёгку стукну, каб нос не задзіраў,— памяркоўна сказаў Селівончык і зноў узмахнуў кулаком.

І тут я ўбачыў Люсю Савіцкую, старасту 6 «Б». Яна стаяла непадалёку і назірала за маёй ганьбай.

Люська ўчора павіншавала мяне з «высокай пасадай» і пажадала вывесці клас у перадавікі. Маўляў, пара і нам заваяваць званне правафлангового.

І вось сутычка з Селівончыкам... Калі б зямля расступілася ў гэты момант пад маімі нагамі, я з радасцю скочыў бы ў бездань. Ды лепш на свеце не жыць, чым выслухоўваць новыя спачуванні Савіцкай. А яна на іх здатная, заўсёды падловіць момант. Як-ніяк, мы — суседзі, цераз дарогу жывём.

Біцца я не ўмеў. І не таму, што такі ўжо нясмелы,— гэта ўсё Селівончык выдумаў. А хіба храбры той, хто лезе да кожнага сустрэчнага з кулакамі?

Селівончык спрытна ўхіліўся ад майго ўдару, і я прамазаў. Натоўп ад захаплення войкнуў. Я ўзмахнуў левай рукой — і зноў міма.

Больш камічнай сітуацыі нельга і ўявіць. Толькі цяпер я ўспомніў, што старэйшы брат Селівончыка займаецца боксам у фізкультурным інстытуце. Ён і навучыў гумарыста розным там баксёрскім хітрыкам, якія мне даводзілася бачыць толькі па тэлевізары. Нават васьмікласнікі лічылі за лепшае не задзірацца з Селівончыкам.

Я ўсё ж неяк злаўчыўся, схапіў Селівончыка загрудкі, і мы пачалі валтузіцца. Мы стаялі, уткнуўшыся адзін у аднаго лбамі, не раўнуючы як тыя бадлівыя казлы, і не маглі зрушыцца ні туды ні сюды.

— Хлопцы, кіньце дурэць! Косцік, ты што? — я пачуў за спіной узрушаны голас рэдактара, які тут жа разгублена папярхнуўся.

Адчуўшы нядобрае, мы з Селівончыкам адскочылі ў розныя бакі, нібы нас заспелі на месцы злачынства. Побач стаяў Іван Данілавіч, наш дырэктар. Балельшчыкаў быццам віхор выдзьмуў з калідора. Акрамя мяне, Мялешкі і Селівончыка засталася толькі Люся Савіцкая.

— Што тут у вас за спаборніцтвы? — акінуўшы падазроным позіркам мяне і Селівончыка, спытаў Іван Данілавіч.

— Гэта Андрэй з Косцікам вырашылі памерыцца сіламі,— адразу ж знайшоўся Мялешка.

— І толькі?

— Ага,— зноў адказаў рэдактар.

— Праўда, Андрэй?

— Праўда,— зманіў я.

А хіба я мог сказаць інакш? Паскардзіцца, што Селівончык мяне перад усімі на пасмешышча выставіў, што махаў кулакамі ля носа і гаварыў розныя крыўдныя словы?.. Калі разважыць, то я павінен наябеднічаць на гумарыста, так? Гэта ў прысутнасці Савіцкай!

— Ну што ж, Андрэй, табе я веру,— не зусім упэўнена сказаў Іван Данілавіч.— Вось толькі чаму балельшчыкі так хутка зніклі?

— Не ведаю,— я паціснуў плячыма, стараючыся не глядзець дырэктару ў вочы.

— Мабыць, пабеглі да ўрока рыхтавацца,— заўважыла Савіцкая.

— Сапраўды, як гэта я не дадумаўся! — павесялеў Іван Данілавіч і павярнуўся да Селівончыка: — Дык хто з вас дужэйшы?

— У іх нічыя,— адказаў Мялешка за гумарыста, які ўсё яшчэ разгублена плюскаў бялявымі вейкамі.

— Нічыя? А гэта вы правільна: нягожа свайго старасту абыгрываць.

— Яны Андрэя паважаюць,— зноў азвалася Савіцкая.— Гатовы за ім у агонь і ваду...

Я быў сам не свой, што Івану Данілавічу зманіў, але ж слова не верабей...

— Гэта добра, што паважаюць,— Іван Данілавіч дакрануўся рукой да пляча Селівончыка.— Без павагі нельга.

З невясёлым настроем ішоў я на ўрок пасля вялікага перапынку. Не развесяліла мяне і тое, што маё запрашэнне на наш сход Іван Данілавіч сустрэў з прыязнай усмешкай. Бо ён адразу ж паведаміў, што сам меркаваў пагаварыць з намі наконт важных пытанняў. Вядома, пад «важнымі пытаннямі» дырэктар меў на ўвазе далёка не гераічныя заслугі 6 «А»...

А тут яшчэ Савіцкая дагнала мяне ля дзвярэй класа і з замілаванасцю прашчабятала:

— Ты, Андрэйка, малайчына!.. Аўтарытэт заваёўваеш. Не выдаў свайго баксёра. Інакш яму здорава б уляцела. Яго ж на мінулым тыдні на вучкоме разбіралі. Бацьку хацелі выклікаць, дык Селівончык са слязьмі абяцаў больш нікому не паказваць свае баксёрскія прыёмы...

Я нічога не адказаў Люсьцы і зачыніў дзверы перад самым яе носам. Яшчэ хвіліна — і я не вытрымаў бы і стукнуў гэтую Савіцкую за шантаж... Падумаеш, навіну расказала. Ды я пра Селівончыкавы слёзы не першы раз чую. А можа, і Люська заадно з Мялешкам і Селівончыкам?

## Урок трэці:

## «Я Ў СТАНЕ ВОРАГА...»

Я забыўся пра таямнічую запіску і раптам на ўроку англійскай мовы ў сваёй парце знайшоў папяровы караблік. Я асцярожна разгарнуў яго і ўбачыў той жа мудрагелісты почырк.

«Я ў стане ворага. Вяду разведку. Рыхтуецца новая правакацыя. Першы бой ты вытрымаў выдатна. Будзь асцярожны. Чакай новых данясенняў. Твой сябар».

А ў правым ніжнім ражку была намалявана разяўленая

зяпа ваўка, з якой вылятаалі словы «ну пачакай заяц»,— толькі на гэты раз без косак і клічніка.

Я зрабіў выгляд, што запіска мяне зусім не зацікавіла. Непрыкметна апусціў папяровы караблік у правую кішэню пінжака, нават мой сусед Стась Чыжык не заўважыў.

Хто ён, засакрэчаны сябар? Чаму хаваецца, не называе свайго імя? І што за бой я вытрымаў? Няўжо гэта сутычка з Селівончыкам?

І чым больш я думаў пра запіску, тым большая крыўда выспявала ў маёй душы супраць яе аўтара. А хіба будзеш гаварыць пра яго добрае слова? Шчыра кажучы, у мяне ў гэты момант было менш злосці на Мялешку з Селівончыкам, чым на сябра-самазванца. Маўчаў бы лепш і не лез са сваёй «разведкай»... Ды якая мне карысць ад яго паведамлення аб «правакацыі», калі я ўсё роўна не ведаю: хто яе рыхтуе, дзе і калі сустракаць новую вылазку маіх праціўнікаў...

На апошнім перапынку ў нашым класе надарылася непрадбачанае: у Зойкі Сцешанок знікла з партфеля замежная чатырохколерная шарыкавая ручка, якую ёй падарыў брат-марак.

Спачатку Зойка падумала, што нехта пажартаваў, і калі ў класе ўсе сабраліся перад пачаткам урока, яна спакойна спытала:

— У каго мая ручка? Зараз будзе кантрольны дыктант, і мне няма чым пісаць.

— Я магу пазычыць сваю, запасную,— першы адклікнуўся Селівончык.

— Мне чужая не трэба, я прывыкла пісаць сваёй,— адказала Зойка, азіраючыся.

— Хто ўзяў ручку Зойкі? — Я паспяшаўся падтрымаць былога старасту.

Усе пераглядваліся, усміхаліся, знікненне ручкі нікога не ўстрывожыла. Вядома, хтосьці пажартаваў. Было б з-за чаго перажываць...

Вось-вось павінна была зайсці ў клас настаўніца беларускай мовы і літаратуры Лідзія Сямёнаўна, але жартаўнік не аб'яўляўся.

А калі Зойка кінулася на сваю парту і заплакала, усе раптам убачылі, што ў класе надарылася бяда. Нават Селівончык маўчаў, палічыўшы за лепшае не выхваляцца сваімі гумарыстычнымі здольнасцямі. У пакоі ўсталявалася няёмкая цішыня. І тут я зразумеў, што знікненне шарыкавай ручкі ні больш ні менш як правакацыя. Няўжо гэта

зноў пастараліся Мялешка з Селівончыкам? Толькі паспрабуй даказаць іх вінаватасць...

Сцешанок так расхвалявалася, што не перастала плакаць нават тады, калі ў клас зайшла Лідзія Сямёнаўна. Настаўніца ўважліва выслухала дзяжурнага Колю Шпака і спакойным голасам сказала:

— Я ўпэўнена, што ручка знойдзецца. Я зусім не дапускаю думкі, што сярод нас могуць быць несумленныя людзі. А пакуль, Зоя, вазьмі маю ручку, будзем пісаць дыктант...

Я сядзеў на ўроку сам не свой. Мабыць, у кантрольным дыктанце прапусціў не менш дзесяці памылак. Але мне было не да іх. Я думаў толькі пра адно: як выкрыць праваатара, дзе Зойчына ручка? Гэта ж ганьба ўсяму класу, ну і, вядома, мне, старасту...

Як разматаць хітры клубок з прапажай ручкі? Дзе яна, тая нітачка, што выручыць мяне і наш клас? А можа, я дарэмна панікую, можа, гэта чатырохколерная ручка сама куды-небудзь закацілася, і трэба толькі добра пашукаць...

Іван Данілавіч, выслухаўшы нашу навіну, пасур'ёзнеў, яго густыя чорныя бровы збегліся да пераносся, вочы глядзелі строга і дакорліва. Вось вам і размова аб важных пытаннях, і за фактамі хадзіць далёка не давядзецца.

— Хто ўзяў ручку? Так, так... узяў. Рэч прыгожая, нічога не скажаш... Толькі атрымліваецца такая непрыемнасць. Ручку ўзяў хтосьці адзін, можа, яшчэ дружку на вушка шапнуў, пахваліўся сваёй спрытнасцю і затаіўся... А цяпер адказ павінен трымаць клас. Як кажуць, за аднаго ўсе... Дык што будзем рабіць?

— Чаму ўсе? — першым адважыўся адказаць на пытанне Мялешка.— Ручка знікла на перапынку, а дзяжурным сёння быў Коля Шпак. Хай ён і скажа, што бачыў.

Коля так і загарэўся чырванню, быццам яго самога абвінавацілі ў прапажы. Колева танклявая постаць застыла над партай нямым пытальнікам.

— Не ведаю,— разгублена выціснуў ён.— Я на перапынку хадзіў у бібліятэку.

— Знайшоў час,— буркнуў Селівончык.

— Вы дарма на Колю нападаеце,— заступіўся за Шпака Іван Данілавіч.— Дзяжурны — не вартаўнік, які за знікненне ручкі павінен адказваць.

— Давайце праверым усе партфелі,— раптам прапанаваў Стась Чыжык.

— Вобыск? — здзівіўся Іван Данілавіч.— І хто ў нас

сышчыкам стане? Як ты думаеш, стараста?

Цяпер, мабыць, у мяне быў выгляд не лепшы, чым у Колі Шпака. Ну і задачка! Паспрабуй тут правільна яе рашыць. Згадзіцца са Стасем? Падазраваць у знікненні ручкі ўвесь клас, у тым ліку і самога сябе? Не, тут трэба выбраць іншы варыянт, інакш гонар класа не выратаваць.

— Я не згодны з прапановай Стася. Той, хто гэта зрабіў, павінен знайсці ў сабе смеласць і аддаць ручку Зойцы.

— Будзем шукаць смеласць,— заявіў наш гумарыст.

— І смеласць, і сумленне,— сказаў Іван Данілавіч.— А вобыск — самая апошняя справа...

У класе ўсталявалася насцярожаная цішыня, быццам мы нечакана апынуліся ў падземным царстве нематы і глухаты.

— Та-ак, а я толькі збіраўся гаварыць з вамі пра сур'ёзныя рэчы,— Іван Данілавіч стаяў спіной да шостага «А» і глядзеў у акно.— Што ж... памылка атрымалася. Бачу, сёння ў нас размовы не будзе,— Іван Данілавіч падышоў да настаўніцкага стала і яшчэ раз акінуў дакорлівым позіркам клас.— Дзіўна ўсё гэта і сумна... Шкада, але мне давядзецца адмовіцца ад свайго перакanання, што здарэнне з ручкай — бяскрыўдны жарт. Сумна ўдвая: ваш аднакласнік разам са смеласцю згубіў сваё сумленне. Я не буду праводзіць следства, спадзяюся, што заўтра раніцой ручка вернецца да Зойкі. А цяпер можаце быць свабоднымі,— з гэтымі словамі Іван Данілавіч выйшаў у калідор.

Такі наш дырэктар заўсёды. Ды лепш бы ён накрычаў, чым вось так «можаце быць свабоднымі» — нібы мы самыя апошнія нягоднікі, з якімі і гаварыць няма пра што...

З-за партаў ніхто не падняўся, усе сядзелі і пазіралі адзін на аднаго і чагосьці чакалі. Нават Мялешка з Селівончыкам не кінуліся на злом галавы да дзвярэй.

— Што будзем рабіць? — маё пытанне прагучала ціха і няўпэўнена.— Няўжо мы не выратуем наш клас ад ганьбы?

— Як збіраешся ратаваць? — Мялешка прыжмурыўся.— Чаму адмовіўся ад прапановы Стася?

— А ты чуў, што сказаў Іван Данілавіч? Каму патрэбны твой вобыск? — я зразумеў, што зараз давядзецца вытрымаць нялёгкі бой.

— Каму? Пра гэта запытай лепш у Зойкі. Бачыш, як яна перажывае.

— Мне не ручку шкада,— азвалася Зойка.— Гэта ж падарунак.

Яна гатова была заплакаць зноў.

— Тады праверым партфелі і сумкі,— рашуча заявіў Селівончык.— Хто «за»... прашу прагаласаваць.

Прагаласавалі ўсе, акрамя мяне і Зойкі. Збаяліся Селівончыка, слабакі. Трэба было падняцца і пакінуць клас, але я чамусьці ўстрымаўся. Не, я не мог адступіць з поля бою, бо Мялешка з Селівончыкам толькі і чакаюць гэтага моманту. Тады хоць у школу не з'яўляйся і на вочы Люські Савіцкай не паказвайся...

«Ну, пачакай, заяц!» — мне ўспомнілася запіска, але тут жа давялося забыцца пра яе, бо пачынаўся вобыск.

Мялешка ўзначаліў «камісію» па расследаванню, у якую ўвайшлі Косця Селівончык, Стась Чыжык і Света Прышчык. Я апынуўся, як кажуць футбалісты, па-за гульнёй. Ініцыятыва поўнасцю перайшла ў рукі маіх праціўнікаў, а мне засталася незайздросная роля пабочнага назіральніка.

Асабліва стараліся Селівончык з Чыжыкам: перsuccessfulтрасалі кожны партфель, сумку, заглядвалі ў парты, нават падручнікі перагортвалі, але замежная ручка не знаходзілася.

— Так нас і будуць чакаць,— усміхнулася Света Прышчык, сочачы за беспаспяховымі пошукамі Косці і Стася.— Ды яе маглі не толькі ў класе схаваць.

— Але ж маглі і не паспець,— сказаў Чыжык.— Вось і паглядзім, і праверым, і на чыстую ваду выведзем...

«Камісія» набліжалася да маёй парты. Я сядзеў у нейкім незразумелым здранцвенні, нібы галоўным віноўнікам знікнення ручкі Зойкі Сцешанок быў сам і ніхто іншы. Невясёлыя думкі камарыным роем віліся нада мной: «Дрэнь твае справы, стараста. Збіраўся пагаварыць аб нашых справах, прыняў выклік Люські Савіцкай, а тут вунь якая гісторыя. Мялешка з Селівончыкам наладзілі вобыск, і ты, стараста, нават не паспрабаваў запярэчыць сваім праціўнікам. Усе згадзіліся з імі, а не з табой...»

Калі «камісія» апынулася ля мяне і Селівончык працягнуў руку за маёй сумкай, Мялешка спыніў яго.

— Пачакай, хіба можна не давяраць старасту,— разважліва сказаў ён.— Мы за Андрэя галасавалі, выбіралі ў важакі... А яшчэ сумняваешся ў яго сумленнасці?

— Вось праверым і не будзем сумнявацца,— адказаў гумарыст.

— Ты лепш самога сябе правер,— не вытрымаў я.

— Не хвалюйся, Стась і Света глядзелі маю сумку,— Селівончык трымаўся героем.— І чаму цябе так непакоіць наша праверка?

— Табе гэтага ўсё роўна не зразумець,— я вытрымаў калючы позірк гумарыста.

— Вядома, куды мне з пяцёрачнікам раўняцца,— Селівончык зрабіў камічную грымасу, і ў класе пырснулі смехам.

Толькі, мабыць, мне і Зойцы было не да вясёлага настрою. Я ўжо шкадаваў, што застаўся ў класе, а не пайшоў за Іванам Данілавічам.

Я быў абяззброены і не мог абараняцца. Ды і што ім дакажаш, чым пераканаеш? Селівончык перад Мялешкам вунь як выслужваецца, сваімі гумарыстычнымі здольнасцямі выхваляецца. А хіба рэдактар супраць таго, каб у маёй парце вобыск рабілі?

— Калі стараста не згодны, мы не маем права глядзець яго сумку,— сказаў Мялешка.— Нельга не паважаць аўтарытэт камандзіра.

— Аўтарытэт — галоўнае! — падтрымаў рэдактара гумарыст.— Без яго быццам без ног: ні туды і ні сюды... Андрэйка ў нас — галава! Вось толькі куды знікла гэтая ручка?

— Давайце зноў прагаласуем,— прапанаваў Стась Чыжык.

— Пайшлі дамоў,— папрасіў Коля Шпак.— Усё роўна не знойдзем ручку.

— Чаму пайшлі?! — не адступаўся Селівончык.— Яшчэ не ўсюды паглядзелі.

— Не трэба, Касцік, мы і сапраўды заседзеліся,— Мялешка перапыніў сябрука.— А яшчэ раз галасаваць — лішняе. Ды і ці толькі ў сумцы можна схаваць ручку?

Мялешкавы словы здаліся мне новымі кпінамі, і я не вытрымаў:

— Вось мая сумка, глядзіце, нюхайце!

— Дзівак, Андрэй, дарма злуешся. Ці ты жартаў не разумееш,— Мялешка паціснуў плячыма.

— Не крыўдуй на нас,— гумарыст адразу ж схапіў маю сумку.

Ён спрытна перакуліў сумку ўверх дном, і на парту разам з падручнікамі і сшыткамі выскачыла чатырохкалерная замежная ручка Зойкі Сцешанок. Спачатку не паверыў сваім вачам, але гэта не быў падман, гэта быў не сон...

Клас войкнуў ад здзіўлення і нечаканасці. Я адчуў, як мой твар заліўся пякучай чырванню, як мной авалодала раптоўная разгубленасць...

Са здранцвення мяне вывеў дрыготкі голас рэдактара:

— Ну вось... Гонар класа выратаваны...

— А яшчэ аб сумленні гаварыў! — Селівончык чамусьці не смяяўся.

— Няпраўда, я не браў ручку! — нарэшце я перасіліў сваю разгубленасць.

— Вядома, не браў. Хіба ты на такое здатны,— Мялешка, здаецца, на гэты раз не кпіў.— Хто прыдумаў такі неразумны жарт? Хто?

Маўчалі аднакласнікі, маўчаў і я. Трэба было апраўдвацца, штосьці казаць... Толькі што? Паскардзіцца на Мялешку і Селівончыка, выказаць ім усю праўду? Але хто паверыць у мае здагадкі? У мяне ж няма ніводнага факта, які можа пацвердзіць маю крыўду на рэдактара і нашага гумарыста. Сутычка ў калідоры, пісьмы «невядомага сябра»... Хіба гэта доказ?

Я ўзяў сумку з падручнікамі і накіраваўся да дзвярэй. Іншага выйсця ў мяне не было.

— А яшчэ стараста,— пачуўся за маёй спіной голас Стася Чыжыка.— На чужую ручку пакваліўся.

— А можа, Андрэй і не вінаваты? — упершыню ўсумніўся і Селівончык.

— Та-а-к, загадка,— згадзіўся з сябруком Мялешка.

Больш я нічога не чуў і выскачыў са школы, нават не зашпіліўшы куртку, быццам мяне дапёк пчаліны рой.

## Урок чацвёрты:

## ЦІ ДОБРА ТОЕ, ШТО ДОБРА КАНЧАЕЦЦА?

Дома я не знаходзіў сабе месца. Выпадак з чатырохколернай ручкай Зойкі Сцешанок не даваў мне спакою. І чым больш я разважаў, тым бліжэй прыходзіў да думкі, што мне не пазбегнуць новых непрыемнасцей. Ды і як ад іх выратуешся, калі ў маёй сумцы знайшлі прапажу. Паспрабуй цяпер даказаць, што гэта ўсё хітрыкі Мялешкі з Селівончыкам. І хто паверыць? Шчыра кажучы, цяпер я і сам гатоў быў засумнявацца ў сваіх падазрэннях...

Што рабіць? Хоць ты ў школу заўтра не з'яўляйся. А куды дзенешся, дзе знойдзеш прытулак ад спачувальных пытанняў Люсі Савіцкай?

Раптам на двары пачуліся галасы. Я глянуў у акно, і сэрца маё трывожна ёкнула. Першай, каго я ўбачыў, была Зойка Сцешанок. За ёй ішлі Света Прышчык і Коля Шпак, якога ў нас празвалі «Дэтэктывам».

Больш цікаўнага хлопца, чым Коля Шпак, не знойдзеш

нават за тысячу кіламетраў ад нашай вёскі Мілавіды. Ён праславіўся ў школе сваёй цікаўнасцю да прыгодніцкіх кніжак. А ў вучком Колю выбралі хутчэй за ўсё таму, што ён умеў фатаграфаваць...

«Чаго гэта яны?» — Я хуценька кінуўся да этажэркі, схапіў кнігу «Гіпербалоід інжынера Гарына», заваліўся на канапу і зрабіў выгляд, што ад чытання і за вушы не адцягнеш.

— Андрэй, мы да цябе.

Яны ў нерашучасці спыніліся ля парога, не адважваючыся прайсці далей.

— Вой, прабачце! — усміхнуўся я.— Так зачытаўся, што і не пачуў, як вы зайшлі. Вельмі цікавая кніжка. Фантастыка.

— Мы тваю маму ля магазіна бачылі, яна сказала, што ты дома,— паведаміў Коля Шпак.

— Праходзьце, сядайце.

Я падняўся з канапы, стараючыся трымацца проста і незалежна, нібы гадзіну назад у нашым класе нічога не здарылася: не было ніякай прапажы, не было маіх ганебных уцёкаў.

Але яны засталіся стаяць ля парога, толькі Зойка ступіла крок-другі наперад.

— Мы па даручэнні класа,— сказала Зойка, і на яе круглым твары мільганула заклапочанасць.

— Даручэнне?

Я адразу ж надзьмуўся.

— Хочаце даведацца, як у маёй сумцы ручка апынулася? Допыт вырашылі наладзіць?

— Ніякі не допыт,— Зойка азірнулася на сваіх спадарожнікаў.— Мы ўпэўнены, што нехта пажартаваў з цябе і ты ні ў чым не вінаваты. Вось толькі каму спатрэбіўся такі жарт?

— У Мялешкі з Селівончыкам спытайце, яны вам дакладна адкажуць,— нявесела падказаў я.

— Спытаць-то спытаем, але чаму іменна ў іх? — усумнілася Света Прышчык.

— А ў каго? — у сваю чаргу запытаўся я.

— Вось давайце і абмяркуем, як будзем дзейнічаць,— сказала былы стараста.

Словы Зойкі неяк адразу растапілі маю непрыязнасць да нечаканага візіту членаў вучкома.

— Тут патрэбны дакладны разлік,— пачуўся разважлівы голас Колі Шпака, які ўсё яшчэ стаяў ля парога.— Вось каб сюды Шэрлака Холмса, ён хутка ўсё разведаў бы.

— Абыдземся і без твайго Шэрлака,— сказала Зойка.

— Холмс не такія заблытаныя гісторыі разгадваў,— Коля быццам і не пачуў Зойку, у яго галаве, здаецца, выспяваў нейкі план. Нарэшце Коля выйшаў на сярэдзіну пакоя.

Мы ўселіся на канапу і пачалі думаць, чакаючы, што скажа наш Дэтэктыў. Мабыць, упершыню я паглядаў з такой павагай на бледнаваты, з чорнай радзімай плямай ля правага вуха, твар Колі Шпака. Ён быў сур'ёзны і засяроджаны.

— Ты ўпэўнены, што гісторыю з ручкай прыдумалі Мялешка з Селівончыкам? — нарэшце Коля схамянуўся і ўтаропіў у мяне свой немігаючы позірк.

— Яны,— адказаў я.

— Чаму яны?

— А хто яшчэ будзе гэтым займацца? — спытаў я і пачаў расказваць пра ўсе свае падазрэнні: успомніў перавыбары, схватку ў калідоры, вобыск у класе. Праўда, я прамаўчаў пра дзве запіскі ад невядомага сябра.

— Та-ак,— задумліва сказаў Шпак,— ніякіх слядоў, ніякіх доказаў, адны... здагадкі. Застаецца аварыйны варыянт.

— Што? — здзівілася Зойка.

— Не спяшайся, даведаешся пасля,— Коля падняўся з канапы і з таямнічым выглядам закружыў вакол стала.

Такім задумлівым мне не даводзілася раней бачыць Шпака. Цяпер яназіраў за ім, стараючыся зразумець адно: няўжо ён усур'ёз збіраецца выкрыць хітрыкі Мялешкі з Селівончыкам? Непакоіў мяне і яго «аварыйны варыянт», але я не стаў дапытвацца.

— Пайшлі, трэба дзейнічаць,— нарэшце аб'явіў Шпак.

Мы выйшлі з хаты ў маўклівай пакорлівасці. Я замкнуў дзверы веранды, ключ схаваў за аканіцай і заспяшаўся з двара. Яны чакалі мяне ля веснічак. Надвячорак быў шэры і халаднаваты, стаяў адзін з нямногіх сухіх дзён непрыветлівай восені.

— Спачатку пойдзем да Селівончыка,— сказаў Коля.

Усе згодна прамаўчалі. І тут мой позірк спыніўся на сіняй паштовай скрынцы, што вісела на нашым плоце побач з веснічкамі. Праз круглыя дзірачкі скрынкі нешта бялелася. Я хуценька адшчапіў кручок, і з ніжняй адтуліны ў маю руку слізгануў самаробны, накшталт папяровага карабліка, канверцік. Я ледзьве не ўскрыкнуў,— канверцік уджаліў маю далонь, быццам распалены вугалёк. Я ўбачыў знаёмую разяўленую зяпу ваўка і ўсё тыя ж яхідныя тры

словы: «Ну, пачакай, заяц!» На гэты раз коскі і клічнік стаялі на сваіх месцах.

Я не паспеў схаваць пісьмо, як побач апынуўся Коля Шпак.

— Ад каго? — падазрона разглядваючы мяне, спытаў ён.

— Ад дзядзькі,— напускаючы абыякавасць, адказаў я.

— А твайго дзядзьку выпадкова не Фантамасам клічуць?

— Сам ты Фантамас,— цікаўнасць Шпака вывела мяне з раўнавагі.

— Я ж пажартаваў, не сярдуй,— Шпак хуценька адступіў убок, быццам я збіраўся адлупцаваць яго.— Прабач, але мне здалося, што пісьмо можа дапамагчы нам.

— Адкуль ты ўзяў? Ці не твой Шэрлак Холмс такую навіну прынёс?

— Не, не Шэрлак,— шматзначна сказаў Шпак і заспяшаўся да Зойкі і Светы, якія спыніліся воддаль, назіраючы за намі.

Я таксама пайшоў за Шпаком, а ў кішэні штаноў ляжала пісьмо, на якім была намалявана разяўленая зяпа ваўка. Што ў ім напісана? Аб чым паведамляе скрытны сябар? Мне так і карцела прачытаць таямнічае пасланне. Але перашкаджаў наш Дэтэктыў, які цяпер цікаваў за кожным маім рухам, быццам канваір за палонным.

Толькі ці можна ўявіць усе тыя сюрпрызы, якія заўсёды падпільноўваюць кожнага з нас? Не мог прадбачыць і я, што ўперадзе.

Селівончык быў не адзін. У невялікім пакойчыку, схіліўшыся над сталом, сядзелі рэдактар Пеця Мялешка і мастак Света Кароўчанка. Мне адразу ж кінуўся ў вочы белы аркуш з яркім аранжавым загалоўкам газеты «Смех, дый годзе», які трымаў у руках Мялешка. Наша з'яўленне рэдакцыйная калегія сустрэла радаснай зацікаўленасцю.

— А мы вас зачакаліся! — паведаміў гумарыст і падміргнуў Шпаку. Той таксама прыплюснуў вока.

«Зачакаліся! Каго? Адкуль ён ведае пра наш візіт? Ці яны загадзя дамовіліся?» — але я тут жа адагнаў нядобрую здагадку. Як-ніяк дэлегацыю да мяне накіраваў увесь клас. І нечага здзіўляцца ўзрушанасці Селівончыка.

— Экстранны выпуск «Смех, дый годзе»,— з важным выглядам паведаміў рэдактар і паклаў аркуш з загалоўкам на стол.— Можа, газета дапаможа адшукаць жартаўніка. Мы сёе-тое прыдумалі...

— Экстранны? — перапытаў Шпак.

— Ага,— уздыхнуў Мялешка.— Цяжкая задача, мабыць, да вечара не ўправімся. Не проста пра невідзімку пісаць.

— Чаму не ўправімся? — здзівіўся Селівончык.— Бачыш, дапамога з'явілася, сам стараста не паленаваўся.

— Гэта добра, што Андрэй прыйшоў,— рэдактар трымаўся з далікатнай сур'ёзнасцю.— Тут якраз параіцца трэба.

Я з надзеяй пазіраў на Шпака, чакаючы, калі ён нарэшце ўспомніць свой «аварыйны варыянт».

Але Шпак чамусьці маўчаў, маўчалі Зойка Сцешанок і Света Прышчык.

Нарэшце Зойка не вытрымала:

— Мы прыйшлі не газету выпускаць.

— Што? — Селівончык глядзеў на Зойку.

— У нас іншы клопат.

— Глядзі ты! — гумарыст рагатнуў, як Савелій Крамараў.— А насценны друк чый клопат? Можа, стараста падкажа?

Я не паспеў і слова вымавіць, як мяне апярэдзіў наш Дэтэктыў.

— Пачакай, Косцік,— сказаў Шпак.— Тут і сапраўды не да газеты...

— Што я чую! — Мялешка аж рукамі ўспляснуў.— Няўжо жартаўнік знайшоўся?

— Толькі ты, Андрэйка, не крыўдуй,— Шпак гаварыў з нейкай вінаватасцю ў голасе.

— Чаго крыўдаваць?

— Прабач...— класны Дэтэктыў адвёў позірк убок.

— Ты пра што?!

— Пра пісьмо, якое ты выняў з паштовай скрынкі,— Шпак сказаў спакойна, нават абыякава, а мяне гэта навіна нібы крапівой джгнула.

— Пісьмо? — Мялешка з Селівончыкам падступіліся да Шпака ўшчыльную.

— Так, вельмі важнае, і няхай Андрэй прачытае яго нам.

— Але ж яно ад нашага дзядзькі Івана,— узрушана адказаў я.— І чаму я павінен чытаць?

— Не, Андрэй, гэта пісьмо не ад дзядзькі Івана,— стаяў на сваім Шпак.

— Адкуль ты ведаеш, хто мне напісаў?! — я нічога не разумеў і глядзеў на Шпака як на самага апошняга дзівака.

— Канверт самаробны, і на ім сёе-тое намалявана,— Шпак не адступаўся.

Усё гэта было падобна на сон, дзіўны і неверагодны.

— Ну, Андрэйка, так нельга,— дакорліва сказаў Мялешка. Цяпер яны з Селівончыкам стаялі побач са мной.— Вучкому не давяраеш. І дарма ты на мяне з Косцікам злуешся: мы супраць цябе нічога дрэннага не маем. Недарэчна ўсё з гэтай ручкай атрымалася.

— І вобыск не трэба было рабіць,— згадзіўся Селівончык.

Я слухаў іх і здзіўляўся: якія яны сталі далікатныя, уважлівыя. А можа, такімі яны былі і раней? Можа, я дарма пакрыўдзіўся?..

І тут мая рука міжволі слізганула ў кішэню штаноў, дзе ляжала пісьмо.

— Вой, воўк з мульціка,— пачуўся ўзрушаны шэпт Светы Прышчык, калі канверцік-караблік апынуўся ў маіх руках.

На гэты раз пісьмо было напісана звычайным почыркам.

«Андрэй, прабач! Гэта мая выдумка. І з запіскамі, і з ручкай. Я не спадзяваўся, што мой жарт так павернецца. На сходзе ў мяне не хапіла смеласці прызнацца. А калі ты выбег з класа, я зразумеў, што перастараўся. Таму я і пішу гэта пісьмо. Коля Шпак».

— Я-я-як?!

Я спачатку хацеў кінуцца з кулакамі на Шпака, але мяне затрымаў Пеця Мялешка:

— Не трэба, Андрэй, не гарачыся, абыдземся без самасуду. Коля за свае жартачкі будзе адказваць перад вучкомам.

Тут усё і выплыла... Усе мае сумненні і здагадкі разляцеліся, быццам чародка перапалоханым вераб'ёў.

Аказваецца, апошняе пісьмо ад «невядомага сябра» Шпак апусціў у паштовую скрынку, калі ішоў да мяне са Светай Прышчык і Зойкай Сцешанок. І пра «аварыйны варыянт» ён выдумаў... Шэрлак няшчасны!

Крыўда на Колю хутка прайшла. Дарэчы, яму давялося пісаць заметку на самога сябе ў «Смех, дый годзе». Вось дзе было весялосці! З Пецем і Косцем мы адразу ж памірыліся. Я зразумеў, што яны зусім не паклёпнікі, як мне здавалася пасля перавыбараў. Адным словам, добра тое, што добра канчаецца...

Толькі гэта было часовае зацішша. Тое, што мы паабяцалі вывесці наш клас у перадавікі, мяне непакоіла, быццам цвік у чаравіку. А вось як выцягнуць гэты цвік?

## Урок пяты:

# ПАМЫЛКА

З шостым «Б» у нас даўняя спрэчка. Так павялося, што яны заўсёды (аж з чацвёртага класа) даюць нам падножку.

Узяць хаця б збор металалому. Мы ж стараліся. З энтузіязмам. І яшчэ з якім. Вунь Лёнік Баркоў нават аднекуль кавалак рэйкі чыгуннае прывалок. Задыхаўся, небарака, нібы на ім хто верхам ехаў...

Але ўсё марна: Люся Савіцкая са сваімі «бэкамі» на балоце нямецкага «тыгра» адкапала. Праўда, ад таго танка толькі вежа засталася. Але ж і гэта знаходка. Ведаеце, колькі яна важыць? Лёнікава рэйка ў параўнанні з ёй — што камар на спіне слана. Вежу тую трактарам у вёску цягнулі. Пашанцавала шостаму «Б»! Лёгенька першае месца адхапілі.

Настрой у мяне быў не з сонечных. Хадзіў і ўсё думаў, думаў. Думаў на ўроках, думаў на перапынках, думаў на кожным кроку. Здаецца, гэтыя думкі мяне не пакідалі нават у сне...

І вось аднойчы да мяне, нібы званок з урока — калі цябе выклікалі да дошкі, а ты нічога не ведаеш,— прыйшоў адказ на той вялікі пытальнік.

А было так. Я тэлевізар глядзеў. І калі я падскочыў і запляскаў у далоні, то зусім не ад захаплення дасціпнасцю і жвавасцю «кавээншчыкаў». Тое, над чым я столькі часу ламаў галаву, начамі недасыпаў, прыйшло да мяне само...

— Трымайцеся, «бэкі»! — голасам Салаўя-разбойніка крыкнуў я, калі на блакітным экране віншавалі пераможцаў сустрэчы.

Мама з дакорам паківала галавой, угледзеўшы ў маёй выхадцы звычайны азарт балельшчыка. А я ў той момант нагадваў Калумба, які ўпершыню ўбачыў бераг Амерыкі, а мо — Бышаўца, які забіў трэці гол у вароты венграў. У рэшце рэшт тут можна абысціся і без выкрыкаў. Галоўнае зусім у іншым. А мы якраз і падышлі да самага галоўнага...

Ужо назаўтра наш клас кінуў выклік шостаму «Б».

— Рыхтуйцеся да паядынку,— сказалі мы.— На сустрэчы клуба вясёлых і знаходлівых даведаемся, хто з нас будзе першы.

Шосты «Б» адразу ж згадзіўся. А іх стараста Люська Савіцкая заўважыла:

— У цябе, Андрэй, не галава, а энцыклапедыя.

Выкапала слоўца — язык зломіш.

— Здорава прыдумаў! Нездарма цябе старастам абралі... Вось бачыш, у перадавікі клас выводзіш...

Гаворыць, а сама ледзь стрымліваецца, каб не захіхікаць. Я зрабіў выгляд, што яе словы для мяне саладзей, чым мёд, што не зразумеў насмешку, а сам сабе падумаў: «Пачакай, на КВЗ я з табой за ўсё разлічуся. Насмяешся!..»

І пачалося для мяне новае клапотнае і вірлівае жыццё. Аж апетыт страціў. Мама занепакоілася — ці не захварэў? Я толькі аднекваўся і бег на рэпетыцыю нашых «кавээншчыкаў». Мы развучвалі артыстычныя нумары, рабілі папяровыя касцюмы, эмблемы, пісалі плакаты. Усё трымалі ў глыбокім сакрэце. Але аб адной, самай важнай таямніцы, апрача мяне, ніхто не ведаў.

Нашай камандзе «кавээншчыкаў» мы прыдумалі гучную назву «Чок», што азначала «Чорны кот». Гэта я прапанаваў. І песню вывучылі, як чорны кот дарогу перабягае і як яму больш за ўсіх не шанцуе.

Мы хадзілі і безупынку паўтаралі словы: «А пока наоборот, только черному коту и не везет...»

Нарэшце прыйшоў доўгачаканы дзень, дзень КВЗ. Калі да сустрэчы заставалася з якую гадзіну і наша каманда ў апошні раз праверыла сваю баявую гатоўнасць, я ціхенька вышмыгнуў за дзверы.

Я спяшаўся. План маёй аперацыі быў складаны. Яго дзёрзкасці і рызыкоўнасці мог бы пазайздросціць нават Яшка-Цыган з «Няўлоўных мсціўцаў». Я шыбаваў на самы ўскрай вёскі, да бабкі Агаты.

Вось ужо каторы дзень я наведваўся да яе. Дакладней, гэтыя візіты пачаліся з таго часу, калі ўзнік мой план дэтэктыўнай аперацыі.

Бабка жыла адна, ціха і непрыкметна. Да яе ў грыбную пару наведвалася гарадская ўнучка. Больш у Агаты сваякоў не было. Можа, яны і жылі дзе, толькі ў госці не прыязджалі. І з'яўленне цімураўца (так я адрэкамендаваўся бабцы) у яе старэнькай, як і гаспадыня, хатцы было сустрэта прыхільна. Праўда, у мяне спачатку выйшла замінка. Курыная бабчына гаспадарка была дагледжана як след. Аб дровах калгас паклапаціўся: пенсіянеры на яго поўным забеспячэнні. Калодзеж стаяў побач з Агацінай хаткай. Таму і з вадой у яе ўсё ў парадку.

«Што рабіць, да чаго прыкласці мае цімураўскія рукі?» — з пакутай думаў я.

— А ты, Андрэйка, газетку пачытай. Я розныміпа-

дзеямі на свеце цікаўлюся. Апошнія паведамленні слухаю. Чытаць я не магу, вочы баляць.

З таго дня я пачаў прыходзіць да бабкі і чытаць ёй газеты, якія прыносіў з сабою з дому.

Хутка я стаў самым начытаным чалавекам не толькі ў сваім класе, але, мабыць, ва ўсёй вёсцы. Цяпер я мог сярод ночы сказаць: колькі людзей жыве ў японскай сталіцы Токіо, які па ліку спадарожнік запушчаны ў космас, каго абралі прэзідэнтам у далёкай афрыканскай краіне.

Да пачатку КВЗ заставалася крыху больш трыццаці хвілін. Я пачаў непакоіцца, што план маёй аперацыі можа лопнуць, нібы паветраны шар, у які пырнулі іголкай.

Паспешліва прачытаў бабцы паведамленне аб пасяджэнні ў Жэневе, а кот усё не з'яўляўся. «І дзе яго нячыстая носіць» — маё хваляванне перарастала ў адчай.

Раней жа ў гэты час ён заўсёды быў дома і, мурлыкаючы, цёрся ля маіх ног. Я з ім вунь як пасябраваў. Наша дружба мацавалася на цвёрдай эканамічнай аснове. Васька вельмі любіў сырое мяса. Ідучы да Агаты, я кожны раз запасаўся прынадным кавалачкам, і кот сустракаў мяне радасным мяўканнем. І вось сёння, калі вырашаецца лёс маёй аперацыі, Ваські няма. Нібы ён сваім кацiным розумам даўмеўся аб маіх планах і вырашыў за лепшае прабавіць час у паляванні на мышэй.

Ходзікі паказвалі, што засталося роўна дваццаць дзве хвіліны. Не, без Ваські я не мог з'яўляцца на КВЗ. Без яго згубіць свой сапраўдны сэнс назва нашай каманды. Нават песня, якую мы вывучылі назубок, не выручыць нас. А я загадзя прадбачыў: мы выстройваемся на сцэне, а ўперадзе на задніх лапах — кот Васька, які важна зыркае сваімі вогненна-зялёнымі вачыма і голасна кажа: «Мяў, мяў...» Тут ужо кожны за жывот схопіцца, тут самыя занудлівыя суддзі ачкоў не пашкадуюць...

Дык вось... Васька стаў маім кумірам з-за свайго асляпляльна-чорнага футра. Калі яго ў цемры пагладзіш супроць шэрсткі, то з яе з сухім трэскам вылятаюць бліскучыя іскрынкі — электрычныя зарады.

Пушысты сібірскі кот, такога хоць у вітрыне выстаўляй. Ваську прывезла з горада бабчына ўнучка. Ён быў вучоны кот.

Перш чым аддаць Ваську кавалачак мяса, я прымушаў яго паказваць розныя цыркавыя нумары. Ён мог хвіліну стаяць на задніх лапках, умеў лічыць, лёгка рашаў складаную арыфметычную задачу 2+2. Праўда, і пры лічэнні і пры складанні ён беспамылкова мяўкаў толькі чатыры

разы. На больш лёгкую задачу 1+1 Васька адказваў пагардлівым маўчаннем, нібы сямікласнік, у якога раптам пацікавіліся ведамі ў аб'ёме табліцы множання.

Што ні кажыце, а бабчын кот быў вунь якім разумнікам. І калі б Васька трапіў да здольнага дрэсіроўшчыка, то, мабыць, праславіўся не менш за ганарліўцаў-дэльфінаў. Яго б вазілі па ўсім белым свеце. Людзі ж вунь як любяць разумных жывёлін, не гаворачы ўжо аб іх далёкіх продках — малпах...

Пятнаццаць... Ходзікі адлічвалі хвіліны, нібы гадзіннікавы механізм узведзенай міны, якая ляжала ў кішэні майго пінжака. Больш чакаць я не мог. Так і не дачытаўшы артыкул аб хваляваннях неграў у Злучаных Штатах, я падхапіўся з зэдліка.

— Мне пара, чакаюць, заўтра дачытаю,— я метэорам прамчаўся да дзвярэй міма разгубленай бабкі.

«Дзе ж гэты нягоднік?» — узрушана думаў я, намацваючы за пазухай пустую торбу. Яна была падрыхтавана для Ваські, а ён, брыдкае стварэнне, дзесьці загуляўся. Пачакай, ты ў мяне пакаштуеш ласунак!..

І раптам я аслупянеў. Большай радасці мне ніколі не даводзілася адчуваць. Яна была такая нечаканая і аглушальная, нібы я толькі што трапіў на планету Марс. На лаўцы пад плотам сядзеў Васька. Разморана лагодным восеньскім надвячоркам, ён драмаў. І тут мяне пакінула вытрымка. Нервы падвялі... Замест таго, каб ціха і асцярожна падысці да ката, я з крыкам «Васька-а!» кінуўся да яго, размахваючы пустой торбай, якую выхапіў з-за пазухі. І гэта была мая самая цяжкая і крыўдная памылка.

Памылка, якую я не магу дараваць сабе і па сённяшні дзень. Васька ашалела бліснуў на мяне сваімі зялёнымі вачыма і ў два скачкі апынуўся на клёне, што раскінуў свае жаўталістыя галіны тут жа, над лаўкай. Тоўсты ствол старога клёна хаваўся за плотам. Так Васька, мабыць, не раз лазіў на дрэва, таму гэтыя два скачкі,— з лаўкі — на плот, з плота — на клён,— былі выкананы ім зайздросна лёгка і па-цыркавому смела.

— Кіс, кіс, кіс,— ледзь не са слязьмі клікаў я Ваську, стоячы на лаўцы.

Адной рукой я ўхапіўся за ніжні сук клёна, другую працягваў да Ваські, робячы выгляд, нібы ў ёй трымаў прывабны кавалачак мяса. Сёння ж, як на тое, у мяне не было прынады. Васька разгадаў маю хітрасць. Ён нават не зварухнуўся і насмешліва пазіраў на мяне са сваёй недасягальнай вышыні.

«Зараз ты ў мяне атрымаеш, пагібель мышыная!» — помсліва думаў я, паставіўшы адну нагу на жэрдку бабчынага плота. З плота было зручней узлесці на клён. Пустую торбу я зноў схаваў за пазухай. І калі мая другая нага намацала апору і я прымерваўся, за які сук ямчэй ухапіцца, раптам пачуўся трэск. Прадухіліць небазбежнае было немагчыма. Ды я нават не паспеў уцяміць, што да чаго. У апошняе імгненне, нібы перад скачком у бездань, я ўзмахнуў рукамі і рухнуў на зямлю разам са струхлелым бабчыным плотам. Шуму мы нарабілі багата. Затуманенымі ад крыўды і болю вачыма я ўбачыў самае трагічнае: чорны кот спалохана сігануў вышэй, у выратавальную жоўтую засень старога клёна...

## Урок шосты:

## ДЫМ БЕЗ АГНЮ

Няўдача на сустрэчы клуба вясёлых і знаходлівых надоўга вывела мяне з раўнавагі. 6 «Б» святкаваў чарговую перамогу. А нам заставалася глытаць горкія пілюлі паражэння — і толькі.

Люся Савіцкая на другі ж дзень пасля КВЗ сустрэла мяне на вуліцы і спачувальна сказала:

— Што ты, Андрэй, такі сумны? Дарэмна перажываеш. У наступны раз і вы выйграеце.

Я моўчкі праглынуў і гэтую пілюлю: дзе тут ужо будзеш пярэчыць, раз прайгралі мы начыстую. Як кажуць, была гульня ў адны вароты.

Міналі дні за днямі, непрыкметна прыляцела зіма, марозная і снежная.

І вось аднойчы, калі празвінеў званок перад першым урокам, у наш клас разам з дырэктарам Іванам Данілавічам і настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Лідзіяй Сямёнаўнай зайшла цётка Матруна.

«Так і ёсць: хтосьці нешта адкалоў!» — спалоханым вераб'ём мільганула ў маёй галаве непрыемная здагадка.

Але я памыліўся. Ды на гэты раз мая памылка была, як святочны сюрпрыз,— нечаканая і радасная.

— Учора ваш аднакласнік,— сказаў Іван Данілавіч,— здзейсніў самаадданы ўчынак.

У класе запанавала цішыня.

— Віншую нашага героя! — З гэтымі словамі дырэктар падышоў да Колі Шпака і абняў яго за плечы.— Малайчына!

Я заўважыў, як Коля спачатку збялеў, а потым твар яго заліўся чырваню. Такая пахвала!

— Наш герой сына Матруны Маркаўны з палонкі выцягнуў.

— Ага ж, з ледзяной вады выратаваў,— жаласліва ўсхліпнула цётка Матруна.— Каб не Коля — не мінаваць бы бяды. Майму ж Пецьку ўсяго шэсць гадкоў. Прастудзіўся, небарака, захварэў.

Вось вам і Шпак! Вось вам і Дэтэктыў! Прыйшоў у школу — і нікому ні слова...

— Вялікае табе дзякуй, сынок! — расчулена сказала цётка Матруна і пацалавала нашага героя, у позірку якога я раптам злавіў адчай і роспач.

— Вучыцеся смеласці ў Шпака,— параіў нам на развітанне Іван Данілавіч і яшчэ зазначыў: — І сціпласці таксама.

Дырэктар і цётка Матруна пайшлі, а мы, быццам загіпнатызаваныя, глядзелі на Колю. І толькі строгі голас Лідзіі Сямёнаўны прымусіў нас узяцца за падручнікі.

Але слухаць настаўніцу я не мог, бо мяне апанавалі зусім іншыя турботы. Хтосьці нябачны нашэптваў на вуха: «Глядзі, не праваронь выпадак. Тут усё залежыць ад цябе, такое не кожны дзень надараецца...»

Я ўявіў сабе, што мы наладжваем урачыстасці ў гонар нашага героя. Аб ім гаворыць уся школа, яго віншуюць. І тут, вядома, успомняць добрым словам і клас, у якім ён вучыцца. Наш 6 «А» стане ў цэнтры ўсеагульнай увагі. Пашана ў адрас Колі Шпака не міне і клас, у якім ён прайшоў маральную загартоўку, узняўся да свайго самаадданага ўчынку. А хіба ёсць такія героі ў класе Люсі Савіцкай?

І калі закончыўся ўрок, я кінуўся да Колі і горача павіншаваў яго. Праўда, наш герой спрабаваў схаваць свае рукі пад партай, але мой аўтарытэт старасты прымусіў яго перасіліць хваравітую сціпласць. Цікаўныя аднакласнікі стараліся выпытаць у Шпака падрабязнасці ўчарашняга здарэння.

— Ну-у, ехаў на лыжах ля ракі,— Коля пачаў чамусьці заікацца.— Чу-у-ю к-крык. Я-я хутчэй туды...

Больш мы не змаглі выціснуць з яго ні слова.

Я тут жа склікаў нечарговае пасяджэнне членаў рэдкалегіі нашай насценгазеты «Смех, дый годзе».

— Трэба выпусціць «Маланку»,— сказаў я, звяртаючыся да рэдактара Пеці Мялешкі.— Нумар прысвячаецца самаадданаму ўчынку Колі Шпака. Я напішу перадавіцу. На другой калонцы змесцім інтэрв'ю з героем. Яго возьме

Пеця. На трэцяй,— я крыху задумаўся,— на трэцяй... будуць водгукі аднакласнікаў. Іх падрыхтуе Косця.

Косця Селівончык, член рэдкалегіі па гумару, згодна кіўнуў сваёй белабрысай галавой.

— А на апошняй калонцы... — я зноў запнуўся.

— Намалюем, як заўсёды, паштовую скрынку,— паспяшалася выручыць мяне Света Кароўчанка.

— Ты што, смяешся? — я здзіўлена глянуў на яе круглыя акуляры.— Прыберажы сваю скрынку да канікулаў...

Нарэшце я знайшоўся:

— Ага, на чацвёртай калонцы змесцім любімую песню Колі. З ім я сам пагавару.

Члены рэдкалегіі адразу ж згадзіліся са мной. Цяпер Мялешка з Селівончыкам — мае найпершыя памочнікі. Стараюцца з усіх сіл, каб наш клас выйшаў у перадавікі.

— Газету вывесім заўтра раніцой, перад урокамі. Падумай над афармленнем,— загадаў я Свеце.

На наступным перапынку я зноў падышоў да Колі. Быў ён нейкі кіслы і разгублены. Ну і дзівак! Радавацца трэба, а ён сядзіць, быццам мыла з'еўшы...

І тут у мяне выйшла замінка. Простае пытанне: «Ты якую песню любіш?» — мне давялося паўтарыць некалькі разоў, перш чым наш герой уцяміў, што да чаго.

Голасам тапельца, які толькі што апрытомнеў, Коля прамовіў:

— Ну-у, тую... з кіно, што спявае Нікулін у фільме «Брыльянтавая рука».

— Песню пра трын-траву?

— Ну.

— Ты што, з глузду з'ехаў? Гэта ж для «Маланкі», трэба школьная песня, а ты пра нейкую там трын-траву...

— Не-е ведаю.

— Ладна, сам у спеўніку пагляджу,— я безнадзейна махнуў рукой, бачачы, што толькі час марна трачу.

Далей усё пайшло як па пісаным. Вестка аб учынку Шпака адразу ж абляцела школу. І ў наш шосты «А» пачалі прыбываць дэлегацыі з розных класаў. Віншавалі Шпака, захапляліся яго адвагай. Прыходзіла класны кіраўнік Юлія Паўлаўна, таксама расхвальвала Колю. Сказала, што пасля ўрокаў будзе ўрачыстая лінейка. Падзеі набіралі святочную вышыню.

Але з асаблівым нецярпеннем я чакаў пасланцоў з шостага «Б». Люся Савіцкая заявілася адна. Яна была нейкая задумлівая і асцярожная.

— Ну як? — Я пераможна зазірнуў ёй у вочы, у якіх

патухлі колішнія насмешлівыя агеньчыкі.

— Ты аб чым? — яна зрабіла выгляд, што не разумее мяне.

— Пра ўчынак Колі Шпака чула?

— У мяне да цябе справа ёсць,— яна не адказала на маё пытанне.— Нам трэба пасакрэтнічаць, выйдзем з класа.

Ну і ну... У прадчуванні чагосьці нядобрага я пасунуўся за Люсяй.

— Дык вось,— суха сказала яна, калі мы апынуліся ў калідоры.— Дарма вы тут дым без агню раздзьмухваеце. Перастараліся.

— Што-о? — яшчэ больш спахмурнеў я, адчуваючы лёгкую млявасць у нагах.

— І ніякі ваш Шпак не герой,— адрэзала Люся.

— З палонкі выцягнуць — па-твойму не подзвіг?

— А подзвігу не было.

У яе вачах зноў загарэліся колкія агеньчыкі.

— Ведаеш, табе гэты нумарок не пройдзе. Зайздросна стала, што не з твайго класа? Вунь сам Іван Данілавіч віншаваў Колю.

— Віншаваў, таму што не ведаў, як усё было.

— А цётка Матруна?

— І яна нічога не ведае.

— Як?

— Вашага Шпака біць трэба, а не віншаваць. Гэта ж ён сам Пецьку ў палонку завёў,— апошнія словы яна прамовіла з сумнай усмешкай на кірпаносым твары.

— Што-о-о?!

— А ты спытай у нашага Зяблікава. Ён жа разам са Шпаком быў учора ля ракі. Яны і Пецьку падгаварылі, каб той паглядзеў, ці моцны на рацэ лёд. Самі баяліся лезці.

Яе словы адразу ж абяззброілі мяне. Я бязвольна апусціў рукі і разгублена азірнуўся...

Савіцкая працягвала абурацца:

— Пецька згадзіўся, вядома,— малы... А тут лёд і трэснуў. Добра, што ля самага берага. Яны і выцягнулі Пецьку з палонкі. Ён з галавой выкупаўся ў вадзе, захварэў. А ты кажаш — герой... Мне аб гэтым сам Зяблікаў прагаварыўся. Не верыш — спытайся ў іх саміх.

— І спытаюся, і яшчэ паглядзім, чыя праўда! — Да мяне вярнулася рашучасць.

— Хочаш не хочаш, а да Івана Данілавіча давядзецца ісці і расказаць аб усім.

— І пойдзем, і раскажам,— я кінуўся за Шпаком.

У нашым класе была ўжо новая дэлегацыя. Першакласнікі прыйшлі, паштоўкі прынеслі, прасілі Шпака паставіць аўтограф. Шпак адмахваўся ад іх, нібы ад галодных камароў. Адправіўшы першакласнікаў, я вывеў нашага героя ў калідор.

— Ты быў учора з Зяблікавым ля ракі?

Шпак тут жа памкнуўся даць лататы. Але я схапіў яго за руку.

— Ну-у, адказвай!

— Бы-ыў...

— Пецьку падгаварылі?

— А-ага...

— Дык чаго ты маўчаў дагэтуль?!

Як я ненавідзеў яго цяпер! Дэтэктыў, Шэрлак Холмс... Выдумшчык пракляты!

— Разгубіўся. Я не думаў, што так павернецца.

Далей я не распытваў. І аб чым?.. Усё рухнула ў адзін міг, нібы падмыты вадой бераг ракі.

«Дым без агню»,— чамусьці ўспомніліся мне словы Люсі Савіцкай. Прыдумае ж...

— Ну, пайшлі да дырэктара, герой ліпавы,— сказаў я і ледзьве стрымаўся, каб не даць Шпаку добрага кухталя.

## Урок сёмы:

## ГОРКАЯ ПРАЎДА

На апошнім пасяджэнні вучкома мне здорава такі ўляцела. Асабліва старалася сямікласніца Люба Войцік — адказная за паспяховасць, камандзір «чырвонага ліхтарыка».

— Вы толькі падумайце! — гаварыла Люба з запалам.— У шостым «А» зусім страцілі пачуццё гонару. Іх двоечнік Стась Чыжык меціць у другагоднікі, а стараста Андрэй Кахута бяздзейнічае.

Гаварыла Люба горача, натхнёна, нібы на аглядзе мастацкай самадзейнасці выступала. І паспрабуй тут апраўдвацца: гэта ўсё роўна, што, трапіўшы ў багну, стараешся сам вылезці, а цябе яшчэ глыбей зацягвае... Я маўчаў, чакаючы, калі нарэшце закончыцца абвінаваўчая прамова супраць мяне.

— Спытаць бы ў таго ж Кахуты. Сам ён у выдатніках ходзіць і задаволены... А як ён дапамагае адстаючым?

...Выйшаў я за дзверы сам не свой. І злаваўся я не столькі на Любу Войцік, колькі на абібока Чыжыка. З-за яго мне вунь як уляцела, нібы я на ўроку спеваў пеўнем кукарэкаў...

Трэба было зноў брацца за гультая Стася Чыжыка, і брацца як след. Ну што ж...

«Удалы пачатак — залог поспеху»,— падбадзёрваў я сябе, быццам палкаводзец перад рашаючай бітвай...

Хуценька паабедаўшы, я адразу ж рушыў на лыжах да Стася. Ён жыў за рэчкай на хутары. Раней там стаяла яшчэ некалькі хат, але іх перавезлі ў вёску. І толькі Чыжыкі заставаліся наводшыбе, на сваёй старой сядзібе, якая прытулілася на самым ускрайку лесу.

Каб скараціць шлях, я ўзяў кірунак напрасткі. Мароз надзейна закаваў лянівую Лахву ў ледзяную браню, і цяпер не трэба рабіць вялікі паўкруг, каб трапіць на мост.

Неўзабаве я быў каля рэчкі і ў пошуках больш нізкага берага падаўся ўверх па цячэнні. За густым зараснікам голага альхоўніку Лахва шырэла, робячы круты паварот. Ля яго я і надумаўся пераправіцца, якраз непадалёку ад Чыжыкавага хутара.

Лёд на рацэ быў чысты і слізкі, як адпаліраваны, і лыжы па ім раз'язджаліся ў розныя бакі. Я з вялікай асцярожнасцю пасоўваўся па лёдзе, нібы ўпершыню стаў на свае целяханскія. Калі да берага заставалася крокаў з пяць, я ўсё ж не ўстаяў на нагах... Паспрабаваў падняцца — і зноў гопнуўся на люстраную роўнядзь. Гэта было ўжо занадта, нібы хто зачараваў праклядты лёд і цяпер, задаволены сваёй хітрасцю, цешыўся з маёй бездапаможнасці.

Раптам да майго слыху даляцеў яхідны смяшок. Я з нянавісцю азірнуўся — і ўбачыў Стася. Ён, ухмыляючыся, стаяў на беразе.

Ну і злосць мяне разабрала, аж у вачах пацямнела! Для яго ж стараюся, аб ім думаю, а ён вунь рот да вушэй расцягнуў і насміхаецца, нібы яму тут цырк які...

Нарэшце Стасю надакучыла пацяшацца, і ён паважна падышоў да мяне.

— Ці-ка-а-ва,— з асалодай сказаў Стась, працягваючы мне руку.

— Ну і слізгата,— я прымушаю сябе ўсміхнуцца і паглядзець у вяснушкаваты твар Стася.

— А я чую: бух ды бух, аж лёд трашчыць... Дай, думаю, пагляджу, ці не бабёр часам на прагулку выйшаў.

Стась прыжмурваецца, яго шапка-вушанка навісае на самыя вочы, і нельга зразумець: падколвае ён мяне ці гаворыць сур'ёзна. Ды і ўвесь яго выгляд нейкі дзівакаваты: на ім вісіць доўгі, ледзь не да пят, белы кажух, на нагах — вялізныя чорныя валёнкі. Сапраўдны Дзед Мароз.

— Я тут непадалёку за бабровай хаткай назіраю. Ты

ніколі не бачыў? Ціка-а-ва-а... Бабры ў гэты час якраз на прагулку вылазяць. Вось толькі сёння чамусьці не паказваюцца. Мабыць, ты іх напужаў...

«Г-м-м, бабры,— падумаў я.— Бач, які гаваркі ты тут. Лепш бы за падручнікамі пасядзеў...»

Нарэшце я дабраўся да берага і з палёгкай уздыхнуў, калі мае лыжы надзейна нырнулі ў пульхны снег. Стась тупае побач і гучна пляскае доўгімі рукавамі бацькавага кажуха.

— А ты куды едзеш?

— Ды вось катаюся.

— Ну-ну, катайся.

— Па дарозе надумаў да цябе зазірнуць,— я вырашыў дзейнічаць абыходным шляхам, пра які казала надоечы Люба.

«Двоечнік, ён цяпер хітры пайшоў. Яго голымі рукамі не возьмеш. Варта ляніўца прыціснуць да сцяны, як ён пачынае скардзіцца на сваю памяць, на боль у галаве, і паспрабуй тады да яго падступіцца»,— успамінаў я разумную прамову Любы Войцік, пазіраючы на свайго падшэфнага.

— Калі ты не спяшаешся, давай за баблрамі паназіраем,— Стась перапыняе палёт маіх сумных думак.

«Ну і арэшак гэты Стась!» — каторы раз падумаў я і, падуладны свайму абяцанню перад вучкомам, пакорліва падаўся за Чыжыкам.

Неўзабаве Стась спыніўся і махнуў рукой. Мы прыселі за лазовым кустом і пачалі назіраць за кучай ламачча, якая была ад нас крокаў за дваццаць.

Прайшло мінут пяць, потым яшчэ столькі ж. Баброў не было. Мароз залез у мае лыжныя чаравікі, пад куртку. Стась нават не варухнецца: яму што? Сядзіць у кажусе, як ля той буржуйкі. А ў мяне зуб на зуб...

— Можа, пойдзем? — тузаю Стася за рукаў.— Ніякіх баброў там няма.

— Цішэй, не крычы,— шэпча Стась,— гэта ты іх напалохаў. Яны і баяцца вылазіць. Пачакаем яшчэ.

— Пачакаем, пачакаем,— перадражніў я Чыжыка.— Тут акалееш хутчэй, чым дачакаешся.

— А я цябе не трымаю,— адмахнуўся Стась.

Але ісці, не выканаўшы задання, я не мог. У мяне не было іншай дарогі, я застаўся, дрыжучы ад холаду і злосці на двоечніка Стася.

І тут пачуўся яго ўзрушаны голас:

— Ой, ледзь не забыўся! Сёння па тэлевізары «Чаты-

рох танкістаў і сабаку» паказваюць, другую серыю. Ты першую глядзеў?

— Не-е.

— Э-эх, вось гэта дык кіно! Гайда да нас, шкада толькі, што за бабрамі не давялося паназіраць.

Я адразу кінуўся па снегавой цаліне да Чыжыкавага хутара, лыжы неслі мяне як на крылах. Спяшаўся я, вядома, не таму, што мне так захацелася паглядзець кіно.

— Рана прыбеглі,— з той жа хітрай усмешачкай паведаміў Стась, калі мы зайшлі ў хату.— Кіно праз гадзіну пачнецца. Трэба было яшчэ за бабрамі пасачыць.

«Сам ты бабёр»,— я ледзь утрымаўся, каб не выказаць Стасю ўсё, што аб ім думаю. Але і на гэты раз абяцанне перад вучкомам дапамагло мне перасіліць злосць.

І тут я вырашыў пайсці ў рашучы наступ.

— Ты зрабіў урокі? — нібы між іншым пытаюся ў Стася.

— Паспею яшчэ,— абыякава махае рукой Чыжык.

— Давай памагу?

— А-а-а, потым,— ён уключае тэлевізар і гаворыць: — Паглядзі пакуль, а мне трэба пагаспадарыць: мама — на ферме, тата — у майстэрні, дык я дома адзін,— з гэтымі словамі Стась спрытна выслізнуў за дзверы.

«Ну вось, зноў асечка»,— з адчаем падумаў я, разгублена пазіраючы на мігатлівы блакітны экран.

Стась не з'яўляўся. «І куды ён знік?» — я падняўся з крэсла і вырашыў ісці на пошукі. Яго знікненне чамусьці не падабалася мне. Тут штосьці не так...

Я выйшаў на кухню. Маю ўвагу раптам прыцягнулі нейкія падазроныя гукі, якія даляталі з-за шырокага коміна печы. Я асцярожна ступіў яшчэ некалькі крокаў і прыслухаўся.

— Уліплі мы з табой, Васька. Пагуляць няма як,— цяпер сумненне знікла: гэта быў Стасеў голас.— Прыпёрся выдатнік, каб на яго ліха! Мой шэф, Васёк. Гэта табе, Васёк, не жартачкі...

Я адчуў, што твар мой заліўся чырванню, нібы мне нечакана давялося пачуць пра сябе самую горкую праўду...

Больш я не мог слухаць, чакаць, калі Чыжыку надакучыць сядзець на печы. І чаго з ім цацкацца, чаго шукаць падыход да яго гультайства?!

— Злазь з печы, чуеш! І ніякія табе бабры, ніякія танкісты і сабакі не дапамогуць. Злазь, кажу! — злосна выгукнуў я.

За комінам стала ціха-ціха.

— Злазь, кажу! Інакш горш будзе...

Спачатку на падлогу чмякнуўся кот Васька. Потым паказаўся і сам Стась, чырвоны, як рак.

— Хопіць з мяне тваіх хітрыкаў... Ды ты што — для мяне вучышся ці для вучкома? Дурня ўсё строіш! — Я быў сам не свой. А хіба да такіх даходзіць добрае слова? Хіба з імі можна спакойна размаўляць?

— Пра-аба-ач, я пажартаваў,— Стась пераступаў з нагі на нагу і ніякавата глядзеў на шэрага ката Ваську, які цёрся пушыстай спіной ля нізкай табурэткі.

— Можаш сабе забаўляцца з бабрамі і двойкамі, бацька каціны!

Я насунуў на галаву сваю шапку-вушанку і накіраваўся да дзвярэй.

— Андрэй, пачакай... Я пажартаваў...

## Урок восьмы:

## ...І МЫ ЗАСМЯЯЛІСЯ

Дзень быў на зыходзе. Халодныя промні барвовага сонца, якое вісела над самым гарызонтам, рассыпаліся па зямлі бліскучымі крышталікамі зорачак-сняжынак.

На гэты раз я пераправіўся цераз раку Лахву без усялякіх прыгод. Настрой у мяне быў прыўзняты, нечакана парадаваў Стась Чыжык. Мабыць, і ў яго прачнулася сумленне, бо ён, калі злез з печы, адразу ж засеў за алгебру. А праз якія паўгадзіны Стась адужаў задачу, нават мая дапамога не спатрэбілася. Вось вам і няўмека, двоечнік-лайдак!

На развітанне Стась папрасіў не расказваць у класе пра бабра і кіно, ён абяцаў больш не падводзіць клас. Гэта для мяне вунь якая навіна! Нарэшце і ў нашым 6 «А» двоечнікі перавядуцца!

Я ўявіў сабе ўрачыстую хвіліну, як нам уручаюць пераходны вымпел «Лепшаму класу» і ў гонар пераможцаў школьны баяніст дзевяцікласнік Сашка Наварай іграе песню пра юнага барабаншчыка. Потым Люська Савіцкая падыдзе да мяне і скажа:

«Ты, Андрэй, малайчына! Дарма я на цябе бочку каціла...»

Мае лыжы лёгка беглі па пульхным марозным снезе. Я ўзяў бадзёры тэмп, быццам здаваў нарматыў ГПА на залаты значок. Лыжня павярнула да Замкавай гары, і я, збавіўшы хуткасць, накіраваўся да яе.

Замкавая гара ўзвышаецца над нашай вёскай — над нашымі Мілавідамі,— быццам магутны былінны волат. А яшчэ яна падобна на велізарны стог сена, які зладзілі казачныя Гуліверы на самым беразе Лахвы. Вяршыню гэтага стога здзьмула ветрам, і на нешырокай роўнай пляцоўцы выраслі купчастыя каржакаватыя бярозы.

Расказваюць, што гадоў дзвесце-трыста назад тут стаяў панскі палац, што гару насыпалі прыгонныя людзі. Палац разам з панам даўным-даўно знік у нябыт, а вось гара засталася...

З поўдня гара аб'ехала, схіл яе зрабіўся пакаты, адхоністы, і тут можна катацца на лыжах без усялякай рызыкі. Зусім іншы выгляд гары з супрацьлеглага боку, дзе яна крута абрываецца ўніз. Гэты абрыў хтосьці празваў Каўказам...

Я ўжо быў недалёка ад Замкавай гары, як пачуў за спіной вясёлы воклік. Маё сэрца ёкнула — гэта была Люська Савіцкая!

Кінуцца наўцёкі, прытварыцца глухім,— ды хіба выратуешся? Яна ж вунь як шпарка на лыжах бегае, чэмпіёнка школы, уладальніца залатога значка ГПА. А ў мяне толькі на сярэбраны значок спрыту хапіла...

Я спыняюся і азіраюся. Люська ўжо зусім блізка, насы яе лыжаў наступаюць на пяткі маіх целяханскіх. Яна ў чырвоным світэры, такога ж колеру шапачцы і рукавічках. На яе шчоках палымнее яркая чырвань, а ў сініх вачах успыхваюць іскрынкі-смяшынкі.

«Жар-птушка прыляцела»,— нявесела падумалася мне.

— Ледзьве дагнала цябе,— гаворыць Люська і смяецца.— Трэніруешся?

— Ага, трэніруюся.

Яна ідзе побач, я міжволі сустракаюся з уважлівым позіркам Люські, і мне яшчэ больш робіцца не па сабе.

— Ну, як твой Чыжык?

Кожнае новае пытанне Савіцкай я лаўлю з перасцярогай, быццам гэта не словы, а пякучыя вугалькі, якіх голай рукой не возьмеш.

— Нічога, абяцаў развітацца з двойкамі.

— Вось дык навіна! — здзіўляецца Люська.— Няўжо расквітаецца?

— Чаму і не? Ляноту з Чыжыка мы абавязкова выб'ем.

— Выбівайце, выбівайце, толькі Стася ў жывых пакіньце... Без яго ваш клас на лыжных спаборніцтвах вышэй апошняга месца не падымецца.

— Гэта яшчэ трэба паглядзець,— не здаюся я.

— Што глядзець,— Люська адчувае сябе на вышыні.— Ды ў вашым жа класе, акрамя Стася, ніхто не з'язджае з Каўказа. Слабакі ўсе і баязліўцы.

Падначка Савіцкай мяне асабліва не закранула. Тут не трэба быць вялікім разумнікам, каб не ўбачыць, што хаваецца за яе словамі. Яна ж самая рызыкоўная лыжніца ў нашай вёсцы і заўсёды катаецца толькі з Каўказа. Так карціць ёй павыхваляцца сваёй храбрасцю.

Ля падножжа Замкавай гары я спыніўся, спынілася і Люська.

— Можа, паспрабуеш? — лагодна спытала яна, паказваючы бліскучай лыжнай палкай на Каўказ.

— Няма чаго і спрабаваць,— самаўпэўнена сказаў я.— Проста... у мяне сёння не той настрой, каб лезці на верхатуру.

— Глядзі ты! Шкада, што ў цябе настрою няма,— гаворыць, а сама, здаецца, вось-вось лопне ад найвялікшай радасці.

І тут да мяне дайшло: я трапіў у новую пастку, выратавацца з якой мне можа дапамагчы толькі цуд.

— Не верыш? — адступаць не было куды.

— Веру, веру... Калі ты з Чыжыкам справіўся, дык што для цябе нейкі там Каўказ. Я вельмі рада, Андрэйка!

— Насміхаешся?!

— Дзівак ты! — яшчэ цішэй кажа яна і азіраецца на сонца, якое барвовым шарам вісіць на самым краі неба.

Тут бы мне махнуць рукой і пайсці да паўднёвага схілу або зусім павярнуць да вёскі, але я насуперак самому сабе раптам сказаў:

— Думаеш, не з'еду, так?

— Нічога я не думаю,— неяк спалохана адказала Люська.

— Тады глядзі, я зараз! — Цяпер мяне нішто не магло стрымаць.

— Андрэйка, не трэба,— за маёй спіной пачуўся ўмольны голас, але я ўжо лез на гару, моцна сціскаючы пластмасавыя рукаяткі лыжных палак.

Пакуль забраўся на вяршыню Замкавай гары, добра-такі запарыўся. Спяшаўся, можна было падумаць, што я перад Люськай так стараюся. Але ж на самай справе зусім іншае патрабавала маю рашучасць і адвагу...

Бярозы, настылыя і заінелыя, стаялі ў засяроджанай маўклівасці. Я абмінуў некалькі тоўстых вузлаватых камлёў і апынуўся над крутым абрывам. З дрыготкай перасцярогай асмеліўся зірнуць перад сабой і зразумеў: ніякая сіла

не прымусіць мяне адважыцца з'ехаць уніз. Ад маёй рашучасці застаўся адзін успамін. Я ўбачыў маленькую, асветленую залатымі промнямі, постаць Люські, якая размахвала рукамі, і з усёй яскравасцю ўявіў, што чакае мяне заўтра ў школе. Вось калі Савіцкая дасць волю сваёй фантазіі і красамоўству...

Мае лыжы быццам прымерзлі да заледзянелага пасля адлігі снегавога шарану. Мароз пачынаў прабірацца пад вопратку, мне зрабілася зябка, няўтульна, нібы я раптам апынуўся на бязлюднай невядомай планеце. Я стаяў над абрывам і не мог скрануцца з месца, падуладны незразумеламу здранцвенню...

Калі я нарэшце наважыўся павярнуць назад, са мной сталася штосьці невераготнае. Гэта было падобна на цуд, незразумелы і дзівосны. Нейкая нябачная сіла, нібы раптоўны віхор, падхапіла мяне, і мае лыжы сарваліся ўніз. Я стаяў на нагах толькі першыя два імгненні, набіраючы хуткасць, быццам снежны ком у каламутную непагадзь.

Цяпер нішто не магло спыніць маю нечаканую пагоню за ветрам, прадухіліць маё бясслаўнае паражэнне. І тут якраз трапіўся трамплін,— круталобы, заснежаны гурбяк, які прыляпіўся да схілу вялізнай барадаўкай. У адзін момант мае лыжы адарваліся ад зямлі, а я, апісаўшы ў паветры акрабатычнае сальта, паляцеў потырч носам у калючы снег. Потым перакуліўся яшчэ і яшчэ, пакуль сіла інерцыі не растала ля самага падножжа Замкавай гары.

Ляжаў я і не варушыўся, стараючыся ўцяміць: што са мной здарылася? Марозны снег, які трапіў за каўнер спартыўнай курткі, дапамог без лішніх ваганняў зразумець: цяпер мяне нішто не выратуе ад пасмешышча. Нават пякучы боль у левай назе (моцна выцяўся каленам, калі прызямліўся пасля акрабатычнага сальта) не змог заглушыць пачуццё едкага, быццам палыновы чад, сораму.

— Андрэйка, што з табой? Ты жывы?!

Але я маўчу, не адказваю. І што тут будзеш казаць, чым пахвалішся? Фокус-мокус паказаў... Вось цяпер ляжы і снег нюхай!

Нарэшце я знаходжу сілы падняцца і пачынаю аббіваць снег, які абляпіў мяне з ног да галавы.

— Во-ой, так напалохалася! Думала, што ты забіўся. Так напалохалася...

— Калі б не трамплін,— апраўдваюся з няўцямлівай ніякаватасцю.

— Я сама заўсёды той трамплін абмінаю, а ты адразу адважыўся... жах адзін.

Упершыню Люська, здаецца, гаворыць без жартачак, і я асмельваюся паглядзець на яе. Нашы позіркі сустракаюцца: яе вочы глядзяць на мяне прыязна і адабральна.

— Варта адзін раз адважыцца, потым будзе не страшна,— гаворыць Люська.— А ты, Андрэй, здорава куляўся! І як толькі твае лыжы засталіся цэлыя?

Раптам мы пачынаем смяяцца, смяёмся не стрымліваючыся, на ўвесь голас. І я ніколечкі не злуюся на Люську, нават забываюся, што нашы класы заўсёды сапернічаюць паміж сабой. А чаго злавацца?



# АПАВЯДАННІ





## ПРАЛЕСКІ

Сёння Рома прачнуўся з першымі сонечнымі промнямі. Спехам паснедаў і пайшоў у школу на гадзіну раней звычайнага.

Школа знаходзіцца ў суседняй вёсцы, за тры кіламетры. Але ўжо на паўдарозе Рома завярнуў убок, па віхлястай сцяжынцы, якая вяла да лесу.

У лесе было пуста і няўтульна: галасістыя званочкі жаўранкаў засталіся там, над полем. Вясна толькі паспела прагнаць снег і падсушыць зямлю. Зеляніна яшчэ хавалася ў набрынялых, гатовых вось-вось лопнуць пупышках, а ігольчатыя травінкі набіраліся сілы пад мінулагоднім лісцем.

Рома ўважліва прыглядаўся да арэшніку, зазіраў пад прысадзістыя елачкі, але ўсё было дарэмна. Тое, што ён шукаў, што прывяло яго сюды ў гэты ранішні час, не траплялася на вочы. Яго кірпаносы, з дробнымі вяснушкамі ля шэрых вачэй твар заружавеўся трывожнай заклапочанасцю. І ён упарта працягваў шныпарыць сярод зарасніку.

Спачатку Рома нават разгубіўся. На сонечным грудку пад кустом арэшніку стаялі сінявокія пралескі. Іх было многа, нібы хто са жмені сыпануў. Яны толькі што прачнуліся і пад першымі промнямі сонца ў дрымотнай млявасці пацягваліся і жмурыліся. Іскрыстыя расінкі, прыляпіўшыся да кволых светла-блакітных пялёсткаў, гралі на сонцы вясёлымі бурштынчыкамі.

Рома асцярожна ля самай зямлі адшчыкваў тоненькія цыбатыя сцяблінкі пралесак, складваючы кветкі адна да

адной. Яго губы ледзь чутна шапталі: «Будзьце, вочкі, як пралескі, сіненькія...»

Букецік атрымаўся зграбны і прыгожы. Хуценька перавязаўшы яго белай ніткай, Рома далікатна абгарнуў кветкі газетнай паперай і паклаў пакуначак у сваю пашарпаную на тасёмкавым рамяні палявую сумку. Больш ён не затрымліваўся ў лесе ні адной хвіліны.

Расчырванелы і задыханы, Рома ўскочыў у клас. Яму пашанцавала. Быў урок фізікі, а Сцяпан Іванавіч, якога ўсе паважалі і любілі за справядлівасць і дабрату, нават не спытаўся аб прычыне яго спазнення.

Рома дастаў з сумкі сшытак, падручнік фізікі, потым адчыніў вечка парты, каб пакласці сумку, і тут яго ўвагу прыцягнула нейкая паперка, што ляжала ў парце.

Лісток у простую лінейку быў складзены акуратным прамавугольнікам. Рома памкнуўся скамячыць яго, як на другім баку заўважыў дзве літары, выведзеныя чырвоным алоўкам: Р. Д. «Значыць, мне, Раману Данілюку»,— адразу ж здагадаўся ён.

Рома і раней атрымліваў розныя запіскі ад сваіх сяброў: ці на кантрольнай з просьбай выручыць з бяды, ці яшчэ па якой-небудзь справе, калі хто не мог дачакацца канца ўрока. Таму папяровы прамавугольнік Рома разгарнуў без асаблівай зацікаўленасці.

Пасярод лістка стаялі друкаваныя літары, нешта накшталт арыфметычнага прыкладу: Р+Л=К... Ён яшчэ раз прабег запіску вачыма — і нічога не зразумеў. «Што гэта за рэбус?»

І раптам яму зрабілася горача. Рома адчуў, як вушы яго наліліся пякучым полымем нечаканай сарамлівасці. Ён спалохана зацiснуў запіску ў руцэ, баючыся паварушыцца. Рому здавалася, што цяпер за ім сочыць увесь клас. Мабыць, толькі цяпер ён зразумеў усю нязручнасць першай парты: заўсёды сядзіш навідавоку — ні табе павярнуцца, ні табе словам перакінуцца... А тут гэтая бяскрыўдная на першы погляд запіска...

Так, сумнення не магло быць: пад літарамі Р і Л значыліся імёны: Рома і Люся. А паміж імі стаяў маленькі яхідны значок плюс.

Магчыма, у другі раз гэта запіска так не ўзрушыла б Рому. Але ж сёння зусім іншая справа...

Люся — Ромава аднакласніца, смяшлівая, з каштанавай касой і сінімі вачыма дзяўчынка. Калі яе звонкі голас гучыць са школьнай сцэны, слухачы сядзяць, быццам зава-

рожаныя, а потым па некалькі разоў выклікаюць Люсю Вяршкову на «біс».

Рома вучыцца з Люсяй чацвёрты год. Яны прыйшлі ў чацвёрты клас Залескай васьмігодкі з розных вёсак. Яму таксама падабаюцца яе спевы, і ён да пякучага болю ў далонях заўсёды апладзіруе ёй на канцэртах.

Аднойчы Рома злавіў сябе на думцы, што яму становіцца сумна, калі ў класе няма Люсі, што ён спяшаецца ў школу, каб хутчэй убачыць яе...

Але гэта было Ромавай таямніцаю, аб ёй ніхто не ведаў, ён засцерагаў яе ад нядобрых зласлівых вачэй.

...І вось — запіска, нібы стрэл, нечаканы і аглушальны. А ў сумцы ляжыць букецік сінявокіх пралесак. Сёння ў Люсі Вяршковай дзень нараджэння. І па традыцыі аднакласнікі збіраліся віншаваць імянінніцу: паштоўкі, кнігі са святочнымі надпісамі. А Рома вырашыў паднесці букецік першых вясновых кветак, якіх сёлета з-за позняга прыходу цёплых, сонечных дзён яшчэ ніхто не бачыў.

Тое, што паўгадзіны назад было для Ромы простым і звычайным,— ён уяўляў, як разам з іншымі падарункамі аднакласнікаў уручае букецік Люсі,— цяпер стала для яго неадольнай перашкодай. Сарамлівая разгубленасць пазбавіла Рому ўсялякай рашучасці. Ён ледзь дачакаўся званка, каб хутчэй вышмыгнуць з класа, нават не глянуўшы туды, на перадапошнюю парту, дзе сядзела Люся. Бо на першым перапынку сямікласнікі дамовіліся віншаваць імянінніцу...

Завярнуўшы за вугал школы, Рома з нейкай асаблівай злосцю парваў на дробныя кавалачкі ядавітую запіску. Але гэта не прынесла яму супакаення. Ён паблукаў па двары, пакрыўджаны і раззлаваны. Потым пайшоў у школьны сад, прыхінуўся спіной да высокай таполі і пачаў назіраць за шпакамі, якія абжывалі новыя домікі. Ім было весела і сонечна. Яны на ўсе лады выводзілі самыя дзівосныя мелодыі: заліваліся, цокалі, высвіствалі, буркаталі.

Тут яго знайшла Люся.

— Ты чаму збег?

Ён аж падскочыў ад нечаканасці, рассмяшыўшы яе сваёй палахлівасцю. Рома адступіў ад таполі крокі з два і разгублена азірнуўся па баках, нібы выглядваючы, куды б гэта спрытней сігануць.

— Ну і баязлівец жа ты! — яна так і залілася ад смеху, у яе быў цудоўны настрой, настрой імянінніцы.— А я шукала цябе. І што ты тут робіш?

Рома нарэшце асмеліўся глянуць на Люсю. І проста перад сабой ён убачыў сінія-сінія, быццам пралескі, іскрыс-

тыя вочы — і адразу ж адвёў позірк убок.

— Во-ось, за шпакамі назіраю,— з няўпэўненасцю адказаў ён.

Яна была так узрушана, што не заўважыла яго панурага погляду.

— А я прыйшла падзякаваць табе за вершы. Яны мне вельмі спадабаліся. Ну і складна ж у цябе атрымліваецца! — пахваліла яна Рому.

Пахвала прымусіла яго яшчэ больш пачырванець. Вершы, аб якіх казала Люся, ён склаў учора для віншавальных паштовак. У Ромы да гэтага ёсць здольнасці, два яго вершы нават у дзіцячай газеце надрукавалі. І калі ў класе надаралася якая-небудзь урачыстасць, тут ужо без свайго паэта не абыходзілася.

Раптам Люся пасур'ёзнела, агледзелася і ціха сказала:

— А я сёння ў парце запіску знайшла,— і паказала акуратны прамавугольнік з паперы ў простую лінейку.

Рома прачытаў запіску. Замест літар стаялі словы: Люся+Рома...

— І хто гэта напісаў? — яна запытальна глядзела на яго.

— Мне такую запіску таксама падкінулі,— нарэшце прамовіў Рома.

— І табе? — Люся пырснула смехам.

— А што тут смешнага? — зусім сумеўся ён.

— Дык вось яно што! — немаведама чаго радавалася яна.— Таму ты і з класа збег?

Нарэшце яна перастала смяяцца і загаварыла сур'ёзна:

— Такім толькі папусціся — праходу не дадуць. І няма чаго з-за нейкай запіскі хвалявацца.

Яе голас гучаў супакойваюча, і Рома адчуў сябе крыху вальней.

— А за вершы яшчэ раз дзякуй! — сказала Люся і пабегла да школы, бо там ужо прызыўна заліваўся званок.

На другім уроку Рома мала-памалу ачомаўся. Размова з Люсяй падбадзёрыла яго, прымусіла задумацца: можа, праўду сказала яна, можа, дарэмна ён так перажывае?..

Побач, нібы здань, блукала яшчэ адно неадступнае пытанне: хто аўтар запіскі? Але западозрыць каго-небудзь з аднакласнікаў Рома не мог...

«А што, калі?» — і тут Рома адважыўся. Гэта рашэнне прыйшло да яго радаснай нечаканасцю.

«Пабачым, што ты цяпер напішаш!» — Рома нарэшце асмеліўся ўзняць галаву і азірнуцца туды, дзе сядзела

Люся. Потым яго пераможны позірк прабег па ўсіх радах, нібы адшукваў таго, невядомага...

І як толькі празвінеў званок і настаўніца англійскай мовы выйшла з класа, Рома рашуча дастаў з сумкі свой пакуначак. Ён разгарнуў паперу, дзьмухнуў на букецік раз, другі. Пялёсткі пралесак уздрыгнулі, ажылі, нібы ў прадчуванні чагосьці хвалюючага...

Рома падышоў да Люсі і смела працягнуў ёй букецік.

— Вось... Віншую з днём нараджэння! — сказаў, быццам упершыню з высокага трампліна скокнуў...

Люся так і зардзелася, радасная, разгубленая:

— Дзякую, Рома! Якія прыгожыя!

Вакол успыхнулі дружныя воплескі, узняўся шум і гам, як пры самай незвычайнай падзеі.

Рома ўсё ж не вытрымаў: ён крута павярнуўся і шпарка, ледзь не подбегам, кінуўся да дзвярэй.

І толькі на сонечным школьным двары, нібы вынырнуўшы з рачной глыбіні, Рома з палёгкай уздыхнуў. Цяпер яму было ўсё роўна: будзе другая запіска ці не.

## СУТЫЧКА

Ён заступіў мне дарогу і пісклявым голасам спытаў:

— Можна з табой пасакрэтнічаць?

Я паглядзеў у загарэлы, з аблупленым носам-фасолінкай твар і згодна кіўнуў галавой.

Які там сакрэт? Я ж не ведаў нават яго імя, бо прыехаў у «Лясную казку» з паўгадзіны назад. Важатая сказала, што я залічаны ў другі атрад і з усімі пытаннямі павінен звяртацца да яе. Хлопец з носам-фасолінкай, які шныпарыў побач, адразу ж паведаміў:

— Я таксама з другога атрада.

Вось і ўсё знаёмства.

— Пайшлі,— сказаў ён, і я паклыпаў за ім да зялёнай альтанкі, якая надзейна схавала нас ад паўдзённай спякоты.

Ён яшчэ раз агледзеўся і, узяўшыся за перламутравы гузік маёй стракатай, з райскімі птушкамі, тэніскі, фанабэрыста спытаў:

— Ты ўмееш гуляць у шахматы?

— Не-е.

— Няўжо?

— Праўда,— адказаў я.— У шашкі магу.

— Ха-ха,— ён глядзеў на мяне з насмешкай.— Знайшоў чым хваліцца.

— Я на школьным чэмпіянаце другое месца заняў,— спрабую апраўдвацца.

— Другое — не першае,— з'едліва зазначыў ён, сустрэўшы маё паведамленне халоднай усмешкай.— А ў «марскі бой» гуляеш?

— Не-е.

— Ты, мусіць, і біцца не ўмееш? — у яго голасе прагучала пагарда.

— Чаго біцца? — я глядзеў на хлопца з аблупленым носам вачыма Нязнайкі, які ўпершыню трапіў на Месяц.— Бойка — апошняя справа.

— Няўжо апошняя? — незнаёмы разглядваў мяне з дапытлівай замілаванасцю, маўляў, такіх дзівакоў ён нават у кіно не бачыў.— А калі я цябе зараз стукну, ты скажаш дзякуй?

— Паспрабуй,— адказаў я, міжволі сціскаючы кулакі.

— Глядзі! — радасна ўсклікнуў хлопец.— А мне здалося, што ты самы апошні баязлівец.

— Каго баяцца, цябе? — Я кіўнуў на яго тонкія з вострымі локцямі рукі, якія матляліся ў кароткіх рукавах салатавай футболкі.

Ён перахапіў мой позірк і нікольки не сумеўся.

— Думаеш, я слабак? Гэта толькі з выгляду... У нашай школе ёсць секцыя па барацьбе самба. Я ўжо другі год у ёй займаюся. Хочаш, пакажу табе адзін прыёмчык?

— Не трэба, іншым разам,— я аднекваюся, чамусьці без усялякіх ваганняў паверыўшы ў забіяцкія вартасці незнаёмца.

—— Ага, не трэба! — ён задаволена прысвіснуў і з пераможным выглядам выскаліўся.— Не, ты ўсё ж баязлівец, па вачах бачу.

— Ну і што? — кажу, быццам ад надакучлівага камара адмахваюся.

— Нясоладка табе будзе. Ты ў летніку першы раз?

— Першы,— адказваю спакойна, хаця слухаць такое, нібы горкія пілюлі ад прастуды глытаць.

— З вёскі прыехаў?

— З Бярозаўкі, мне пуцёўку ў школе далі. Наш клас у зборы лекавых траў вызначыўся, а я больш за ўсіх назбіраў.

— Вясковыя ўсе такія... нясмелыя. Я адразу заўважыў, што ты навічок,— ён прапусціў міма вушэй мае словы пра

збор лекавых траў і, крыху разважыўшы, дадаў: — Вось я і вырашыў табе дапамагчы.

— Як дапамагчы?

— Вельмі проста. Я ў «Лясной казцы» буду трэцюю змену адпачываць, мне ўсе дзіркі ў агароджы знаёмыя. Я сюды пасля чацвёртага класа ўпершыню прыехаў. Можам у любы момант пайсці і малінамі паласавацца ці да дачнікаў па яблыкі злазіць. Тут зусім побач цэлы пасёлак, праўда, там таксама высокія парканы. Ды са мной не прападзеш.

— Ведаеш, я па чужых агародах не ўмею лазіць.

— Не хвалюйся, навучу,— ён заспакойвае мяне з нахабнаватай упэўненасцю, быццам я гатовы пайсці за ім на край свету.

І адкуль толькі ўзяўся на маю галаву гэты шустры? Што яму ад мяне трэба? Сказаць бы яму некалькі слоўцаў, каб адчапіўся,— але я чамусьці маўчу, ды і пра яго сакрэт карціць даведацца. А тут яшчэ гарачыня зусім размарыла, з альтанкі страшна вылазіць. Добра, што пакуль важатыя «Лясной казкі» абмяркоўваюць, як мы будзем праводзіць урачыстую лінейку.

— У летніку я больш за ўсё «ціхі» час ненавіджу: сярод белага дня спаць укладваюць, быццам ночы не хапае. Тут кожны твой крок пад наглядам, нават на рэчку па камандзе ходзяць. Ды я ўхітраўся і без каманды купацца.

— А ты спрытны,— не вытрымліваю, каб не пакпіць з незнаёмца.

— Без гэтага нельга,— аўтарытэтна заяўляе шустры.— Думаеш, у «Лясную казку» лёгка трапіць?.. Табе пашанцавала, у перадавікі выбіўся, узнагародзілі. А мой тата вунь колькі пабегаў, пакуль мне пуцёўку дастаў.

— Дык табе ж тут не падабаецца: «ціхі» час, розныя каманды, купацца не пускаюць,— пачуццё калючай непрыязнасці да хлопца з носам-фасолінкай паступова ахоплівае мяне.

— Каманды камандамі, а лепшага летніка за «Лясную казку» не знойдзеш. Я летась за змену аж на два кілаграмы папраўіўся. Тут вунь якое меню! Клубніцы даюць, нават апельсіны бываюць.

— А што, дома цябе кепска кормяць? — мяне так і цягне за язык, каб падкалоць шустрага.

— Не-ее...

— А чаму такі худы?

— Спортам многа займаюся, барацьбой самба, за шах-

матамі гатовы цэлы дзень праседзець. Тады да мяне не падыходзь, пра ўсё на свеце забываюся.

— З-за свайго спорту і на сонцы мала бываеш, зусім не загарэў, белы, як у бальніцы ляжаў.

— Да мяне загар не прыстае,— шустры апраўдваецца і адразу ж пераводзіць гаворку на іншую тэму: — У цябе адкуль такая тэніска?

— Як адкуль?

— Загранічная, мусіць... Птушкі не нашы, заморскія.

— Ты адгадаў. Гэтую тэніску мой брат прывёз з Кубы. Ён механік карабля, па ўсіх акіянах плавае.

— Вось здорава! Нездарма я тут з табой час марную.

— Чаму нездарма?

— Я маркі збіраю, філатэліяй захапляюся. Мы з табой будзем перапісвацца. Ты ў свайго брата папросіш, каб ён маркі розных краін прысылаў, згода?

Шустры гаворыць, як па пісаным чытае. Быццам мы з ім сябрукамі найпершымі сталі і пакляліся ў вечнай дружбе. Складна выходзіць, усё падлічыў, размеркаваў...

— Ты што, не згодны?

Ён нецярпліва штурхае мяне ў плячо. Маё маўчанне абурае яго.

— Чаго згаджацца, трэба падумаць,— я наўмысна расцягваю кожнае слова.

— Дзівак, я ў даўгу не застануся. Рэдкая марка — гэта цэлы скарб. Мы з табой зможам не толькі на цукеркі зарабіць. Варта мне ля магазіна «Філатэліст» з заморскімі марачкамі з'явіцца, як там цэлы натоўп збярэцца. А ў вёсцы твае маркі нікому не патрэбны, ты з іх нават заціркі не зварыш,— ён задаволена выскаліўся і аж прытупнуў сваімі жоўтымі замшавымі сандалетамі.

— А ты яшчэ і гандляр-камбінатар,— кажу я, але мае словы ніколькі не кранаюць яго.

— Табе гэтага не зразумець,— ганарліва зазначае шустры.— Вясковыя ўсе такія цюхцявыя, прывыклі чужым розумам жыць...

І раптам я не вытрымаў. Раней такое са мной ніколі не здаралася. А тут мяне ўсяго аж трэсла ад пякучага гневу. І я стукнуў шустрага.

— Ты што, ты што? — ён ускочыў з лаўкі, як уджалены.

— Вымятайся адсюль, жук каларадскі! — ціха сказаў я і паднёс кулак да носа-фасолінкі.— Ну-у!

Ён спалохана войкнуў і выслізнуў з альтанкі.

— Псіх ненармальны! Гэта табе так не пройдзе, я ва-

жатай скажу. Цябе адсюль за хуліганства вытурацць, вось пабачыш, дурань вясковы,— прыгразіў шустры і подбегам заспяшаўся прэч.

Самбіст-філатэліст уцякаў, аж пыл курэў з-пад яго замшавых сандалетаў. І на свае прыёмчыкі і сакрэты забыўся...

Я застаўся ў альтанцы адзін. На змену раптоўнаму ўзрушэнню прыходзілі невясёлыя думкі: «І трэба было мне пагарачыцца, цяпер непрыемнасці не абярэшся. А хіба з такімі можна па-добраму? Хіба яны разумеюць дабро?..»

Гарачыня даймала і тут, у цяньку. Падумалася пра ласкавую прахалоду рэчкі Заранкі, што прабягае побач з роднай Бярозаўкай, пра сяброў, якія засталіся там, у вёсцы,— і шчымлівае пачуццё самоты ахінула мяне. Я зажмурыўся, зручней уладкаваўся на лаўцы і пачаў чакаць, калі шустры прывядзе важатую. Я быў упэўнены: тая разбярэцца ва ўсім.

## ПАСТКА

Здарылася так, што гаворка пра летні адпачынак Алёшкі пачалася якраз тады, калі ў госці завітаў дзядзька Серафім.

Маці настойвала на пуцёўцы ў летнік, а бацька пярэчыў, маўляў, Алёшка ўжо не маленькі, яго можна адправіць у вёску, да бабулі, тым больш што ўнука там даўно чакаюць.

Алёшка быў рады ехаць да бабулі, але ў размову ўмяшаўся дзядзька Серафім.

— Хопіць вам спрачацца, я вашага Алёшку выручу. Яму такое яшчэ нават і не снілася.

Алёшка, бялявы, танклявы хлопчык, з доўгімі, нібы ў дзяўчынкі, вейкамі над шэрымі вачыма, слухаючы дарослых, быў з твару спакойны. Ён стаяў ля акна і з вышыні пятага паверха назіраў за вуліцай, за імклівай плынню аўтобусаў, тралейбусаў, грузавікоў.

Летась ён адпачываў у бабулі, дык пра тыя райскія дні аж сёння прыемна ўспомніць. Алёшка быў там сам сабе гаспадар, ніхто не надакучаў яму перасцярогамі: не бегай, не заплывай далёка, на сонцы не перагравайся, як у тым летніку са строгімі важатымі. Бабка Маруся клапацілася толькі аб адным:

— Еш, унучак, еш. Табе расці трэба, дужэць. Мужчына павінен быць моцным...

І Алёшка слухаўся бабку, яму падабалася, што з ім размаўляюць, як з дарослым, што вераць у яго самастойнасць. Ды і чаго тут баяцца, калі ён ужо ў сёмы клас перайшоў,— гэта вам не нейкі там дзетсад, які трэба на вяровачцы вадзіць...

Дык ён і сёлета з ахвотай паехаў бы ў вёску, да лянівай рэчкі Гайны, да духмяных сунічных палян, да задумлівай цішыні росных ранкаў...

Алёшкавы ўспаміны-летуценні перапыніў яхідны голас, які прымусіў насцярожыцца і адвярнуцца ад акна. Хлопчык убачыў, як дзядзька Серафім задаволена пагладзіў свой поўны жывот, і яго круглы чырвоны твар, нібы нераспелы памідор-велікан, асвяціўся самазадаволенай усмешкай.

— Э-э-э-х, Іван, Іван,— дзядзька Серафім пачаў здалёк.— Крыўдуй не крыўдуй, а праўду я скажу.

— Ды скажы ўжо, скажы,— ніякавата адазваўся бацька.— Ведаем тваю праўду...

— Хоць і родны ты мне брат,— працягваў дзядзька Серафім,— а не разумею я цябе. Не ўмееш ты жыць... І ў каго ты такі ўдаўся?

— Што зробіш, браток, не ў цябе,— кпліва зазначыў бацька.

— Трэба мне за твайго Алёшку ўзяцца,— прыцмокнуў тоўстымі губамі дзядзька Серафім.— Інакш вырасце ён у цябе ягнём, якому жыць у вечнай боязі.

— Не ўжо, не чапай майго сына, не табе яго розуму вучыць!

Бацька ўзрушана падняўся з-за стала.

— Ды я пажартаваў, супакойся,— дзядзька Серафім усміхнуўся.— А вось на лета я Алёшку бяру на сваю дачу. Лес, рэчка, паветра — азон: сапраўдны курорт.

Ад гэтых слоў Алёшку аж скаланула, нібы ён басанож ступіў на чмялінае гняздо. Але дзе тут будзеш пярэчыць, калі маці адразу ж пачала дзякаваць дзядзьку за шчодрасць, за добрае сэрца. Бацька таксама прамаўчаў, бо ў іх сям'і апошняе слова было за маці.

— Адпачнеш у мяне, пляменнічак, на ўсе сто. Сёлета мой садок будзе ўпершыню пладаносіць, і без памочніка мне не абысціся,— задаволена разважаў дзядзька Серафім. Ён з натугай вылез з-за стала і, куляючыся на кароценькіх ножках, падкаціўся да Алёшкі, абняў яго за плечы.— Мая гаспадыня з Ірышкай на поўдзень паедзе, урачы прыпісалі чарнаморскія ванны. Ды мы і адны справімся. Будзем каралямі жыць. Ні табе важатых, ні табе выхаваўчых пяціхвілінак...

І Алёшка вымушаны быў паехаць на дзядзькаву дачу, насуперак сваёй волі, свайму патаемнаму жаданню правесці лета ў бабулі.

Здавалася, што больш трэба: рэчка побач, лес таксама, клубніцы, раннія яблыкі ў садзе,— адпачывай, моцы набірайся. Ды было адно «але», якое не давала Алёшку спакою, прымушала яго сэрца сціскацца ад незразумелай крыўды і пякучай непрыязнасці да дачных канікулаў. Толькі змяніць што-небудзь ён не мог...

Так ішлі дні за днямі, нудныя, падобныя адзін на другі, нібы зялёныя ягады на агрэставым кусце...

І вось аднойчы хтосьці залез у сад да дзядзькі Серафіма, залез праз высокую дашчаную агароджу з калючым дротам. Злодзей быў асцярожны і разборлівы. Ён не латашыў спехам усё, што пад руку трапілася, а сарваў некалькі крамяных, нібы высветленых з сярэдзіны, пладоў з ранняй яблынькі, да якой дзядзька Серафім баяўся падпускаць нават Алёшку.

— Рана яшчэ, зялёныя,— гаварыў ён, з замілаваннем пазіраючы на цуда-дрэўца, быццам на ім раслі не звычайныя яблыкі, а залатыя.

У дзядзькі Серафіма ўсё было на строгім уліку: кожны яблык, кожная ягада. Ён і Алёшку часта напамінаў, што многа есці зеляніны шкодна, што ад аскоміны зубы крышацца, што трэба прывучаць сябе да беражлівасці. Аднаго толькі Алёшка ніяк не мог зразумець: і чаго шкадаваць гэтую зеляніну, калі яе вунь колькі ў дзядзькавым садзе, калі ён ледзь не кожную раніцу возіць клубніцы на сваім «Запарожцы» ў горад, на рынак?

Дзядзька Серафім адразу ж прыкмеціў прапажу. Яго твар-памідор яшчэ больш зачырванеўся, а вочкі-гузічкі зрабіліся злымі і калючымі. Спачатку ён падазрона разглядваў Алёшку, і яго позірк прымусіў хлопчыка сумецца і разгублена паціснуць плячыма, маўляў, я нічога не ведаю.

— Ды не, ты такое не мог зрабіць,— нарэшце сказаў дзядзька Серафім.— Не мо-о-г. А хто?

З гэтымі словамі ён рупліва пашкандыбаў у сад, спадзеючыся знайсці там адказ на сваё пытанне.

Алёшка бачыў, як дзядзька Серафім раўніва аглядваў кожны куст і кожнае дрэва, а потым нырнуў у густы зараснік малінніку, што падступаў да агароджы. Назад ён выскачыў без аглядкі, быццам за ім гнаўся цэлы вывадак шэршняў. Яшчэ здалёк Алёшка пачуў яго раз'юшаны голас:

— Ах галадранцы, ах паразіты! Падумаць толькі: дош-

ку адарвалі, зрабілі пралаз — дзядзька Серафім доўга не знаходзіў сабе месца, сноўдаў па двары і ўсё войкаў, ахкаў, нібы ўчадзелы.

Нарэшце ён спыніўся і зняможана апусціўся на лаўку пад разгалістым клёнам, на якой сядзеў Алёшка. Дзядзька Серафім выцер шырокай пухлай далоняй кроплі поту з чырвонага твару-памідора і помсліва прамовіў:

— Ні-чо-о-га, злазіў адзін раз, палезе і яшчэ. Яму гэтыя яблычкі бокам вылезуць...

Выказаўшы пагрозу ў адрас таго, невядомага, дзядзька Серафім задаволена сплюнуў і хітравата падміргнуў Алёшку:

— Вось так, пляменнічак, і жывём. Зайздроснікаў вакол, што камароў на балоце. На чужое ўсе ласы... Чужы дабрабыт спакою не дае, каб на вас ліха!

Дзядзька Серафім падняўся з лаўкі і пайшоў да дашчанай паветкі. А Алёшка, успомніўшы, што сёння яшчэ не купаўся, непрыкметна знік з двара.

Калі ён праз гадзіны паўтары вярнуўся з рэчкі, дзядзькі Серафіма дома не было. На кухонным стале побач з бутэлькай малака і батонам ляжала запіска:

«Паехаў у горад, абедай адзін». І крыху ніжэй: «У сад не хадзі, чакай мяне».

Алёшка здзіўлена паціснуў плячыма. «Чаму не хадзіць у сад? Раней жа дзядзька не забараняў... Мабыць з-за той адарванай дошкі».

Але Алёшку гэтая забарона ніколькі не засмуціла. Ён і раней заходзіў у сад не так часта, бо заўсёды помніў дзядзькаў наказ:

— Усё тут працай набыта, кожны яблычак маім мазалём выгадаваны. У ашчаднасці і беражлівасці — сэнс нашага жыцця...

Алёшка падсілкаваўся малаком і батонам, а потым пайшоў на двор і лёг у мяккі гамак, які быў падвешаны паміж клёнам і плотам. Густая лістота дрэва засцерагала хлопчыка ад сонечнай спякоты, і ён хутка адчуў, што ім памалу авалодвае лагодная санлівасць.

Алёшка пачаў драмаць, як раптам да яго слыху, нібы з-пад зямлі, даляцеў крык, роспачны, адчайны. Ён мігам выскачыў з гамака і прыслухаўся. Ці не здалося? Крык паўтарыўся: «О-ой, о-ой! Памажы-ы-це-е!» Голас даносіўся з саду, і Алёшка, забыўшыся на забарону дзядзькі Серафіма, кінуўся туды. Хтосьці клікаў на дапамогу, хтосьці трапіў у бяду...

Алёшка разгублена спыніўся пасярод саду і агледзеўся,

бо ніяк не мог уцяміць, хто і дзе крычыць, каму памагаць?

— А-а-а! — сцішэлы стогн прымусіў Алёшку схамянуцца і агледзецца. Цяпер ён упэўніўся, што крык далятае з малінніку, куды нядаўна лазіў дзядзька Серафім.

Алёшка прабег па баразне, уздоўж роўнага рада разлапістых кустоў парэчак, і апынуўся ля густога высокага малінніку, які сям-там раўняўся з двухметровай агароджай. Разважыўшы з хвіліну, ён пачаў прабірацца па вузкім праходзе паміж дашчанай сцяной і цесна сплеценым маліннікам. Тут было горача і душна, дошкі едка патыхалі разамлелай смалой.

Нечакана зараснік адступіўся ад агароджы, утвараючы вусцішную палянку, і Алёшка проста перад сабой убачыў незнаёмага хлопца, гадоў дванаццаці, які, скурчыўшыся, ляжаў на зямлі. Твар яго, спалатнелы і заплаканы, выказваў столькі пакутлівага болю і роспачы, што на Алёшку быццам ледзяным холадам падзьмула.

— Ты чаго? — спытаў ён разгублена, убачыўшы, што рукі хлопца моцна трымаюцца за бліскучы дрот, які прыкручаны да чорнага провада.

— А-а-а! — ціха прастагнаў незнаёмы, скіраваўшы на Алёшку ўмольны позірк.

І тут ён зразумеў усё. Гэта здагадка была для Алёшкі раптоўным, страшэнным выбухам...

Далей Алёшка дзейнічаў нібы ў нейкім паўзабыцці, перасільваючы здранцвенне і страх. Ён асцярожна падкраўся да чорнага провада-вужакі, а потым, ухапіўшыся за яго дзвюма рукамі, з усяе сілы пацягнуў на сябе. Бліскучы дрот выслізнуў з хлопчыкавых пальцаў, і Алёшка адным узмахам шпурнуў чорны провад праз маліннік, у сад. Незнаёмы ўткнуўся тварам у зямлю і заціх.

Алёшка кінуўся да будынка дачы. Ён хутка адшукаў на сцяне веранды разетку і выхапіў з яе штэпсель, які быў злучаны з чорным провадам. Потым Алёшка спехам напоўніў вадой малочную бутэльку і пабег назад. Цяпер ён ведаў, што рабіць, каму памагаць...

Калі Алёшка зноў апынуўся ля хлопца, той спалохана падхапіўся з зямлі на калені і ўтаропіўся на яго сваімі вялікімі чорнымі вачыма.

— На, выпі вады! — Алёшка хуценька падаў бутэльку.

Хлопец адразу ж схамянуўся і, удзячна кіўнуўшы галавой, пачаў прагна піць. Яго рукі дрыжалі нібы ў ліхаманцы, вада пралівалася, сцякала на клятчастую тэніску. Алёшка стаяў збоку і нерашуча пераміналася з нагі на нагу. Ён адчуваў сябе ніякавата, нібы сам прыдумаў гэтую пастку...

Хлопец нарэшце адарваўся ад бутэлькі і аддаў яе Алёшку.

— Дзякуй,— яго ціхі і дрыготкі голас парушыў няёмкае маўчанне.

— А я пачуў і хутчэй сюды,— сказаў Алёшка.— Ну і ўліп жа ты.

— Гэта ўсё з-за Пецькі Цыпрука. Яму «Арлёнак» нядаўна купілі, а задарма ён не дае катацца,— вінавата апраўдваўся хлопец.

— Ты ўчора сюды таксама лазіў? — здагадаўшыся, спытаў Алёшка.

— Я тут не першы раз,— прызнаўся хлопец.— Пецьку клубніцы насіў і яблыкі. Я многа не рваў, каб ніхто не заўважыў.

— А вось і заўважылі,— сказаў Алёшка.— І пастку паставілі.

— Якую пастку?

— Бліскучы дрот з электрычным токам па-твойму не пастка?

— Я ж не ведаў... Хацеў дрот убок адкінуць, а ён і прыліп да рук.

— Цяпер будзеш ведаць,— тонам бывалага чалавека зазначыў Алёшка.— Тваё шчасце, што я побач быў.

Алёшка насцярожыўся і прыслухаўся. Непадалёк пачулася знаёмае гудзенне матора легкавой машыны. Сумненняў быць не магло: з горада на сваім «Запарожцы» вяртаўся дзядзька Серафім.

«Ну, цяпер мне ўляціць,— падумаў з трывогай Алёшка.— Вось будзе крыку. Без дазволу ў сад зайшоў... А чым апраўдаешся? Што хлопца вызваліў? Дык дзядзька ж сам падстроіў... Помсціў за свае яблычкі...»

— Пайшлі хутчэй, гаспадар прыехаў,— сказаў Алёшка і першы нырнуў у пралаз.

Хлопец азірнуўся і спрытна нырнуў за ім.

— Бывай,— сказаў Алёшка, калі яны спыніліся ў арэшніку, што пачынаўся адразу ж за агарожай.— З Цыпруком не дружы. Ён цябе да дабра не давядзе...

— А я з ім і не дружу... Гэта ўсё з-за «Арлёнка». Мне тата абяцаў купіць... на дзень нараджэння.

— Вось і добра...

— Ну, я пабег. Вялікі дзякуй за выратаванне! — Незнаёмы, не аглядваючыся, паспешліва знік за шыракалістай сцяной арэшніку.

Алёшка нейкі момант стаяў на месцы, не ведаючы, што рабіць, куды ісці. Тое, што здарылася тут, у дзядзькавым

садзе, па-ранейшаму працінала ўсю яго істоту калючымі дрыжыкамі, ён ніяк не мог супакоіцца.

І тая незразумелая крыўда, тая пякучая непрыязнасць, якія выспявалі ў яго душы ўсе апошнія дні, раптам надалі Алёшку рашучасці, прымусілі павярнуць назад, да пралаза ў агароджы.

Алёшка сутыкнуўся з дзядзькам Серафімам на двары ля разгалістага клёна. Дзядзька нёс пустыя кошыкі, на яго твары блукала задаволеная ўсмешка, мабыць, паездка на рынак была паспяховай.

— Як адпачываецца, пляменнічак? Што новенькага ў тваім бязвоблачным летнім дзяцінстве?

— Вы, вы!! — голас у Алёшкі перахапіла, яму нестава-ла паветра.

Дзядзька Серафім, адчуўшы нядобрае, выпусціў з рук кошыкі, у яго вочках-гузічках успыхнулі халодныя агеньчыкі.

— Як вы маглі! — Алёшку ўсяго аж трэсла.— Вы — нядобры чалавек, вы — сквапны кулак! Я ненавіджу вас... Больш тут і нагі маёй не будзе!..

Алёшка спяшаўся выгаварыцца, спяшаўся выказаць усю сваю крыўду, усю сваю нянавісць.

Твар-памідор дзядзькі Серафіма пабялеў, выцягнуўся, быццам з яго раптам выціснулі ўвесь чырвоны сок.

— Алёшка, што з табой?!

— Вы — злачынец!

Больш Алёшка не мог гаварыць, не мог быць побач з чалавекам, якога так узненавідзеў. Ён павярнуўся і пайшоў прэч.

Алёшка кіраваў да аўтобуснага прыпынку, які знаходзіўся на шашы кіламетры за чатыры ад дачнага пасёлка. Здарэнне ў садзе, сутычка з дзядзькам Серафімам падганялі Алёшку, прыспешвалі яго хаду, быццам ён сам толькі што выратаваўся ад электрычнай пасткі.

## АЎТОГРАФ ПЕЛЕ

Яны сустрэлі мяне ў пад'ездзе, калі я прыцемкамі вяртаўся дадому. У матавым святле лямпачкі, што вісела ля дзвярэй, я ўбачыў Дзіму Маёрава з суседняга дзевяціпавярховага дома і незнаёмага хлопца.

— А мы цябе зачакаліся,— Дзіма выйшаў наперад, на макаўцы яго круглай галавы тырчаў бялявы непаслухмяны віхор.

— Апошняя трэніроўка,— сказаў я, паказваючы на свае запыленыя кеды.— Усе стараліся да сёмага поту.

— Заўтра — фінал,— заўважыў даўгалыгі незнаёмец у чырвонай футболцы.

— Ага, будзе схватка! — павесялеў Дзіма і тут жа дадаў: — Пазнаёмся, Слава Батурын, капітан «Ракеты».

— Сярожа,— працягнуў я руку, углядаючыся ў скуласты твар з тонкім шрамам на ніжняй губе.

Мая цікаўнасць была не выпадковая. Пра Славу Батурына я пачуў ад Дзімы яшчэ некалькі дзён назад, калі стала вядома, што наша «Чайка» будзе гуляць у фінале з «Ракетай».

...Тады Дзіма падлавіў мяне на школьным стадыёне і, адвёўшы ў зацішны куток, загадкава паведаміў:

— А ў мяне для цябе ёсць сюрпрыз.

Я абыякава паглядзеў у яго прыжмураныя хітраватыя вочы і паціснуў плячыма, маўляў, што там за «сюрпрыз»...

— Капітан «Ракеты» хоча пабачыць цябе,— Дзіма насцярожана азірнуўся.

— Няўжо? — усміхнуўся я.

— Чакай-чакай, смяяцца будзеш потым. Капітан «Ракеты» — мой сябар, таксама сямікласнік, мы з ім за адной партай сядзім. Ён, як і я, у спецыялізаванай школе вучыцца, з другога класа па-нямецку «шпрэхаем».

— Ну і што? Гэта і ёсць твой сюрпрыз?

Але Дзіма не спяшаўся выкладваць сваю таямніцу, памаўчаў, яшчэ раз азірнуўся.

— Славаў брат — журналіст, у Маскве працуе, за граніцай часта бывае. Нават з самім Пеле сустракаўся.

— Можа, і за ручку давялося павітацца?

— Вітаўся ці не вітаўся — сказаць не магу... Толькі фота Пеле з яго аўтографам брат прывёз Славу ў падарунак.

Я сустрэў яго словы спакойна, як самую звычайную выдумку, але Дзіма, здаецца, не жартаваў.

— Можа, не верыш? Я сам бачыў: на фотаздымку Пеле з мячом стаіць, а знізу яго подпіс. Ды і брат Славаў цяпер у Мінску, можаш у самога запытаць, калі сумняваешся.

Аўтограф Пеле! Няўжо праўда? Я другі год збіраю фота вядомых спартсменаў. У маёй калекцыі ёсць аўтографы футбаліста Малафеева і шашыста Гантварга, фехтавальшчыка Сідзяка і барца Мядзведзя... А тут — сам Пеле!

— Кажаш... аўтограф Пеле? — нібы між іншым спытаў я, стараючыся не выказваць сваёй зацікаўленасці да Дзімавай навіны.

— Ага,— ён адразу ж схамянуўся.— Слава з табой хоча сустрэцца і пагаварыць.

— Пра што?

— Не ведаю, ён табе сам скажа,— Дзіма паказаў свае рэдкія, крывыя зубы.— Магу па сакрэту паведаміць, што ўсё залежыць ад цябе. Калі пажадаеш, аўтограф будзе твой.

Больш ён нічога не сказаў.

...І вось гэтая сустрэча ў пад'ездзе, знаёмства пры святле матавай лямпачкі.

— Заўтра сустракаемся ў фінале,— капітан «Ракеты» прыхінуўся спіной да сцяны

— За першае месца паспрачаемся,— удакладніў я.

— Цяжка будзе нам з леташнімі чэмпіёнамі саперні-чаць,— Слава пераглянуўся з Дзімам і дадаў: — Адзін капітан «Чайкі» чаго варты! Каб нам такога ігрока!

— Ды наша «Чайка» і без мяне можа першы прыз «Скуранога мяча» заваяваць.

— А я магу ў заклад ісці, што без цябе «Чайка» прайграе «Ракеце» з сухім лікам,— у голасе Дзімы я адчуў падначку.

— Так ужо і з сухім,— не здаваўся я.

— Давай паглядзім! — гарачыўся Дзіма.

— Хопіць спрачацца! — Слава адхінуўся ад сцяны. У кожным руху яго спартыўнай постаці адчувалася ўпэўненасць.

Я адразу заўважыў, што капітан «Ракеты» не любіць, калі з ім не згаджаюцца. Гэта, мусіць, ведаў і Дзіма, бо ён не стаў пярэчыць, а пакорліва адступіў убок.

— Збіраеш аўтографы?

— Збіраю,— адказаў я з ранейшай насцярожанасцю.

Капітан «Ракеты» чамусьці выклікаў у мяне недавер.

— Магу ашчасліўіць! — сказаў Слава і выцягнуў з задняй кішэні сваіх заграні́чных тэхасаў невялікае квадратнае фота.

Гэта быў Пеле! Не газетная выразка ці каляровая паштоўка, а сапраўдны фотаздымак з мудрагелістым шыкоўным подпісам.

— А цяпер бліжэй да справы.. Тут адна гісторыя... Можна сказаць, далікатная... Так, Дзім?

— Яшчэ якая далікатнасць! — падхапіў той.— Ды я ўпэўнены, што Сярожа зразумее цябе... як футбаліста. Такі аўтограф!

Капітан «Ракеты» рашуча, быццам адганяючы камара, узмахнуў рукой і сказаў:

— Трэба, Серж, каб твая «Чайка» заўтра прайграла.

— Ты што?!

— Ведаеш, я пахваліўся брату, што мы выйграем фінал... Вельмі прашу, Сержык, выручы! У тваёй «Чайкі» прызоў хапае, а тут... Ну, пастарайся заўтра не забіваць галы ў нашы вароты, пры выпадку ў сваёй штрафной... Ды хіба мне цябе вучыць?! Усё будзе ціха, камар носа не ўшчэміць. У футболе інакш нельга...

Я быў аглушаны, быццам атрымаў удар у жывот, калі цямнее ўваччу і перахоплівае дыханне.

Такое са мной здаралася на футбольным полі. Бывала, прыставяць «апекуна», гэта значыць, абаронцу, і ён цэлы матч па пятах бегае. Я — на левы край, і ён туды ж, зробіш фінт у цэнтр, і мой «цень» таксама побач. Ну што ж, бегай сабе, гэта правіламі гульні не забараняецца. Ды толькі ў такога «апекуна» цярпення не заўсёды хапае, а тут калі яшчэ гол заб'еш...

— Лаві момант! Такі аўтограф... самога Пеле!

Дзіма ўлюбёна глядзіць на Славу.

— Хітра вы прыдумалі,— мала-памалу пачынаю цяміць, што да чаго.— Аперацыя «Ы» — і гол у свае вароты.

— Якая тут хітрасць! — капітан «Ракеты» прыжмурваецца.— Ты — нам, мы — табе, агульная справа.

— Слухай, Сярожа, я чуў, што ў цябе канфлікт з «Чайкай», нібы капітанскую павязку могуць зняць, праўда? — У голасе Дзімы чуюцца спачувальныя ноткі.— Падумаць толькі: такога іграка не шануюць...

Гэта ўжо было падобна на здзек, Дзімавы кепікі — стрэмка пад пазногаць. Усё разведалі, дакладна разлічылі...

— Можаце каціцца са сваім аўтографам, не на таго натрапілі! — выкрыкнуў я і заспяшаўся па лесвіцы на чацвёрты паверх, адчуваючы ва ўсім целе непрыемныя дрыжыкі.

Капітан «Ракеты» дагнаў мяне паміж другім і трэцім паверхамі.

— Прабач, гэта ўсё Дзім наплявузгаў... Лічы, што паміж намі не было сённяшняй размовы. Пажартавалі... і толькі.

— Хай і не было,— згадзіўся я.

— На, вазьмі аўтограф, ён мне не патрэбны,— раптам выпаліў Слава.— Хай будзе ў тваёй калекцыі.

Я не паспеў апамятацца, як капітан «Ракеты» сунуў мне ў рукі фотаздымак, а сам, пераскокваючы цераз прыступкі лесвіцы, кінуўся прэч.

— Да сустрэчы ў фінале! — данеслася да мяне знізу.

Я нейкі момант здзіўлена ўглядаўся ў белазубую ўсмешку Пеле, губляючыся ў здагадках: «Якая муха ўкусіла Славу? Чаму ён аддаў фота, калі я адмовіўся прыняць яго прапанову?..» Так і не знайшоўшы адказ на свае пытанні, я пачаў паволі падымацца наверх, адчуваючы незразумелую трывогу перад заўтрашнім днём. Нават не радаваў рэдкі аўтограф выдатнага бразільскага футбаліста, бо ў вушах стаялі словы Дзімы пра «капітанскую павязку». Калі толькі паспеў ён пранюхаць?..

І ўсё ж я не губляў надзеі: заўтра наш трэнер Алег Сямёнавіч перадумае і адменіць сваё рашэнне. Я вельмі спадзяваўся, што мне даруюць...

Але калі на другі дзень раніцай мы сабраліся на перадматчавую ўстаноўку, Алег Сямёнавіч сказаў:

— Сазанкоў, перадай павязку Аліку Беламу. Ты не апраўдаў давер'я. Я думаю, што нам трэба пагаварыць аб паводзінах былога капітана.

Што толькі не прыпомнілі яны! І што я на здачу нарматываў комплексу ГПА не з'явіўся, мячык не кідаў, на турніку не падцягваўся. Ды я гэты мячык магу на сто метраў шпурнуць, а тады якраз матч кіеўскага «Дынама» па тэлевізары паказвалі, вось і не прыйшоў на стадыён. У зазнайстве мяне абвінавачвалі, нібы я ў пас не гуляю, на ігракоў пакрыкваю. А хіба тут не будзеш пакрыкваць, калі яны натоўпам за мячом бегаюць?

Выслухаў я гэта, нават паабяцаў выправіцца, а ў самога ўнутры аж кіпіць ад злосці. Паглядзім, думаю, як вы сёння выйграеце, як першы прыз заваюеце. І тут мне ўчарашняя размова з капітанам «Ракеты» прыгадалася. І фота Пеле з аўтографам перад вачыма мільганула і знікла, маўляў, памятай пра Слававу шчодрасць.

Калі «Чайка» і «Ракета» выстраіліся ў цэнтры поля, а капітаны Алік Белы і Слава Батурын абмяняліся поціскамі рук, я зразумеў, што буду гуляць супраць сваіх. І ўжо нішто не магло прымусіць мяне перадумаць, асіліць маю помслівую крыўду. А тут капітан «Ракеты», прабягаючы міма, шматзначна выгукнуў:

— Віншую, Сержык!

Яшчэ адна стрэмка... Але спачатку я ўсё ж забіў гол у вароты «Ракеты». А праз якіх пяць мінут няўдала адкаціў мяч свайму варатару: з-за маёй спіны выскачыў нападаючы «Ракеты» і зраўняў лік. Першы тайм так і закончыўся.

У раздзявалцы мінуту-другую стаяла цішыня, нібы ўсе толькі што выраталіся ад нядобрай пагоні.

— Нічога страшнага,— нарэшце парушыў маўчанне

Алег Сямёнавіч.— Бегалі нядрэнна, трэба пахваліць Сярожу, важны гол забіў. Праўда, потым памыліўся, але з кім такое не бывае... І яшчэ адна заўвага табе, Сярожа. Раней ты захапляўся індывідуальнай гульнёй, а сёння часцей стараешся пас аддаць. У першым тайме ў цябе была выдатная пазіцыя ў штрафной «Ракеты», а ты паспяшаўся адкінуць мяч Дылько, які быў прыкрыты...

Я слухаю трэнера, а самога па-ранейшаму крыўда дапякае: «Будзе вам і пас, будзе і выдатная пазіцыя!»

Недзе адразу ж пасля перапынку я палез напралом, наўмысна сутыкнуўся з абаронцам «Ракеты». Ляжу, скурчыўся, быццам мяне боль невыносны даймае.

— Можа, замену папрасіць? — з трывогай пытаецца расчырванелы Алік, наш новы капітан.

— Нічога, пройдзе.— Я падымаюся.

— Малайчына, Сярожка, без цябе нам не выйграць у «Ракеты»,— Алік, здаецца, гатовы расцалаваць мяне.

— Ага, не выйграеце.— Накульгваючы, бягу за мячом, балельшчыкі воклічамі вітаюць мяне.

Праўда, не абышлося і без свісту, калі я прабіў міма з лініі варатарскай.

— Паднаціснем, Сержык! — радаваўся Слава Батурын, бо наша «Чайка» пачала гуляць «на адбой».

Калі Слава прабіваўся да нашых варот, я кінуўся яму ў ногі непадалёку ад адзінаццаціметровай адзнакі. Слава ўпаў эфектна, нават цераз галаву перакуліўся. Пенальці ён выканаў з майстэрскай дакладнасцю. Наш варатар Віця Кірыленка скокнуў у адзін вугал варот, а мяч уляцеў у супрацьлеглы. Гэта быў апошні гол у фінальным матчы...

Потым прыйшла расплата... Не, мяне ніхто не дакараў, ніхто не абвінавачваў...

Капітан «Ракеты» з горда ўзнятай галавой ішоў па стадыёне. Параўняўшыся са мной, радасна сказаў:

— Дзякуй за падножку, калекцыянер! Камар носа не ўшчэміць...

Вось тут да мяне і дайшло, быццам мне яшчэ адну стрэмку пад пазногаць загналі, нібы пасля гульні ў жмуркі з маіх вачэй павязку знялі. Я стаяў разгублены і спустошаны: ніхто не захапляўся маім футбольным майстэрствам, ніхто не звяртаў на мяне ўвагу. Віншаванні прымаў Слава Батурын і яго каманда...

Калі я ў сумнай адзіноце паклыпаў са стадыёна, ля варот мяне спыніў Дзіма Маёраў. Ён быў незвычайна ўзбуджаны і вясёлы, а яго шчарбаты рот расцягвала задаволеная ўсмешка.

— Здорава цябе Слава вакол пальца... на фальшывы аўтограф купіў.

Я аслупянеў.

— Ха-ха! — Дзіма аж захліпаўся.— Мы самі той аўтограф напісалі, чорнай тушшу, па-нямецку... Эдсан Арантэс ду Насімента...

## ХТО ЛЕПШЫ РЫЦАР

Сёння ў нас з Юрыкам аб'явіўся важны клопат. А ўсё з-за конкурсу, што прыдумала наша стараста Іра Будрык. Ён нават Юрыка вывеў са стану ўстойлівай раўнавагі.

«Хто лепшы рыцар?» Падумаць толькі! Гэты конкурс на лепшага рыцара будзе праходзіць цэлы месяц. А спаборнічаць будзем мы, хлопчыкі шостага класа. Пераможца конкурсу атрымае першы прыз — пуцёўку ў летнік «Зубраня». Аўтарытэтнае журы, у якое ўвайшлі адны дзяўчынкі, узначаліла наша важатая, дзевяцікласніца Оля Грыбкова.

І што вы думаеце?.. Гэты конкурс вельмі зацікавіў Юрыка. Яго шэрыя вочы, здаецца, аж пацямнелі ад нейкіх там патаемных думак. А можа, яму ў «Зубраня» захацелася з'ездзіць?! Ён ледзьве дачакаўся канца заняткаў і стрымгалоў выскачыў з класа.

— Пачакай, Сасноўскі, заўтра ты ў нас за ўсё адкажаш! — пагрозліва крычалі дзяўчынкі ўслед Юрыку.— Скончацца твае штукарствы!

Але ўмовы конкурсу ўступалі ў сілу з заўтрашняга дня, і Юрык прапусціў гэтую пагрозу міма вушэй. Я таксама, не затрымліваючыся, выслізнуў з класа са сваім сябруком, у якога, напэўна ж, ужо быў падрыхтаваны шыкоўны сюрпрыз...

— Вось табе, Максім, і талерачка з блакітнай кветачкай,— падміргнуў мне Юрык сваімі бялявымі вейкамі, калі мы апынуліся далёка ад школы.— Уключаемся ў конкурс!

Я не ступіў больш ні кроку, быццам мае кеды раптам да дарогі прыклеіліся.

— Каб апошняе месца заняць? — скептычна заўважыў я.

— Першае табе не падабаецца? — у сваю чаргу запытаўся Юрык і таксама спыніўся.

— Ды хіба нам адужаць гэты конкурс?

— Што за пытанне? — Юрык цыркнуў слінай і выняў

з кішэні карычневых тэхасаў невялічкі папяровы квадрацік у клетачку.

— Я перапісаў умовы конкурсу. Тут чырвоным (Юрык меў на ўвазе колер пасты сваёй шарыкавай ручкі) па беламу напісана,— сябрук узмахнуў паперкай перад маім носам.

— Ведаю, што напісана, на памяць вывучыў.

— «Пераможцам конкурсу стане той, хто будзе добрым сябрам і ветлівым са старэйшымі»,— прачытаў Юрык і весела прысвіснуў.— Ды што тут складанага? Дзе знойдзеш больш верных сяброў, чым мы з табой? А са старэйшымі я магу быць ветлівым не толькі адзін месяц: «Калі ласка, дайце я паднясу вашу сумку», «Можа, у краму збегаць?..»

Юрык уваходзіў у ролю, нібы артыст у фільме «Іван Васільевіч мяняе прафесію». Вось дзе было смеху, калі мы гэтага Івана Васільевіча глядзелі ў калгасным клубе. І песня ўсім спадабалася... пра слёзы, якія капаюць з Марусіных вачэй.

— Ты трэці пункт прачытай,— я паспрабаваў астудзіць гарачы Юрыкаў настрой.

— Та-ак, з гэтым пунктам мы можам забуксаваць,— Юрык чмыхнуў, быццам папярхнуўся, пазіраючы ў паперку.— «Не крыўдзіць і паважаць дзяўчынак...» Ды хіба з імі мірна пражывеш хоць адзін дзень? А конкурс аб'явілі на цэлы месяц...

— Як жа цяпер з першым месцам? Ці ты забыўся, што ў нашым класе вучыцца Аркаша Лахвіч?

— Тут і ўся загваздка,— Юрык, здаецца, спусціўся з неба на зямлю.— Аркашка — манная кашка... Ён для нас... як у мосце дзірка. Сапернік нумар адзін. Вось для яго я пастараюся сёе-тое прыдумаць.

— Дарэмна цэлы месяц марнавацца. Прыз за першае месца ў рыцарскім конкурсе можна заўтра ж уручыць Лахвічу. Ён, мусіць, сам і прыдумаў гэтае спаборніцтва...

Я нагаворваў на Аркашку з далёкім прыцэлам, каб толькі пераканаць Юрыка, што нам лепш за ўсё конкурсны месяц перачакаць у зацішку. Ды любы ў нашай школе пацвердзіць, што Лахвіч недасягальны, быццам штангіст Васіль Аляксееў у другой цяжкай вагавай катэгорыі. Выдатнік, чэмпіён школы па бегу на 60 метраў, баяніст. І гэта яшчэ не ўсе заслугі Аркашкі.

— Вось табе і талерачка з блакітнай кветачкай,— Юрык азірнуўся і рашуча стукнуў мяне па плячы.— А мы з Аркашкам яшчэ паспрачаемся. Тут сёе-тое наклёўваецца. Сёння вечарам абмазгуем. Яшчэ паглядзім, каму першы прыз дастанецца.

Я каторы раз пераканаўся, што пярэчыць Юрыку — як ваду рэшатам насіць. Ды хіба быў калі выпадак, каб я змог прымусіць Юрыка рабіць так, а не гэтак? Юрык у нашай дружбе за галоўнага: першае і апошняе слова заўсёды за ім.

Сказаў бы ён зараз забрацца на самую верхавіну стогадовай ліпы, што ўзвышаецца пасярод вёскі, і я, не задумваючыся, пакарабкаўся б наверх. Як гэта было раней, калі я па Юрыкавай камандзе лазіў у калгасны сад па чырвоныя трускалкі або цукровыя ранеткі. Юрык заўсёды ў дазоры заставаўся, але аднойчы я быў заспеты вартаўніком дзядзькам Макарам сярод белага дня на градзе. Тады Юрык разяваку прадаў, а я вельмі захапіўся буйнымі ягадамі.

Бацькава «сухапарная лазня» навучыла мяне быць больш асцярожным, але не змагла затушыць нашу дружбу.

Вы, напэўна ж, падумаеце, што Юрык на галаву вышэйшы за мяне, у плячах шырэйшы і валодае хітрымі прыёмамі самба ці каратэ. Памыляецеся! Калі мы з Юрыкам возьмемся барукацца, дык ён ужо на першай мінуце ляжыць на лапатках. І ростам ён не выйшаў, і на турніку больш трох разоў не падцягваецца. Як бачыце, наша дружба мацуецца зусім не на фізічнай сіле...

І калі Юрык вечарам расказваў пра свой дзівосны план — як абысці ў рыцарскім конкурсе Аркашку Лахвіча, я зразумеў, што мяне чакаюць нялёгкія выпрабаванні. Ды паспрабуйце страляць па мішэні з завязанымі вачамі!..

Што ні кажыце, а мой сябрук знаходзіць нечаканыя варыянты ў рашэнні самых складаных задач. Я маю на ўвазе не нейкія там «арыфметычныя» пералёты самалётаў з пункта «А» ў пункт «Б». Як-ніяк трэба рашыць мудрагелістае ўраўненне з адным невядомым: хто лепшы рыцар у нашым класе?

Назаўтра на першым жа перапынку я нясмела падышоў да Аркашкі Лахвіча і з ніякаватай усмешкай сказаў:

— Выручай, Аркашка. Надакучыла мне ў троечніках хадзіць. Бяры нада мною шэфства.

Ён бліснуў шкельцамі сваіх акуляраў, і яго круглы з ямачкамі на шчоках твар умомант падфарбаваўся кволай чырванню.

— Жартуеш?

Аркашка адразу ж захваляваўся. Ён заўсёды хвалюецца, калі да яго звяртаешся з якой-небудзь просьбай. І чырванее без аніякай там прычыны.

— Ці ж да жартаў? — Я кожнае сваё слова загадзя прымерыў.— Дома спакою не даюць. Мама хоча бачыць

мяне на дошцы гонару... Тады я пагарачыўся, не падумаў... прабач.

Я паспяшаўся папярэдзіць новае Аркашкава пытанне, якое, напэўна ж, павінна было зляцець у яго з языка.

На мінулым тыдні ў мяне надарылася непрыемная сутычка з Аркашкам, калі я адмовіўся ад яго дапамогі па рускай мове. Ды яшчэ абазваў ачкарыкам. І гэта тады, калі ўсе выдатнікі бралі шэфства над троечнікамі, бо ў нашай насценгазеце «За выдатную вучобу» з'явіўся гучны заклік: «Дадзім бой тройкам!»

— Добра, памагу,— згадзіўся Аркашка і, крыху падумаўшы, дадаў: — Прыходзь вечарам у сем гадзін. Раней не магу з табой сустрэцца, трэба з Ленай пазаймацца.

— Дзякуй,— ціха сказаў я, хаця чакаў зусім іншага адказу.

Аркашка яшчэ шэфствуе над Ленай. Яна па матэматыцы адстала, калі ў бальніцы была. Ды мы з Юрыкам даўно заўважылі паміж Ленай і Аркашкам нейкія асаблівыя адносіны. Аркашка нават у бальніцу за тры кіламетры хадзіў да Лены, калектыўнае пісьмо класа і яблыкі перадаваў. Толькі чаму ён, а не дзяўчынкі?

Праўду кажучы, я назіраў за Аркашкам шмат дзіўнага і загадкавага. То ён у зборы макулатуры аж са скуры вылузваецца, каб на першае месца выйсці, то на прапалцы град у школьным агародзе па дзве нормы выконвае, каб толькі яго пахвалілі. А паглядзелі б вы, як Аркашка ў аглядзе строю і песні выструньваўся, як ён крок адбіваў і ўсё іншых падганяў: «Што гэта вы, як сонныя мухі! Чацвёртакласнікі і тыя лепш за нас ідуць. Давайце не падкачаем!..»

Да гэтых заклікаў Аркашка заўсёды здатны. Асабліва нам з Юрыкам ён спакою не дае.

— Чаму на экскурсію ў лес не хадзілі? — пытаецца.— Увесь клас сабраўся, а вас так і не дачакаліся.

— А мы цікавую кніжку чыталі.— Юрык не лезе ў кішэню па слова...— У нас індывідуальны план выхаднога дня.

Ці яшчэ:

— Чаму да першакласнікаў не наведваліся, заданне не выканалі?

— Не паспелі казку пра Чырвоную Шапачку вывучыць, мы малышам спектакль будзем паказваць.— Юрык прыдумляе апраўданне нават не міргнуўшы вокам.

Адным словам, у нас з Аркашкам адносіны даволі-такі складаныя, як, напрыклад, у двух пеўняў, што жывуць на адным двары.

І я вельмі спадзяваўся, што Аркашка адмовіцца браць нада мной шэфства і Юрыкаў план лопне, быццам сухая порхаўка пад нагой. Але мае спадзяванні не збыліся. Аркашка здзівіў і на гэты раз: ён згадзіўся вывесці мяне ў чацвёрачнікі.

«І што ён за чалавек?! — дзівіўся я.— Хоць бы пакрыўдзіўся як-небудзь... за ачкарыка ці розныя там жартачкі».

Але Аркашка, мабыць, не ўмеў крыўдзіцца. Бо калі я завітаў да яго з падручнікам рускай мовы, ён сустрэў мяне прыязнай усмешкай. Толькі адразу ж папярэдзіў:

— Займацца будзем сур'ёза. І не чакай ад мяне ніякай паблажкі.

— Добра,— згадзіўся я.

Да гэтага мяне прымушаў хітры Юрыкаў план, хаця я зусім не верыў у яго поспех. Ды і адкуль ён павінен быў прыйсці? Не з неба ж зваліцца...

Наша «аперацыя» ў Юрыкавым уяўленні выглядала так. Я заваёўваю Аркашкаў давер: стараюся з усіх сіл, маўляў, мне толькі адны пяцёркі і сняцца. Аркашка на сёмым небе ад задавальнення, на кожным кроку мяне расхвальвае: глядзіце, які малайчына Максім Ракіцкі, з тройкамі расправіўся. Вядома, тут і пра Аркашкавы заслугі пагалоска па школе паплыве...

І вось тады, калі Аркашка будзе здымаць «ураджай» свайго шэфства, я і выкладу перад ім на талерачку з блакітнай кветачкай (гэта Юрыкавы любімыя словы) адну далікатную прапанову. Або Аркашка адмаўляецца ўдзельнічаць у конкурсе «Хто лепшы рыцар?», або я зноў запускаю вучобу і скочваюся на тройкі ці нават заводжу дружбу з двойкамі. І Аркашку, як адказнаму за паспяховасць у нашым класе, давядзецца трымаць невясёлую справаздачу перад вучкомам. А гэта для яго страшней, чым скачкі цераз гімнастычнага каня... Тут, як уяўляе Юрык, Аркашку можна браць голымі рукамі, быццам чырванапёрку ў мутнай вадзе. Яшчэ Юрык сказаў, што за такую ўдалую аперацыю яго пахваліў бы сам Шцірліц...

У той першы вечар майго добраахвотнага візіту да Аркашкі я заседзеўся ў Лахвічаў да позняга. І зусім не таму, што мяне раптам прываражыла граматыка рускай мовы з правапісам літары «о» ў словах іншамоўнага паходжання.

Спачатку Аркашка цікавіўся маімі ведамі граматычных правілаў. Праз нейкія паўгадзіны мой шэф, быццам урач, які выслухаў хворага, устанавіў дыягназ:

— Ясна... Будзем пачынаць з пятага класа. Я тут абду-

маю планчык нашых заняткаў, выпішу параграфы, на якія трэба звярнуць асаблівую ўвагу. На сёння хопіць, а заўтра прыходзь без спазненняў.

Аркашка зірнуў на будзільнік і сказаў:

— Мяне чакае «Лунацік».

— Хто?

Ён неяк сумеўся, паправіў на носе свае акуляры:

— Я мадэль майструю... самаходны месяцаход.

— Ну-у! — яшчэ больш здзівіўся я.— Як майструеш?

— Па чарцяжах з часопіса «Мадэліст-канструктар». Хадзем пакажу.

У майстэрні — невялікай дашчанай прыбудове да пуні, што стаяла ў канцы двара Лахвічаў, я ўбачыў шмат розных інструментаў, металічных прыстасаванняў, нават нейкі станок.

— Тут татава гаспадарка,— з гордасцю сказаў Аркашка.— Тата заўсёды дазваляе мне карыстацца сваімі інструментамі.

У нашай вёсцы Аркашкавага бацьку называюць майстрам на ўсе рукі і кажуць, што лепшага калгаснага механіка за сто кіламетраў не знойдзеш. Ды гэта што! Вунь старэйшы Лахвіч сам зрабіў аўтамабіль. Хоць і смешны драндулет і на ўсю вёску матор трашчыць, але хуткасць у яго не горшая, чым у якога-небудзь «Запарожца».

А вось тое, што Аркашка таксама любіць майстраваць, было для мяне вялікай навіной.

— З рухавіком запарка, ніяк са схемай не разбяруся, трэба тату чакаць, а ён на цэлы месяц на курсы паехаў.

Аркашка бліскае сваімі круглымі акулярамі і схіляецца над мадэллю, што стаіць на нізкім століку ля акна. Месяцаход на шырокіх металічных кольцах, памерамі не большы за радыёпрыёмнік «Гайна», вельмі падобны на сапраўдны, што спускаўся на Месяц і якога паказвалі па тэлевізары.

— Ён будзе сам ездзіць?

— А як жа! «Лунацік» у мяне самаходны. Зраблю маторчык — і паедзем... Не на Месяц, дык хаця б на школьную выстаўку.

— З такім экспанатам можна і ў Мінск ехаць.

— Куды там...— Аркашка ледзь прыкметна ўсміхнуўся.

І дзіва-дзіўнае... Упершыню я паглядзеў на Аркашку з павагай, і ён цяпер зусім не здаваўся мне выскачкам і задавакам...

Пасля знаёмства з Аркашкавай майстэрняй я стаў наведвацца туды кожны вечар. Спачатку мы займаліся рускай мовай: я пісаў дыктанты, адказваў правілы, і шэф быў

задаволены мною. Потым мы ішлі ў майстэрню, дзе я ўжо на другі дзень навучыўся працаваць паяльнікам і выпілоўваць лобзікам з фанеры розныя штуковіны. Усё гэта так захапіла мяне, што я нават забыўся пра хітры Юрыкаў план і пра конкурс на лепшага рыцара.

І вось на зыходзе першага тыдня маіх візітаў да Аркашкі, калі я надвячоркам вяртаўся ад Лахвічаў дадому, мяне сустрэў Юрык. Выгляд у яго быў нейкі насуплены і непрыветлівы.

— З Маннай кашкай знюхаўся? — у Юрыкавым голасе пачуліся пагарда і здзек.

— Я ж па плану... Ты сам прыдумаў...

Юрык глядзеў на мяне са зняважлівай усмешачкай і, здаецца, гатовы быў кінуцца ў бойку.

— Заўтра ж адмовішся ад шэфства.

Яго словы — суровы загад.

— А як з конкурсам?

— Хай Манная кашка ў «Зубраня» едзе. Я сёння з Ірай пасварыўся, усё роўна нам першага месца не бачыць,— кажа Юрык і цыркае слінай.

Але я чамусьці не згаджаюся са сваім сябрам. Як мне адмовіцца ад шэфства? Тады ж будзе закрыты ўваход у Аркашкаву майстэрню. А там так цікава!..

— Мне з рускай мовай трэба падцягнуцца...

Я не гляджу на Юрыка, але адчуваю, што ён увесь аж пазелянеў ад злосці.

Юрык заўсёды такі: не любіць, калі яму хто пярэчыць. Праўду кажучы, я ніколі і не выступаў супраць яго загадаў...

— Знюхаўся! — Юрыкаў голас захліпнуўся.— Ты яшчэ пашкадуеш, пабачыш талерачку з блакітнай кветачкай!

Ён заспяшаўся прэч, а я, разгублены і ўсхваляваны, застаўся адзін. Я не мог пабегчы за Юрыкам, не мог сказаць яму, што адмаўляюся ад Аркашкавага шэфства... Такое са мной было ўпершыню.

## ГУКАВОЕ ПІСЬМО

Крыўда, горкая і пякучая, прымушала Гену ісці шпарка, ледзь не подбегам. Ён спяшаўся хутчэй мінуць вузкую вулачку і апынуцца за рогам прамтаварнага магазіна, каб схавацца ад пільнага позірку вялікіх акон трохпавярховага будынка школы. Хлопчык адчуваў гэты позірк спіной,

адчуваў асуджальны дакор, і ўжо нішто не магло спыніць яго, а тым больш павярнуць назад.

Не, здаецца, Гена яшчэ ніколі не быў такі ўзрушаны, як сёння. Ніколі... Ды калі б ён хоць на якое імгненне мог уявіць, што так усё атрымаецца... Яго, напэўна ж, і сілком не завялі б у музей. Няхай бы самі слухалі, няхай бы радаваліся. Толькі б яму, Гену Міхальчыку, не чуць тыя словы, не бачыць тыя з'едлівыя ўсмешкі.

У яркім сінім небе плыло сонца. Вялікае, жоўтае. Нядаўна мінуў поўдзень, і яно паволі спускалася да небасхілу. Было цёпла і хораша.

За машынным дваром дарога павярнула да маладога беластволага бярэзніку. За ім разлёгся вялікі сасновы лес.

Гена прыцішыў крок, нібы пераканаўся, што пагоня адстала. Але думкі зноў вярталі яго ў школу.

...Пісьмо прыйшло раніцай. Было яно незвычайнае — гукавое. Гэтая навіна імгненна абляцела школу і асабліва ўсцешыла сямікласнікаў: Касманаўт прыслаў адказ на іх ліст!

Ужо некалькі месяцаў Касманаўт працаваў на арбітальнай станцыі. І дзіва-дзіўнае: пісьмо прыляцела з космасу, яго даставіў на Зямлю экіпаж наведвання. Вось дык сюрпрыз!

Касманаўт вучыўся ў гэтай школе, хадзіў за чатыры кіламетры з вёскі Зялёнае, тут жа скончыў дзесяцігодку. У школьным музеі, што адкрыўся год назад, напярэдадні 12 красавіка, былі асабістыя рэчы Касманаўта, скафандр, шмат фотаздымкаў, і зямных і касмічных, школьны дзённік за сёмы клас, класны журнал...

Гена таксама з вёскі Зялёнае. Ён жыве насупраць дома, дзе прайшло дзяцінства Касманаўта. Касманаўт прыязджаў у Зялёнае два гады назад пасля свайго першага палёту ў космас. Уся вёска сустракала Марфінага Валодзю.

Як сёння, Гену бачыцца тая сустрэча, калі ён, тады яшчэ пяцікласнік, апынуўся побач з Касманаўтам і, нібы зачараваны, глядзеў на «Залатую Зорку» Героя Савецкага Саюза. Потым Касманаўт, даведаўшыся, што Гена — сын Міколы Міхальчыка, з якім яны сябравалі ў школьныя гады, падарыў яму значок — партрэт Гагарына — і сказаў:

— Гэты значок быў са мною ў космасе. Беражы яго! Няхай ён будзе тваім добрым талісманам...

І вось — гукавое пісьмо. І як было не паслухаць яго? Пасля ўрокаў увесь сёмы клас пайшоў у школьны музей касманаўтыкі. Кіраўнік музея настаўнік гісторыі Мікалай Пракопавіч уключыў магнітафон.

«Вельмі радасна атрымаць ліст з роднай школы тут, у космасе. Не ўяўляеце, як гэта здорава: ляціш сярод зорак, Зямля ў ілюмінатары, быццам вераснёўская антонаўка, а ты чытаеш навіны сваіх землякоў. Мяне ўзрушыў і засушаны кляновы лісток. Кажаце, што ён з дрэва, якое я калісьці пасадзіў ля школы? Лісток з майго дзяцінства... Ён жа так падобны на карту роднай Беларусі! Гляджу на яго і бачу дарогу, што бяжыць ад маёй вёсачкі да школы. Праз балота, лясок, поле, міма бярэзніку... Вярнуся на Зямлю, прыеду ў госці, і мы пройдзем разам па гэтай дарозе, абавязкова пройдзем».

Касманаўт замоўк. У музеі ўсталявалася асаблівая цішыня, але яна працягвалася не больш як паўхвіліны.

«А цяпер я хачу пагаварыць з Генам Міхальчыкам. Пагаварыць са сваім земляком-суседам... Засмуціў ты мяне, Гена, засмуціў... І няўжо табе не дапамог мой талісман?».

Гена аж злякнуўся, твар успыхнуў гарачай чырванню. Сорам, хоць ты скрозь зямлю праваліся. Ён стаяў ашаломлены і разгублены...

Голас з космасу, гукавое пісьмо... Гэта Тоня Сіняўская пастаралася. Распісала, пахвалілася, адрапартавала... І ўсё з-за Генавых двоек па алгебры і англійскай мове.

Вучыўся Гена раней без троек, настаўнікі нават хвалілі, а тут раптам двойка за двойкай.

— Што здарылася з Міхальчыкам?

— Загультайнічаў, разбэсціўся, а такі быў старанны, паслухмяны... Вядома ж, сам сабе гаспадар. Што старэнькая бабуля можа з ім зрабіць? У інтэрнат яго трэба...

Хлопчык не хацеў у інтэрнат. Генавы бацькі паехалі працаваць у Цюмень амаль год назад. Абяцалі забраць сына, як толькі крыху абжывуцца. Гена пакуль застаўся ў Зялёным разам з бабуляй Акулінай.

Міналі дні, а ў лістах з Цюмені была адна просьба: «Пачакай, сынок, дома. Пакуль яшчэ рана ехаць». І Гена прывык да гэтых слоў, чакаў...

Занядужала бабуля. А тут куры, гусі, карова. Клопаты па гаспадарцы ляглі на плечы ўнука.

Прыйшоў верасень, а з ім і школьныя непрыемнасці. І тут — пісьмо аднакласнікаў Касманаўту...

...Гена параўняўся з бярэзнікам, спыніўся, агледзеўся і рашуча ступіў на сцяжынку, што вяла ў бок ад дарогі, да беластволых дрэўцаў. Ішоў, услухоўваўся ў навакольную цішыню, а думкі былі там, у школьным музеі, дзе гучаў праніклівы голас Касманаўта.

«Я веру: гэта ў цябе, Гена, часовая замінка, і ты зможаш

адолець свае няўдачы. Сябры-аднакласнікі дапамогуць. Праўда? Не адступайцеся, будзьце ўпартымі і настойлівымі, не пакідайце таварыша ў бядзе...

Давайце дамовімся, калі я вярнуся на Зямлю і завітаю ў Зялёнае, вы раскажаце мне пра сваю перамогу. Добра?»

Усе слухалі гукавое пісьмо з вялікай увагай. Адны спачувальна пазіралі на Гену, другія пераміргваліся і шматзначна ўсміхаліся. Гена яшчэ ніколі не адчуваў сябе так кепска, як у гэты момант. Яму было і сорамна, і крыўдна, і балюча...

— Вось вам і космас,— задумліва заўважыў Мікалай Пракопавіч і шчоўкнуў выключальнікам магнітафона.— Праславіліся, нічога не скажаш... Чулі: «Не пакідайце таварыша ў бядзе...» А мы?

— Гэта з-за Міхальчыка,— горача ўсклікнула Тоня Сіняўская.— Мы ж абяцалі Касманаўту расказваць пра ўсё, нічога не ўтойваць.

— Правільна, утойваць не трэба,— згадзіўся Мікалай Пракопавіч.— Толькі што цяпер будзем рабіць? Якімі навінамі сустрэнем Касманаўта?

— Няхай Гена дасць слова,— сказаў Пеця Чыж.

— Ён ужо даваў, і не раз,— успыхнула Тоня.— Ведаем яго абяцанкі.

Вось тут Гена не вытрымаў і выскачыў з музея. Ужо ніщто не магло спыніць яго, прымусіць павярнуць назад. Расказаць пра бабулю, якая ледзь тупае ад печы да парога? Пра маму і тату, якія абяцаюць узяць яго ў Цюмень? Пра ваду, якую даводзіцца насіць кожны дзень па чатыры-пяць вёдзер здалёку.

Тут, у бярэзніку, у Гены была патаемная мясцінка, куды ён прыходзіў з радасным чаканнем незвычайнай сустрэчы.

Невялічкая палянка, акружаная густым арэшнікам, а пасярод палянкі — старая каструбаватая бяроза, з тоўстым замшэлым камлём, магутнымі галінамі і густой кронай. На вышыні трох метраў у ствале бярозы было дупло, у якім жылі тры вавёркі: шустрыя, рыжыя, з пушыстымі хвастамі і чорнымі вочкамі-пацеркамі.

Гена з цікавасцю назіраў за зверкамі, за іх пацешнымі забавамі, цыркавымі трукамі, палётамі з бярозы на бярозу. Яны неўзабаве прывыклі да хлопчыка і ўжо не палохаліся яго.

Гена прыходзіў на палянку не з пустымі рукамі. Сланечнікі, гарбузікі і, як самы вялікі ласунак,— арэхі-лузанцы і сушаныя грыбы. Хлопчык прымацаваў фанерную

кармушку да тоўстай галіны, на метра паўтара ніжэй ад дупла,— частуйцеся, даўгахвостыя!

Хлопчык спыніўся ля бярозы, прыслухаўся. Цішыня, спакой. Ласкавыя промні сонца мякка высвечваюць зялёную палянку, падобную на кінаэкран. Вось-вось пагасне святло і пачнецца лясная казка.

Гена схамянуўся, агледзеўся, высыпаў у кармушку гарбузікі і ціхенька свіснуў. Гэта быў умоўны сігнал. Раз, другі, трэці. Хлопчык глядзеў на акенца дупла і чакаў.

— Ф-ю-іць, ф-ю-іць, ф-ю-ю...

З акенца выглянула пацешная галоўка: чорная пыска, вочкі-пацеркі, чуйныя вушкі. Нюхнула паветра, стрэльнула вочкамі туды-сюды, убачыла Гену, радасна піснула і знікла.

Праз якую секунду-другую з дупла адна за адной выскачылі тры агніста-рыжыя вавёркі і сiганулі да кармушкі. Вавёркі хуценька палузалі гарбузікі. Некалькі семак звалілася ў траву.

Хлопчык сагнуўся, каб падняць іх, і тут вавёрка скочыла яму на спіну. Ад нечаканасці Гена аж прысеў.

Хлопчык сцішыўся. Вавёрка перасела з аднаго пляча на другое, чамусьці незадаволена фыркнула, потым зрабіла стойку на задніх лапах. Гена, не азіраючыся, падняў над галавой руку з семкамі. Імгненне — і вавёрка, выхапіўшы з яго рукі ласунак, як на крылах, узляцела на бярозу.

— Мне пара,— сказаў Гена, памахаў рукой вавёркам, якія з цікавасцю назіралі за ім, і пакіраваў да дарогі, што вяла ў вёску.

Ішоў, думаў... Хлопчыкаў позірк слізгануў па полі, падняўся ў яркі чысты блакіт, на якім імклівай стралой выпісаўся белы след рэактыўнага самалёта.

«Недзе там, у бязмежнай прасторы, ляціць Касманаўт. Далёка-далёка, у глухой бязважкасці... І назірае ў ілюмінатар за зялёнай Зямлёй. А можа, якраз пралятае над роднай Беларуссю, бачыць яе рэкі, азёры, лясы... Ён хадзіў у школу па гэтай дарозе, міма бярэзнічку, па полі, міма гэтага дуба, што стаіць, як вартавы, ужо гадоў дзвесце-трыста. Дзіўна, нават неверагодна... Мой сусед дзядзька Валодзя... і космас. І гэтае гукавое пісьмо... А што, калі я сам напішу Касманаўту? Пра ўсё раскажу. І паабяцаю ўзяцца за вучобу...»

Раптам Гена пачуў за спіной рэзкі сігнал аўтамашыны. Ад нечаканасці ён скочыў да абочыны дарогі і толькі тады азірнуўся. Блакітны «пазік», які штодня возіць вучняў з навакольных вёсак у школу і са школы, параўняўся

з Генам і спыніўся. Адчыніліся дзверцы, выглянуў Мікалай Пракопавіч:

— Сядай, паедзем разам.

Хлопчык сумеўся, пачырванеў, разгублена паглядзеў па баках і нерашуча ступіў да «пазіка».

У аўтобусе ён убачыў Тоню Сіняўскую і Пецю Чыжа. «Куды гэта яны? Жывуць жа побач са школай?!» — здзівіўся Гена.

— Давай сюды,— Мікалай Пракопавіч паказаў на месца побач з сабою.

Хлопчык асцярожна апусціўся на сядзенне, паклаў на калені сумку.

— Да Марфы Іванаўны едзем,— сказаў настаўнік.— Касманаўт прыслаў гукавое пісьмо і сваёй маці. На адной плёнцы. Магнітафон вязём. Марфе Іванаўне будзе цікава паслухаць сына. Пісьмо з космасу... Ты, Гена, дарма пакрыўдзіўся. Сам павінен разумець... Можа, і не трэба было вось так адразу... Тут і наш недагляд. У цябе ж вунь якая сітуацыя... Ведаеш, сёння прыйшло пісьмо ў школу і ад тваёй маці.

— Пісьмо?! — Гена схамянуўся, утаропіўся ў настаўніка.

— Ага, пісьмо. Потым пагаворым, дома, разам з бабуляй. Такое супадзенне: космас і Цюмень. Нібы згаварыліся... А ты горды...

Аўтобус прытармазіў, хіснуўся ўбок. Гена не ўтрымаўся і штурхануў локцем Мікалая Пракопавіча. Настаўнік абхапіў Гену за плечы, прыціснуў да сябе, быццам засцерагаючы ад удару, і сказаў:

— Усё будзе добра, Генадзь! Цяпер мы не дадзім цябе ў крыўду. Разам будзем змагацца...

За акном аўтобуса замільгалі хаты. Голас настаўніка запаланіў Гену, прагнаў яго крыўды-сумненні, прымусіў усміхнуцца. І хлопчык адчуў незвычайную палёгку, нібы толькі што адолеў круты схіл высокай гары.

## ВЕЛАСІПЕД

Як заўсёды, яны кацілі з ветрыкам. Знаёмая дарога, знаёмыя віражы. Крыху прытармазілі на крутым павароце, калі мінулі плошчу і завярнулі на асфальтаваную алею, што пралегла па беразе возера. Наперадзе — Эдзік, за ім — Віцька.

Асфальтаваная дарожка прывяла да касцёла, чырвоны

шпіль якога ўзнёсся высока ў неба. Высокія сцены з чырвоных цаглінак. Глядзіш знізу ўверх — галава кружыцца, а зверху ўніз?

Яны не спыніліся каля касцёла, а звярнулі на дамбу.

За дамбай — зноў паварот, зноў — направа да вострава, на якім знаходзіцца гарадскі парк. Першы прыпынак — кола агляду. Вялікае металічнае збудаванне ўжо гады два не працуе. І не круціцца кола, і не падымаюцца яго люлькі ўсё вышэй і вышэй.

Успамінаецца, як і яны залазілі ў люльку і паволі плылі ўверх. Узнімаліся над дрэвамі, над паркам, над гарадком. Віцька баяўся глядзець уніз, а ўсё ўзіраўся ў шпіль касцёла. Эдзіка вышыня не палохала, ён пачуваў сябе вольна і толькі пакепліваў з сябрука.

Ды сапсаваўся матор, перастала круціцца кола агляду, а рамантаваць яго ніхто не бярэцца.

Побач з колам насыпаны курганчык, на ўтравелым баку прымацавана каменная пліта з надпісам: «Пад гэтай плітой 5 лістапада 1967 года пры закладцы Кургана Вечнай Славы замураваны запавет нашчадкам. Адкрыць у 2017».

— Цікава, што там напісана? — пытаецца Віцька.

— А хто яго ведае,— адказвае Эдзік, жмурачы свае зеленаватыя вочы.

Яны прамчаліся па алеі парку, паўз танцавальную пляцоўку, праляцелі праз вузкі масток, які вісеў над ручаём, зрабілі паварот каля кіёска з вялізным іржавым замком.

Выехалі да возера, спыніліся непадалёку ад рыбака, які шпурляў раз за разам бліскучую блясну. Яна ляцела над паверхняй імклівым сонечным зайчыкам, размотваючы за сабой ледзь прыкметную жылку, і тут жа знікала пад вадой. Рыбак круціў катушку спінінга з насцярожанай увагай, але блясна вярталася ні з чым.

— Няма дурных лавіцца на жалезку,— усміхнуўся Эдзік і зноў ускочыў на веласіпед.

Разагналіся, паляцелі навыперадкі. На павароце Эдзік раптам прытармазіў, штосьці ўбачыў на сцежцы, а Віцька зазяваўся і з усяго разгону ўдарыў у задняе кола свайго сябрука. Рэзкі штуршок кінуў Віцькаў веласіпед убок, і ён шуснуў у кусты, нават добра не ўцяміўшы, што здарылася. Зваліўся на зямлю разам з веласіпедам і Эдзік.

— Ты што? — першым ускочыў на ногі Эдзік.

Ён крычаў, абмацваючы сваё калена, і моршчыўся ад болю. Віцька вінавата апраўдваўся. Яму таксама было

балюча, ён трымаўся правай рукой за шчаку. Абдзёрся аб сухую галінку, нават кроў выступіла.

Эдзік уз'юшыўся яшчэ больш, калі ўбачыў, што на заднім коле выскачылі з вобада дзве спіцы.

— Ты што нарабіў, што?! — ён гатовы быў кінуцца з кулакамі.— Як я цяпер паеду, як?!

Віцька стаяў ашаломлены і прыгнечаны, адчуваў сваю віну, і яму было вельмі кепска.

— Вазьмі мой веласіпед,— сказаў ціха, з мальбой у голасе.

— Недавярак. Ты цэлае кола аддавай, хоць з-пад зямлі...

Эдзікаў новы веласіпед быў адмысловы, яго прывезлі з самай сталіцы... Не тое што Віцькаў драндулет — аблезлы і дабіты, хоць і лёгкі на хаду. Ды хіба параўнаеш з Эдзікавым?!

Яны раз'ехаліся непрыяцелямі, і для Віцькі пачаліся пакутлівыя дні адзіноты. Ён разумеў, што Эдзік без новага кола не пойдзе на прымірэнне, не адпусціцца. І дзе знайсці гэтае самае кола? У магазіне не купіш. Ды і за якія грошы?

Адзін, зусім адзін... Як гэта пакутна: раптам пазбавіцца сяброўства, апынуцца ў глухім, змрочным свеце.

Віцька ішоў па тратуары, зацененым густой лістотай каштанаў, і не ведаў, што рабіць, чым заняцца. Не тое што раней, з Эдзікам. Тады заўсёды знаходзіўся занятак. А што можаш ты адзін? Каля крамы, дзе прадаюць сокі і марожанае, Віцька спыніўся, хоць ведаў, што ў кішэнях пуста.

Тут Віцька ўбачыў, як да крамы падкаціў на веліку незнаёмы хлапчук, спыніўся, прыхіліў веласіпед да каштана і няспешна пайшоў да дзвярэй. Віцька хацеў быў зрушыць з месца, але затрымаўся, міжволі прыгледзеўся да веласіпеда і адразу зазначыў, што ён вельмі падобны на Эдзікаў. І такі ж новенькі.

«Шанцуе ж людзям!» — уздыхнуў больш са шкадаваннем, чым з зайздрасцю.

І раптам у галаве мільганула думка.

«Ніхто не будзе ведаць... І з Эдзікам памірымся...» — Думка апякла, прымусіла здрыгануцца. Трывожна затахкала сэрца.

«Не марудзь, хутчэй!» — настойваў таемны голас.

«Нельга, гэта ж — ганьба... А калі зловяць...» — не пагаджаўся другі голас.

«Баязлівец, цісні на педалі — і няхай шукаюць ветру ў полі».

«Не хачу, не буду!»

«Ты ж зусім змарнееш без Эдзіка».

«Заткніся, не змарнею!»

І як жа Віцька ўзрадаваўся, калі ўбачыў у дзвярах крамы хлапчука з марожаным у руцэ! Быццам даплыў да берага, хоць зусім не ставала сіл.

Ішоў дадому і дапытваўся ў самога сябе:

«Няўжо я мог бы ўкрасці? А калі б хлапчук яшчэ прастаяў у чарзе?»

Толькі зарана Віцька радаваўся, зарана... Думка, як стрэмка, засела ў памяці і ўжо на другі дзень нагадала пра сябе, калі ён убачыў Эдзіка. І не падысці да яго, і не загаварыць... Сумна, а што зменіш?

Пратрымаўся Віцька яшчэ адны суткі, а потым апоўдні пакіраваў да крамы, дзе прадаюць сокі і марожанае. І той, другі голас, чамусьці маўчаў: не перасцерагаў, не адгаворваў.

Віцька прагульваўся каля крамы даволі доўга, нават паспеў пастаяць у чарзе і з'есці «Пламбір». А той, каго ён чакаў, не з'яўляўся. Чаканне было трывожнае, вярэдлівае. Але жаданне памірыцца з Эдзікам было мацнейшае за ўсялякія там пакуты сумлення...

Да крамы пад'ехаў той самы бялявы хлапчук, на тым самым новенькім веласіпедзе. Віцька захваляваўся яшчэ больш. Здавалася, усё ўлічана, кожны крок, а тут... Нібы і не рыхтаваўся, не настройваў сябе... Ён таксама зайшоў у краму, паволі прасунуўся каля доўгай чаргі, каб пераканацца, што хлапчук стаіць у самым яе хвасце.

«Мінут пятнаццаць трэба чакаць, калі не больш»,— адзначыў Віцька і выслізнуў на вуліцу. Прыкмеціў, што з акна крамы не праглядаецца пляцоўка, на якой стаіць веласіпед.

«Разявака, будзе ведаць, дзе ставіць»,— падумаў і неяк крыху паспакайнеў, у яго рухах з'явілася ўпэўненасць і рашучасць. Вось толькі загарэлы твар збялеў, выцягнуўся, а шэрыя вочы застылі.

Ён выкаціў веласіпед на тратуар, уцягнуўшы галаву ў плечы, і чамусьці не спяшаўся, нібы чакаў, што зараз яго гукнуць, скажуць спыніцца. Быў яшчэ шанц павярнуць назад, паставіць чужы велік на месца.

Віцька сеў на сядло і націснуў на педалі. Ужо праз секунду-другую спіцы ў колах зліліся ў суцэльны круг, а пругкі вецер прымусіў прыгнуцца да руля.

Гэта была страшэнная гонка, без аглядкі, на мяжы ўсіх сіл. Нямелі ногі, мігцела ў вачах, а Віцька круціў і круціў.

Завярнуў у завулак, выскачыў на цэнтральную вуліцу гарадка, праляцеў міма сваёй школы. Тут пачынаўся круты спуск, уніз — да скрыжавання, дзе пралегла шаша.

Разагнаўшыся, Віцька нарэшце перастаў круціць педалямі. Веласіпед сам набіраў хуткасць з крутога спуску, трэба было прытармажваць. Ён крутнуў педалі назад, але яны гэтак жа лёгка зрабілі абарот назад, як і наперад. У веласіпедзе не было тармазоў!

Стужка асфальту ляцела пад коламі ўсё шпарчэй і шпарчэй. Звярнуць бы ўбок, толькі як? Асфальт абрываецца глыбокім кюветам, а за ім — сцяна высокай агароджы. Звернеш — зубоў не пазбіраеш...

Тут была адзіная магчымасць паратунку: вытрымаць гэтую шалёную гонку, уседзець за рулём, праскочыць скрыжаванне, а там адразу ж пачынаецца пад'ём.

Утрымацца, праскочыць... За паваротам, на самым рагу,— ягоны дом. Веласіпед схавае ў пуні, прыкрые саломай. Счакае колькі дзён, а потым пойдзе да Эдзіка і прапануе заднее кола, узамен таго, з выбітымі спіцамі. Эдзік, напэўна ж, пагодзіцца, не адмовіцца. А чаго яму адмаўляцца?

Вось толькі б праскочыць гэты праклятыспуск, толькі б не бразнуцца на асфальт. І чаму няма тармазоў, чаму?

Святлафор успыхнуў чырвоным святлом, калі Віцька падлятаў да скрыжавання. А злева па шашы імчаў фургон, якому ўжо запалілася зялёнае святло...

Віцька заўважыў фургон занадта позна. Хутчэй не заўважыў, а адчуў, што злева на яго кіруе нейкая чырвоная аграмадзіна. Падлетак нават не змог крыкнуць. Але ён усё ж паспеў спружыніцца і за нейкую сотую долю секунды да ўдару кінуць сябе з веласіпеда назад. Быццам хто нябачны схапіў рукою за футболку і сарваў з сядла.

Ён нерухома ляжаў на асфальце і нічога не бачыў і не чуў. Веласіпед храбуснуў пад коламі фургона, чырвоная машына з усяго разгону ўрэзалася радыятарам у святлафор, і пасыпалася разбітае ветравое шкло. А вадзіцель, збялелы і знямелы, вываліўся з адчыненых дзвярэй кабіны, рукі ў яго былі ў крыві.

## ДРУЖОК

Стальное колца ланцуга лёгка слізгае па туга нацягнутым дроце паміж хлявом і верандай, усяго метраў дзесяць. Ад будкі — да ганка, ад ганка — да будкі...

Здаецца, час прывыкнуць ужо да калянага скуранога

ашыйніка — не адзін жа дзень мінуў... Але як тут прывыкнеш? Нібы раз'ятраны драпежнік схапіў мёртвай хваткай за хіб і не адпускае. А тут яшчэ гэты бразгатлівы ланцуг... Вось і сноўдайся туды-сюды, пакуль не надакучыць...

Зрэдку Дружок незласліва пагаўкае, калі ўбачыць за плотам суседскую курыцу, ці паскуголіць, нібыта паскардзіцца на сваю адзіноту. Толькі каму скардзіцца? Хата на замку, гаспадары на працы, а іх сын Кастусь у школе. І калі ўжо ён вернецца дадому? Яго вяртанне — збавенне ад ланцуга і такія вясёлыя хвіліны вольніцы. Хоць і кароткія, амаль што мімалётныя. Прамільгнуць — не заўважыш. Толькі, мусіць, інакш нельга...

Залез Дружок у будку (колькі ж можна бегаць туды-сюды?), прымасціўся ля круглага акенца, каб назіраць за дваром і веснічкамі. Цішыня, лагода. І чаго ўжо тут на сваё жыццё-быццё скардзіцца? Не галодны, і будка зацішная: спачывай сабе ды адно мух адганяй. А там і Кастусь са школы заявіцца і спусціць Дружка з ланцуга, і пабягуць яны разам на прагулку. Як і ўчора, і пазаўчора...

Нуднае чаканне паступова прыжмурвае вочы, навявае дрымоту. Дружка ахінае сон. А ён у тым сне — зусім яшчэ шчанючок, нягеглы і бездапаможны. Побач — мама Пальма і яшчэ трое такіх жа рудавата-бурых маленькіх цюцькаў. Сямейства бяздомнай Пальмы знайшло прытулак у старым стозе саломы, які аж пачарнеў ад часу. Стог стаяў у канцы агародаў, наводшыбе, і там можна было не асцерагацца чужога вока.

Пальма выскубла ў стозе нару, зрабіла мяккае, утульнае гняздо і прывяла на божы свет чацвёра сабачанят. Яна не думала, што будзе з яе малечай заўтра ці паслязаўтра, не магла яна ўявіць і апошні дзень свайго бадзяжніцтва. Адзінае, што турбавала Пальму,— гэта ежа. Суцішыць хоць крыху свой пастаянны голад, накарміць сваіх прагавітых немаўлят... А яны патрабуюць, жаласліва скуголяць, балюча кусаюць пустыя саскі. Ды адкуль узяцца таму малаку, калі даводзіцца харчавацца рознымі адходамі ля свінафермы ці аб'едкамі на вясковых задворках.

На пошукі ежы Пальма траціла шмат часу: не кожны дзень можна было пажывіцца ля фермы, а ў вёсцы часцей за ўсё бяздомнага сабаку сустракалі ўлюлюканнем і пагрозлівымі вокрыкамі. Іншы раз яна забывалася на асцярожнасць, прабіралася на які-небудзь двор і занадта позна заўважала небяспеку. Яе жорстка дубасілі, стараліся зняве-

чыць, але бадзяжка ратавалася ўцёкамі. Пабітая і знямоганая, вярталася яна да стога, дзе яе чакалі чацвёра галодных шчанюкоў, залазіла ў схованку і адлежвалася да наступнай раніцы.

Малыя высмоктвалі з чэрава маці апошнія кроплі малака, сярдзіта тыцкалі сваімі тупымі мордачкамі ў запалыя, худыя бакі, пакрыўджана скавыталі. Толькі Пальма была безуважная да іх неспакою і крыўдаў, бо ў яе зусім не ставала моцы. Ні на ласку, ні на далікатную строгасць. І што будзе заўтра, як жыць далей?

Мінуў дзень, другі... Пальма па-ранейшаму наведвалася да фермы, кружыла, вынюхвала ля двароў, сёе-тое знаходзіла, нават не грэбавала рознай тухляцінай. Яна трывала, ёй было не прывыкаць... Толькі вось падрасталі шчаняты, ім хацелася есці, яны не маглі зміpыцца са сваім жабрацкім лёсам. І іх жаласлівае скавытанне, у якім усё больш чуліся патрабавальныя ноткі, прымушала Пальму вылазіць з-пад стога і брысці куды-небудзь, азіраючыся па баках сваімі слязлівымі, выцвілымі вачыма. Выгляд у яе быў жаласны.

Аднойчы непадалёк ад фермы, за густым кустом лазняку, Пальма ўбачыла старога знаёмага. Ён спрытна расправіўся са сваёй чарговай ахвярай — тлустай, апетытнай курачкай. Толькі лёгкі пух кружыў у паветры. Так, гэта быў Пірат — паджары, даўганогі і ўкормлены, хаця таксама бяздомны. Ды гэтая бяздомнасць яго ніколькі не трывожыла. Ён з маленства навучыўся жыць па няпісаным правіле: «Голад не дзядзіна, з’ясі і ўкрадзена». Зусім яшчэ зялёным псючком ён злавіў дурное куранятка, асмакаваўся, а потым ужо не ўяўляў сваё бадзяжніцтва без свежай курацінкі. Падрос, стаў хітры, дзёрзкі і няўлоўны. За ім сачылі, наладжвалі засады, але ён нейкім дзівам вылузваўся з самых небяспечных сітуацый. І нават пасля таго, як шрот адсек яму правае вуха, ён не адмовіўся ад свайго рызыкоўнага палявання.

Небяспека прывучыла Пірата да дзіўнай хітрасці. Ён на нейкі час пакідаў у спакоі жыхароў адной вёскі і перабіраўся ў суседнюю. А там працягваў свой курыны промысел. Ды з яшчэ большай асцярогай. Але ж, як кажуць, шыла ў мяшку не схаваеш... І аднавухаму даводзілася зноў перабірацца ў іншую вёску. Ён усюды знаходзіў не толькі ежу, але і новую кампанію — такіх жа, як сам, бяздомных сабак. Жыў Пірат, не тужыў, а калі выспявалі непрыемнасці, знікаў у невядомым кірунку. І шукай у полі ветру...

І вось вясновым ранкам Пірат зноў аб'явіўся ля фермы, дзе ён быў апошні раз яшчэ на пачатку зімы. Пальма ўзрадавалася нечаканай сустрэчы, ёй адразу ж успомніўся той вясёлы час, калі яна дружыла з Піратам, а ён частаваў яе курацінай. Сама Пальма не ўмела лавіць курэй, хаця іншы раз і дапамагала аднавухаму даганяць разявакупеўня, які раптам станавіўся на крыло. Ды колькі мог праляцець курыны кавалер?! Пірат любіў браць такіх задавак на ляту. Імклівы скачок — і певень нават не паспяваў крыкнуць сваё развітальнае «ку-ка-рэ-ку!». У аднавухага была мёртвая хватка...

Вяртанне Пірата змяніла жыццё Пальмы і яе шчанюкоў. Цяпер яны не галадалі, іх апякун амаль кожны дзень прыносіў да стога спажыўную здабычу.

Дзёрзкасць курынага злодзея ўстрывожыла вёску. І хаця Пірат вельмі асцярожнічаў, яго прыкмецілі, за ім пачалі сачыць. І хутка заўважылі, што кожны раз ён знікае на аселіцы за старым, учарнелым стогам. Там жа прыкмецілі і Пальму...

На аблаву выйшлі перад самым усходам сонца. Чацвёра паляўнічых са стрэльбамі ды яшчэ тры чалавекі з доўгімі жалезнымі кіямі. Камандаваў аблавай калгасны брыгадзір, у руках якога была двухстволка. Гэта ў яго асабістай гаспадарцы недалічыліся аж трох яйканоскіх чубатак. І таму брыгадзір быў вельмі ўзрушаны, прадчуваючы блізкую расплату.

Стог акружылі, наперад выйшлі паляўнічыя са стрэльбамі, сталі раіцца.

— Вунь дзірка, там шэльмы!

— Трэба выкурыць іх з логава...

Вясковы бабыль Саўка, які быў верным брыгадзіравым служкам, павolі пасунуўся да стога, трымаючы доўгі кій напагатове.

— Асцярожна, я страляю першы,— сказаў брыгадзір.

— Толькі мяне не падстрэльце,— азірнуўся Саўка, бліскаючы соннымі вачыма з-пад брыля скуранай кепкі.

Ён спыніўся крокі за чатыры ад стога, прысеў і скіраваў кій у лаз. Было далекавата, давялося ступіць яшчэ бліжэй.

— Эй, дыверсанты! — крыкнуў Саўка і смалянуў кіем пад стог.— Вылазьце, дагуляліся!

Але з нары ніхто не выскачыў, не пачулася адтуль таксама ніякіх гукаў.

— Ваўкалакі ноччу ўцяклі,— сказаў Саўка, пратыкаючы кіем салому вакол дзіркі.— Пажыравалі і зніклі...

— Не, яны дзесьці тут,— усумніўся брыгадзір, усё яшчэ трымаючыся воддаль.— Сёння мы не выпусцім іх жывымі.

Пірат пачуў галасы занадта позна. Ён падпоўз да выхаду, але каля стога прама перад сабой убачыў чалавека, які трымаў у руках доўгі кій. Пірат хуценька адпоўз назад, дзе спала Пальма са сваімі шчанюкамі, і затаіўся. Была надзея, што бяда абміне іх начлежку, што гэта дарэмная трывога...

Але галасы не заціхалі, не аддаляліся, а яшчэ больш пазванчэлі, наблізіліся. Раптам штосьці зашархацела ў зляжалай саломе, і ў той жа момант Пірат аж сцяўся: у яго бок упіўся востры канец кія. Боль быў пякучы, ды аднавухі стрываў, не кінуўся на свайго крыўдзіцеля. Ён адразу ж адчуў знаёмы халадок блізкай небяспекі, калі трэба шукаць паратунак...

Толькі як выскачыць з гэтай пасткі? Ёсць адзін выхад, але ён перакрыты людзьмі, з якімі ў Пірата заўсёды былі варожыя адносіны. Аднавухі разумеў: яго не пашкадуюць, яму не даруюць... А як жа Пальма са шчанюкамі, няўжо ім таксама няма збавення? Пракляты стог, праклятая начлежка... Яшчэ ні разу Пірат не трапляў у такі безнадзейны пераплёт.

Прахапілася Пальма, цяўкнула спрасонку, яе таксама дастаў кій. Толькі малыя па-ранейшаму спакойна пасопвалі, прыгрэўшыся ля матчынага жывата. Ды гэта былі апошнія хвіліны спакою.

Другі ўдар, рэзкі і балючы, прымусіў Пальму раз'ятрана забрахаць і кінуцца да выхаду. Яна не ўцякала, не думала ратавацца, бо ёю кіраваў не страх, а імкненне абараніць сваіх шчанюкоў, выбавіць іх з нечаканай пасткі. Гэта там, ля вясковых двароў, Пальма пачувала сябе баязлівай папрашайкаю, асцярожнай шукальніцай аб'едкаў. А тут было яе жытло, тут яна магла і агрызнуцца, паказаць свае вострыя зубы.

Саўка, пачуўшы люты брэх, імгненна адскочыў ад стога, пакаўзнуўся, няўклюдна бразнуўся вобзем і на карачках папоўз прэч. Усе загалёкалі, сёй-той падаўся назад. Тут ужо было не да смеху, калі з-пад стога вынырнула аскаленая сабачая галава з шалёнымі вачыма. Усё вырашала імгненне...

Брыгадзір стрэліў дуплетам, амаль не цэлячыся. Дымны рой карцечы сустрэў Пальму ў скачку. Яна кульнулася ў паветры і цяжка звалілася на росную вясновую траву. Паспрабавала падняцца, хрыпла захлынаючыся крывёю, гаўкнула, але прагучалі яшчэ два стрэлы, якія прымусілі яе заціхнуць назаўсёды.

— Ну што, наелася курацінкі? — зларадна сказаў брыгадзір.— Дзе яшчэ адзін зладзюга? Іх жа было двое...

— Хаваецца ў стозе... Глядзіце, каб не ўцёк. Колькі ўжо ён водзіць нас за нос...

— Нічога, гэта яго апошняя гастроль,— сказаў брыгадзір, зараджаючы двухстволку.

Мажны, шыракаплечы, з адкрытым, бронзавым ад загару тварам, які прыцяняў шыракаполы капялюш, ён быў падобны на каўбоя з прыгодніцкага амерыканскага фільма. Побач з ім Саўка выглядаў проста хлапчуком.

— А калі ў логава даць дымку? — спытаў Саўка.

— Не-е, мы пачастуем нягодніка шротам,— адказаў брыгадзір і падвёў да лаза дула стрэльбы.

Спачатку ён націснуў на адзін курок, праз якую хвіліну — на другі. Першы зарад сакануў па Піратавых вачах (ён якраз залёг у праходзе), другі ўпіўся ў шыю...

Пірат, аслеплены і акрываўлены, ужо ў агоніі выпаўз са схованкі, і тут яго дабілі жалезнымі кіямі. Гэта было страшэннае відовішча, асабліва раз'юшыўся Саўка, нават брыгадзіру давялося супакойваць свайго служку.

— Хопіць, ён ужо не пабяжыць... Потым, Савось, возьмеш рыдлёўку, трэба будзе закапаць...

— Добра, Адамавіч, зраблю ім паніхіду,— памяркоўна згадзіўся Саўка.

Яны ішлі да вёскі, калі сонца ледзь вызірнула з-за лесу і ўсё навокал запалымнела нейкім злавесным барвовым святлом. Быццам толькі што ў свеце адбылося непапраўнае ліхадзейства.

Пра расправу з курынымі злодзеямі брыгадзіраў сын Кастусь даведаўся ад захмялелага Саўкі, які дапамагаў ладзіць у агародзе парнік і спачатку хваліў бацьку за трапны дуплет, потым казаў, што маглі абысціся і без стралянiны: трэба было закрыць уваход у логава і падпаліць стог струхлелай саломы.

— Паліць жыўцом? — усумніўся бацька.— Не-е, гэта не па-людску...

— Нічога страшнага... Там жа яшчэ было трое сабачанят, з-пад стога павылазілі. Такія лупатыя, пузаценькія... Ля мёртвай сучкі поўзалі... Давялося рыдлёўкай, адным ударам... Нават не піскнулі. Распладзіліся!

— А ты, Савось, азвярэлы бязбожнік, малых не пашкадаваў,— асуджальна вымавіў бацька.— Шчаняты не вінаватыя, як тыя царскія дзеці...

— Дык я іх ад галоднай смерці выратаваў, дапамог...

— Пашкадаваў воўк авечку...

Кастусь стаяў у двары і добра чуў размову бацькі з Саўкам. Пачутае вельмі ўстрывожыла хлопчыка, прымусіла пайсці на аселіцу. Якраз пачаліся вясновыя канікулы, і час быў вольны.

Там, на аселіцы, Кастусь і ўбачыў рудаватага шчанючка, які поўзаў каля стога ўчарнелай саломы і жаласліва скуголіў.

— І як гэта цябе не заўважыў Саўка? — хлопчык з трывогай назіраў за бездапаможнай істотай.— Шчаслівчык!

Сабачка адразу ж спадабаўся Кастусю, абудзіў у яго далікатнай душы спагаду і шкадаванне.

Успомніліся Саўкавы словы, яны прымусілі Кастуся больш пільна агледзецца наўкола. Ён убачыў каля стога шмат слядоў, утаптаную ў гразь зялёную траву, заўважыў шырокую цёмна-бурую пляму, а крыху воддаль — грудок свежай зямлі... Яму зрабілася зябка і няўтульна, нібы раптоўна падзьмуў халодны, сіберны скразняк.

Кастусь расшпіліў балонневую куртку, прытуліў да сябе сабачку, каб суцішыць і сагрэць яго. І той амаль што адразу перастаў скуголіць і дрыжаць, потым даверліва лізнуў Кастусёву руку цёплым вільготным язычком.

— Што будзем рабіць, Дружок? — неяк адразу знайшлося імя.— Цяпер ты адзіны сведка злачынства, і цябе таксама могуць забіць. Яны не паглядзяць, што ты яшчэ зусім маленькі.

Хлопчык гаварыў абачліва. Яму ўяўляліся злыя, нядобрыя людзі, якія нікога не пашкадуюць і не памілуюць, а разам з імі яго, Кастусёў, бацька. Гэта ён за курэй адпомсціў, даўно ўжо грозіўся расквітацца з курыным злодзеем. Ды што куры...

Бацька ва ўсім паважае парадак і суровасць. Ён і сына павучае, яму не падабаюцца Кастусёвы рахманасць і далікатнасць.

— І ў каго ты такі ўдаўся? Хіба ж можна ў наш час расці размазнёй? Каму патрэбна твая сляза? Бачыце, яму разбуранага гняздзечка шкада, ён гатовы кінуцца ў бойку за мураша, а за сябе пастаяць не можа...

Апошнім часам Кастусь не дзяліўся з бацькам сваімі сакрэтамі, ён не хацеў выслухоўваць розныя папрокі і павучанні... Лепш ужо прамаўчаць, перапакутаваць сам-насам, знайсці суцяшэнне ў самім сабе. А хто цябе зразумее, хто паспачувае? Так думаў трынаццацігадовы Кастусь Пташук. І здарэнне на аселіцы ля стога толькі пацвердзіла яго сумненні.

Хлопчык прынёс Дружка дадому з вялікай перасцярогай, каб ніхто не ўбачыў. Цішком прабраўся ў пуню, у кардоннай скрынцы зрабіў з сена і рознай старызны ўтульнае гняздо і замаскіраваў яго. Нават маці нічога не сказаў: тайна ёсць тайна.

І надалей Кастусь вельмі асцярожнічаў. А як даводзілася хітраваць, каб тайком накарміць свайго гадаванца і прагуляць па свежым паветры! Добра яшчэ, што напачатку быў вольны канікулярны тыдзень. Пойдуць бацькі на працу, а Кастусь — у пуню. Вынесе Дружка ў сад, пусціць яго на зялёную траўку, а таму — радасць і ўцеха. Ён і бегае, і куляецца, і ганяецца за якой-небудзь мушкай ці чмялём. Любата!

Радаваўся хлопчык разам са сваім чацвераногім сябруком, цешыўся яго гарэзлівасцю, але гэтую радасць азмрочвала неадступнае пачуццё трывогі. Ён заўсёды быў напагатове, чуйна прыслухоўваўся да гукаў з вуліцы. Праўда, яго заспакойвала тое, што рокат бацькавага матацыкла чуўся здалёку. І пакуль «Ява» падлятала да двара, Кастусь паспяваў схаваць Дружка ў пуні. Ды колькі магла доўжыцца гэтая гульня ў хованкі?

Закончыліся вясновыя канікулы, а з імі — вясёлыя Кастусёвы прагулкі з сабачкам. Дружок сядзеў у кардоннай скрынцы цэлымі днямі, чакаў, пакуль Кастусь вернецца са школы і пачастуе малачком ці якім-небудзь булёнчыкам. Але што пачастункі?! Псючок ірваўся на волю, ён хацеў бегаць, куляцца, даганяць... І крыўдаваў, і жаласна скавытаў, калі зноў заставаўся ў цёмнай схованцы. Дружку надакучыла патаемная цямніца, цяпер ён быў не тым бездапаможным і баязлівым шчанюком, якога хлопчык знайшоў ля стога.

Неяк апоўдні Кастусь адчыніў пуню і раптам убачыў ля дзвярэй Дружка, які сам вылез са сваёй схованкі. Сабачка так нечакана кінуўся пад ногі, што хлопчык не паспеў злавіць яго. Уцякач каціўся па двары на кароценькіх ножках і весела падбрэхваў ломкім галаском. Быццам дражніўся з Кастусём, які бег следам за ім, спрабуючы прадухіліць бяду.

Але было позна. Насустрач, ад брамы, ішоў бацька і здзіўлена назіраў за гэтай камічнай сцэнкай.

— Ого, што бачу! Адкуль у нас госць?

Кастусь дагнаў Дружка ля плота, падхапіў яго на рукі і прыкрыў крысом балонневай курткі.

— Гэта мой сабачка, я знайшоў яго,— дрыготкім галасам сказаў Кастусь, не гледзячы на бацьку. Ён гатовы быў

заплакаць, адчуваючы ўласную бездапаможнасць. І трэба ж было Дружку выбегчы з пуні...

— Кажаш, знайшоў? — даволі спакойна перапытаў бацька.— Цікавая знаходка, пашанцавала табе...

Здаецца, упершыню (ва ўсялякім разе як помніць Кастусь) бацька не стаў дакараць і пацвельваць. Ці настрой у яго быў лагодны, ці няшчасны выгляд сына, худзенькага і безабароннага, прымусіў змілавацца, пашкадаваць. Навальніца, якую з такой трывогай чакаў хлопчык, прайшла міма, без грымотаў і бліскавіц. Не ведаў Кастусь, што на яго жыццёвым небасхіле клубіцца іншая хмара, больш страшная і злавесная, якая і паспрыяла бацькавай лагоднасці...

Адам Адамавіч толькі што вярнуўся з раённай бальніцы, дзе яму паведамілі аб выніках медыцынскага абследавання яго сына Кастуся. Размова была несуцяшальная: у хлопчыка аслаблены арганізм, малакроўе. Яму патрэбны станоўчыя эмоцыі, спакой. Асабліва супрацьпаказаны розныя нервовыя стрэсы. Бяда ў тым, што Кастусь вельмі ўражлівы, далікатны, як не з нашага часу...

Так нечакана закончылася нелегальнае жыццё Дружка. Яму зрабілі будку, ён стаў паўнапраўным жыхаром на брыгадзіравым падворку.

Мінула вясна, наступіла лета. Дружок рос, набіраўся моцы. У ім не было нічога пародзістага, самы звычайны дварняк рудавата-бурай масці, з абвіслымі вушамі і тоўстымі крываватымі лапамі. І хвост у яго абаранкам. Вось толькі вочы нейкія зусім несабачыя: уважлівыя і разумныя.

Усё лета Кастусь з Дружком былі разам. На беразе возера, у лодцы, па дарозе ў лес, на сунічнай палянцы... Дружок быў кемлівым вучнем, Кастусёвы каманды лавіў на ляту, стараўся заўсёды пацешыць свайго гаспадара, зрабіць яму прыемнае. Але аднойчы перастараўся: злавіў на вуліцы суседскае куранё і пачаў яго душыць... Кастусь ледзьве адратаваў разяваку, нават агрэў Дружка дубцом. Выпадковае здарэнне? А можа, гэта праявіўся Піратаў паляўнічы азарт?

Калі неўзабаве Кастусь убачыў, як Дружок накінуўся на параненага дзікага голуба, ён зразумеў: нападзенне на суседскае куранё не было бязвіннай дурасліваcцю. І каб не наклікаць бяду, хлопчык больш не адпускаў ад сябе Дружка ні на крок. Для прагулянак давялося зрабіць ашыйнік з сырамятным павадком. Не спадабалася гэта Дружку, а што зробіш? Трэба зміp ыцца...

— Хопіць Дружку гультаяваць,— сказаў у апошні дзень лета бацька.— Пакуль ты, сын, у школе, ён будзе ў нас вартаўніком.

Кастусь пагадзіўся: не запіраць жа Дружка ў пуню. Ды і чужак пабаіцца заходзіць на двор, калі пачуе раз'яраны брэх і ўбачыць, як сабака апантана кідаецца на прывязі.

Нацягнулі дрот паміж хлявом і верандай, знайшоўся новенькі ланцужок. Змацавалі ланцужок з ашыйнікам сталёвай зашчапкай.

— Ну вось, цяпер мая душа будзе спакойная,— задаволена прамовіў гаспадар.

Тое, што ўзялі на ланцуг, вельмі пакрыўдзіла Дружка. Ён схаваўся ў будку і не вылазіў да позняга вечара, пакуль не прагаладаўся. Нялёгка было Дружку развітвацца са сваёй вольніцай, нават Кастусёвы суцяшэнні спачатку не памагалі. Але, як вядома, час лепшы лекар...

Мімалётны сон перапыніў лёгкі стук веснічак. Дружок схамянуўся, выскачыў з будкі і са звонкім брэхам кінуўся да веранды. Сустрэча была шумная і радасная, Кастусь абдымаў Дружка за шыю, прытульваў да сябе, гладзіў па галаве, спіне, а ён стараўся лізнуць яго ў твар.

— Ну, як ты тут, зачакаўся? Ага... Не крыўдуй, сёння ў мяне было шэсць урокаў, а потым я заглянуў у бібліятэку. Нічога, зараз паабедаем і адразу ж пойдзем на сенажаць. Ведаеш, там з'явіліся шампіньёны. Дзед Антось казаў, я толькі што сустрэў яго з поўным кошыкам. Паможаш мне збіраць, добра?

Неўзабаве яны спяшаліся да сенажаці, што разлеглася каля возера, за які кіламетр ад вёскі. Дружок так і рваўся наперад, і Кастусь ледзь стрымліваў яго. Як толькі завярнулі за крайнюю хату, хлопчык выпусціў павадок з рукі, і сабака паляцеў па знаёмай сцежцы да возера. Гэта былі непаўторныя імгненні імклівага бегу і радаснага адчування свабоды. За Дружком бег Кастусь, размахваў над сабою сінім поліэтыленавым пакетам, і настрой у яго быў цудоўны.

Тое, што шампіньёны выскачылі на сенажаці, не было вялікай нечаканасцю. Бо яшчэ летам, пасля цёплых ліпеньскіх дажджоў, дачнік дзед Антось выпадкова натрапіў на грыбны неруш. Дзіва-дзіўнае, раней жа шампіньёны ніколі не раслі тут. А можа, ніхто з вяскоўцаў не звяртаў на іх увагі? Гэта ўсё дачнікі — яны і порхаўкай не грэбуюць...

Вось дачнік дзед Антось (ён у вялікай дружбе з брыгадзірам) і падахвоціў Кастуся збіраць шампіньёны. Не-

калькі дзён імі ласаваліся. Падсмажыш са смятанкай — пальчыкі абліжаш! І ў лес далёка не трэба ісці...

З'яўленне шампіньёнаў у верасні здзівіла Кастуся і ўзрадавала. Трэба толькі паспець на сенажаць, пакуль навіна пра грыбы не абляцела вёску.

На гэтым поплаве ўжо не адзін год не касілі траву, тут ад самай вясны таўкліся коні, зрэдку пасвіліся каровы. Сенажаць была куп'істая, занядбаная, парослая драсёнам ды шчаўлюком, але вось жа гэтую зямлю, утаптаную конскімі капытамі, чамусьці ўпадабалі шампіньёны.

— Шампіньёны-шпіёны,— прыгаворваў Кастусь, пільна гледзячы пад ногі.— І дзе вы тут пахаваліся?

Дружок усё ніяк не мог уціхамірыцца і з вясёлым брэхам кружыўся па сенажаці. Ён падбягаў да Кастуся, спыняўся на хвілінку, рабіў перад хлопчыкам стойку і зноў кідаўся прэч.

— Грыбы шукай, грыбы! — крычаў Кастусь услед.

Але Дружок якраз падняў з травы шпачыную чараду, і яго ўвага адразу ж пераключылася на чорную птушыную хмарку, што праз колькі метраў ізноў апусцілася на сенажаць.

«Я даганю вас!» — брахаў Дружок і прыпускаўся наўздагон за шпакамі. Яму было ўсё роўна, каго даганяць і куды бегчы. Вольнаму — воля!

Кастусь звярнуў налева, да возера, і праз некалькі крокаў утрапёна спыніўся. Ля шырокай купіны сядзелі шампіньёны. Цэлая сямейка!

— Тры, пяць, сем, дзевяць!

Хлопчык, усхваляваны і радасны, кінуў вачыма па баках і заўважыў зусім побач яшчэ дзве купкі белагаловых грыбоў, якія схаваліся за шырокае лісце чамярыцы. Ён, не спяшаючыся, дастаў з кішэні складанчык, адкрыў вострае лязо, яшчэ раз агледзеўся наўкола і толькі тады прысеў на кукішкі. Гэта была яго звычайная манера «ціхага палявання», калі побач нікога няма і можна не асцерагацца, што твае грыбы трапяць у чужы кошык.

Вострае лязо сцізорыка лёгка зразала белыя карані шампіньёнаў, і Кастусь асцярожна складваў грыбы ў пакет, загадзя заслаўшы дно зялёным аеравым лісцем, якое нарваў каля возера.

— Ну што, нашпіёніліся? — пытаўся хлопчык, перабіраючыся да новай купкі.— Думалі, я не знайду вас? Не на таго натрапілі...

А Дружок працягваў праследаваць шпачыную чараду,

якая быццам дражнілася з ім. Адлятала на колькі метраў, садзілася, а калі Дружок падбягаў бліжэй, ізноў падымалася ў паветра. Маўляў, паспрабуй дагані! І гэтая гульня ў даганялкі адводзіла Дружка ўсё далей і далей, аж да дарогі, што аддзяляла сенажаць ад узаранага ржышча.

Збіраючы шампіньёны, Кастусь не бачыў, дзе Дружок. Ды і што за ім сачыць — не маленькі, пабегае і назад вернецца. Не бачыў хлопчык і машыну з жалезнай будкай, што паціху пыліла па дарозе ад райцэнтра. І ці мала іх праносіцца па бальшаках і гравійках?

Ля дарогі шпачыная чарада крута паднялася ў неба і імкліва панеслася да возера, а Дружок нарэшце спыніўся і ў апошні раз гаўкнуў ёй услед. Добра такі забегаўся, аж высалапіў язык. Адвёў душу пасля ланцуговай няволі. Цяпер можна і адсапціся.

І тут якраз насупраць спынілася машына-будка, на якую Дружок нават не павёў вухам. Не насцярожыла яго і тое, што з кабіны выскачыў чалавек са стрэльбай. Паміж Дружком і машынай было метраў сорак...

Кастусь пачуў стрэл і аж злякнуўся. Ён падскочыў як уджалены і ўтаропіўся туды, дзе спынілася машына. Хаця да дарогі было далекавата, Кастусь адразу ж убачыў Дружка, які чамусьці круціўся на адным месцы, быццам хтосьці ўчапіўся ў ягоны хвост. Убачыў ён і чалавека са стрэльбай, які цэліўся ў Дружка.

— Э-эй-й! — хлопчык закрычаў нема і адчайна, на колькі ў яго хапіла духу.— Мой Дружок, мо-о-й! Не чапайце-е-е!

Раскацістым рэхам прагрымеў другі стрэл. Нейкая нябачная сіла падкінула Дружка ўгору, перакуліла яго цераз галаву і бразнула вобзем...

— Мо-ой Дру-ж-о-о-к!

Чалавек са стрэльбай заўважыў хлопчыка і адразу ж кінуўся да машыны, якая амаль што імгненна сарвалася з месца, узняўшы за сабой густы шлейф шэрага пылу.

Кастусь бег да дарогі, плакаў і крычаў, пакуль не ахрып і не страціў голас. Ды колькі мог прабегчы Кастусь Пташук, якому забаранялася гуляць нават з мячом? А тут жа на яго вачах, сярод белага дня, калі яшчэ вераснёўскае сонца лагодна высвечвала засмужаны далягляд, адбылося штосьці страшнае і дзікае. Ён не мог паверыць у гэта, не мог падумаць.

— Дружок, даражэнькі мой, пачакай, я зараз... Я дапамагу табе, па-ча-ка-а-й!

Кастусь спатыкнуўся, упаў, паспрабаваў падняцца і не змог: ногі не слухаліся яго. Ён тыцнуў тварам у сухі калючы дол і заплакаў горка і безнадзейна. Яго калаціла нібы ў ліхаманцы. Мусіць, ва ўсім белым свеце ў гэтую хвіліну ён быў самы няшчасны і адзінокі.

Праз колькі хвілін Кастусь усё ж прыўзняўся на локцях і затуманенымі вачыма пачаў узірацца ў касагор ля дарогі.

У самотным позірку хлопчыка яшчэ цеплілася спадзяванне, якое крыху супакойвала, суцішвала пякучы адчай.

Раптам ён убачыў Дружка, але зусім не там, дзе хацеў убачыць. Сабака поўз на жываце, няўклюдна заграбаючы па зямлі пярэднімі лапамі, раз-пораз знясілена тыцкаючыся пысай у жухлую траву. Ён быў ужо блізка, хаця не настолькі, каб Кастусь мог разгледзець акрываўленую галаву Дружка, убачыць яго перабітыя заднія лапы, пачуць жаласлівае скавытанне параненай істоты.

— Дружок, я тут! — усклікнуў Кастусь і з вялікім намаганнем, адштурхоўваючыся ад зямлі каленямі і локцямі, папоўз насустрач. Ягонае цела аж трымцела ад знямогі.

Гэта былі цяжкія, пакутныя метры. І для Дружка, і для хлопчыка. Адлегласць паміж імі паволі скарачалася, яны збліжаліся. І ўжо нішто не магло спыніць іх.

...А ці не тая далёкая вясновая раніца, калі на аселіцы каля стога ўчарнелай саломы прагрымелі стрэлы, адгукнулася гулкім рэхам у ціхім асеннім дні? І прынёс гэтае рэха Дружок — адзін з чатырох шчанюкоў бяздомнай Пальмы?

Хто ведае, хто адкажа...

*Светлай памяці*
*маці маёй*
*Яўгеніі Антонаўны*
*прысвячаю.*

## *ДАГАНІ СВАЁ МАЛЕНСТВА!*

*Якая дзівосная, загадкавая і непаўторная наша памяць! Колькі падзей, з'яў, уражанняў захоўвае яна ў сваёй скарбонцы: дзень за днём, год за годам... Мы помнім, што было з намі ўчора і пазаўчора, помнім і больш далёкае... І чым далей мы адыходзім ад свайго маленства, тым усё больш узбагачаецца скарбонка нашай памяці. І, вядома ж, запамінаецца ўсё самае важнае, адметнае, уражлівае, што калісьці вельмі закранула, узрушыла, прымусіла задумацца, усхвалявацца, а можа, нават, і папакутаваць.*

*І калі сёння чалавеку за пяцьдзесят, і кожны пражыты дзень павялічвае гэты салідны рахунак, вяртанне ў дзяцінства выклікае ў яго пачуццях і радасць, і сум, і здзіўленне, і шкадаванне... Ажывіць падзеі даўно прамінулых дзён, паглядзець на сябе з вышыні дзесяцігоддзяў: які́м ты быў, што цябе цікавіла, якімі ўчынкамі ты можаш ганарыцца, а якімі не? Так узнікае жаданне дагнаць сваё маленства.*

*Я адчыняю скарбонку сваёй памяці і вяртаюся на некалькі дзесяцігоддзяў назад, у той далёкі, патаемны час, калі яшчэ свежыя вятры не паспелі развеяць гаркавы дым ваеннага ліхалецця. Мне — дзесяць — дванаццаць... Памяць, на жаль, захавала не ўсё, што хацелася б сёння ўзнавіць, ажывіць: факты, дэталі, падзеі. Па часе давядзецца сёе-тое прыдумаць, дамаляваць, даверыцца сваёй фантазіі і ўспамінам сваіх аднагодкаў. Гэта ж так няпроста — даганяць сваё маленства!*



## ЦУКЕРКІ-ПАДУШАЧКІ

Што б там ні казалі, а самае яркае і запамінальнае ўражанне пасляваеннага дзяцінства — гэта прыезд у вёску Свідзянка кінаперасоўкі. Колькі радасці і ўзрушэння было ў голасе таго, хто першы аб'яўляў навіну:

— Кіно едзе!

І Міша разам з сябрукамі бег наперагонкі насустрач падводзе, на якой побач з возчыкам, звесіўшы з драбінаў ногі ў чорных хромавых ботах, сядзеў кінамеханік Іван Размоўка. Выгляд у яго, як заўсёды, быў бравы і нават фанабэрысты. Густы кучаравы чуб выглядаў з-пад доўгага брыля клятчастай кепкі, а з тоўстай ніжняй губы звісала цыгарэта, з якой далікатным струменьчыкам віўся бялесы дымок. Іванаў бравы выгляд дамалёўвала тонкая нітачка чорных вусікаў, што быццам прыклеіліся пад гарбатым носам. Быў ён гаваркі, вясёлы і па-заліхвацку іграў на гармоніку, які заўсёды вазіў з сабою.

— Здарова, жэўжыкі! — пыхкае цыгарэтным дымком Размоўка, калі хлапчукі акружаюць падводу, з цікаўнасцю разглядаючы скрынкі з апаратурай і дзвіжок, які стаіць ззаду падводы.— Што тут у вас новенькага адбылося за тыдзень? Засумавалі без мяне? Давай, Міхаська, залазь на наш драндулет, падвязём, а ты раскажаш пра вашы навіны.

Возчык прыпыняе каня, і Міша спрытна забіраецца на калёсы, прымошчваецца на каленях ля дзвіжка. Такі гонар яму аказалі невыпадкова. Кіно дэманструюць у школе, і, вядома ж, настаўнічын сын карыстаецца ў кінамеханіка асаблівай увагай. Міша і фільмы глядзіць бясплатна, чым

выклікае ў сваіх аднагодкаў непрыкрытую зайздрасць. Бо не заўсёды ім шанцуе вымаліць у сваіх бацькоў тыя магічныя капейкі, за якія можна купіць білет на сеанс. І яны часцяком прастойваюць ля дзвярэй школы ў чаканні, што кінамеханік зміласцівіцца і пусціць у клас, каб паглядзець хоць апошнія кадры фільма.

— У мяне план, я не магу працаваць бясплатна.— Размоўка быў няўмольны.

Кінамеханіку даводзілася вытрымліваць не толькі ўмольныя позіркі дзяцей, але і асаду дарослых дзецюкоў, якія іншы раз штурмавалі дзверы школы п'янай сілай. Тады ён заглушаў дзвіжок і аб'яўляў:

— Усё, сёння кіна не будзе!

І гледачы, якія купілі білеты, пачыналі ўшчуваць дзецюкоў:

— Як вам не сорамна! З-за вас мы не паглядзім фільм. На выпіўку грошы знайшліся, а тут прыдурваецеся...

У рэшце рэшт агульнымі намаганнямі безбілетнікаў выстаўлялі за дзверы. Размоўка заводзіў дзвіжок, і на белым экране, што занавешваў класную дошку, з'яўлялася назва фільма.

Размоўка дакурвае цыгарэту, акурак сплёўвае на дарогу і пытаецца ў Мішы:

— Як справы ў школе? Мамка многа двоек наставіла ў свой журнал?

— Не, нямнога,— адказвае Міша.

— А сярод вас ёсць двоечнікі? — цяпер кінамеханік пытаецца ў хлапчукоў, якія маўкліва шпацыруюць за падводай.

— Няма! — адзываецца самы бойкі Валодзька Бляўскі.

— Глядзіце ў мяне! — торгае рукой свае чорныя вусікі Размоўка.— Даведаюся ў Яўгеніі Антонаўны пра двойкі, не пушчу ў кіно, нават за грошы.

— А за пяцёрку можна без білета? — смяецца Валодзька.

— За адну пяцёрку? — падтрымлівае жартаўлівы настрой Размоўка.— Не-е, так я зусім застануся без плана... Вось калі па ўсіх прадметах будзе «выдатна», тады я згодны. Бярыце даведку ў Яўгеніі Антонаўны, толькі з круглай пячаткай, што вучыцеся на адны пяцёркі, і прыходзьце на сеанс без грошай. Вось жа Міхаська ў вас выдатнік!

— Яму лацвей, яго мамка вучыць! — зноў падначвае Валодзька Бяляўскі.

— Ну і што? Хіба Яўгенія Антонаўна завышае сыну адзнакі? — прыжмурваецца кінамеханік.

— Ды не-е,— нібы апраўдваецца Валодзька,— Міша ў нашым класе лепшы вучань, яму не трэба завышаць...

— Малайчына! Такія не будуць жыць па блату,— падхвальвае Мішу кінамеханік.— З такімі можна і ў разведку...

— Дзядзька Іван, які фільм везяце? — нарэшце не вытрымлівае Міша, каб неяк змяніць кірунак няёмкай для яго гаворкі.

— Вой-вой, а пра галоўнае я не сказаў! — Размоўка гучна пляскае далонямі па халявах сваіх хромавых ботаў.— Шэдэўр сусветнага кіно! Трафейны Тарзан! Вось гэта карцінка — адвал башкі! Мяне з Панізоўя не хацелі выпускаць: тры сеансы даваў, яшчэ прасілі круціць.

— Тарзан! Тарзан! — загалёкалі хлапчукі.

Зарадаваўся і Міша. Ён яшчэ раней чуў пра гэты знакаміты фільм, расказваў кінамеханік. А ўпершыню Іван Размоўка — сталы ўжо, гадоў за трыццаць пяць мужчына,— прыехаў з кінаапаратурай у Свідзянку недзе на зыходзе лета. І вось ужо два месяцы, кожны тыдзень у школе дэманструюцца фільмы, а Размоўка часцяком заходзіць да загадчыцы школы, Мішавай маці, папіць чайку, пагаварыць пра жыццё-быццё і кінамастацтва, паведаць розныя навіны раённага і больш шырокага маштабу.

Міша з маці, старэйшым братам Шурам і цёткай Анэтай жылі ў тым жа доме, дзе размяшчалася пачатковая школа. Большая палавіна дома — школа, у якой у дзве змены вучыліся вучні чатырох класаў. Першая змена — першы і трэці класы, другая — другі і чацвёрты. І з усімі чатырма класамі займалася Яўгенія Антонаўна. Абяцалі прыслаць новую настаўніцу, але пакуль не прысылалі.

У меншай палавіне дома, які перавезлі з суседняй вёскі неўзабаве пасля вайны, абсталявалася сям'я загадчыцы школы. Свідзянка, датла спаленая фашыстамі, адбудоўвалася спакваля, яшчэ не ўсе вяскоўцы перабраліся ў свае хаты са змрочных, прусаковых зямлянак. Таму прыезд у вёску кінаперасоўкі радаваў не толькі дзяцей і моладзь, але і людзей сталага веку.

Гэта было амаль што святам. А тут яшчэ, як правіла, пасля кожнага сеанса наладжваліся танцы пад Размоўкаў гармонік.

І вось нарэшце — «Тарзан»! Той самы, якога Размоўка

выбіваў у свайго начальства не першы месяц. Тарзанаўскую стужку ўжо даўно круцілі ў Лагожскім раёне, пра яе хадзілі фантастычныя чуткі, як пра нешта казачнае, незямное... І пра міфічнага, неверагоднага Тарзана!

— Такога дзіва, пацаны, вы ніколі не бачылі,— пахваляецца кінамеханік.— Джунглі, прыгоды, экзатычныя звяры... Фільм не для слабанервовых. Палахліўцаў прашу не прыходзіць... А то яшчэ давядзецца браць у Міхалёніхі ваду ад спуду.

— Нічога, мы не з баязлівых,— кажа Валодзька.— Вайной у лесе жылі, ад фашыстаў берагліся...

— І колькі ж гэта вам у вайну было гадкоў? — пытаецца Размоўка і прыпальвае новую цыгарэту.

Хлапчукі задумваюцца, пераглядваюцца. Задумваецца і Міша, падлічвае, нарэшце згадвае, што на канец вайны яму ішоў чацвёрты... А бацьку свайго не помніць. Тады іх сям'я жыла ў вёсцы Палонка, што за пяць кіламетраў ад Свідзянкі. З матчыных успамінаў Міша ведае пра гады ліхалецця. А вось ужо самому запомнілася, як з братам Шурам (ён старэйшы на тры гады) мылі кацялкі савецкім салдатам, якія вызвалілі Палонку ад фашыстаў. Салдаты пачаставалі братоў шакаладам, але Міша аддаў сваю плітачку Шуру, бо чамусьці не ўпадабаў той нязвыклы пачастунак. І помніцца Мішу ў ваконнай шыбіне іхняй хаты маленькая дзірачка, ад якой па ўсім крузе разбягаліся светлыя шкляныя промнікі. Толькі бацьку не помніць, якога фашысты застрэлілі ў той жа хаце, на кушэтцы, за дзень да прыходу нашых. Напярэдадні вызвалення амаль усе палонкаўцы з'ехалі ў лес, каб перачакаць страляніну і лютасць адступаючых акупантаў. Паехала ў лес і сям'я Зарэўскіх, а вось бацька наадрэз адмовіўся ехаць, маўляў, каму патрэбны хворы чалавек. І не ўберогся...

Неўзабаве пасля вайны настаўніцу Яўгенію Антонаўну накіравалі працаваць у Свідзянкаўскую пачатковую школу. Яна нейкі час хадзіла ў школу кожны дзень з Палонкі, а потым разам з сынамі і цёткай Анэтай пераехала на сталае жыхарства ў Свідзянку.

Пра лясное жыццё Валодзькі і яго аднагодкаў Міша нічога не ведаў. А тут Размоўкава пытанне прымусіла згадаць той, не такі ўжо далёкі час.

— Мне тры гады было,— сказаў Валодзька.

— І нам,— пацвердзілі астатнія.

— Нягуста,— паківаў галавой кінамеханік.— А я, пацаны, партызаніў, ля Паліка наш атрад базіраваўся. У бла-

каду ледзьве не адправіўся на той свет. Параненым, у балотнай багне двое сутак праляжаў, пакуль немчуру не адагналі ад Паліка. Так што лясных прыгодаў і ў мяне хапала. Вядома ж, не параўнаць іх з Тарзанавымі... І Чыты ў нас не было... Ладна, больш расказваць не буду, самі ўсе дзівосы ўбачыце.

Якраз падвода падрулілa да школы, і Размоўка лёгка саскочыў на зямлю, папыхкваючы цыгарэтным дымком.

— Прыехалі, будзем разгружацца,— сказаў кінамеханік і, звяртаючыся да возчыка, папрасіў: — Памажы, браток, зняць дзвіжок, цяжкаватая машына.

— За памажы плаціць трэба,— буркнуў маўклівы, нягеглы мужчына, з зарослым рудой шчэццю тварам.

— Табе брыгадзір заплаціць,— адрэзаў Размоўка.— У наступны раз бясплатна паглядзіш фільм.

— Патрэбны мне гэтыя фільмы як сабаку пятая нага,— злосна сплюнуў возчык. Але ўсё ж памог зняць з падводы дзвіжок і, не развітаўшыся, павярнуў такога ж панурага, як і сам, каня ў зваротную дарогу.

— Мусіць, сёння не пахмяліўся,— гледзячы ўслед падводзе, сказаў Размоўка.— Бач ты, яго фільмы не цікавяць, цямнушнік гэтакі.

На ганку школы з'явілася Мішава маці, радасная, узбуджаная. Прывіталася і сказала:

— У нас яшчэ адзін урок, калі ласка, Іван Адамавіч, пастаўце апаратуру ў калідоры.

— Добра, Яўгенія Антонаўна, мне няма куды спяшацца, да вечара яшчэ шмат часу. Я вам не буду перашкаджаць.

— А які фільм прывезлі?

— «Тарзан», Яўгенія Антонаўна, славуты «Тарзан»! Першая серыя.

— Нарэшце-такі дачакаліся!

— Ага, дайшла чарга.

— Міша, правядзі Івана Адамавіча да нас, трэба ж адпачыць з дарогі.

— Нічога, нічога, не турбуйцеся, не пехатой жа дабіраліся. Праўда, Міхаська? — Кінамеханік падміргнуў, паблажліва ўсміхнуўся, падымаючы з зямлі самую большую скрынку — кінапраектар.— А вось аб'яву нам трэба намаляваць. Так што, Міхаська, ідзі падрыхтуй нашы фарбы і пэндзаль. Я зараз перанясу апаратуру ў калідор.

Міша азірнуўся на хлопцаў, якія стаялі непадалёку, нібы чакаючы новых звестак пра Тарзана, махнуў рукой,

маўляў, у мяне важнае заданне, і пайшоў на другі бок дома, дзе быў уваход у іхнюю кватэру.

Чуткі пра «Тарзана» ўзбударажылі вёску, як самая надзвычайная падзея. Яшчэ задоўга да пачатку сеанса каля школы сабраўся ладны натоўп нецярплівых гледачоў, якія ў каторы раз перачытвалі аб'яву, што вісела на школьнай сцяне, перагаворваліся, перакідваліся жарцікамі. Міша таксама круціўся непадалёку, падышоў і Валодзька Бяляўскі. Хутчэй бы ўбачыць Тарзана!

З'явіўся Размоўка, весела павітаўся з вяскоўцамі і адразу ж пакіраваў да дзвіжка, які стаяў за крокаў пяць ад школьнага ганка.

— Нешта нездаровіцца майму коніку, чмыхае, каб яго пранцы,— паведаміў кінамеханік, здымаючы з дзвіжка брызентавую накідку.— Запарышся, пакуль завядзеш.

— А ты, Адамавіч, свячу паглядзі...

— Карбюратар паспрабуй прачысціць, можа, у цябе бензін з пясочкам.

Нецярплівыя гледачы акружылі кінамеханіка, давалі парады, выказвалі розныя здагадкі. Устрывожыліся, бо калі будзе барахліць дзвіжок, ці яшчэ горш — не завядзецца, тады ўжо, напэўна ж, давядзецца адкласці сустрэчу з Тарзанам на нейкі няпэўны час. Бо здаралася ж такое і раней.

Міша прыпомніў, як у мінулы раз таксама не заводзіўся дзвіжок. Колькі ўжо з ім валаводзіўся Размоўка — не адну гадзіну! Не дапамог і вопыт мясцовага шафёра Пятра Навіцкага. Здаецца, усё перабралі, а дэфект не знайшлі. Гледачы разышліся, засталіся самыя цярплівыя з моладзі і хлапчукоў. І Міша застаўся.

Дзвіжок занеслі ў класны пакой і пры святле газавай лямпы сталі перабіраць дэталі рухавіка. Кінамеханік раззлаваўся, вырашыў даказаць сваё. Хлопцы па чарзе апантана круцілі рукаятку, але дзвіжок зноў і зноў здзекліва чмыхаў, выпускаў едкую порцыю дыму і пагардліва замаўкаў.

— Не-е, ты ў мяне завядзешся! — упарта заяўляў Размоўка і дзьмухаў на злашчасную свячу, перакручваў кранік карбюратара.

У пакоі клубіўся бензінавы чад, дым шчыпаў вочы, але ўсе трывалі, спадзеючыся на нейкі цуд. І ён сапраўды адбыўся! Дзесьці далёка за поўнач дзвіжок усё ж уступіў настойлівасці кінааматараў і раптам гулка затарахцеў, асвятліўшы дымны пакой электрычным святлом. Вось дзе было радасці!

Тут жа Размоўка, паддаўшыся ўсеагульнай узрушанасці, нечакана аб'явіў:

— Будзем глядзець фільм!

Дзвіжок вынеслі ў калідор, кінамеханік уставіў у праектар стужку, і праз якую хвіліну-другую на экране з'явіліся першыя кадры фільма «Сямёра смелых». Захапляючая, прыгодніцкая карціна, з пагонямі, стралянінай і рознымі неверагоднасцямі, з якіх заўсёды знаходзілі выйсце смелыя і рызыкоўныя кінагероі. Той сеанс закончыўся на досвітку, але ніхто не паказваў ні стомленасці, ні санлівасці. А ўражанняў — аж пад завязку!

«Толькі б сёння не падвёў дзвіжок»,— думаў Міша, назіраючы за кінамеханікам, які засяроджана чараваў над рухавіком. І балельшчыкі прыціхлі, стараючыся не перашкаджаць Размоўку.

Падышоў вясковы балабон Базыль Тылеўскі. Ён служыў фінагентам і днямі прападаў у раз'ездах па суседніх вёсках, спаганяючы з гаротных сялян бязбожныя штрафы і нядоімкі. І на гэты раз, як заўсёды, Базыль не мог памаўчаць і секунды. Убачыўшы Размоўку, які схіліўся над дзвіжком, ён адразу ж загундосіў:

— Што, кіншчык, іскру згубіў? Грашыш, Ванятка, грашыш... Вунь і да нашай настаўніцы падлабуньваешся... Ходзяць чуткі-пачуткі, у нас нічога не схаваеш, а тым больш такое...

— Кінь плявузгаць, Базыль! — незласліва агрызнуўся Размоўка.— Пляткар ты несусветны, горш за якую бабу.

— Ну не кажы, якая ж гэта плётка?! Не прыбядняйся, Адамыч, з цябе магарыч! Калі вяселле будзем ладзіць?

— Ціпун табе на язык! — на гэты раз раздражнёна сказаў кінамеханік і сплюнуў недакурак пад ногі.— Мала табе фінагентаўскіх магарычоў? У бедных бабак апошняе забіраеш, як той панскі цівун...

— Я па закону, для дзяржавы стараюся, ёй пасля вайны трэба падымацца на ногі. Так што, калі ласка, што вінен — аддаць павінен! А ў цябе, Адамыч, здаецца, і ў Панізоўі ёсць залётка... Людзі не сляпыя, яны ўсё бачаць.— Базыль казаў з падначкай, падміргваючы левым вокам. Правае ў яго замяніў шкляны шарык. Кажуць, Базыль дставаў тол з гранаты, а яна раптам узарвалася: вока выбіла, пальцы на адной руцэ скалечыла. Яшчэ добра, што галаву не знесла.

З гэтым шкляным вокам на Свідзянкаўскіх вечарынках надараліся камічныя казусы. Базыль, калі заяўляўся на

танцы пад «мухай», можна сказаць, даваў бясплатны канцэрт. Ён заказваў барыню і пускаўся ў скокі, адначасова выконваючы свае любімыя прыпеўкі.

Сербіянка, мая мамка,
Не хадзі на вуліцу...

А яшчэ ў Базылёвым рэпертуары была нейкая дзіўная песня пра бараду, якую чамусьці спявак увесь час расцягваў па горадзе. Захапіўшыся танцам, тэмп якога нарастаў з кожным кругам, Базыль раптоўна спыняўся і аб'яўляў прапажу свайго шклянога вока. На пошукі адразу ж кідаліся дзеці, якія былі самымі ўважлівымі гледачамі і слухачамі на кожнай вечарынцы. Знайсці тое маленькае шкельца пры цьмяным святле газоўкі было даволі няпроста. У рэшце рэшт вока знаходзілі. Базыль спрактыкаваным рухам устаўляў шкляны шарык на ранейшае месца і зноў пускаўся ў скокі.

Калі б гэту бóраду
Расцягнуць па гораду...

І смех, і жарты, і пацеха! Базыль танчыў да поўнай знямогі, аздабляючы сваё выступленне вісклівым п'яным голасам і беспардоннымі прыпеўкамі, ад якіх сарамлівыя дзяўчаты і малалеткі затыкалі вушы. І ніхто не мог ні паўшчуваць танцора, ні запярэчыць яму. Ну, а з Размоўкам у фінагента Базыля Тылеўскага былі даўнія рахункі, якія натхнялі вясковага балабона на здзеклівыя насмешкі.

Вось і новая сустрэча фінагента з кінамеханікам на школьным двары не магла скончыцца мірна-смірна.

— Заткніся ты, аднавокі цыклоп! — амаль прашыпеў Размоўка.— Што ты вярзеш?

— Не трэба хваляваццa, Адамыч, не трэба... Галоўнае, каб твая жонка не даведалася.— Базыль умеў даводзіць свайго праціўніка да «белага калення»... А сам ні пры якіх сітуацыях не губляў раўнавагу і здзеклівы спакой.— Я больш нікому не скажу... Мішаня таксама не раскажа сваёй мамцы... Кіншчыкі на дарозе не валяюцца. Ты, Мішаня, умееш хаваць мужчынскія сакрэты, праўда ж? А можа, Адамыч развядзецца з паварыхай гарадской сталоўкі і ажэніцца на загадчыцы школы? Тады ў цябе, Мішаня, будзе другі татка, такі сімпатычны кіншчык з вусікамі!

— Падлюга! — гнеўна выкрыкнуў Размоўка і пайшоў з кулакамі да Базыля.

А на школьным двары стаяў несусветны рогат. Цырк на дроце! Пацяшаліся дзецюкі — кіно бясплатнае, і «Тарзана»

не дачакаліся. Толькі Мішу было не да пацехі. Ён раптам разгубіўся, зачырванеўся, быццам ягоны твар апякла крапіва-жыгучка. Яму здалося, што смяюцца не з кінамеханіка і фінагента, а рагочуць з яго самога...

Міша кінуўся прэч ад гэтага здзеклівага рогату, каб не бачыць і не чуць п'янага аднавокага Базыля ды адвадзіць ад сябе ненавіснае: «У цябе, Мішаня, будзе другі татка...» Нейкае невядомае і незразумелае пачуццё ашаламіла хлопчыка, разбудзіла ў ім нешта крыўдлівае і балючае...

Ён захаваўся на ляжанцы ў запечку, спаслаўшыся на болі ў жываце, і аддаўся горкім перажыванням. А думкі ягоныя кружыліся вакол аднаго — здзекліва-зняважлівага і вярэдлівага.

«Няўжо такое сапраўды можа стацца? Я не памятаю свайго тату, мне было тады ўсяго тры гады... А тут... Базыль выскаляецца пра «другога татку»... І чаму мама так радуецца, калі бачыць кінамеханіка Івана Размоўку? І кожны раз запрашае ў госці... Сёння мяне Размоўка падвёз на падводзе з кінаапаратурай, больш жа нікога не падвёз...»

У вушах па-ранейшаму надакучлівым камаром гудзеў здзеклівы Базылёў голас: «Ты, Мішаня, умееш хаваць мужчынскія сакрэты?»

Хутка ў запечку зусім сцямнела, але Міша нават не думаў выбірацца адтуль, знерваваны сваёй незразумелай крыўдай.

— Сынок, як ты тут? — занепакоена запытала маці.— Баліць? Хутка ж у кіно...

— Баліць,— ціха адказаў Міша.— Я не пайду ў кіно.

— Дык жа «Тарзан»! Можа, сушаных чарніц даць?

— Не трэба, перастане... Я паляжу яшчэ...

— Добра, сынок, паляжы, а мне трэба праверыць сшыткі.

Ён суцішыўся, знябыўшыся ад сваіх перажыванняў, і непрыкметна задрамаў. Прачнуўся ад галасоў, што даляталі з-за перагародкі.

— Трэба ў міліцыю заявіць... Гэта ж злоснае хуліганства і групавое нападзенне.

— Нічога, я сам разбяруся, не на таго натрапілі... Дaслужыцца — і без другога вока застанецца! Хай цяпер танцуе сваю барыню пад язык...

— Якія недавяркі. І як толькі іх зямля трымае? Зрабі ім добрае — яшчэ абнячслав яць!

— Бог з імі, недавяркамі, Яўгенія Антонаўна! Можа, і вам ужо наплялі што-небудзь?

— Вы пра што, Іван Адамавіч?

— А-а-а, ды я так, між іншым... А фільм вам спадабаўся?

— Ой-ёй-ёй, вельмі-вельмі! А які слаўны Тарзан!

— Яшчэ тры серыі ёсць у нашым раёне. Пастараюся прывезці на наступным тыдні другую серыю.

— Дзякуй вам, вось будзе цікава! Вунь сёння колькі сабралася гледачоў, аж на падлозе сядзелі! Шкада, Мішка занядужаў, такі фільм не паглядзеў... Заснуў, я не асмелілася разбудзіць.

— З дзецьмі ўсялякае надараецца, так і глядзі...

— Давайце, Іван Адамавіч, пап'ём чайку.

— Можна, з прыемнасцю! Вось толькі схаджу на двор, дзвіжок брызентам накрыю, раптам ноччу пойдзе дождж.

— Добра, я чакаю,— зноў пачуўся ціхі матчын смяшок.

Размова гэтая, міжволі пачутая Мішам, зноў напомніла яму пра сутычку фінагента з кінамеханікам на школьным двары.

«Чаму мама казала пра міліцыю і групавое нападзенне? Можа, там і дзецюкі ўмяшаліся? Ад іх усяго можна чакаць».

Яго здагадкі перапыніў далікатны матчын голас:

— Мішка, ты спіш? Як жывоцік?

Ён спачатку не азваўся, прытварыўся, што спіць, але тут жа адчуў лёгкі дотык матчынай рукі:

— Сынок, прачніся, чуеш?

— Чую,— больш ён не мог маўчаць.

— Тут Івана Адамавіча трэба чайком пачаставаць, а цукру ў нас няма... Дай, сынок, падушачак, няёмка без цукру...

І чамусьці зноў шуганула гарачынёй у твар, як тады, на школьным двары, і нeяк раптоўна засмяглі вусны. Міша ледзь чутна, але цвёрда, адказаў:

— Няма падушачак, няма!

— Сынок, пашукай! Я ў нядзелю паеду ў горад, куплю яшчэ цукерак,— ужо ўмольна прасіла маці.

— Для яго няма! — злосна буркнуў Міша.— І чаго ён ходзіць да нас? Чаго?

— Во-ой, сыночак! — спалохана войкнула маці.— Ты пра што? Няўжо і табе напляткарыў Базыль? Які бессаромнік! Выдумкі ўсё гэта, сынок, выдумкі!

Мішу падалося, што маці заплакала, але ён зацята маўчаў. Пачуццё невядомай дасюль сыноўняй рэўнасці завалодала ўсёй яго істотай. І хлопчык ужо быў не ў сілах

прымусіць сябе злезці з печы, каб дастаць з шуфлядкі стала падушачкі з павідлавай начынкай. Ён, Міша, не мог змірыцца з думкай, што маці будзе частаваць імі кінамеханіка, якога ён так нечакана неўзлюбіў. І ні бясплатнае кіно, і ні жаданне ўбачыць Тарзана не змаглі адужаць гэтую яго зацятасць.

Бразнула клямка, вярнуўся Размоўка. Маці хуценька выслізнула за перагародку, і Міша пачуў яе разгублены голас:

— Праштрафілася я, Іван Адамавіч, цукар закончыўся, а я і не заўважыла...

— Нічога, абыдземся без салодкага, мы ж не дзеці! — шматзначна рассмяяўся кінамеханік.

Міша накінуў на галаву байкавую коўдру, заціснуў вушы далонямі, каб не чуць далей іхнюю размову. І быццам нырнуў з высокага берага ў чорны вір.

Назаўтра Размоўка павёз кіно ў суседнюю вёску Пархава і больш ужо ніколі не прыязджаў у Свідзянку. Казалі, што яго перавялі на іншы маршрут. А яшчэ хадзілі чуткі, што гэта ўсё з-за Базыля і ягоных дружкоў, якія прыгразілі кінамеханіку суровай расплатай.

Міша бачыў, што гэтая навіна вельмі засмуціла маці, але яна ні словам не выказала сыну свайго засмучэння. Толькі праз шмат гадоў маці ўспомніла:

— Ведаеш, сынок, а твае цукеркі-падушачкі памаглі... Я тады ўсё ж сказала кінамеханіку, каб ён болей не прыходзіў да нас. Розным там чуткам не верыла, а табе паверыла... Потым аказалася, што ў яго ўжо была свая сям'я, і дзеці...

— Смачныя былі цукеркі, з павідлам. Цяпер такіх няма,— чамусьці з выбачэннем сказаў сын.

## ШПАКОЎНЯ

Ён праляжаў на гарышчы хаты не адзін год і знайшоўся зусім выпадкова сярод розных непатрэбнай старызны. Запылены, з выцвілай, пажаўцелай вокладкай і парудзелымі старонкамі. Стары класны журнал сорак восьмага — сорак дзевятага вучэбнага года. Колькі ж адшумела ліўняў, адгрымела навальніц і сплыло снягоў з тае пары?! І які гэта далёкі, шчымліва-незваротны час! А класны журнал не загубіўся, адшукаўся праз сорак пяць гадоў, захаваўшы на сваіх старонках імёны і прозвішчы вучняў пачатковай

школы № 62, адзнакі, расклады, тэмы ўрокаў... І роўны, упэўнены почырк настаўніцы Яўгеніі Антонаўны, і фіялетавыя літары і лічбы, выпісаныя сталёвым вучнёўскім пяром.

Валодзя Бяляўскі, Жорж Грудзінка, Ваня Вершаль, Міша Аксючыц, Надзя Казлоўская, Маня Вершаль, Жорж Ляўданскі... Аднагодкі-аднакласнікі, дзеці жудаснай ваеннай пары. Кожны з іх перажыў страшную трагедыю роднай вёскі, якую фашысты спалілі датла разам з яе жыхарамі. Выратаваліся толькі тыя, хто паспеў схавацца ў лесе...

Гартаю выпетраныя старонкі, думаю, згадваю, успамінаю. Чытаю назвы ўрокаў: беларуская мова, беларуская літаратура, арыфметыка, чыстапісанне, гісторыя, спевы... І красамоўныя сведчанні ведаў: «5», «4», «3», «2»... Вось жа і маё імя, вось жа і мае адзнакі па беларускім чытанні: «5», «4», «5», «5»... Што тады праходзілі на ўроку беларускага чытання? Вучылі на памяць верш «У школу», чыталі апавяданні «Пілiпка», «Юрачка», «Чырвоны аловак»... А далей ужо больш сур'ёзныя творы: «Ад матыкі да трактара», «Таня-рэвалюцыянерка», «Падарунак таварыша Куйбышава», «Смерць героя»...

Адгортваю старонку граматыкі і правапісу і бачу, што тут мае адзнакі не такія ўжо вясёлыя: «3», «3», «4», «4»... А побач — адзнакі аднакласніка: «2», «2», «2», «2»...

Чытаю тэмы ўрокаў: алфавіт, адушаўлёны і неадушаўлёны прадмет, з'явы прыроды... Старонка за старонкай, урок за ўрокам, дзень за днём... А фіялетавыя словы і лічбы перакідваюць ланцужок памяці ад дня сённяшняга да дзён далёкай мінуўшчыны. І міжволі адбываецца цуд: лічыльнік часу пачынае адлічваць гады ў зваротным кірунку — дзевяностыя, сямідзесятыя, пяцідзесятыя...

І вось я ўжо там, у мройным маленстве, убачаным са старонак старога класнага журнала. І мроя гэтая нейкая загадкавая і таямнічая. Яна чамусьці найперш высвечвае з глыбіні памяці нешта малаверагоднае, фантасмагарычнае. І не ў клас вядзе, не на ўрок, а ў той непраўдападобны вечар, што і праз гады ўспамінаецца з ніякаватым неўразуменнем і вінаватай усмешкаю. Як і тая шпакоўня, якую мы з братам Шурам змайстравалі са старых дошак і вывесілі на даху хлява.

Вясна была ў поўным разгары, і шпакі спяшаліся аблюбываць сваё жытло. Але чамусьці яны абміналі нашу шпакоўню, быццам якое пачварнае пудзіла. І што ім не падаба-

лася ў нашым дамку? Нават вераб'і не пажадалі заняць вольную жылплошчу.

— Можа, дзірка занадта вялікая? — выказаў сваё меркаванне брат. Толькі змяніць што-небудзь мы ўжо не маглі, даводзілася чакаць і спадзявацца...

І вось аднойчы маё чаканне было ўзнагароджана: я ўбачыў шпака, які сеў на нашу шпакоўню. Гэта быў нейкі дзіўны шпак, вяртлявы, неспакойны і баязлівы. А яшчэ ён дзесьці страціў свой хвост і таму выглядаў даволі смешна.

Спачатку бясхвосты з прыдзірлівай падазронасцю агледзеў шпакоўню звонку, нібы баючыся хітрага падвоху. Потым з яшчэ большай асцярожнасцю пераскочыў да квадратнай дзіркі, якую мы з братам выдзяўблі долатам у дошцы. Нарэшце ён асмеліўся зазірнуць у акенца і, пераканаўшыся ў сваёй бяспецы, нырнуў у шпакоўню.

Я, узрушаны і заінтрыгаваны, працягваў сваё назіранне, захінуўшыся за вугал хаты. Мяне турбавала адно: чым закончацца агледзіны? Вельмі ж ужо дзівакаваты гэты навасёл! Такога паспрабуй улагодзіць...

Праз хвіліну-другую бясхвосты выскачыў са шпакоўні, ён па-ранейшаму быў нейкі ўзбуджаны і яршысты. Нібы толькі што вырваўся з кіпцюрастых каціных лапаў... А хіба свой хвост шпак згубіў па асабістым жаданні? Вось і асцярожнічае, вось і не давярае...

Шпак узляцеў на шпакоўню, агледзеўся і тут жа ўзняўся ў паветра. Я так і зніякавеў: «Усё, і гэты шустрык даў драпака!» Але маё расчараванне было заўчаснае. Бясхвосты вярнуўся з доўгай саломінкай у дзюбе і ўжо без усялякай асцярожнасці нырнуў у шпакоўню.

«Ага, не ўцёк!» — я ледзьве стрымаўся, каб сваім крыкам радасці не спудзіць доўгачаканага навасёла.

Шпак пачаў будаваць гняздо! За першай саломінкай ён хуценька прынёс поўны рот сухой травы, потым яшчэ і яшчэ... Бясхвосты лётаў нібы апантаны і зносіў у шпакоўню ўсё, што траплялася яму ў дзюбу. І саломку, і сухія травінкі, і курынае пер'е... Шпак вельмі спяшаўся, быццам баяўся, што яго могуць апярэдзіць і ён не паспее зладзіць сваё гняздо.

Я быў вельмі ўсцешаны такой птушынай неўтаймоўнасцю. Навасёл завіхаўся без перадышкі: злятаў уніз, апускаўся проста каля хлява, неяк дзіўна падскокваў па зямлі, нібы пад ім быў гарачы прысак, падхопліваў дзюбай якую-небудзь драбязу і зноў — уверх, да шпакоўні.

І тут здарылася неверагоднае. Раптам я стаў сведкам нейкага дзіўнага цыркавога трука, які праз гады бачыцца

вясёлым, камічным здарэннем. У такое і сам не паверыў бы, калі б хто расказаў... Але ж гэта не выдумка! І яшчэ раз пераконваешся: жыццё іншы раз падкідвае такія сюрпрызы, што і насмяешся да слёз, і рукамі развядзеш... Толькі ў той вясновы дзень мне было не да смеху, як і ў той дзівацкі вечар...

Спачатку ад шпакоўні адвалілася донца. Вось жа майстравалі мы з братам птушыны домік, а цвікі ў нас былі старыя, іржавыя. Таму і зладзілі яго на скорую руку. За донцам шухнула саламяна-травяное гняздо, адразу ж падхопленае раптоўным парывам ветру. Услед за донцам і гняздом сігануў уніз бясхвосты. Ён бездапаможна перакуліўся ў паветры, страшна напалоханы каварнай неспадзяванкай, але тут жа стаў на крыло, зрабіў круты віраж, жаласліва свіснуў і адчайна паляцеў у вышыню. Толькі я і бачыў яго.

Мы з братам знялі шпакоўню, прыбілі донца і зноў паднялі над хлявом. Але наша птушыная хатка пуставала да самага лета. Ды аднойчы моцны вецер скінуў яе на зямлю, і яна ад удару развалілася на асобныя дошчачкі. Гэта была першая і апошняя шпакоўня майго дзяцінства, якая так ашаламіла бяздомнага шпака.

Гартаю пажаўцелыя старонкі класнага журнала, узіраюся ў знаёмы почырк настаўніцы Яўгеніі Антонаўны, а памяць настойліва вяртае ў той далёкі фантасмагарычны вечар, які, падаецца мне, працягвае прыгоды бясхвостага шпака сваёй недарэчнасцю і абсурднасцю. І сваёй непрадбачанасцю...

Мы дамовіліся адзначыць заканчэнне пачатковай школы ў хаце Надзі Раманоўскай. Нас было шасцёра: тры хлапчукі і тры дзяўчынкі, кампанія адзінаццацігадовых. І ніводнага дарослага. Як жа — выпускнікі! Кожны прынёс тое, што змог узяць дома: хлеб, бульбу, цыбулю, сала. Аднекуль з'явілася бутэлька моцнага напітку, яна і надала нашай вячэры яшчэ большую таямнічасць і загадкавасць. Сядзелі ў прыцемках, лямпу не запальвалі.

Я адчуваў сябе даволі ніякавата, такое ж, мусіць, адчуванне было і ў астатніх удзельнікаў выпускнога вечара. Побач са мной сядзеў Валодзя Бяляўскі і неяк шматзначна падкашліваў і раз-пораз штурхаў мяне локцем. Дзяўчынкі прымасціліся за сталом насупраць і патаемна перашэпталіся, падхіхіквалі.

— Што мы такія кіслыя? — нарэшце не вытрымаў Ва-

лодзя.— Трэба было Базыля запрасіць, ён бы нас павесяліў...

— Яшчэ павесялімся,— азвалася Надзя.— Базыль на вечарынку прыйдзе, зноў будзе танцаваць барыню з барадой.

— Калі вока не згубіць,— заўважыла Зіна Хаткевіч, Надзіна сяброўка.

— Знойдзем, як і раней знаходзілі,— засмяяўся Валодзя.

Упамінанне пра Базыля крыху падцяпліла халадокніякаватасці, надало рашучасці. І тут Надзя прапанавала:

— Хлопцы, налівайце ў шклянкі, а то хутка зусім сцямнее.

Было боязна і страшнавата: выпадак жа вымушаў да нечага вельмі бессаромнага і забароненага. І не адмовіцца, і не адважыцца... Такое ж са мною было ўпершыню! А яшчэ зусім нядаўна я нават і думкі не дапускаў, што прымушу самога сябе адолець гэты страх і зраблю гэты зламысны крок...

— За наш чацвёрты клас! — бойка аб'явіў Валодзя.

Я асцярожна ўзяў сваю шклянку, нібы ў ёй была нейкая выбухова-небяспечная вадкасць, і адчуў, як уздрыгнула мая рука. Добра яшчэ, што ніхто не заўважыў у прыцемку маю разгубленасць.

— Піце да дна! — таямніча прашаптала Зіна, круглатварая таўстушка.— За наша шчасце!

У нос патыхнуў непрыемны пах, ад якога аж перахапіла дыханне. Я зажмурыўся і прыпаў вуснамі да халоднага беражка гранёнай шклянкі, усё яшчэ не адважваючыся зрабіць першы глыток.

— Не бойся, я ўжо выпіў,— падбадзёрыў мяне Валодзя і тут жа закашляўся.

— Ой, дзяўчынкі, што са мной?! — раптам усклікнула Зіна.— А ты, Мішка, чаму сачкуеш? Давай, смялей!

І я быццам кінуўся ў бурны вясновы паток, як кідаюцца стрымгалоў наперад у хвіліну раптоўнай небяспекі, калі няма іншага выйсця. Што будзе тое будзе!

Апякло рот, запяршыла ў горле, і я аж задыхнуўся.

— Ты закусвай, цыбульку бяры! — чамусьці ўзрадавалася Зіна.

Нарэшце я каўтнуў пякучы камяк, перавёў дух і прагна накінуўся на хлеб з салам. Адразу ж запякло ўнутры, і гарачая хваля шуганула ў галаву. Са мной адбывалася штосьці незвычайнае і палахліва-незнаёмае, нібы мяне нечакана закружыла нячыстая сіла. Такое ж, мусіць, ачму-

рэнне адбывалася і з усёй нашай шасцёркай. За сталом усчаліся бязладная гамана, смех, гучныя воклічы, а Зінка заспявала:

Мама, я лётчика люблю!
Лётчик высоко летает...
Много денег получает...

— Цішэй, не шуміце! — пасправабавала ўціхамірыць кампанію Надзя.— Мама хутка прыйдзе, я ж абяцала, што ў нас усё будзе добра.

Вот за что я лётчика люблю,—

запальчыва ўсклікнула Зіна і зарагатала.

— Зінка, супакойся! Ты што, здурнела? — шыкнула на сяброўку Надзя, але тая нібы і не пачула яе.

Мама, я повара люблю,
Повар варыць суп и кашу...

— Давай, Зінка, давай,— гэта ўжо Валодзя завёўся, а Ваня з Аняй таксама падхапілі Зініну песню.

Нарэшце Зіна змаглася, закашлялася, і Надзя запаліла лямпу, бо стала зусім цёмна. Святло было хліпкае, цьмянае, як у нейкім таямнічым падзямеллі. Я адчуваў сябе нязвыкла, але нядаўняя ніякаватасць паступова знікала, таяла разам з тым першым даўкім глытком.

Толькі Зіну ўжо нельга было ўціхамірыць, не падзейнічала на яе і Надзіна перасцярога. І што там для Хаткевіч нейкія перасцярогі, калі яна ўжо водзіцца з дарослымі хлопцамі і славіцца ў школе сваімі блатняцкімі прыгодамі. Ды і была яна старэйшая за ўсіх нас на год ці два...

— Хлопчыкі, давайце цалавацца! — раптам аб'явіла Зіна.— Я буду з Мішкам, ён падабаецца мне!

Мяне нібы варам аблілі: вось жа ўліп дык уліп! Добра яшчэ, што быў прыцемак, і ніхто не заўважыў, як мой твар запалымнеў яркай чырванню. А Зіна ўжо вылезла з-за стала, і ўсе дружна запляскалі ў ладкі.

— Не бойся, Мішка, Зінка не ўкусіць цябе! — падштурхнуў локцем Валодзя.— Яна ўмее цалавацца! Ты — шчасліўчык!

— А я і не баюся! Чаго баяцца?! — Я пастараўся не выказаць сваю разгубленасць, усё яшчэ знаходзячыся ў бязважкім, галавакружным стане. Сёння для мяне быў вечар выпрабаванняў і непрадказальных учынкаў.

Я падняўся і пайшоў насустрач Зінцы. Праўда, ступаў не зусім упэўнена, нібы пад маімі нагамі гайдалася падлога. Мне не хацелася цалавацца з Зінкай, такой тоўстай і лупа-

тай. З яе ж у школе заўсёды пасмейваліся, называлі «качкай» за валюхастую паходку, а тут — першы пацалунак. Ды яшчэ адкрыта, навідавоку, як нейкае пасмешышча. Але ў той момант для мяне было ўсё роўна: з кім, дзе і як? Галоўнае, не паказаць выгляду, што ты баязлівец і гатовы даць драпака ў любое імгненне. Як гэта надарылася аднойчы, яшчэ ў шасцігадовым узросце.

Нас было трое: я, Ваня і Света. Жылі па суседству, сябравалі, сустракаліся кожны дзень. І тады гулялі ў хованкі. Забегаліся, развесяліліся. І раптам Ваня прапанаваў:

— Давай, Света, цалавацца!

Света захіхікала, заружавелася, але надзіва лёгка пагадзілася. Толькі спытала:

— А як Мішка?

Ваня быў у нас за верхавода, таму сказаў як адрэзаў:

— Спачатку ты са мной, а потым — з Мішам!

На тым і пагадзіліся. Побач стаяў скляпок, дзверцы якога былі адчынены. Ваня са Светай схаваліся за тымі дзверцамі, а мяне пакінулі за стоража. Калі якая трывога — свісні!

Быў сонечны, лагодны дзень. Я стаяў на варце і чакаў, пакуль Ваня нацалуецца з Светай. Мінула, мусіць, хвілін дзесяць, а яны ўсё не паказваліся. Я прайшоўся па сцежцы туды-сюды, спыніўся, прыслухаўся, але нічога падазронага не заўважыў і не пачуў. Маё чаканне міжволі перарастала ў хваляванне. І што яны там — заснулі? Ды мяне больш за ўсё трывожыла адно: як я сам буду цалавацца з дзяўчынкай? Гэта ж не ў жмуркі гуляць... Прыдумаў Ванька забаву! І колькі ўжо яго чакаць? А можа, ім цяпер не да мяне, можа, я стаў трэці лішні? Мне зрабілася ніякавата, нават крыху страшнавата, нібы за тымі дзверцамі скляпка адбывалася штосьці патаемнае, недазволенае.

І тут мяне аклікнулі. Я азірнуўся і ўбачыў Свеціну маці. Зніякавеў, разгубіўся — хоць стой, хоць падай!

— Дзе Светка, вы ж гулялі разам? Абедаць пара.

Я не паспеў свіснуць, папярэдзіць Ваню аб небяспецы, і на пытанне Свецінай маці не змог адказаць ні слова. Але ўсё ж асіліў сваю разгубленасць і даў такога драпака — толькі мяне і бачылі!

Мае ўцёкі не выратавалі нас ад добрай-такі прачуханкі. Света ва ўсім прызналася. Бацькі адлупцавалі Ваню, прыгразілі, каб і блізка не падыходзіў да Светы. Уляцела і мне, хаця за што? Я ж не цалаваўся, а толькі быў за стоража...

...І вось гэтая вячэра ў Надзінай хаце, і нечаканая Зінчына прапанова... Я іду ёй насустрач і не ведаю, што буду рабіць, як падступлюся да аднакласніцы, якая мне зусім не падабаецца. Вось калі б з Надзяй... Яшчэ ж у першым класе перарастак Коля Марцінок «ахрысціў» нас «жаніхом» і «нявестай», і не толькі ён адзін пакепліваў на гэты конт... Але Надзя ніколі не зрабіла нават маленькага намёку на тое, што я магу разлічваць на яе ўзаемнасць. Адно пасмейвалася ды адмахвалася на тыя кепікі старэйшых дзецюкоў.

Гэты мімалётны ўспамін пра «жаніха» і «нявесту» раптам падбадзёрыў мяне: я буду цалавацца з Зінкай на зло Надзі Раманоўскай! Няхай бачыць, няхай сабе задаецца...

Зінка пахла цыбуляй, яе круглы твар нават у паўзмроку пунсавеў пераспелым памідорам. Я абняў Зінку за плечы і тыцнуўся носам у гарачую шчаку. За сталом выбухнула новая хваля захмялелай весялосці.

— Няўмека, хіба ж так цалуюцца?! — кпліва выкрыкнула Зінка і моцна абхапіла мяне за шыю, аж дух перахапіла.

Яна прыліпла вільготнымі губамі да майго рота і раптам балюча глыманула мяне сваімі вострымі зубамі. Я рвануўся з яе ўчэпістых рук, адскочыў убок і гнеўна выдыхнуў:

— Ты што кусаешся, сучка?

— Га-га-га! — балельшчыцкі рогат дасягнуў сваёй найвышэйшай адзнакі.

— Цямнушнік! — пакрыўдзілася Зінка.— Гэта ж пацалунак, узасос!

— Каб ты скісла са сваім засосам! — кіпеў я, абмацваючы пальцамі ўкушаную губу.

— Ну, хопіць крыўдавацъ,— умяшалася Надзя.— Яшчэ асвойтаецеся, навука гэтая няхітрая. Пайшлі лепш на вечарынку, там недзе Базыль выступае.

Усе адразу ж пагадзіліся, толькі Зінка прапанавала:

— Давайце вып'ем на развітанне!

Зноў жа ніхто не запярэчыў, і я таксама, каб не выклікаць на сябе новыя кпіны. Хопіць ужо і аднаго Зінчынага пацалунка!

Калі мы падышлі да школы, я адчуў сябе зусім знямоганым. Кружылася галава, ногі зрабіліся нейкія ватныя, непаслухмяныя. Якраз каля ганка сустрэлі нашага аднакласніка Жоржыка, якога мы не ўзялі ў сваю кампанію. Тады ён прыгразіў:

— Ладна, я прыпомню вам, яшчэ пашкадуеце!

Жоржык быў зласлівы і помслівы, ён нікому не даваў спуску, бо прызнаваў толькі сваю праваму.

— Ну як, павесяліліся? — з'едліва спытаў Жоржык і схапіў Надзю за руку.— Пойдзем патанцуем!

— Не чапай! — узгарэўся я.— Танцуй са сваёй казой!

Ён, мусіць, толькі і чакаў гэтую зачэпку, бо тут жа падскочыў да мяне і здзіўлена выгукнуў:

— Гляньце, дык ён жа п'яны!

Мы счапіліся і пачалі тузацца. Але сілы былі няроўныя. Жоржык штурхнуў мяне, і я паляцеў потырч, балюча гвазданууўшыся аб зямлю. Усё ж сабраўся з сіламі, ускочыў на ногі і кінуўся да Жоржыка, які быў напагатове. Я кіпеў гневам і нянавісцю, мы зноў схапіліся загрудкі. Раптам пачуўся ўзрушаны мамін голас:

— Спыніцеся! Што здарылася? Я каму сказала!

— Гэта Міша прыдзіраецца... Ён жа вунь які...

Далей усё адбывалася як у нейкім нядобрым сне. Я не стаў чакаць, пакуль Жоржык выгаварыцца, а кінуўся прэч, у густы вечаровы прыцемак. Спатыкнуўся, упаў, але зноў падхапіўся і чамусьці павярнуў да дрывотні. Там я вобмацкам адшукаў ёмкі дручок і заспяшаўся назад, да школы.

Што мной кіравала ў гэты момант? Чаму я вярнуўся туды, дзе мама ўсё яшчэ размаўляла з Жоржыкам, высвятляючы абставіны нашай сутычкі? Злосць, крыўда, помста? І не адказаць, і не апраўдацца... Ніхто не заўважыў, як я выскачыў з цемры, узмахнуў дручком і стукнуў па Жоржыкавых плячах. Гэта адбылося так нечакана, што ўсе разгублена знерухомелі, а я бесперашкодна сігануў наўцёкі, быццам за мной пагналася гайня нацкаваных сабак.

Мінуў драўляны масток, які вісеў над неглыбокай рачулкай, што цякла з балота, і пакіраваў па цёмнай вуліцы, разгарачаны нечаканай сутычкай. Я не ведаў, што рабіць, куды бегчы, дзе шукаць паратунак. Ну... нібы той бясхвосты шпак, які раптам вываліўся разам з донцам і гняздом з нягеглай шпакоўні і паляцеў у невядомым кірунку.

Нарэшце я звярнуў з дарогі і схаваўся на ўзмежку, насупраць нашай новай хаты. Тут мы пакуль не жылі (у хаце яшчэ не было падлогі), але доўгачаканае наваселле прыводзіла мяне сюды кожны дзень. Я з цікавасцю назіраў, як будаўнікі крылі шчапой дах, устаўлялі ў пустыя праёмы зашклёныя рамы вокнаў, вешалі на металічныя завесы дзверы...

Цяпер у кволым месячным святле наша новая хата, над якой вісела Вялікая Мядзведзіца, выглядала нейкай за-

гадкавай і таямнічай. І ўсё навокал было такое ж патаемнае і нерэальнае, нібы я раптам апынуўся на якойсьці чароўнай планеце...

Я ляжаў на волкай зямлі, насцярожана прыслухоўваўся да начной цішыні і адчуваў, як мной паволі авалодвалі дрыжыкі неўразумення і страху перад невядомасцю.

«Што я нарабіў? Як я пакажуся на маміны вочы? Чым апраўдаюся?..»

Такім і запомніўся той далёкі вечар — непраўдападобны і абсурдны. Як і згадка пра бясхвостага шпака і нашу шпакоўню...

...Гартаю пажоўклыя старонкі старога класнага журнала, чытаю, успамінаю... І той вечар, і тыя горкія перажыванні адзінаццацігадовага хлапчука. Было — не было, прыснілася — прымроілася? А маленства адыходзіць усё далей і далей, і не дагнаць яго, і не спыніць... Маленства, у якім столькі няўрымслівага, адчайнага і дапытлівага, а іншы раз... бяздумнага... І зноў жа ўспамінаюцца песні, якія мы развучвалі на ўроках спеваў: «На пасту стаяў», «Мы ў бой паедзем на тачанцы», «Тры танкісты», «Кацюша»... Песні суровай пары, нашага пасляваеннага дзяцінства.

## БАРАДЗІНО

З ім адбывалася штосьці незразумелае і таямнічае. Вось ужо не адзін дзень, і не першы месяц.

А ўсё пачалося з таго сонечнага вераснёўскага дня, калі ён упершыню прыйшоў у пяты клас сямігадовай школы і ўбачыў яе, настаўніцу рускай мовы і літаратуры. Дагэтуль ён займаўся ў пачатковай, а вучыўся ў сваёй маці Яўгеніі Антонаўны. І гэта акалічнасць, мабыць, наклала свой адбітак на яго характар, сарамлівы і далікатны. І з выгляду ён быў нейкі несамавіты: бледнаваты ў вяснушках твар, тонкая шыя, доўгія рукі. Кожную сваю няўдачу ўспрымаў з хваравітым самабічаваннем і затоенымі пакутамі. Ён чырванеў ад любой, самай нязначнай заўвагі, і перажываў, аж да слёз, калі раптам атрымліваў дрэнную адзнаку. Гэта ўжо была амаль што трагедыя...

А тут — новая Палонкаўская сямігадовая школа, у якую ён павінен хадзіць са сваёй вёскі за пяць кіламетраў кожны дзень: і ў слоту, і ў завіруху. Ды яшчэ зусім незнаёмыя настаўнікі: Ксенія Іосіфаўна, Мікалай Іванавіч, Марыя Сцяпанаўна, Аляксандр Сяргеевіч... А сярод іх — настаўніца рускай мовы і літаратуры Ніна Флораўна.

Як упершыню ўбачыў яе, так і зачырванеўся, і ўзрушыўся, і зніякавеў. Добра яшчэ, што ніхто не заўважыў гэтага ягонага ўтрапення, быццам ён быў адгароджаны ад сваіх аднакласнікаў нейкай нябачнай сцяной. Ды і каму патрэбны яго перажыванні? У рэшце рэшт ён умеў хаваць свае думкі-згадкі, а тым больш гэтае таямнічае і незразумелае ачмурэнне.

Яна заўсёды была такая вясёлая і ўзнёслая, кожны яе ўрок, асабліва літаратуры, пралятаў як адно імгненне, як нейкі дзіўны, чароўны сон. І ён чакаў яе з'яўленне ў класе, як чакаюць прылёт казачнай жар-птушкі. І патаемна назіраў за ёю, за кожным яе рухам, усмешкай, лавіў кожнае яе слова.

Дзень, калі ў раскладзе значыўся ўрок Ніны Флораўны, быў для яго і радасцю, і пакутай. І ён спяшаўся ў школу нават у самую віхурную непагадзь, а былі выпадкі, калі адпраўляўся ў пяцікіламетровую дарогу з прастуднай тэмпературай. Яго нішто не магло стрымаць, прымусіць прапусціць урок Ніны Флораўны. Тут ужо ён не мог перасіліць самога сябе...

І тая раніца была слотная, ветраная. Як кажуць, у такое надвор'е добры гаспадар і сабаку не выганяе з хаты. І маці здзівілася:

— Куды ты, сынок, у такую залеву? Пабудзь дома, хіба ў школе не зразумеюць... Гэта ж не вуліцу перабегчы...

Але ён не паслухаўся, не збаяўся непагадзі, пацвярджаючы сваю рашучасць важкім аргументам:

— У нас сёння кантрольная па матэматыцы, ды вунь жа і дождж перастаў.

Накінуў брызентавы плашчык на плечы, галаву прыкрыў башлыком — і гайда на двор. У тую раніцу больш ніхто не пайшоў у школу з іхняй вёскі. І ён адзін адмераў пяць кіламетраў: сцежка праз поле, потым па балоце з дзвюма кладкамі праз дзве канавы, далей — зноў узгорыстае поле, міма могілак, лагчынаю, ад якой сцежка выводзіла да невялічкага ляска. Часам пачынаўся дождж, нудны і золкі, не выратоўваў ад халоднай макраты брызентавы плашчык з башлыком на галаве. Штаны да калена былі мокрыя, чвякала вада і ў гумовых ботах. Але ён упарта ішоў наперад, адзін на школьнай сцежцы ў дажджлівую, змрочную раніцу. Сумку з падручнікамі і сшыткамі ён хаваў пад крысом плашчыка, аберагаючы яе ад вільгаці.

І чым бліжэй ён падыходзіў да школы, тым усё больш трывожным станавіўся яго вярэдлівы неспакой. А неспакой

гэты з'явіўся амаль што адразу, як толькі ён звярнуў з вясковай дарогі на вучнёўскую сцежку.

Сёння на ўроку рускай літаратуры трэба будзе прачытаць на памяць верш Лермантава «Барадзіно». Ён вучыў учора цэлы вечар (верш запамінаўся з цяжкасцю) і гатовы быў вучыць хоць усю ноч, але раптам скончылася ў лямпе газа, таму давялося ўкладвацца спаць раней часу. А «Барадзіно» ж вунь які доўгі верш! І словы нейкія нязвыклыя...

— Скажи-ка, дядя, ведь недаром
Москва, спалённая пожаром,
Французу отдана?

Ён адмерваў па хлюпкай сцежцы крок за крокам і паўтараў напаўголаса вершаваныя радкі.

Ведь были ж схватки боевые,
Да, говорят, еще какие!
Недаром помнит вся Россия
Про день Бородина!

Напачатку ўсё ішло ладна і складна, ён нават заўважыў, што пад рыфму крочыць лягчэй. Але ўжо на сярэдзіне верша пачаліся непрыемнасці: кудысьці раптам зніклі асобныя словы, якія ён беспаспяхова спрабаваў адшукаць у патаемных схованках сваёй памяці.

Ён вяртаўся да першых радкоў верша ў надзеі, што за імі, як нітка за іголкай, пацягнуцца і астатнія.

— Скажи-ка, дядя, ведь недаром
Москва, спалённая пожаром,
Французу отдана?

Ён ужо дэкламаваў уголас, быццам сам пытаўся ў невядомага дзядзькі пра французаў, якія захапілі спаленую Маскву. Тут жа падумалася: «І чаму французаў пусцілі ў Маскву? Вунь жа немцаў спынілі, і з танкамі, і з самалётамі... А там жа былі толькі гарматы з карцеччу ды салдацкія штыкі...»

— Да, были люди в наше время,
Не то, что нынешнее племя:
Богатыри — не вы!

«Ага, багатыры! — ужо з'едліва падумаў ён.— Адступалі, як самыя апошнія баязліўцы, а потым яшчэ скардзіліся на дрэнны лёс. І чаго цяпер выхваляцца Барадзінскай бітвай? Людзей колькі загубілі, а што толку? Толькі мучайся з гэтымі рыфмамі?»

У яго ных думках спакваля выспявала глухая непрыязь да верша «Барадзіно» і да паэта, які прыдумаў такую мудрагелістую размову з нейкім там дзядзькам.

Смешались в кучу кони, люди,
И залпы тысячи орудий
Слились в протяжный...

«Стон» ці «вой»? Ён не мог прыпомніць патрэбнае слова, губляўся ў здагадках, пакуль нарэшце не дайшоў да вузкай лапіны асінніку. Захінуўся пад густаватым голлем і дастаў падручнік з дэрмацінавай чорнай сумкі. Хуценька прабег вачыма ўвесь верш, спыняючыся на радках, якія вылецелі з ягонай памяці. І слова «вой» адзначыў, і «рэдуты».

Але доўга затрымлівацца яму было нельга, час прыспешваў, таму давялося зноў пакласці падручнік у сумку і скіравацца на мокрую, слізкую сцежку.

«Плохая мне досталась доля»,— ён з ледзь прыкметнай усмешкай на разгарачаным хадою твары перафразіраваў радок і рашуча пакрочыў наперад, да панылага асенняга ляска, за якім ужо было зусім блізка да Палонкі.

Першы ўрок быў нямецкай мовы, і Міша адпачываў пасля нялёгкай дажджлівай дарогі. Хаця што за адпачынак? Мокрыя штаны ліплі да каленяў, халадзілі ногі, і яму пачувалася даволі няўтульна. Але ўсё ж цесны пакойчык, у якім мясцілася каля дваццаці вучняў з чатырох навакольных вёсак, паступова цяплеў, саграваў і яго, азяблага, бледнатварага хлапчука, у думках якога па-ранейшаму трывожным барабанным пошчакам гучалі вершаваныя радкі пра Барадзінскую бітву.

— Скажи-ка, дядя, ведь недаром...

Як заўсёды, на ўроку нямецкай мовы клас пацяшаў цыбаты і глюгасты пераростак Лёня Мардас. З ім у «немкі» Яніны Васільеўны склаліся вельмі няпростыя адносіны з самага першага ўрока. Бо Лёня адразу ж заявіў:

— Я не буду тлуміць галаву фрыцаўскімі шпрэхамі. Хопіць, тры гады вывучаў! Матка, яйка, шпэк?! Шнэль, шнэль, хэндэ хох! Гітлер капут!

— Перастань, хопіць крыўляцца,— строга сказала Яніна Васільеўна.— Нямецкая мова невінаватая...

— Невінаватая?! — узгарэўся Лёня.— А хто застрэліў маю мамку?! Хто скалечыў майго татку?! Хто спаліў нашу хату?! Фрыцы праклятыя! І мова іх праклятая, змяіная! Лёня ўжо не гаварыў, ён выкрыкваў гнеўна і асуджальна, твар яго збялеў, рот перасмыкнула шалёная грымаса.

— Супакойся! — разгубілася настаўніца.— Не ў цябе аднаго гора, вайна натварыла...

— Вайна?! На вайну звальваеце, а яшчэ на каго? Хто прыслужваў фашыстам, хто ім дапамагаў? Шпрэхен зі дойч? Вы дзе ў вайну былі, чым займаліся?

— Я партызанам дапамагала, звесткі з камендатуры перадавала...— яшчэ больш сумелася Яніна Васільеўна.

— Ведаем мы гэтыя звесткі... Фрыцам перакладалі на допытах савецкіх людзей, а потым шпацыравалі з афіцэрамі па вуліцах мястэчка... Не-на-ві-джу-у!

І тут з Лёнем надарыўся прыпадак, проста на ўроку, перад усім класам. Ён упаў на падлогу, з яго рота павала пена, а ўсё ягонае цела затрэслася ў рэзкіх канвульсіях. Гэта было страшэннае відовішча, у класе ўсчаліся крыкі і лямант. Пабеглі за дырэктарам і за медыцынскай дапамогай. Яніна Васільеўна як аслупянела. Ухапілася рукамі за настаўніцкі стол — і ні з месца.

Аказваецца, у Лёні — эпілепсія. Да яго гэтая хвароба прыстала ў вайну, пасля вялікага нервовага ўзрушэння, калі ён цудам выратаваўся з фашысцкай аблавы і некалькі сутак адзін хаваўся ў лесе. Лёня доўга хварэў, месяцамі ляжаў у бальніцы, а тут яшчэ тры ваенныя гады, таму ў пятым класе яму ўжо было за шаснаццаць...

Той прыпадак на ўроку нямецкай мовы прымусіў усіх настаўнікаў ставіцца да Лёні Мардаса з далікатнасцю і асцярогай: не дакучаць пытаннямі па школьных прадметах, не прымушаць яго вучыць тое, да чаго не ляжала Лёнева душа.

Увогуле, Лёня вучыўся цераз пень калоду, можна сказаць, проста адбываў нумар у школе. Ну, а з нямецкай мовай у яго былі асабістыя рахункі, нібы ён уступіў у зацятую схватку з нейкім сваім заклятым ворагам. І тут ужо не злічыць перажыванняў і непрыемных хвілін для Яніны Васільеўны. Яна старалася не заўважаць розныя Лёневы жартачкі, нават ставіла ў класны журнал здавальняючыя адзнакі, не пачуўшы ад яго ніводнага слова па зададзенай тэме, каб толькі не выклікаць Лёнеў агонь на сябе. Але ён быў непадкупны!

На ўроках нямецкай мовы Лёня блазнаваў, прыдурваўся, выкідваў смяшлівыя конікі. Ён мог сярод урока падняцца са свайго месца, прайсціся па класе клоунскай паходкай і раптам выгукнуць:

— Хэндэ хох, кіндэр Войцік!

Кожны раз Мардас выбіраў для сваіх дурацкіх жарцікаў новую ахвяру. Той, чыё прозвішча ён называў, павінен быў выконваць яго каманду без усялякіх пярэчанняў. Інакш —

не мінаваць здзеклівай помсты пустабрэха Лёні Мардаса, які выхваляўся сваёй сілай і не меў сабе роўных нават сярод сямікласнікаў. А тут яшчэ гэтая магічная хвароба і боязь усіх і кожнага выклікаць новы прыпадак страшнай эпілепсіі. Хай прыдурваецца, хай вычмураецца, толькі б не бачыць яго канвульсій і перакошанага твару з успененым ротам...

Але больш за ўсё Лёня Мардас упадабаў адну далікатную тэму, якую ён мусіраваў амаль што кожны школьны дзень. Тут ужо ягоным прыдумкам не было межаў.

— Кіндэр Вовусь, дай буську кіндрыцы Мані! Хуценька, я чакаю!

Ці яшчэ:

— Заўтра будзем жаніць Ромку са Светкай. Рыхтуйце для маладых падарункі.

Іншы раз ён трапляў у дураслівы стан пікантных разважанняў:

— Яніна Васільеўна, адпачніце, яшчэ нашпрэхаецеся. Сёння я прачытаю маім дарагім аднакласнічкам лекцыю пра... лю-б-о-оў! Школа забівае вашы светлыя галоўкі рознымі суфіксамі ды прыназоўнікамі, мучае задачкамі ды вершыкамі, а вас жа цікавіць зусім іншае, такое таямнічае і прыемнае... Вы хочаце цалавацца, абдымацца і жаніхацца, праўда ж? Не аднеквайцеся, па вачах бачу, што хочаце!

— Лёнечка, не трэба з дзеткамі на гэтую тэму,— асмелілася Яніна Васільеўна.— Ім яшчэ рана...

— Потым будзе позна,— сказаў як адрэзаў Лёня.— Хопіць іх частаваць байкамі пра бусла і капусту. А вы, Яніна Васільеўна, раскажыце, як круцілі любоў з нямецкімі афіцэрамі! Пра ўсё, як было, без утайкі...

Яніна Васільеўна — у слёзы, і за дзверы. Тут жа з'явіўся дырэктар і з прыязнай усмешкаю вывадзіў Лёню з класа, у якім яшчэ доўга пырхала гучнае хіхіканне, пакуль не вярталася настаўніца нямецкай мовы. Урок працягваўся, быццам нічога і не здарылася. Так, бязвінны жарцік, вылецеў і знік за акном спуджаным вераб'ём. А што тут можна было змяніць ці перайначыць?

Дзіва дзіўнае — на ўроках рускай мовы і літаратуры Лёня Мардас станавіўся зусім іншы, яго нібы падмянялі, ён — і не ён. Ні пустабрэхства, ні дурацкіх паднaчак, ні беспрабуднага гультайства. Яго нават Ніна Флораўна ставіла ў прыклад іншым:

— Вось так трэба вучыць рускую літаратуру! Не зу-

брыць, а адчуваць сэрцам, даходзіць розумам.

І Лёня стараўся, да кожнага ўрока Ніны Флораўны рыхтаваўся як след і адказваў на любое пытанне без запінкі. Праўда, у гэтым старанні было штосьці ўяўнае і падазронае. Лёня, здаецца, проста выслужваўся перад Нінай Флораўнай і гатовы быў выконваць любую просьбу па ледзь прыкметным кіўку яе прыгожай, у белакурых завітках галавы.

— Ніна Флораўна, дазвольце вам памагчы! Давайце я занясу ў настаўніцкую сшыткі. Мы выпусцім насценгазету пра творчасць Пушкіна.

Аднойчы, калі большасць вучняў схапілі двойкі па рускаму дыктанту, Ніна Флораўна вельмі расхвалявалася, маўляў, столькі памылак могуць рабіць толькі малапісьменныя людзі. А яшчэ яна выказала асуджальны дакор у адрас настаўнікаў пачатковых школ, з якіх пасля чатырох гадоў вучобы прыйшлі вучні ў пяты клас Палонкаўскай сямігодкі.

— І хто толькі вас там вучыў? Няўжо вам ніхто не казаў аб напісанні ненаціскных галосных?

— А Мішку мамка вучыла,— з'ехіднічаў Лёня Мардас.

— І, відаць, нядрэнна вучыла,— азвалася на Лёневу заўвагу Ніна Флораўна.— У Мішы Зарэўскага толькі дзве памылкі, можна сказаць, выпадковыя.

— Яму добра, яму пашанцавала,— нібы апраўдваўся Лёня, які напісаў дыктант на слабенькую троечку.

Мусіць, пасля таго дыктанта Лёня Мардас і неўзлюбіў Мішу Зарэўскага і пачаў даймаць яго сваімі кпінамі больш за астатніх аднакласнікаў. Насміхаўся, абзываў «здыхлячком» ды «рабенькім гусачком», прымушаў спяваць частушкі пра Сталіна і Гітлера. А што Міша? Ён трываў, пакутаваў і з кожным днём усё больш і больш ненавідзеў глюгастага пераростка. І да ўсяго — Міша вельмі перажываў з-за прыязных адносін (так яму здавалася) паміж Нінай Флораўнай і Лёнем Мардасам. А як Лёня выструньваўся перад настаўніцай, як стараўся ёй дагадзіць! І яна не пярэчыла, не адмаўлялася ад дапамогі настырнага вучня, і ўсміхалася яму, і падхвальвала...

Сядзеў Міша за партай пасля нялёгкай гразкай дарогі, паступова саграваўся, супакойваўся, пакуль на ўроку нямецкай мовы прыдурваўся Лёня Мардас. Ды нядоўгай была Мішава перадышка. Хаця якая там перадышка, калі зноў жа даводзілася пракручваць у памяці непаслухмяныя рыфмы пра Барадзіно. Ён паклаў «Русскую литературу» на

калені і цішком заглядваў у падручнік, каб перачытаць радкі, якія ўсё яшчэ не запаміналіся.

Ён зачытаўся, страціў пільнасць, а калі схамянуўся, было позна. Мардас вокамгненна апынуўся побач, выхапіў з Мішавых рук «Русскую литературу» і паспяшаўся да Яніны Васільеўны, якая сядзела за сталом у глыбокай задуменнасці.

— Вы толькі паглядзіце, чым займаецца настаўнічын сынок на ўроку шпрэхэн зі дойч! — усклікнуў Лёня, падмацоўваючы сваю прытворную ўзрушанасць красамоўнымі жэстамі.— Вершыкамі забаўляецца! Яніна Васільеўна, прыміце меры!

— Лёнечка, супакойся, табе нельга хвалявацца,— ціха прамовіла настаўніца.— Міша стаpанны вучань, ён вунь адзін прыйшоў у школу за пяць кіламетраў у такую непагадзь. Хай адпачне.

— Адпачываць на ўроку? — яшчэ больш завёўся Лёня.— Я — стараста класа! Парушальнік дысцыпліны павінен панесці пакаранне.

— Не трэба, Лёнечка, Богам прашу, не трэба,— умольна сказала Яніна Васільеўна. Увесь яе выгляд быў разгублены і разняшчасны.

— Бога не чапайце, Бог тут ні пры чым,— адрэзаў Мардас.— Я не дазволю нейкім здыхлікам самавольнічаць.

У класе панавала трывожная цішыня: усе разумелі, што Мардас проста так не супакоіцца. Ён знайшоў зачэпку, якая развязала яму язык і дала волю ягонаму пустабрэхству.

Міша адчуваў сябе вельмі прыгнечана і амаль безнадзейна. Ён ведаў, што не зможа запярэчыць Мардасу, выказаць яму сваю нянавісць. І заступіцца няма каму: і настаўніца, і аднакласнікі былі пад гіпнозам Мардасавай нахабнасці. Ды, мусіць жа, ва ўсіх яшчэ быў недалёкі ўспамін аб Лёневым прыпадку, які ўсе ягоныя выхадкі апраўдваў як бязвінны жарт.

Лёня падышоў да Мішавай парты і загадаў:

— Устаць, божая кароўка!

Міша падняўся, не гледзячы на свайго крыўдзіцеля. Клас затаіўся ў прадчуванні чагосьці смешна-пацешнага. Урок нямецкай мовы набліжаўся да перапынку, і, здаецца, пяцікласнікі не вельмі гарэлі жаданнем вучыць словы, якія Яніна Васільеўна напісала крэйдай на дошцы. А настаўніца неяк засяроджана гартала падручнік і, мусіць, таксама чакала, калі празвініць званок.

— Та-а-к,— нарэшце парушыў маўчанне Лёня.— Зараз ты прачытаеш нам верш «Барадзіно». Напамінаю нашу дамову. Да ўрокаў Ніны Флораўны мы рыхтуемся з асаблівай адказнасцю. Ніякіх дурыкаў і сімуляцый! Хто парушыць наша святое абяцанне, той будзе карацца як здраднік. I ніякіх апраўданняў. Ну, давай, мы слухаем цябе, рабчык-гусачок!

Дык вунь куды павярнуў Лёня Мардас! I дамову ўспомніў, і «святое абяцанне»... Сам жа прыдумаў тую «дамову», праявіў ініцыятыву...

— Да ўрокаў Ніны Флораўны будзем рыхтавацца як след! — аб'явіў стараста і прымусіў усіх прагаласаваць за «святое абяцанне».— Калі хто не стрымае слова, няхай крыўдуе на самога сябе. Паблажак ад мяне не чакайце!

Так Лёня Мардас узяў шэфства над рускай мовай і літаратурай. Лайдак з лайдакоў, а вось жа праявіў інтарэс хоць да аднаго школьнага прадмета. Здзівіў дырэктара школы і парадаваў Ніну Флораўну. Яшчэ б! У школе толькі і размоў пра гультайства і блазноту пераростка Лёні Мардаса, а тут і сам узяўся за вучобу, і аднакласнікаў падахвоціў «святым абяцаннем».

Вось толькі паплылі па школе чуткі: хто са здзіўленнем, хто з усмешкай, хто з асуджэннем... Адны сцвярджалі, што ў Лёні Мардаса не ўсе дома, другія асуджалі настаўніцу рускай мовы і літаратуры, маўляў, яна сама вінаватая, дала повад, затлуміла вучню, хоць і пераростку, галаву... А той нібы з глузду з'ехаў...

Дайшлі тыя чуткі і да Мішы Зарэўскага — узрушылі і ўсхвалявалі. Падалося, што яго самога падлавілі з патаемнымі думкамі пра Ніну Флораўну, абнародавалі, выставілі на пасмешышча... А вось Лёня нібы і не чуў тых шматзначных намёкаў (ці не паказваў выгляду?), а ўсё завіхаўся каля Ніны Флораўны і нават праводзіў настаўніцу да хаты цёткі Тэклі, дзе яна кватаравала.

Пра дзіўную дружбу маладзенькай настаўніцы і вучня даведалася Мішава маці (яна зрэдку бывала ў сямігодцы па сваіх школьных справах) і зрабіла такую выснову:

— Прыгожанькая, каму хочаш закружыць галаву! Рамантычная, паэтычная душа. А што Лёнік? Дурненькі хлапчына... Ёй прыемна, што змагла прыахвоціць лайдака да сваіх урокаў. Тут далікатны педагагічны разлік... Ніна Флораўна доўга ў вёсцы не затрымаецца, такія ведаюць сабе цану...

Міша з трывогай слухаў матчыны разважанні, хваляваўся, нібы яго самога тычыліся гэтыя словы. Праўда, адзінае, што ўсцешвала Мішу апошнія дні, дык гэта магчымасць бачыць настаўніцу рускай мовы і літаратуры, чуць яе ўзнёслы голас, таемна захапляцца такой незвычайнай, як яму здавалася, прыгажосцю. І што там нейкія чуткі, байкі, намёкі?!

Калі Лёня Мардас загадаў чытаць на памяць верш «Барадзіно» на ўроку нямецкай мовы перад усім класам і ў прысутнасці Яніны Васільеўны, Міша Зарэўскі зразумеў, што ў яго жыцці наступаюць самыя драматычныя хвіліны. Усведамленне сваёй бездапаможнасці і раптоўная нянавісць да Мардаса зліліся ў адзін горкі і даўкі камяк: гарачыня шуганула ў галаву, перахапіла дыханне.

— Ну-ну, давай, не цягні ката за хвост,— Лёня адышоўся да дошкі і здалёку назіраў за сваёй ахвярай.— Паглядзім, як ты паважаеш свайго цёзку. Мішуня, мы ўважліва слухаем цябе! Толькі чытай з пачуццём, сам разумееш — твор геніяльнага рускага паэта.

Нечакана да Мішы прыйшоў паратунак. Ціха адчыніліся дзверы, і ў клас зазірнуў дырэктар, павёў позіркам і ўсё зразумеў.

— Лёня, пайшлі са мной,— сказаў ён строга, пераступаючы парог класнага пакоя.— Бачу, ты не стрымаў сваё слова. Нам давядзецца развітацца з табой, і ўжо нішто не зменіць маё рашэнне. Хопіць цацкацца!

— Мікалай Іванавіч! — кінуўся да дырэктара Мардас.— Я ж нічога дрэннага, я ж са згоды! Мішка збіраўся расказаць верш Лермантава «Барадзіно». Вось і Яніна Васільеўна пацвердзіць...

— «Барадзіно» на ўроку нямецкай мовы? — зноў-ткі са строгасцю ў голасе здзівіўся дырэктар, запытальна пазіраючы на Яніну Васільеўну.

— Вядзіце яго куды-небудзь, Мікалай Іванавіч,— з роспаччу выдыхнула настаўніца.— Колькі ж можна здзекавацца...

Яна закрыла твар рукамі і ўсхліпнула. Больш дырэктар не стаў распытваць нікога.

— Пайшоў вон! — грэбліва вымавіў ён і пагнаў Мардаса перад сабою.

Збавенне ад Мардасавай знявагі не прынесла Мішу палёгку, ён, як і хвіліну таму, адчуваў сябе адзінокім і непрыкаяным. У ягоных думках па-ранейшаму жыло трывожнае чаканне ўрока рускай літаратуры, на якім давя-

дзецца чытаць верш «Барадзіно». А можа, пранясе, можа, Ніна Флораўна не выкліча яго да дошкі? Хаця на гэта была малая надзея, як і на тое, што дырэктар больш не пусціць у клас пераростка Лёню Мардаса.

Ніна Флораўна птушкай заляцела ў клас — такая лёгкая, імклівая і вясёлая, нават пахмурнае надвор'е не магло сапсаваць яе прыўзняты настрой.

— Добры дзень, хлопчыкі і дзяўчаткі! Я рада вітаць вас на маім уроку! Ого, сёння вашы рады парадзелі.— Яна імгненна стала сур'ёзнай, прайшла да стала, села на крэсла, раскрыла класны журнал.

Упершыню за апошні час прамаўчаў Лёня Мардас, без каментарыяў якога не заставалася бадай што ніводная рэпліка настаўніцы рускай мовы і літаратуры. Відаць, яму добра ўляцела... Напэўна ж, атрымаў ад дырэктара і ў хвост і ў грыву, калі стаў такі рахманы і памяркоўны. Толькі ці надоўга?

— Дажджу збаяліся? А вось жа Міша Зарэўскі не спалохаўся, малайчына!

Пахвала Ніны Флораўны прыемна ўзрушыла Мішу, шчокі яго ледзь прыкметна заружавеліся, і ён асмеліўся зірнуць на настаўніцу. Яна была ў квяцістым світэры, які так пасаваў да белакурых завітушак, што абрамлялі яе ўсмешлівы, натхнёны тварык.

— Сёння мы зачаруемся цудоўнай паэзіяй геніяльнага рускага паэта Міхаіла Юр'евіча Лермантава,— узнёсла вымавіла Ніна Флораўна.— Я ўпэўнена, што верш «Барадзіно» падараваў вам не толькі слодыч паэтычнага слова, але і адкрыў веліч і мужнасць рускага народа, ажывіў слаўныя старонкі гераічнай мінуўшчыны. Важна, каб вы сэрцам успрынялі прачытанае, каб кожны вобраз знайшоў водгук у вашых думках. Вось давайце і ўслухаемся ў музыку Лермантаўскага радка. Хто ў нас жадае першы?

— Зарэўскі жадае,— усё ж не вытрымаў Мардас.— Ён жа не спалохаўся дажджу, каб толькі верш прачытаць.

— Леанід, ты што паабяцаў Мікалаю Іванавічу? Можа, табе яшчэ раз напомніць?

— Вінават, больш не буду.— У яго голасе няма ранейшай самаўпэўненасці.— Я ж каб лепш...

— Добра, будзем спадзявацца.— Ніна Флораўна ўважліва паглядзела на Мардаса і ўсміхнулася.— Ну, што ж, можа, і сапраўды пачнём з Мішы? Я цаню Мішаву працавітасць і настойлівасць у вучобе. А вось табе, Лёня, гэтага

і не стае... Але хопіць пра нашы праблемы, сёння ў нас паэтычны ўрок! Міша Зарэўскі, калі ласка, да дошкі.

І ўяўляў жа гэты момант, і адганяў яго прэч, усё яшчэ спадзеючыся на нейкі цуд, але запрашэнне да дошкі прагучала для Мішы вялікай нечаканасцю. Ён аж уздрыгнуў, не ў сілах саўладаць са сваёй разгубленасцю.

«А можа, сказаць, што не вывучыў «Барадзіно», і не выстаўляцца на пасмешышча перад усім класам? — мільганула выратавальная думка.— Толькі што з гэтага? Хіба прызнаннем апраўдаешся перад настаўніцай? Вунь Лёня задаволена ўхмыляецца: яму радасць, яму пацеха...»

Міша ішоў да дошкі як на эшафот. І выгляд у яго быў такі прыгнечаны, што Ніна Флораўна нават спытала:

— Што з табой, Міша, можа, захварэў?

— Не-е, та-а-к...

— На Барадзінскую бітву сабраўся! — зноў не ўтрымаўся Мардас.

Настаўніца на гэты раз прамаўчала, толькі раздражнёна ўзмахнула рукой, маўляў, адстань, надакучлівы камар!

Скажи-ка, дядя, ведь недаром
Москва, спалённая пожаром,
Французу отдана?

Першую страфу Міша прадэкламаваў бадзёра і ўпэўнена. Ён глядзеў у акно, за якім гаспадарыла непагадзь, і паволі набліжаўся да каварнага радка, нібы ішоў па вузкай сцежцы, што вяла да крутога абрыву. І не затрымацца, і не павярнуць назад...

Нарэшце ён спыніўся, каб перавесці дыханне, пакутліва адшукваючы ў сваёй памяці патрэбнае слова.

Два дня мы были в перестрелке,
Что толку в этакой...

Яшчэ раз паўтарыў:

Что толку в этакой...

Тут жа пераскочыў на наступны радок:

Мы ждали третий день...

У рэшце рэшт, канчаткова разгубіўшыся і заблытаўшыся, Міша замоўк, утаропіўся вінаватым позіркам у брудную, зашмальцаваную падлогу.

Ніна Флораўна насцярожылася, паднялася з-за стала, падышла да Мішы.

— Не хвалюйся, успомні. Верш Лермантава... Я не

дапускаю думкі, што яго можна недавучыць! Гэта ж цудоўная паэзія, музыка душы і сэрца! Не адчуваць яе — быць глухім і сляпым...

— Як крот у нары! — ажывіўся Лёня.— Давайце, Ніна Флораўна, я памагу Зарэўскаму, ён, відаць, замарыўся...

— Памаўчы, Мардас, памаўчы! Пакуль нам не патрэбны памочнікі...

Міша адчуў, як голас настаўніцы пастражэў, як у ім з'явіліся нейкія халодныя ноткі. Але змяніць што-небудзь ён ужо не мог: горыч і адчай паволі нарасталі ў яго свядомасці. І вострае адчуванне сваёй віны, і крыўда на самога сябе. Ды калі б гэта быў не ўрок Ніны Флораўны, ён, напэўна ж, так не перажываў бы, не пакутаваў. І чырвань шуганула ў твар, і нібы падзьмула едкім дымам у вочы. Хоць скрозь падлогу праваліся!

— Разумееце! — цяпер Ніна Флораўна ўзрушана звярталася да ўсяго класа.— Верш уваскрашае вялікую Барадзінскую бітву, подзвіг слаўных сыноў нашай Айчыны! «Барадзіно» — своеасаблівы гімн мужнасці і самаахвярнасці чалавека! Не вывучыць гэты верш — значыць аднесціся з непавагай да нашай гістарычнай спадчыны, да нашай памяці. Дык дзе мы спыніліся?

Настаўніца глядзела на Мішу з абнадзейваючым чаканнем, усё яшчэ спадзеючыся на свайго вучня, якога яна толькі што хваліла за стараннасць і працавітасць у вучобе. Сітуацыя ўскладнялася тэмай урока, захопленасцю Ніны Флораўны высокай паэзіяй Лермантава. Бо ў маўчанні вучня ёй бачылася і асабістая знявага, што ніяк не стасавалася з яе далікатнай і ўзвышанай натурай.

Два дня мы были в перестрелке,
Что толку в этакой безделке?

Ніна Флораўна прачытала зламысны радок, на якім спатыкнуўся вучань, пачала наступны:

Мы ждали третий день.

Але Міша маўчаў, пакутліва ўсведамляючы сваю асуджанасць, і ледзь стрымліваўся, каб не расплакацца проста тут, ля дошкі. Словы верша вылецелі з ягонай памяці начыста, і нават падказка Ніны Флораўны не змагла ажывіць хоць адзін радок.

Настаўніца не бачыла бядотнага стану свайго вучня, яго маўчанне высушыла апошнюю кроплю яе цярпення.

Ушчэнт пакрыўджаная і абняслаўленая, яна амаль выгукнула:

— Усё, сядай! Я не чакала ад цябе, Зарэўскі, такога нахабства... Ты вельмі здзівіў мяне і расчараваў. Я стаўлю табе адзінку!

Яе тварык у гэты момант зрабіўся несімпатычны: вусны скрывіліся ў злоснай грымасе, вочы заіскрыліся калючымі агеньчыкамі. Лёня Мардас зарадаваўся, нібы толькі што атрымаў важную асабістую перамогу. І тут жа здзекліва прадэкламаваў:

Когда б на то не божья воля,
Не отдали б Москвы!

Толькі Міша ўжо быў безуважны да ўсяго навокал, асьлеплены і аглушаны сваёй нечаканай ганьбай. Ён ледзьве дайшоў да парты, сеў, апусціў галаву на крышку, закрыўся рукамі і горка заплакаў.

— Масква слязам не верыць! — Лёня карыстаўся момантам, натхнёны ўзрушанасцю Ніны Флораўны.— Скажы нам, дзядзька, чаму Зарэўскі не вывучыў Ба-ра-дзі-но?

— Мардас, ідзі да дошкі, хопіць прыдурвацца,— гнеўна сказала настаўніца.— Мы ўрок паэзіі ператварылі ў камедыйны фарс!

Міша вяртаўся дадому ўсё той жа слотнай асенняй дарогай, і настрой у яго быў самы мярзотны. А ў галаве, як на зайгранай грамафоннай пласцінцы, надакучлівым голасам паўтараўся адзін і той жа радок верша «Барадзіно»: «Скажи-ка, дядя, ведь недаром...» І голас гэты чамусьці быў вельмі падобны на голас настаўніцы рускай мовы і літаратуры Ніны Флораўны. А тое ачмурэнне, якое валодала Мішавымі пачуццямі з самых першых вераснёўскіх дзён, набыло нейкі яшчэ больш незразумелы і самотны сэнс. Нібы з ім, дванаццацігадовым хлапчуком, адбылося штосьці трагічнае і непапраўнае.

Неўзабаве Ніна Флораўна развіталася з пяцікласнікамі. Выгляд у яе быў крышку сумнаваты і нават разгублены.

— Сёння мой апошні ўрок у вашым класе,— сказала настаўніца.— Такія жыццёвыя абставіны... Вучыцеся, не лянуйцеся. І ты, Лёня, не блазнуй, не маленькі ўжо, пара і сур'ёзным стаць.

— Ой, Ніна Флораўна, як жа я без вас?! — усклікнуў Мардас.— Я кіну школу, хопіць, навучыўся! Я паеду з вамі!

— Не трэба, Лёня, такіх жартаў. У цябе ўсё яшчэ

наперадзе. Я вам усім, дарагія дзеці, жадаю шчаслівай жыццёвай дарогі! Дружыце з кнігай, літаратурай! Памятайце, што ў кожнага з вас можа надарыцца сваё Барадзіно. І важна выстаяць, не адступіць, а перамагчы. Як Міша Зарэўскі... Вось жа вывучыў потым верш «Барадзіно» і прачытаў на «пяць». Значыць, таксама перамог.

Міша зачырванеўся, расхваляваўся, не асмельваючыся ўзняць вочы на настаўніцу. Ды растрывожыла яго не ўпамінанне верша «Барадзіно», а, вядома ж, развітанне Ніны Флораўны, яе апошні ўрок. Як жа так?! Настаўніца рускай мовы і літаратуры больш не зойдзе ў клас, і ён, Міша Зарэўскі, ніколі не ўбачыць такую дзівосную ўсмешку, не пачуе звонкі, узнёслы голас... Хіба ж можна такое перажыць?!

Чорны дзень Мішавых разняшчасных пакутаў давяршыўся дома вечарам, калі маці паведаміла ашаламляльную навіну:

— Ну вось, я ж казала... Такія ў вёсцы доўга не затрымліваюцца. Прыгожанькая жар-птушка... Вунь як высока ўзляцела! За раённага пракурора ваша Ніна Флораўна выходзіць замуж. Пашанцавала!

І не бачыла маці ў вечаровым прыцемку, як спалатнеў яе сын Міша, а яго сінія вочы затуманіліся слязамі, і ён тыцнуўся тварам у падушку, каб забыцца пра ўсё на свеце. У той вечар яму раптам зусім расхацелася жыць...

## НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ

Быў у мяне верны і безадказны сябрук, пра якога і сёння, праз столькі вірлівых і хуткаплынных дзесяцігоддзяў, успамінаецца з душэўнай цеплынёю і ўдзячнасцю. Ды хіба магу я ўявіць сваё маленства без яго? Ён неаднойчы выручаў мяне ў складаных сітуацыях, праўда, іншы раз надараліся неспадзяванкі, калі ўжо і мне даводзілася прыходзіць яму на выручку. Як і тады, у той пагодны летні надвячорак, калі мы вясёлай гурмой наладзілі хованкі на калгасным гумне.

Спачатку ўсё ж назаву імя майго сябрука, якое, напэўна ж, выкліча ў каго-небудзь і здзіўленне, і ўсмешку... Дык вось, гаворка ідзе пра самы звычайны дарожны веласіпед. З ім у мяне адбылося столькі прыгод і неверагодных здарэнняў, што пра іх можна апавядаць бясконца. А колькі кіламетраў школьных дарог накруцілі гумавыя колы майго вынослівага веліка?!

Тады без свайго сябрука-веласіпеда я не ступаў і кроку. І на гумно прыкаціў са спадарожным ветрыкам. А тут якраз сабралася развясёлая кампанія. Усё гумно было застаўлена стагамі свежай аржаной саломы (жнівень жа стаяў на двары), і лепшай мясціны для гульні ў хованкі нельга было знайсці. Не вытрымаў і я: падкаціў веласіпед да крайняга стога, прыкрыў яго саломай і таксама ўключыўся ў гульню.

Выкопвалі ў стагах норы, залазілі ў іх, замаскіроўвалі дзіркі саломай,— і паспрабуй тут каго знайсці! Той, каму выпала шукаць, трапляў у незайздроснае становішча: пошукі працягваліся да таго часу, пакуль усе самі не вылазілі са сваіх схованак.

Калі надакучылі хованкі, прыдумалі новую забаву: хто залезе на вяршыню стога. Задача для самых спрытных і рызыкоўных. Ды амаль ніхто з хлопцаў не захацеў паказацца слабаком: на штурм стагоў пайшлі дружным прыступам. І ўзнялася над гумном саламяная завіруха.

У самы разгар штурму з'явіўся сторож дзядзька Макар. Яго гнеўны голас прагучаў раптоўным сігналам небяспекі, і ўсе сіганулі ўрассыпную. Я таксама даў лататы, нават спачатку забыўся пра свой веласіпед.

— Што ж гэта вы надумаліся, нягоднікі?! — крычаў сторож.— Стой, страляць буду!

І хаця я ведаў, што ў дзядзькі Макара няма стрэльбы, страх гнаўся за мной куслівым сабакам. Трэба было ўцякаць, ратавацца самому і ратаваць веласіпед. Я апраметна кідаўся ад аднаго стога да другога, ліхаманкава ўскопваў рукамі і нагамі салому, але пошукі былі дарэмнымі. Мой драндулет як скрозь зямлю праваліўся... А можа, хто з хлопцаў падхапіў яго яшчэ раней, калі мы гулялі ў хованкі? Толькі цяпер у каго запытаешся, хто падкажа? Не да дзядзькі ж Макара звяртацца за дапамогай...

Адразу ж за дарогай раслі высокія, метры пад два, каноплі, і я з разгону нырнуў у іх выратавальную гушчэчу. Лез напралом, падмінаючы пад ногі гнуткія сцяблiны, хаця і расхінаў іх рукамі, стараючыся як найхутчэй уцячы ад пагоні. У рэшце рэшт, напэўна, яе і не было, але ж, як вядома, у страху вочы вялікія...

Нарэшце я змогся і, быццам спаткнуўшыся, асеў на зямлю, суцішыўся і прыслухаўся. Церпкі канапляны чад казытаў у носе, кружыў галаву, і я пакрысе супакойваўся, пераканаўшыся ў надзейнасці сваёй схованкі. Толькі гэта было мімалётнае супакаенне, якое тут жа абярнулася ранейшай трывогай і закружыла нада мной чырвоным бухматым чмялём.

«Як я вярнуся дадому без веласіпеда? Што будзе, калі яго знойдзе сторaж? Не-е, такое і ўявіць немагчыма...»

Чмель усё гудзеў і гудзеў, нібы папярэджваў мяне аб блізкай небяспецы. Хвіліна, другая, трэцяя... Ды я і без чмялінага гудзення ведаў, што трапіў у вельмі складаную неспадзяванку. Цяпер ужо і не ўцячэш, і не схаваешся...

Чмель нарэшце паляцеў, а я вырашыў дачакацца змяркання. Дачакацца і вярнуцца на гумно. Іншага выйсця ў мяне не было. Наперадзе мяне чакала суровае выпрабаванне, якое трывожыла сваёй невядомасцю і непрадказальнасцю. Нібы я раптам апынуўся адзін у дрымучым і непраходным лесе.

Што рабіць? Кінуцца туды, пабегчы сюды? Але я трываў, я чакаў, пакуль над гумном апусцяцца прыцемкі. Там маё збавенне, там мой паратунак... Я ўсё ж спадзяваўся і верыў, што знайду свой веласіпед.

Я пракраўся да краю канаплянага поля, агледзеўся і прыслухаўся. Мяне даймалі камары і дрыжыкі. Было боязна і вусцішна. Шпарка прамільгнуў да гумна і, азіраючыся, падбег да крайняга стога.

Салома занадта гучна шамацела пад рукамі, што яшчэ больш наганяла страху. Я спыняўся, сцішваўся, а потым зноў працягваў пошукі. Гэта ўжо было падобна на здзек, быццам нейкі нячысцік наладзіў са мною гульню ў хованкі. І закружыў, і заваражыў... А мой веласіпед схаваў у іншым месцы...

І калі я зусім разгубіўся і зняверыўся ў сваім пошуку, мае рукі раптам намацалі пад шархоткай саломай штосьці цвёрдае, металічнае. Гэта быў мой велік — верны, безадказны сябрук! Як жа я зарадаваўся, як узрушыўся! Нібы той казачны Пакацігарошак, які адужаў змея.

Ужо добра-такі сцямнела, але я па-ранейшаму асцярожнічаў, таму вырашыў каціць веласіпед не па дарозе, а нацянькі: міма канаплянага поля і яшчэ далей, каля Замкавай гары. І чаму я выбраў такі накірунак — цяжка сказаць. Хутчэй за ўсё — я баяўся сустрэцца з дзядзькам Макарам. Як там ні было, але ж асцярожнасць яшчэ нікому не шкодзіла...

Я прабіраўся наўздагад, углядаючыся ў цемру шырока раскрытымі вачыма. Хоць бы які арыенцір, хоць бы месяц выплыў на неба... Толькі б не зваліцца ў выпадковую яміну ды не наляцець на якую карчажыну. Не за сябе хваляваўся, а за свайго сябрука. Я моцна трымаўся за руль, прыцішваў хаду, каб не падаваць якіх-небудзь гукаў. А навокал пана-

вала вечаровая вусцішнасць, якую зрэдку парушаў лянівы сабачы брэх, што далятаў з вёскі.

Паступова пасвятлела (ці гэта мае вочы прывыклі да цемры?), я ўсё ж змог разгледзець за крокі тры агароджу і паспеў павярнуць управа. Веласіпед ціхенька брынькаў шчыткамі ды багажнікам, калі трапляў на выбоіну, і быццам папярэджваў: не спяшайся, будзь асцярожным.

Нарэшце я апынуўся ля Замкавай гары, і тут аж жахнуўся, калі ў цемначы зусім побач прыкмеціў абрысы вясковых могілак. Справа — круты абрыў да ракі Гайны, злева — дашчаная агароджа. У мяне не было іншай дарогі, як кіраваць са сваім веласіпедам каля металічных крыжоў і каменных помнікаў, над якімі высіліся каржакаватыя бярозы. А я ж нават днём стараўся абыходзіць могілкі падалей, чамусьці ўяўляючы іх мясцінай, дзе блукаюць прывіды-невідзімкі. А куды адлятае душа чалавека, калі ён памірае? Можа, так і кружыць тут, над крыжамі і помнікамі?

Я выруліў веласіпед на сцежку, што вяла ад Замкавай гары ўніз, да вёскі, і раптам аслупянеў, ахоплены халодным здранцвеннем. Проста перада мной у бярозавым голлі ўспыхнуў нейкі мігатлівы аранжавы шар. Ён вісеў у паветры на ўскрайку могілак і, здаецца, набліжаўся да мяне. Што гэта — здань, прывід, чыясьці душа? Я трымаўся за руль веласіпеда, як загіпнатызаваны, і не мог скрануцца з месца...

Дзіўны шар плыў, наліваўся чырванню і паволі падымаўся ўверх, усё вышэй і вышэй. Цяпер ужо ён не здаваўся шарам, а хутчэй за ўсё быў падобны на жоўты сланечнік, які раптам расквітнеў у вечаровай цемры. Галюцынацыя працягвалася хвіліны дзве-тры, і толькі тады я зразумеў, што таямнічы шар-сланечнік — месяц-поўня, які выплыў з-за Замкавай гары гіпнатычным прывідам. Напэўна, гэта быў зрокавы падман, выкліканы моцным нервовым узрушэннем. Як міраж, як цяжкае хваравітае трызненне...

Месяцавае святло вывела мяне са стану халоднага здранцвення, і я шпарка пашыбаваў па асветленай сцежцы, ужо не зважаючы на ўсялякую перасцярогу. Я спяшаўся хутчэй мінуць прымхлівую мясціну, уцячы падалей ад яе таямнічых прывідаў. Я амаль што бег побач з веласіпедам, які імкліва набіраў хуткасць з крутога схілу. Добра яшчэ, што не трапіў пад ногі камень-спатыкач, і я без перашкод спусціўся з пагорка. Выскачыў на дарогу і без аглядкі пакіраваў да моста, за якім стаяла наша хата.

Я прыкаціў веласіпед дадому, паставіў яго ў сенцах і,

калі пераканаўся, што мама не звярнула ўвагу на маё позняе вяртанне, супакоіўся. Усе мае перажыванні засталіся там — ля гумна і могілак. Галоўнае, мой велік не трапіў на вочы старажу дзядзьку Макару, і сам я выслізнуў з хітрай пасткі, нібы ўвішны пячкур з лазовага нерата.

Ноччу мне прысніўся той самы жоўты месяц-сланечнік, які павіс нада мною загадкавым прывідам, быццам клікаў кудысьці... А потым у майго веласіпеда з'явіліся крылы, і ён узняўся ў неба і паляцеў да месяца. Паляцеў адзін, без мяне... Ужо ў небе веласіпед ператварыўся ў чорнага бусла, які гнездаваўся на вялізнай сасне, што расла пасярод могілак.

Сон з месяцам-сланечнікам і чорным буслом мне сніўся яшчэ не адзін раз, калі я цяжка хварэў ангінай. Нагойсаўся на веласіпедзе, а потым нажлукціўся халоднай калодзежнай вады і застудзіў горла.

Ляжаў у бальніцы, не піў і не еў некалькі дзён і, здаецца, паміраў... Трызніў і да знямогі ганяў на веліку: то некага адчайна праследаваў, то ад кагосьці ўцякаў... І чамусьці толькі ноччу, пры святле месяца-сланечніка...

Я ўсё ж акрыяў, быццам вярнуўся з таго свету: змарнелы і сухднелы — скура ды косці. Добра яшчэ, што працягваліся канікулы і не трэба было ісці ў школу. Я днямі сноўдаўся каля хаты, сядзеў на лавачцы ў цяньку, чытаў кніжку пра палескіх рабінзонаў.

Праз колькі дзён пасля бальніцы я зноў выруліў свой веласіпед на вуліцу, асцярожна сеў на сядло і адчуў радасць імклівай язды і радасць выратавання пасля цяжкай хваробы. Быў сонечны дзень, і белы бусел кружыў у сінім небе. Чорны бусел бачыўся мне ў чорных бальнічных снах... А я круціў і круціў педалямі, нібы стараўся ўцячы ад самога сябе.

Уцячы ці дагнаць? А колькі ж было гэтых гонак потым, праз два гады, калі я ездзіў на веласіпедзе ў дзесяцігодку: штодня дзесяць кіламетраў — у школу, і дзесяць — назад, дадому.

Ну, хаця б тая ж туманная асенняя раніца, яшчэ ў прыцемках, з золкай надакучлівай імжой. За вёскай дарога брала на пад'ём, і трэба было націскаць на педалі, прыгнуўшыся да руля, каб хутчэй узабрацца на ўзгорак, з якога ўжо веласіпед каціў сам, аж да невялікага ляска. Тут і перадыхнеш, і сілы набярэшся для новага разгону.

Дарога нырнула ў дрэвавы калідор: справа стаяў густы альшэўнік, злева — кашлатыя елкі ды гонкія сасонкі. Рап-

там наперадзе, гэтак метраў за пяцьдзесят, у туманнай смузе я заўважыў, як штосьці цёмнае прамільгнула цераз дарогу. Нядобрая здагадка працяла мяне навылёт, прымусіла адразу ж затармазіць і крута павярнуць назад. Трывожна таххала сэрца, нямелі ногі, але я ўзляцеў на ўзгорак на адным дыханні. Спыніўся, саскочыў на зямлю і ўтаропіўся на лясную дарогу, якая ледзь праглядвалася ў шэрым туманным паўзмроку.

«Што там прабегла? Якая зверына? Няўжо... воўк?»

Было боязна і нават страшна, як тады, калі ў поцемках шукаў ля саламяных стагоў веласіпед, а потым убачыў над могілкамі месяц-сланечнік. І што цяпер рабіць? Вярнуцца дадому, спаслацца на хваробу? А можа, гэта толькі мне здалося, прымроілася? І нічога там не прамільгнула...

Я паступова супакойваўся, хаця трывожная насцярожанасць не сплывала разам з золкім туманам, які паволі падымаўся ўверх. Наўкола прыкметна раз'яснілася, а я ўсё яшчэ стаяў у нерашучасці: вяртацца дадому ці ехаць у школу? І тут быццам бы хтосьці падштурхнуў мяне: «Чаго баяцца? Давай праскочым гэты лясок! Круці педалі — і трымайся за руль!»

Яшчэ колькі хвілін развагі — і я рашуча стаў нагою на левую педаль. Прыўзняўся, мацней сціснуў пластмасавыя рукаяткі, потым агледзеў багажнік, да якога была прывязана дэрмацінавая сумка з падручнікамі і сшыткамі, яшчэ раз кінуў позірк на пярэдняе кола з выламанай спіцай і на заляпаны гразёю ланцуг, нібы пераконваючыся ў іх надзейнасці. І толькі тады зрыхтаваўся да сваёй адчайнай гонкі.

Я ўляцеў у лясны калідор на імклівай хуткасці, якую змог набраць з узгорка, накручваючы педалі з усіх сваіх сіл. Хаця хуткасць тая была не такая ўжо і высокая: ды як тут разгонішся па слізкай асенняй дарозе? Так і глядзі, каб не зваліцца разам з веласіпедам у каляіну.

І ўсё ж гэта быў ашаламляльны рывок. Я імчаў наперад і крычаў дзікім фальцэтам:

— Прэч з дарогі, казёл аднарогі! Заб'ю, гад печаны! Э-э-ге-ге-ей!

Гэты крык надаваў мне смеласці і сілы: вытрымаць, не разгубіцца, праскочыць лясны калідор. Алешнік — справа, елкі і сасонкі — злева мільгалі туманнымі прывідамі, але я глядзеў толькі на дарогу і спяваў да хрыпаты:

— «Наверх вы, товарищи, все по местам, последний парад наступает!..»

Вылецеў на адкрытае поле і толькі тады даў перадышку

сваім знямелым нагам: дарога якраз спускалася ў лагчыну, за якой пачынаўся яшчэ адзін зацяжны пад'ём.

— Малайчына, велік, ты здорава мяне выручыў! — Я выказаў сваю ўдзячнасць уголас і зноў націснуў на педалі. Наперадзе мяне чакала нялёгкая асенняя дарога даўжынёю ў сем кіламетраў. Трэба было спяшацца, каб не спазніцца на першы ўрок.

І быў такі выпадак. Недзе ўжо глыбокай восенню, калі пачаліся замаразкі і дарога за ноч добра-такі падмерзла, я выруліў раніцою на вузкі завулак вёскі Гасцілавічы, за два кіламетры ад Лагойска. На крутым павароце колы веласіпеда трапілі на слізкую шырокую наледзь, і я раптам разам з веласіпедам бразнуўся вобземлю. Тут якраз з двара насупраць выскачыў паджары вялізны сабака і з вісклівым брэхам кінуўся да мяне. Я ляжаў на лёдзе і бараніўся з дапамогай веласіпеда, тыцкаючы пярэднім колам у ашчэраную пашчу. А гэта яшчэ больш падахвочвала сабаку, нібы я зламысна дражніўся з ім. Сітуацыя, трэба сказаць, была не з вясёлых. І паспрабуй на слізкім лёдзе падняцца на ногі, калі на цябе нападае азвярэлы ваўкадаў. Ён жа зусім раз'юшыўся і, здаецца, гатовы быў накінуцца на мяне з самымі ваяўнічымі намерамі. Быццам той паляўнічы ганчак, які дагнаў няшчасную ахвяру і вось-вось глымане яе сваімі вострымі клыкамі.

Невядома, колькі б працягвалася гэтая нечаканая сутычка (і чым бы яна закончылася?), калі б я нарэшце не злаўчыўся і не стукнуў колам па сабачых іклах. Яму, мусіць, раней не давалі ў зубы, бо ваўкадаў адразу ж адскочыў убок і пакрыўджана заскуголіў. Гэтага імгнення мне якраз хапіла, каб ускочыць на ногі і зрыхтавацца да новай абароны, выставіўшы перад сабою веласіпед. Але тут, на шчасце, з-за веснічак з'явіўся барадаты дзядзька і гучным крыкам прагнаў сабаку ў двор, а мяне супакоіў:

— Не бойся, хлопец! Пірат не кусаецца, ён у нас вялікі жартаўнік.

— Я нічога не сказаў, аб'ехаў слізкую наледзь, выруліў на сцежку і хутчэй ускочыў на сядло.

«Ага, не кусаецца, брахун ікласты! — узрушана думаў я, кіруючы да моста цераз раку Гайну.— Калі б не веласіпед, як бы я абараніўся ад гэтай псіны?»

І яшчэ адна згадка-успамін. Тады мне, дзесяцікласніку, прапанавалі ўдзельнічаць у школьных раённых спаборніцтвах — дваццаціпяцікіламетровай веласіпеднай гонцы. Я спачатку аднекваўся, спасылаўся на свой старэнькі веласіпед, на якім асабліва не разгонішся. Але мяне ўсё ж уга-

варылі, бо ў нашым класе вучыўся кандыдат у майстры спорту Алёша Свірчэўскі. Яму гарантавалі першае месца, а мне, галоўнае, трэба было толькі прайсці дыстанцыю, прынесці камандзе заліковыя ачкі.

З раздзельнага старту я рвануў пад дружныя воклічы балельшчыкаў. Разагнаўся і панёсся па асфальтаванай шашы колькі ёсць духу, нібы наперадзе мяне чакала лёгкая прагулка. Узляцеў на ўзгорак, пайшоў на спуск, які даў мне кароткую перадышку. Хтосьці абганяў мяне, кагосьці абганяў я, а шаша, высветленая майскім сонцам, неслася насустрач разам з высокімі прыдарожнымі бярозамі. Метр за метрам, кіламетр за кіламетрам...

Першую палавіну дыстанцыі дзьмуў спадарожны паўднёвы вецер, і ён аблягчаў гонку, падганяў у спіну. Але як толькі я павярнуў назад, пругкі парыў ветру адразу ж шугануў у твар, прымусіўшы мяне яшчэ ніжэй сагнуцца над рулём. Вось тут і пачалося сапраўднае выпрабаванне на стойкасць і вынослівасць. Недзе ўжо на пятнаццатым кіламетры я адчуў, што выдыхаюся, што мой веласіпед зусім страціў хуткасць, нібы я ехаў не па асфальце, а па вязкай палявой дарозе.

Міма, як на крылах, праляцеў Алёша Свірчэўскі, толькі крыкнуў:

— Трымайся, Міша! Хутка — фініш!

І панёсся наперад, не збаўляючы хуткасць, яму і сустрэчны вецер не перашкода. Яшчэ б! У Алёшы шыкоўны гоначны веласіпед, з тонкімі шынамі, пакручастым, быццам барановыя рогі, рулём і рэгулятарам перамены скарасцей. А з якім азартам ён імчаў па трасе! Калі шаша ішла на пад'ём, Алёша прыўзнімаўся з сядла, станавіўся на педалі і ніколькі не прыцішаў тэмп гонкі.

Я пратрымаўся за кандыдатам у майстры спорту якіх метраў дзесяць-пятнаццаць і тут жа безнадзейна адстаў, адчуваючы, што вось-вось зрулюю ў кювет. На нагах — пудовыя гіры, у вачах — сляпучае мігценне... Ды і што я мог накруціць на сваім старэнькім дарожным веласіпедзе?! Ён жа быў зусім няздатны да шасейных гонак, добра яшчэ, што восенню і вясной (зімой я кватараваў у Лагойску) кожны дзень вазіў мяне ў школу і дадому па дваццаць кіламетраў. Даставалася майму веліку: і камеры даводзілася клеіць, і новыя спіцы ўстаўляць, і мяняць падшыпнікі ў задняй утулцы. Шмат было клопатаў з гэтымі падшыпнікамі: калі яны зношваліся, я не мог тармазіць, і вядучая зорачка пракручвалася на халастым ходу. Нават перад невялікім узгоркам даводзілася злазіць з веласіпеда і каціць яго побач з сабой.

Але тады, на дваццаціпяцікіламетровай дыстанцыі, я ўпарта ішоў да фінішу. Налягаў на педалі ў нейкім туманным паўзабыцці, бо мной кіравала адзінае жаданне: выстаяць, утрымацца за рулём! І на дваццатым кіламетры, і на дваццаць другім...

Фініш выплываў з сонечнага марыва доўгачаканым збаўленнем ад пакутлівай знямогі. Усё бліжэй і бліжэй... І тут я кінуўся фінішаваць адчайным спуртам. Як толькі яшчэ знайшліся сілы на гэты апошні рывок?! Няўжо нарэшце адкрылася другое дыханне: і ў мяне, і ў майго старэнькага дарожнага веласіпеда? А ў блакітным небе ззяла яркае майскае сонца, якое раптам расквітнела нада мною жоўтым сланечнікам.

...Мінаюць гады, дзесяцігоддзі, а я з тугою ўспамінаю тую непаўторную пару і здалёку бачу сябе, разгарачанага велагоншчыка, які выйшаў на фінішную прамую...

Ой, як жа даўно гэта было!

## ПАДДАЎКІ

«Ляжаць ніжэй травы, цішэй вады»,— такі быў загад Жоржыка Цыгана.

Жоржыкава прозвішча Казлоўскі, а Цыганом мы яго празвалі. Можа, што ў яго былі чорныя вочы і цёмны, нібы падвэнджаны, прышчаваты твар.

Нас пяцёра, Жоржык — шосты, і ўсе мы на ляту ловім кожнае слова нашага важака. Ніхто, вядома, не асмельваецца назваць Жоржыка Цыганом проста ў вочы. Ён у нас аўтарытэт — ого!

Мы стаіліся ў засадзе, ляжым «ніжэй травы, цішэй вады» ўжо з паўгадзіны, чакаем. Метраў за пяцьсот ад месца засады — выспа, парослая густым бярэзнікам, дзе мы зладзілі сабе будан — «церамок», і цяпер не ўяўляем свой вольны час без нашай патаемнай схованкі. Скажу па сакрэту, Цыган наведваецца сюды і ў час заняткаў. Ён жыве ў цёткі Аўдулі і сам сабе гаспадар. Хачу іду ў школу, хачу гуляю... Цыган два разы заставаўся на другі год і летась апынуўся ў нашым пятым класе. І ўсе хлопцы прызналі яго за важака.

Звычайна мы збіраліся да нашага церамка ў нядзелю з самай раніцы. Ішлі не з пустымі рукамі — запасаліся хто чым можа. Разводзілі касцёр, пяклі бульбу і бавілі час гульнёй у шашкі.

Мы гулялі на высадку, але гэтую «высадку» лепш за ўсё назваць паказальнымі выступленнямі нашага чэмпіёна Жоржыка Цыгана. Цыган умеў праводзіць хітрыя камбінацыі з прарывам у дамкі, і мы толькі дзіву даваліся: адкуль такая кемлівасць? Потым ён прапанаваў гуляць у паддаўкі. Тут выйграваў той, хто першы аддаваў усе свае шашкі.

Дзіўная гэта гульня. Калі ў звычайнай партыі стараешся абараніць кожную сваю шашку, ловіш кожны зявок праціўніка, дык у паддаўках адзін клопат — падкузьміць самога сябе. Прайграць, каб выйграць... Уладальнік апошняга месца (першае заўсёды даставалася Жоржыку) павінен быў выконваць любое пажаданне пераможцы: скакаць, спяваць частушкі, бегчы ў краму па цукеркі або вазіць на сабе чэмпіёна. І паспрабуй тут не выканаць волю важака! Тады ўжо развітвайся з церамком, з шашачнымі турнірамі і іншымі спакусамі...

Учора прайграў мой брат Шурка. Два гады назад Шурка быў аднакласнікам Цыгана, а цяпер на «выдатна» вучыцца ў сёмым. Мусіць, таму Цыган не любіў майго брата і прыдумваў супраць яго розныя каверзы. Асабліва Шурку не шанцавала ў шашачных турнірах.

— Гэта табе, Шурык, не правілы зубрыць,— пакепліваў Цыган.— У шашках кумекаць трэба, не тое што з «ікcамі» ды «ігрэкамі». І за што толькі табе пяцёркі ставяць? Прабач, але раз прайграў, будзь ласкавы — падстаўляй спіну. Скажу па сакрэту, мне вельмі падабаецца катацца на выдатніках. Гэта ж такі гонар!.. Абра-ка-даб-ра!

Цыган выскаляўся і не хаваў сваёй радасці. Шурка быў спакойны, але я ведаў, што гэта за спакой, і нічым не мог дапамагчы брату. Я вельмі перажываў за Шурку, бо яго пройгрышы ў большасці выпадкаў — вынік хітрай тактыкі Цыгана, які наўмысна прайграваў слабаку Ліпкіну, каб той не заставаўся на апошнім месцы. Вось вам і паддаўкі...

Учора была субота, і калі мы надвячоркам меліся пайсці да церамка, Цыган успомніў апошні Шуркаў пройгрыш і загадаў:

— Прынось, Шурык, свой гармонік, будзеш весяліць нашу суполку.

— Я яшчэ слаба іграю,— пачаў адмаўляцца Шурка.

— Не прыбядняйся,— паблажліва паляпаў яго па плячы Цыган.— Чуў, што збіраешся выступаць на сцэне...

— Ды гэта ж адзін нумар. Дзяўчынкі з нашага класа будуць спяваць, а я акампаніраваць ім...

— Вось-вось, ты спачатку паакампаніруй нам, а потым

ужо сваім дзяўчынкам... Даўжкі, Шурык, трэба аддаваць, сам разумееш. Абра-ка-даб-ра!

— Тата не дазваляе выносіць гармонік на вуліцу,— паспрабаваў я заступіцца за брата.

— А акампаніраваць дзяўчынкам можна? — паставіў рубам пытанне Цыган.

І я не стаў спрачацца з Цыганом. Марна было даказваць яму, што гармонік у Шуркі зусім новы і ён іграе на ім усяго другі тыдзень. Ды хіба Цыгана ўзрушыць тое, што Шурка захапляецца музыкай? Настаўніца спеваў казала, што ў Шуркі добры музычны слых, і калі б яго вучылі іграць на якім-небудзь інструменце з маленства, ён мог бы стаць сапраўдным музыкантам. А што ў Шуркі ёсць гэты самы «музычны слых» — бясспрэчна. Ён жа за некалькі дзён не толькі асвойтаўся з «галасамі» і «басамі», але паспеў развучыць «Кацюшу» і яшчэ дзве-тры мелодыі.

Шурка мусіў згадзіцца. Цыган быў задаволены, пахваліў майго брата.

— Вітаю і дзіўлюся. Дарма я лічыў выдатнікаў жміндамі. Бачу — памыляўся. Гармонік у цябе, Шурык, важнецкі... Шанцуе ж...

Цыган любіць пабалабоніць, язык у яго падвешаны. Толькі гэтая «падвеска» — не для школы, бо настаўнікі выціскаюць веды з Цыгана, быццам ваду з каменя. Праўда, яму ад гэтых школьных перажыванняў — ні горача, ні холадна. Цётка Аўдуля зусім не цікавіцца вучобай свайго пляменніка, а розныя далікатныя захады нашай «хуткай дапамогі» Цыган сустракае кплівай усмешачкай.

— Салажкі, не стройце з сябе вялікіх разумнікаў. Для мяне ваша навука — костка ў горле. Вы лепш вазьміце шэфства над якой-небудзь бабулькай. Яна вас пернікамі пачастуе. Абра-ка-даб-ра!

Вось тут і падступіся да Жоржыкавага сумлення. Яму і настаўнікі не могуць даць рады, нават спецшколай яго не прыструніш.

«Бязбацькавіч, расце на лес гледзячы»,— казала пра Казлоўскага мая мама.

Жоржык прыехаў у нашу вёску да цёткі Аўдулі яшчэ трэцякласнікам, і ніхто не ведаў, адкуль ён і дзе яго бацькі.

— Ну, Шурык, павесялі кампанію,— Цыган сядзіць ля ўваходу ў церамок, па-турэцку падкурчыўшы ногі, і сочыць за маім братам, нібы каршун, які прыгледзеў сваю ахвяру. Шурка прымасціўся крокі за тры ад церамка на сухім сасновым кругляку, схіліўся над гармонікам і паволі расцягнуў мяхі, яго пальцы прабеглі па перламутравых гузі-

ках. Шурка іграў песню: «Широка моя страна родная, много в ней полей, лесов и рек».

— Во-ой, хопіць! — Цыган з кіслай мінай на твары ўзмахнуў рукой.— І адкуль ты гэтую «страну» выкапаў? Ты нам, Шурык, пра любоў пачырыкай, каб да сэрца дайшло. А пра «рэкі» лепш у клубе трынькай. Дзяўчынкі табе дзякуй скажуць.

Шурка не адказаў на зубаскальства Цыгана і ўсё іграў (толькі больш ціха) ранейшы матыў: «Я другой такой страны не знаю...»

— Ну дык як жа з цілі-цілі цестам? А мо сербіянку?

Цыган паволі падняўся, са смакам пацягнуўся і гэтак жа паволі падышоў да Шуркі.

— Клёва іграеш, вось толькі рэпертуар у цябе, Шурка,— вешчая кавурка, неважнецкі... Мне ад тваёй «страны»... аж зуб разбалеўся. Дай-ка сюды гармонік... Падвесялімся матыўчыкам задушэўным. Га, хлопцы? — Цыган азірнуўся на нас і зарагатаў: — Абра-ка-даб-ра!

«Где так вольно дышит человек»...

Раптам музыка абарвалася. Я ўбачыў, як пабялеў Шуркаў твар, як ён рэзкім рыўком сціснуў мяхі гармоніка і смела паглядзеў у вочы нашаму важаку.

— Гармонік не дам,— голас майго брата прагучаў ціха і рашуча.— Можаш свае сербіянкі заказваць па радыё.

Мы анямелі: пярэчыць важаку?!

— Хлопцы, чулі: гарманіст зафанабэрыўся.— Жоржык завойкаў, схапіўся за жывот, нібы ад невыносных колікаў.— Во-о-ой, не магу... Трымайце мяне, павалюся... У шашках — слабак, а фанабэрыю разводзіць... Але як з даўжком? У нас жа дамоўленасць, праўда, Борык?

Гэта Цыган звяртаецца да лупатага Барыса Ліпкіна, які быў у важака за ад'ютанта і вернага служку.

— Ага, усе дамаўляліся,— Ліпкін глядзіць сваімі пукатымі вачыма проста ў рот Жоржыку, гэта, мусіць, каб злавіць яго словы на ляту.— Бунт, забастоўка. Шкада, але давядзецца развітацца з Шурачком.

Шурка не стаў чакаць, калі Цыган аб'явіць «абракадабру». Ён падняўся з кругляка, перакінуў рамяні гармоніка праз левае плячо і пайшоў.

— Малайчына, Шурка — вешчая кавурка, здагадлівы. Толькі твая фанабэрыя табе бокам вылезе, напомніш маё слова,— прыгразіў Цыган.— Аб-ра-ка-даб-ра!..

— Трэба правучыць вешчую кавурку,— сказаў Цыган, калі мы сабраліся сёння раніцай ля церамка.— Каб нос

угору не задзіраў і ад сваіх даўгоў не ўцякаў. З выдатнікамі інакш нельга. Аб-ра-ка-даб-ра!

Мне крыўдна было за брата, але я маўчаў. Маўчалі і ўсе астатнія: важаку пярэчыць нельга.

Вядома, Шурка пакрыўдзіўся на мяне. Вечарам, калі я вярнуўся дадому і папрасіў яго памагчы адолець задачку з іксамі, ён нават у мой бок не глянуў. Потым сказаў:

— Эх вы!.. Цыган хутка будзе ездзіць на вас верхам. Ён здзекуецца, а вы як вады ў рот набралі. Аматары паддаўкоў. І ты з імі заадно.

— Я што, я нічога... Трэба было не прыносіць гармонік. Сам вінаваты.

— Я вінаваты, я? — Шурка глядзеў на мяне, як на ворага.— А яшчэ родны брат.

— Ты ж і мне гармоніка шкадуеш,— упікнуў я.

— Шкаду-у-еш,— передражніў Шурка.— Ды ў цябе да музыкі ні складу, ні ладу.

— Добра, што ў цябе «склад»...

Так мы і пасварыліся. А тое, што Шурка аж дрыжыць над сваім гармонікам,— факт. Я паспрабаваў паіграць аднойчы, дык ён на мяне каршуном наляцеў, аж маме давялося ўмяшацца. Праўда, я да гэтай ігры асаблівай ахвоты не маю, іншы раз проста цікава. Іншая справа — шашкі. Я гатовы гадзінамі сядзець за шашачнай дошкай. Тут і азарт, і хваляванне, і радасць перамогі...

— У гэтым пісьме я прапаноўваю вешчай кавурцы мір.— Цыган узмахнуў белым канвертам ля самага майго носа,— запрашаю Шурачку да церамка. У дванаццаць нуль-нуль. Ты, Барыс, даставіш наша пасланне.

— А можа, лепш... Мішка? — замяўся Ліпкін.— Ён жа брат...

— Не, у мяне на гэты конт ёсць зусім іншы план,— выскаліўся Цыган.— Пад кодавай назвай «капкан». Вось дзе будзе смеху...

Ліпкін пабег у вёску, а мы засталіся ля церамка.

Сёння важак быў нейкі не падобны на самога сябе. І мне чамусьці не падабалася яго загадкавасць. Ён, напэўна, штосьці прыдумаў супраць майго брата і да пары да часу ўтойваў. Гэтае пісьмо, заява аб прымірэнні. Ды не такі Жоржык Казлоўскі прасцяк...

— Пайшлі,— Цыган падняў угору кароткі дзяржак сапёрнай рыдлёўкі.

Я ішоў па віхлястай сцяжынцы апошні. Сцежка вілася па крутым адхоне па-над шырокай лугавінай каля Вузлян-

кі. Кажуць, раней, гэтак гадоў дзвесце-трыста назад, гэты адхон, на якім цяпер разросся арэшнік, быў стромым, непрыступным берагам бязмежнай воднай прасторы.

— Вось тут і спынімся,— сказаў Цыган, калі мы адышлі ад церамка з паўкіламетра.— Харошае месцейка, як па заказу.

Справа, ледзьве не да самай сцежкі, падступаўся густы маліннік, а злева, крокаў на дваццаць уніз, абрываўся адхон, пакрыты бруднымі касмылямі рудой леташняй травы.

Цыган агледзеўся, а потым убіў рыдлёўку ў зямлю.

Праз якую хвіліну-другую на ўсю шырыню сцежкі з'явілася круглая ямінка. Мы глядзелі на Цыгана і чакалі, што будзе далей.

Нарэшце ён разагнуўся і паклікаў мяне:

— Давай, Мішунчык, пагрэйся... Хвалю, што не клюнуў на агітацыю братана. Ад імя нашай суполкі дзякуй.

Я хутка змогся, спацеў, але не паказваў выгляду, не здаваўся.

— Давай, Мішунчык, яшчэ крышку. Ты, можа, на калені стань, зручней будзе. Мая прамашка, трэба было ўзяць рыдлёўку з доўгай ручкай, а не сапёрную.

Нарэшце прыбег Ліпкін.

— Гарманіста знайшоў на ферме, ён памагаў маці паіць цялят. Перадаў пісьмо... Сказаў, што прыйдзе,— Ліпкін не мог адсапціся і хапаў паветра на поўны рот.

— Цудоўненька! — сказаў Цыган і праспяваў: — «Я другой такой страны не знаю...»

Ён выхапіў з маіх рук рыдлёўку, скочыў у ямку, берагі якой даставалі яму ўжо амаль да пояса, падраўняў дно, прытупнуў некалькі разоў сваімі аблезлымі кедамі і загадаў:

— Ану, хілячкі, хуценька наламіце галінак і сухога лісця збярыце. Раз, два, тры!..

Мы кінуліся выконваць загад.

...І вось мы ляжым у малінніку, маўчым, назіраем за Цыганавым «капканам»: хто ў яго трапіць? Раптам да майго слыху даляцеў нейкі дрыготкі малінавы звон. Я прыслухаўся і пачуў ціхую мелодыю, што плыла, набліжалася, мацнела. Гэта іграў Шуркаў гармонік. Шурка набліжаўся да месца нашай засады па сцяжынцы, на якой Цыган з нашай дапамогай замаскіраваў сваю пастку. І тут нарэшце да мяне дайшло! «Дык жа гэты «капкан» Цыган падрыхтаваў

для Шуркі! І пісьмо з Ліпкіным падаслаў, каб у пастку заманіць...» Мне зрабілася горача, але я па-ранейшаму ляжаў «ніжэй травы, цішэй вады» і сачыў за сцяжынкай, суцяшаючы сябе тым, што Шурка заўважыць і абміне Цыганову пастку...

Шурка ішоў спакваля, нібы заваражаны меладычнымі гукамі, і, напэўна, нічога не чуў і не бачыў, што дзеецца наўкола. Брат іграў «Кацюшу» — сваю любімую песню:

«Расцветали яблони и груши,
Поплыли туманы над рекой...»

Шурка паволі набліжаўся вузкай сцяжынкай да Цыгановай пасткі. Я добра бачыў братаў твар, непаслухмяны віхор бялявых валасоў, што смешна тырчаў на макаўцы, бачыў, як Шуркавы пальцы бегаюць па перламутравых гузіках. І быў як загіпнатызаваны. Я слухаў музыку і на нейкі момант забыўся, што мы ляжым у засадзе. Усё-такі хораша іграе Шурка...

Побач суха і коратка трэснула, зашамацела, пачуўся здаўлены кашаль. Я азірнуўся і ўбачыў Цыгана, які давіўся смехам: яго прышчаваты твар аж пачырванеў ад натугі. Жоржык сядзеў на кукішках і ледзьве стрымліваўся, каб не зарагатаць.

Нашы позіркі сустрэліся. Цыган падміргнуў мне, маўляў, чакай, зараз убачыш цуд несусветны... Такі настрой у яго з'яўляецца заўсёды, калі ён ездзіць верхам на кім-небудзь са сваіх даўжнікоў. Гэта для яго вунь якая радасць!

Шурка спыніўся за два-тры крокі ад Цыгановай пасткі, паправіў левай рукой на правым плячы шырокі рэмень гармоніка, усміхнуўся самому сабе і шырока расцягнуў мяхі. Разам з першымі акордамі вясёлай песенькі Шурка рушыў наперад.

Я не паспеў крыкнуць «стой», не паспеў папярэдзіць брата аб небяспецы. Я ўсё яшчэ спадзяваўся, што Шурка абміне яму... Але тонкія арэхавыя палачкі, прыкрытыя леташнім лісцем і жоўтым пяском, шуснулі пад Шуркавай нагой, ён упаў, гармонік вырваўся з рук, працяжна заенчыў і кульнуўся ўніз па крутым адхоне.

— Абра-ка-даб-ра! Ха-ха-ха!

Рагатаў Цыган, войкаў Ліпкін, смяялася ўся наша суполка. Яны пацяшаліся над маім братам. Толькі мне было не да смеху. Я падхапіўся са сваёй ляжанкі і кінуўся напралом праз маліннік. Я ўцякаў ад агіднага рогату нашага важака. У гэтых уцёках, здавалася мне, быў паратунак, маё

збавенне ад пачуцця горкай віны і сораму: «Шурка не павінен бачыць мяне побач з Цыганам. Я не хаваўся ў засадзе, не капаў яму...»

Ужо ў бярэзніку я раптам знячэўку зачапіўся наском чаравіка за непрыкметны пянёк і з усяго разгону паляцеў на замшэлы сухі дол, балюча тыцнуўся тварам у калючы верасовы куст.

Праз колькі хвілін пачуў прыглушаныя галасы. Я прыўзняў галаву, пачаў углядацца ў той бок і праз вузкі прагал бярэзніку заўважыў знаёмыя абрысы нашага церамка, які здалёк нагадваў хатку бабы-ягі.

Я ўскочыў на ногі і, прыгнуўшыся, сігануў убок да нізкарослага арэшніку.

— Абракадабра! — зусім побач сказаў Цыган.

Я прысеў на кукішкі, адчуваючы ва ўсім целе непрыемную здранцвеласць.

Яны ішлі міма. Весела балабоніў Цыган, яго словы даляталі да мяне зумклівымі восамі.

— І чаго гэта вы хвасты падціснулі? Нічога з ім не здарылася, прыкідваецца... Калі што — на Мішука звернем. А як ён даў лататы, вось дык смяхоцце... Для роднага брата яму выкапаў... Здорава я прыдумаў! Абракадабра!

— Шурачок, мусіць, не прыкідваецца,— пачуў я пісклявы галасок Ліпкіна.— Вы пабеглі, а я паглядзеў. Сядзіць ля ямы і плача...

— Плача? Так яму і трэба... Сам вінаваты, не будзе нос задзіраць. Ведаем мы гэтых пяцёрачнікаў...

Галасы паступова заціхлі, а я счакаў якую хвіліну і напрасткі заспяшаўся да ракі, туды, дзе хаваўся ў засадзе. Я ўбачыў Шурку здалёк і, паспешліва звярнуўшы са сцяжынкі, схаваўся за куст арэшніку. «Што я скажу брату? Можа, лепш не паказвацца яму на вочы? Але ж чаго ён там? Не, з ім штосьці здарылася...» Перасіліўшы сваю разгубленасць, я выбраўся з-за куста і не зусім упэўнена пайшоў да Шуркі, які сядзеў узбоч сцежкі і, здаецца, быў безуважны да ўсяго навокал. Гармоніка ля яго не было, і гэта мяне яшчэ больш устрывожыла.

— Шурка! — я паклікаў асцярожна.

Ён нават не зварухнуўся, быццам не пачуў.

— Дзе гармонік? — я абышоў Шурку збоку і зазірнуў яму ў твар.

Шуркавы вочы, невідушчыя ад слёз, глядзелі міма мяне.

— Шурка, чаго ты?! — я апусціўся на калені перад братам.— Гэта я — Мішка... Хіба ты не пазнаў?

Нечакана слёзы сыпанулі з маіх вачэй.

— Гэта я... я вінаваты,— слёзы перашкаджалі гаварыць.— Цыган загадаў капаць... Я не ведаў, што для цябе... Даруй, даруй...

Я ўхапіў Шурку за руку, стараючыся прымусіць брата ачнуцца, сказаць хоць адно слова.

— Я не паспеў папярэдзіць... думаў, ты абмінеш пастку. Я ненавіджу Цыгана... Шурка, ты чуеш мяне, чуеш?

Я не стрымліваў слёз, спяшаўся выгаварыцца, нібы гэта была наша апошняя сустрэча.

— Чаму ў нас так? Мы ж браты? Чаму я паслухаў Цыгана, а не цябе? Чаму? — з маіх грудзей вырваўся ні то крык, ні то стогн.

І тут нашы позіркі сустрэліся. Я ўбачыў, што Шуркавы шэрыя вочы ажылі, заіскрыліся. Брат насцярожана глядзеў на мяне, як глядзяць на незнаёмца, калі сумняваюцца: можна яму даверыцца ці не?

— Прынясі гармонік, ён там,— нарэшце вымавіў Шурка, кіўком галавы паказваючы проста перад сабой.

— Я зараз!

Шурка прыдзірліва аглядае гармонік з усіх бакоў, выцірае далонямі брудныя плямы пылу, здымае рудыя травінкі, што прыліплі да бліскучых металічных ражкоў, і ціха, амаль шэптам разважае:

— Трапілі мы з табой у пастку... Прыдумаў недавярак, дакладна разлічыў...

Я стаю побач, слухаю брата, які размаўляе з гармонікам, і адчуваю сябе самым апошнім нягоднікам.

— Як усё хітра замаскіраваў... Каб брат брату яму капаў. У табліцы множання спатыкаецца, а тут...

Шурка закідвае рэмень на правае плячо, нізка схіляецца над двума радамі белых гузікаў і паволі расцягвае мяхі. Ён услухоўваецца ў разнагалоссе гукаў, што вылятаюць з гармоніка, прабягае пальцамі зверху ўніз і знізу ўверх па ўсіх гузіках і толькі потым заспакоена кажа:

— Бач, так гопнуўся аб зямлю, пад адхон куляўся, а іграе чыста...

— Можа, дамоў пойдзем,— нясмела прапанаваў я.

— Трэба ісці,— сказаў Шурка.— Але я падвярнуў нагу — баліць, не ступіць.

— Давай памагу...

Цяпер я гатовы выканаць любы загад Шуркі, гатовы пайсці за ім хоць на край свету.

— Давай... Не чакаць жа, пакуль Цыган яшчэ адну пастку падрыхтуе. Памочнікаў у яго хапае...

Шурка шчыльна сціснуў мяхі, зашпіліў на баках гармоніка чорныя раменьчыкі і сказаў:

— Вазьмі гармонік на плячо, так будзе лягчэй... Вось так, правільна. А цяпер памажы падняцца. Асцярожна, не тузай...

Шурка абхапіў правай рукой маю шыю, а я левай рукой абняў яго ў поясе, і мы пашкандыбалі дадому. Брат рабіў некалькі скачкоў на левай назе, і нам даводзілася зноў і зноў спыняцца, каб перадыхнуць. Я папраўляю на плячы рэмень гармоніка, Шурка ямчэй абхоплівае мяне за шыю, і мы паволі рухаемся ўгору па пясчанай сцяжынцы, што пралегла між густога маліннiку.

Калі мы ўзабраліся наверх, Шурка апусціўся на рудую, прыцярушаную шэрым пылам траву:

— Ну вось... адолелі. Абракадабра праклятая...

Я паставіў гармонік на зямлю і прысеў побач з Шуркам. Тут жа (і што за насланнё!) ледзьве не над самай маёй галавой пачуўся з'едлівы голас:

— Салют, братанчыкі! А я ўжо не спадзяваўся знайсці вас... Абракадабра!

Я ўвесь сцяўся, але не зварухнуўся, не расплюшчыў вочы. Як я ненавідзеў Цыгана ў гэты момант!

— Выскаляка несусветны,— спакойна сказаў Шурка.— І адкуль у цябе столькі злосці?

— Якая злосць?! — развёў рукамі Цыган.— Я проста пажартаваў. Ці ты жартаў не разумееш?

— Ага, пажартаваў... І пастку замаскіраваў «па-добраму»...

— Пастку? — яшчэ больш здзівіўся Жоржык.— Ты вось у Мішкі запытай... Ён лепш за мяне ведае... Хто з рыдлёўкай завіхаўся, хто арэшнік ламаў для маскіроўкі?.. Брат брату маніць не будзе, чыстай праўдай пачастуе... на талерачцы з ружовай каёмачкай... Мішка — смелы, з ім можна ісці ў разведку.

Цыган сыпаў словамі, быццам гарохам з дзіравага мяшка. Я адчуваў, што ён проста так ад нас не адчэпіцца.

— Абракадабра! — раптам крыкнуў я, адштурхнуў Цыгана і памчаў па краі адхона да бярэзніку.

Я бег, адчуваючы ў нагах незвычайную лёгкасць. Нібы і не карабкаўся хвілін дзесяць-пятнаццаць назад па крутым схіле гары разам з братам Шурам, выбіваючыся з апошніх сіл. Уся мая крыўда і злосць на Цыгана скіравалася цяпер на церамок, з якім былі звязаны ўсе мае няшчасці і гэтая

ганьба. Я з усяго разгону наляцеў на фанерную сцяну церамка, якая мацавалася на тонкіх бярозавых кійках і гнуткіх арэхавых прутах. Сцяна адразу рухнула, а потым паволі, амаль бясшумна асеў уніз толевы дах хліпкай Цыгановай пабудовы і накрыў мяне сабою.

Я ляжаў, цяжка дыхаючы, але дзіўна — цяпер я быў спакойны, як ніколі.

— Абракадабра! — сказаў я, падняўся і, не спяшаючыся, пайшоў назад, туды, дзе застаўся мой брат Шурка. Яму патрэбна была мая дапамога.

## АДНОЙЧЫ РАНІЦАЙ

Яшка дапіваў малако, калі з вуліцы пачуўся свіст. Перакінуўшы цераз плячо рэмень сумкі, Яшка бразнуў клямкай і выскачыў з хаты. На хаду завязаў шнуркі шапкі-вушанкі пад падбародкам, надзеў рукавіцы, якія звязала маці з цёплай авечай воўны.

Навокал густая чарнільная цемра. Стаіць марозны зімовы ранак, калі яшчэ гаспадарыць ноч, а світанне крочыць дзесьці далёка на ўсходзе. Але ж не будзеш яго чакаць, трэба спяшацца ў школу.

Іх сямёра. Звычайна восенню ці вясной з іхняй вёскі ходзіць куды больш дзяцей. А цяпер, калі ночы сталі такія цёмныя і доўгія і што ні дзень завіруха, дзяўчынкі жывуць у інтэрнаце. Толькі яны, хлопцы, дамовіліся хадзіць у школу ўсю зіму. Яны — не дзяўчынкі, ім няма чаго баяцца злосных сцюжаў і завейных дарог...

Коля Мяцельскі ў іх за важака. Цяпер ён, як і заўсёды, ідзе ўперадзе і асвятляе дарогу факелам. Факел — выдумка Колі. Гэта звычайная літровая кансервавая бляшанка, донца і бакі якой прабіты цвіком на мноства дзірак. Бляшанка прычэплена да доўгага кавалка дроту. За гаручае ў хлопцаў — гума ад старой аўтамабільнай шыны. Гарыць гума ярка, дымна і сквірчыць, нібы сала на патэльні. Ды гэткай бяды! Галоўнае, што пад нагамі відно, хоць іголкі збірай.

А шлях у хлопцаў няблізкі, аж пяць кіламетраў. І трэба ісці і ісці. На лыжах у такую цемру не разгонішся. Таму і шыбуюць яны пехатой. Ад шпаркага кроку хутка становіцца цёпла. Неяк адразу мякчэе калючы сіберны вецер. Яшка нават развязвае шнуркі шапкі-вушанкі.

Паспрабуй за гэтым даўганогім сямікласнікам Колем угнацца. Яшка меншы, толькі ў пяты ходзіць, таму ён

паспеў ужо запарыцца. Але ён не падае выгляду, Яшка Казлоўскі не з тых, хто пры першай цяжкасці скардзіцца.

Яшка замыкае групу. Яго рука раз-пораз лезе ў кішэнь паліто і абмацвае прадаўгаваты круглы футарал ліхтарыка. Учора бацька прывёз з горада. Ну і было Яшку радасці! Ён цэлы вечар не выпускаў ліхтарык з рук. Нават з ім у пасцель лёг. Залез Яшка з галавой пад коўдру і давай пстрыкаць выключальнікам. Цікава-а! Мабыць, ён цэлую ноч не спаў бы, калі б маці ліхтарык не адабрала.

Яшку так і карціць выцягнуць з кішэні ліхтарык і стрэліць у цемру доўгім вострым промнем. Ён мог бы цяпер абысціся і без факела, і не трэба было б удыхаць едкі смурод ад гарэлай гумы. Бо вецер якраз у твар дзьме. Але ж варта хлопцам убачыць ліхтарык — і тады ад іх адбою не будзе. Кожны захоча яго патрымаць. І не толькі патрымаць, але і пасвяціць. Адзін пстрыкне выключальнікам, другі, трэці... Так і перапаліць могуць лямпачку. А ў Яшкі няма запасной...

З дарогі хлопцы звярнулі на сцежку. Яе пратапталі яны напрасткі, праз балота і поле. Так да школы бліжэй на кіламетра паўтара, а можа, і больш.

Нарэшце Яшка не вытрымлівае і вымае ліхтарык з кішэні. Ён захінаецца ад ветру спіной і націскае на кнопку. Яркі прамень слізгае па снегавой раўніне. Цемра спалохана адлятае і толькі воддаль спыняецца, яшчэ больш учарнеўшы. Яшка накіроўвае прамень у неба і, задаволены, назірае за высокім, нібы ад пражэктара, слупам, такі яму даводзілася бачыць у кінафільмах аб вайне.

— Што гэта ў цябе? — раптам ён чуе за спіной танклявы голас пранырлівага Косціка Раткевіча. Яшка ўздрыгвае, быццам хто за каўнер калючага снегу сыпнуў.

— Нічога,— гаворыць Яшка і намерваецца схаваць ліхтарык.

— Як нічога?! — здзіўляецца Косцік.— Ды я сам толькі што бачыў, пакажы,— і тут жа гукае: — Э-эй, хутчэй сюды!

— Што за трывога?

— Ды вось, хаваецца,— паведамляе Косцік.

— Як хаваецца? — перапытвае Коля.

Адступаць няма ўжо куды, і Яшка нехаця гаворыць:

— Нічога я не хаваюся, бацька ў горадзе купіў.

— І ты дагэтуль маўчаў?! — усклікvae Коля і перадае факел Косціку, які з імпэтам падхоплівае яго.

Косцік заўсёды рады выслужыцца перад важаком.

— Дай пагляджу,— загадвае Коля.

Яшка аддае ліхтарык. Усе згрудзіліся вакол і ад за-

хаплення толькі цмокаюць губамі. Коля, нібы гэта яго ліхтарык, безупынку шчоўкае выключальнікам, накіроўваючы прамень у розныя бакі.

— Вось дык ліхтарык! Сіла!

— А б'е як далёка, метраў на сто!

Ліхтарык пераходзіць з рук у рукі, кожны стараецца пасвяціць ім як мага больш.

Яшку пачынаюць даймаць дрыжыкі. Так з ім заўсёды, калі яму чагосьці шкада. А тут жа не абы-што, а ліхтарык! Яшка ледзь стрымліваецца, каб не выхапіць яго з рук хлопцаў.

Потым чарга падыходзіць да Косціка.

— Яшка, можна я пранясу крыху? — пытаецца Косцік.— Я не буду запальваць, проста так патрымаю.

Яшка ўспыхвае, як порах:

— Патрымаю! Згубіць можаш. Гэта табе не нейкая там цацка. Хай твой бацька купіць, тады і трымай колькі хочаш.

Косцік апошні раз націскае на кнопку.

— Давай! — злосна крычыць Яшка і хапае Косціка за рукаў паліто.

Той ад штуршка губляе раўнавагу і потарч носам падае ў сумёт. Ліхтарык адлятае ўбок і глыбока зарываецца ў снег. Яшка зверам кідаецца на Косціка:

— Ах ты, бязрукая варона! Ды я цябе...

Бойка павінна была вось-вось разгарэцца, але Коля заступіў Яшку дарогу.

— Ну-ну, спакойна, распетушыўся тут...

— А чаго ён кідае ліхтарык у снег?

— Гэта ж ты мяне таўхануў,— пакрыўджана гаворыць Косцік, абтрасаючы ад снегу паліто. Ён ледзь не плача, яго кожны можа пакрыўдзіць. Косцік самы малы сярод хлопцаў, хоць у шосты клас ходзіць.

— Ты яшчэ ў мяне атрымаеш,— пагрозліва абяцае Яшка, хаваючы ліхтарык у кішэнь.

— Жмінда, ліхтарыка шкада! — не стрымліваецца Косцік.

Яшка зноў наступае на яго, па-баксёрску наставіўшы кулакі. Ды Коля прадухіляе расправу. Ён засланяе сабой Косціка і гаворыць Яшку:

— Паспрабуй хоць пальцам Косціка зачапіць... Пайшлі, хлопцы, а то спознімся.

Усе, акрамя Яшкі, ідуць за Колем.

— Ай-яй-яй, напалохалі, абыдуся і без вас! — выкрыквае Яшка наўздагон хлопцам.

Счакаўшы, пакуль яны адышліся на добрую сотню крокаў, ён уключыў ліхтарык. Яркі прамень адганяе цемру, асвятляючы вузкую сцежку, якая глыбока ўрэзалася ў снег. За ноч яе прысыпала завея, але шэсць пар ног толькі што добра прытапталі пульхную снегавую муку. І Яшку лёгка ісці; ён упэўнена адмервае крокі, любуючыся сваім ліхтарыкам. Ён нават забываецца на спрэчку з Косцікам. Цяпер Яшка адзін, і яму ніхто не перашкодзіць, не папросіць патрымаць ліхтарык...

Чырванаватае, мігатлівае святло факела рухаецца ўперадзе на ранейшай адлегласці. Яшка не думае даганяць яго, яму аднаму таксама някепска.

Пачынае ісці снег. Сняжынкі цяжкія, бухматыя. Яны начнымі матылькамі злятаюцца на святло ліхтарыка і, нібы апаліўшы свае крыльцы, падаюць тут жа на сцежку, пад ногі. Хрум-хрум, хрум-хрум,— парыпвае пад Яшкавымі валёнкамі снег.

Раптам прамень знікае, цемра радасна навальваецца на Яшку. З нядобрым прадчуваннем ён шчоўкае выключальнікам раз, другі,— але дарэмна. «Няўжо лямпачка перагарэла?» Яшка не хоча верыць у гэта. «Можа, замыканне?» Але і ад такой думкі яму не становіцца лягчэй, бо ў цемені ўсё роўна нічога не наладзіш.

Яшка зусім губляецца. «Што цяпер рабіць?» Вочы нібы завязаны, а ў цемры хіба пройдзеш па вузкай сцежцы.

Далёка ўперадзе мільгае святло факела. Цяпер толькі адна надзея на яго. І Яшка спяшаецца за ім. Але ўжо праз некалькі крокаў ён адчувае, што збіваецца са сцежкі і аж па самыя калені залазіць у снег. Яшка паварочвае направа, потым налева, але сцежка нібы праваліласяя.

— Э-э-й! — неяк сам па сабе вырываецца з ягоных грудзей крык. Толькі яго ніхто не чуе.

Далей Яшка прабіваецца снегавой цалінай, назіраючы за святлом факела. Робіцца нясцерпна горача — хоць паліто скідвай. Яшка часта хапае марознае паветра на поўны рот, стараецца з апошніх сіл. Перадыхнуць бы які момант, адсапнуцца, але ж чырвоная кропка плыве ўсё далей і далей...

Нечакана Яшка бачыць, што выратавальны агеньчык знікае. А навокал глухая непраглядная сцяна, і паспрабуй тут вызначыць: дзе ўсход, дзе захад...

Яшка спыняецца, да болю ў вачах углядаючыся ў цемру. Ён спадзяецца, што агеньчык з'явіцца зноў. У трывожным чаканні праходзіць адна хвіліна, другая. Яны здаюцца невыносна доўгімі, ад чаго ў Яшкі халадзее спіна.

Куды ісці, у які бок? Так можна і ў балота залезці, дзе крыніцы нават у вялікі мароз на паверхню выбіваюцца. Чакаць, пакуль развіднее? Але ж да світання яшчэ далёка...

Адчай і роспач ахопліваюць Яшку. Ён адзін, адзін сярод маўклівага снежнага поля, сярод невядомай, палахлівай цішыні. Яшка нават чуе, як з сухім шоргатам падаюць на зямлю сняжынкі. Яму становіцца страшна.

— Э-эй, хлопцы-ы! — адчайна крычыць Яшка, ледзь стрымліваючы слёзы.

Але яго слабы голас тут жа раствараецца ў насцярожанай цемені.

Яшка моцна сціскае ў руцэ круглы футарал ліхтарыка, які цяпер не здаецца яму такім прываблівым...

Раптам зусім у супрацьлеглым баку нешта бліскае, знікае. Потым зноў з'яўляецца ўжо бліжэй. Яшка адчувае, як мярцвеюць яго ногі, як ён не можа скрануцца з месца ні на крок.

«Што гэта? Воўк?!»

Яркая кропля набліжаецца, расплываючыся светла-чырвонай кляксай. І тут да яго слыху даносіцца:

— Я-я-шка-а!

— Гэ-эй, я ту-у-т! — радасна гэйкае Яшка і кідаецца насустрач. І куды толькі падзеліся яго здранцвенне, адчай...

Праз некалькі крокаў Яшка чапляецца за штосьці нагой і з усяго разгону ныряе ў калючы снег, які набіваецца ў валёнкі, рукавы паліто, засыпаецца за каўнер, апякае твар. Але Яшка тут жа падхопліваецца і яшчэ шпарчэй бяжыць наперад, баючыся, каб выратавальны агеньчык не знік зноў.

У святле факела Яшка заўважае дзве постаці — Колі і Косціка. Яны са здзіўленнем разглядваюць яго.

— Ты чаго сюды забрыў? — нарэшце пытаецца Коля.

Яшка ніяк не можа аддыхацца, ён хапае паветра, нібы толькі што яго выцягнулі з палонкі.

— Ды вось... мусіць, лямпачка перагарэла.— Яшка зморана выцірае рукавіцай кроплі расталага снегу на твары.— Са сцежкі збіўся... За вамі пабег, але не дагнаў...

Коля з Косцікам пераглянуліся.

— Мы так і падумалі,— сказаў Коля.— Назад вярнуліся, па слядах пайшлі...

Яшка вінавата зірнуў на Косціка, іх позіркі сустрэліся.

— Прабач мне,— сказаў Яшка.— Дарэмна я...

— Нічога, я не крыўдую,— адказаў Косцік.

— Ну вось і добра,— задаволена зазначыў Коля.— Гайда хутчэй, нас ужо зачакаліся.

Усе трое ўзялі кірунак да сцежкі. А на ўсходзе ледзь прыкметна пачынала святлець вузкая палоска неба, набіраўся моцы ранак новага дня.

## АРЭХАВЫ СПАС

Быў светлы дзень, дзень арэхавага Спаса. Жоўценькія лушчакі ўжо ледзьве трымаліся на галінках, гатовыя ў любое імгненне выслізнуць са сваіх утульных гнёздаў. І варта гайдануць ляшчыну туды-сюды, як самыя спелыя арэхі ляцяць на зямлю: бяры, ласуйся смачнымі зярнятамі.

Вось Пецька з Янкам і выбраліся апоўдні за вёску, у густы арэшнік, што разросся на ўзгорку ўзбоч дарогі.

Спыніліся ля высокага куста і пачалі мышкаваць пад ім, разграбаючы сухое, шархоткае лісце. Потым трэслі гонкія ляшчыны, радаваліся кожнай сваёй удачы.

Шукалі, мышкавалі, і раптам Янкавы пальцы шкрабанулі па чымсьці цвёрдым. Непрыемна так, нават балюча. Узлаваўся Янка, хацеў гэты камень (а што ж яшчэ?) шпурнуць куды-небудзь, каб болей не трапляўся пад рукі. Разгарнуў ён струхлелае лісце і аж зніякавеў. Хіба ж бывае камень з такой рабрыстай паверхняй? Ды вунь яшчэ нейкі куртаты хвост. Здагадка апякла нябачным полымем.

— Пеця, глянь, што я знайшоў,— амаль шэптам вымавіў Янка.

— Спарыш? — Пеця не выказаў асаблівай цікавасці да Янкавай узрушанасці.

— Не-е, хутчэй сюды! — не сказаў, а выкрыкнуў Янка.

Сябрукоў голас прымусіў Пецю, цельпукаватага, круглатварага хлапчука, схамянуцца, хаця не ў яго характары нейкія там хваляванні. А чаго нервавацца? Як той Янка — шустры, танклявы, непаседлівы. Гэта Янка ўгаварыў Пецю пайсці па арэхі, маўляў, сёння Спас — святы дзень, яго мамка казала. Янкава маці набожная, вось толькі царкву ў вайну спалілі (ці то немцы, ці то партызаны), і цяпер няма дзе маліцца. Праўда, Янкава маці ў сваёй падслепаватай хацінцы кожную раніцу і кожны вечар перад абразом укленчвае, усё яшчэ свайго Хвядоса з вайны чакае, Бога штодзённа ўпрошвае...

І Пеця — бязбацькавіч. Яго татку ноччу забралі, павезлі некуды — ні слыху ні дыху. Быццам правініўся ён перад савецкай уладай, акупантам дапамагаў.

— Мана, сынок,— праз слёзы апраўдвалася Пецева маці,— твой татка не служыў ворагам. Ён жа быў з адной рукой, малатарня пакалечыла... Таму яго і на фронт не

забралі. З партызанамі трымаў сувязь... Бяда-гора, некаму не дагадзіў, нехта паскардзіўся, нахлусіў... За яго брыгадзірскую справядлівасць, за чэснасць...

Пеця слаба помніць свайго бацьку. Ды што яму цяпер матчыны перажыванні? Усе гэтыя ўспаміны для яго далёкія, нібы чужыя. Было — не было... Хаця не-не ды і зашчыміць недзе пад сэрцам, калі раптам каторы ўжо раз пачуе матчына жаласлівае шкадаванне:

— І ці хутка татка вернецца? Як жа я вас адна выгадую... У кладоўцы і мышам няма чым пажывіцца...

У Пеці ж ёсць меншыя брацік і сястрычка, Мішка і Волечка. Добра, што бабуля за імі наглядае, калі мама пасвіць калгасных авечак. Тут ужо і яму, Пецю, справа знаходзіцца. Вось толькі сёння вылучыў вольную хвілінку, каб лушчакамі паласавацца ды і Мішку з Волечкай прынесці пачастунак.

— Што ў цябе тут? — спытаў Пеця, паволі выходзячы з-за куста.— Мо гадзюку злавіў?

— Ды вось... міна,— палахліва вымавіў Янка і паказаў на рабрысты яйкападобны прадмет.

— «Мі-на-а»,— передражніў Пеця.— Мо костка дыназаўра?

Сказаў, але прыгледзеўся, прыжмурыў сваё зялёнае вока, потым прыгнуўся, махнуў рукою на Янку.

— Шпакойна,— неяк міжволі замест літары «с» вымавілася «ш».— Не-е, гэта не костка. Асця-рож-на-а...

Сябрукі адступілі ўбок, на крокі тры ад знаходкі, маўклівыя, засяроджаныя. Назіралі, пераглядваліся. Нарэшце Янка не вытрымаў:

— І чаго мы баімся? Яна не ўзарвецца, зусім заржавела. Вайной жа не разарвалася...

— Ага, не разарвалася,— згадзіўся Пеця.

Першы адважыўся Янка. Далікатна, быццам паўнюткую шклянку з малаком, падняў з зямлі знаходку, агледзеў яе з усіх бакоў, дакрануўся пальцам да куртатага хваста, перадаў Пецю. І той пакруціў у руках яйкападобны рабрысты прадмет, нібы пераконваючыся, што ён і сапраўды добра-такі заржавеў.

— Міны такімі не бываюць,— заўважыў Пеця.— Гэта граната.

— Граната дык граната,— не стаў пярэчыць Янка і адразу ж прапанаваў: — Давай узарвём.

— Ты што?!

— Як у кіно: кінем і схаваемся.

Яны знайшлі на ўзгорку акоп, у які вецер нагнаў сухога

жоўтага лісця, прымасціліся, гранату паклалі на бруствер, каб агледзецца і вызначыць: у які бок кінуць сваю небяспечную знаходку.

— Тут, мусіць, быў бой,— сказаў Пеця.— Адсюль дарога пад прыцэлам: не праехаць і не прайсці.

— Та-та-та-та! — прылёг да бруствера Янка.— Атрымлівайце, фашыс-ты!

Раптам ён схапіў гранату, размахнуўся і крыкнуў:

— Гэта вам за татку!

Кінуліся сябрукі на дно акопа, затаіліся ў чаканні выбуху. Секунда, другая, трэцяя...

— Жалязяка, нічога яна не ўзарвецца,— сказаў Пеця і высунуўся з акопа.

Падняўся і Янка, выпростваючы знямелыя ногі. І сонечны далягляд, і крыху засмужанае жнівеньскае неба былі спакойныя і вусцішныя.

— Куды ты закінуў яе? — спытаў Пеця і вылез з акопа.

— А нашто яна нам,— узлез на бруствер і Янка.— Няхай валяецца, як і валялася.

— Не-е, трэба знайсці, я хачу кінуць,— не пагадзіўся Пеця.

І знайшлі, і яшчэ раз кінулі, і яшчэ... Кідалі з акопа, не хаваліся: хто далей?

Нарэшце надакучыла гэтае спаборніцтва, выраншылі кідаць гранату ў цэль. Якраз вялізны валун убачылі ля ўзгорка. Толькі да яго ад акопа было далекавата, і сябрукі перайшлі на больш зручную пазіцыю.

Асмялелі, зусім забыліся пра небяспеку. Траплялі гранатай у валун (ён уяўляўся хлапчукам варожым танкам), аж іскры іншы раз бліскалі. Лімонка чыркала па гладкай паверхні сівога каменя, глуха бумкала, адлятала ў траву, але не ўзрывалася.

— Можа, яе ў агонь пакласці,— выказаў здагадку Янка, выціраючы ўзмакрэлы лоб рукавом выцвілай кашулі.— Падсмажыць нягодніцу.

— А што, можна і падсмажыць.— Пецю таксама надакучыла кідаць гранату.

Запалкі знайшліся ў Янкавай кішэні. Вось толькі дзе раскласці цяпельца? Чамусьці не захацелася на ўзгорку, ля акопа. Яны спусціліся ў лагчыну, абдумваючы план сваіх наступных дзеянняў. Пеця ўсунуў лімонку ў прасторную кішэню латаных-пералатаных штаноў, і тая пры кожным кроку злёгку біла па назе, таму даводзілася прытрымліваць жалязяку рукою.

За ўзгоркам, бліжэй да вёскі, хлапчукі ўбачылі векавую

ліпу і не згаворваючыся пакіравалі да яе. Магутная, у некалькі абхватаў, з густой разлапістай кронай, яна ўзвышалася над наваколлем, мусіць, не адно стагоддзе. А на самай яе вяршаліне буслы змайстравалі кубло. Ужо каторы год жывуць тут, выводзяць сваіх даўганогіх бuслянят.

Знізу ў бусліным гняздзе знайшлі прытулак крыклівыя вераб'і. Прысуседзіліся, зладзілі свае гнёзды ў сухім галлі, што нанасілі буслы. І ўтульна ім, і адчуваюць сябе ў поўнай бяспецы. А буслоў ніколькі не турбуе вераб'інае самавольства, быццам і не заўважаюць сваіх шумных кватарантаў.

Пеця і Янка неаднойчы бывалі ля ліпы, залазілі па яе таўшчэзным ствале ў густую зялёную лістоту. Праўда, высока не забіраліся, аблюбаваўшы сабе зручнае сядзенне на ніжніх тоўстых галінах. Сядзелі, словамі перакідваліся, захапляліся Робін Гудам. Якраз кіно паглядзелі пра адважных лясных разбойнікаў. Фільм у школе (былой паліцэйскай хаце) паказвалі. Два разы ў месяц прыязджаў у іх вёску кінамеханік. Прадаваў білеты, заводзіў дзвіжок на двары і круціў стужку. Гулка стракатаў кінапраектар у цёмным пакоі, а на дошцы, занавешанай белай прасцінай, мільгалі таямнічыя кадры. І ўяўлялі сябе Пецька з Янкам побач з Робін Гудам, і ляцелі на імклівых конях насустрач небяспецы... І трапна стралялі з засады са сваіх самаробных лукаў...

Хутка назбіралі сухога галля, ад дарогі прынеслі цэлы абярэмак саломы, паклалі ўсё пад ліпай, ля самага ствала. Чаму абавязкова пад ліпай? Хто ж яго ведае...

Чыркнуў Янка запалкай, паднёс кволы агеньчык да саломы, і той адразу ж схапіўся за жоўтую сцяблінку, разгарэўся, пераскочыў на суседнюю саломінку, а потым яшчэ вышэй.

Праз хвіліну-другую полымя ўскінулася над сухім галлём, якое сябрукі паклалі на салому, дыхнула гарачынёй, прымусіўшы адхінуцца ад цяпельца.

— Скачы на ліпу! — загадаў Пецька і выняў з кішэні лімонку.

— А ты?

— Я зараз, хутчэй!

Калі Янка забраўся наверх, Пецька сунуў гранату ў салому і вокамгненна апынуўся побач з сябрам. Захінуліся, затаіліся. Маўкліва назіралі за кастром, чакалі. Здаецца, нават вераб'і прыціхлі там, пад бусліным кублом.

— Няўжо і агонь не паможа?

— Пусты нумарок.

— Чакай, няхай угрэецца.

Неўзабаве касцёр пачаў дагараць, полымя паступова асела, толькі зрэдку выблісквала над попелам мігатлівымі агеньчыкамі.

— Прыдумаў дурное.— Пецька кпліва паглядзеў на Янку, які адчуваў сябе даволі ніякавата. Нібы і сапраўды быў вінаваты, што не ўзарвалася лімонка.

— Яна сама знайшлася,— сказаў у сваё апраўданне Янка.— Колькі пасля вайны праляжала...

— Што вайна! Лепш бы арэхі збіралі...

— Ага, лепш,— згадзіўся Янка.

Яны зноў памаўчалі, губляючыся ў здагадках: а можа, раптам бабахне? Верылася і не верылася... Ды, вядома ж, беражонага і Бог беражэ. Хаця хто з іх думаў пра гэта? І не думаў, і не асцерагаўся... Больш турбавала тое, што лімонка не ўзрывалася, быццам гуляла з імі ў кошкі-мышкі. А яны падахвоціліся, нават на ліпу залезлі, каб толькі свайго дамагчыся. І ўсё дарэмна...

Першы не вытрымаў Пецька, штосьці буркнуў сабе пад нос і пачаў маўкліва спускацца ўніз. Павольна так, з перасцярогай. Янка таксама намацаў нагою пругкую галіну, перахапіў рукамі другую, што звісала над галавой, гайдануўся, быццам перад скачком. Але тут жа суцішыўся, сустрэўшыся з суровым Пецькавым позіркам.

Сябрукі дабраліся да ніжніх галін ліпы, спыніліся, прыглядаючыся да згаслага вогнішча, над якім ледзь прыкметна курэўся шызаваты дымок.

— Ну што, падсмажылі бульбачку,— усміхнуўся Пецька.— Пара выгортваць з прыску.

— Хай астыне, апячыся можна,— абрадаваўся Янка Пецькавай усмешцы.— Паласуемся.

І тут раптам прагрымеў выбух. Імкліва ўзвілося ўверх шэрае воблака попелу разам з іскрыстым вуголлем, быццам ураганны віхор шугануў пад ліпай. Выбуховая хваля здзьмула вогнішча, даляцела да хлапчукоў, ашаламіла іх. Яны зваліліся ўніз, прызямліліся на тое самае месца, дзе толькі што дыміўся касцёр.

Сябры ляжалі, амаль што самлелыя, асцерагаючыся новага выбуху. Ім усё яшчэ не верылася, што яны засталіся жывыя. Пашанцавала, няйначай нарадзіліся ў кашулях... А можа, Янку з Пецем выратаваў арэхавы Спас?

...Дагараў жнівеньскі дзень. Плыло да небасхілу пятае пасляваеннае лета, якое ледзьве не стала апошнім у жыцці двух хлапчукоў. А год нараджэння Пеці і Янкі выпаў на векапомны сорак першы.

# ЗМЕСТ

**АПОВЕСЦІ**

Малінавая шкатулка — 6
...І мы засмяяліся...— 106

**АПАВЯДАННІ**

Пралескі — 144
Сутычка — 148
Пастка — 152
Аўтограф Пеле — 158
Хто лепшы рыцар — 164
Гукавое пісьмо — 170
Веласіпед — 175
Дружок — 179

**ДАГАНІ СВАЁ МАЛЕНСТВА**

Цукеркі-падушачкі — 193
Шпакоўня — 204
Барадзіно — 213
На фінішнай прамой—227
Паддаўкі — 235
Аднойчы раніцай — 245
Арэхавы Спас — 250

Літаратурна-мастацкае выданне

ЗАРЭМБА Міхась Мікалаевіч

Аповесці, апавяданні

*Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту*

Рэдактар *У. А. Марук*

Мастацкі рэдактар *К. С. Ракіцкі*

Тэхнічны рэдактар *А. В. Русецкая*

Карэктар *Д. Р. Лосік*

Здадзена ў набор 28.02.95. Падпісана да друку 05.08.96. Фармат 84×108 1/32. Папера афсетная. Гарнітура Тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 13,44. Ум. фарб.-адб. 13,86. Ул.-выд. арк. 15,26. Тыраж 5000 экз. Зак. 1828.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 7. 220600, Мінск, Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Зарэмба М.
З 34 Арэхавы Спас.: Аповесці, апавяданні: Для сярэд. і ст. шк. узросту/Маст. В. В. Дударэнка.— Мн.: Юнацтва, 1997.— 254 с.: іл.

ISBN 985-05-0028-X.

Драматычна развіваюцца падзеі ў аповесці «Малінавая шкатулка». Вадзім Алейнікаў адбывае пакаранне ў калоніі для непаўналетніх, але на волі застаюцца яго былыя «дружкі». Яны і перадаюць трынаццацігадоваму Алегу Алейнікаву запіску з калоніі ад брата Вадзіма...

У кнігу таксама ўключаны гумарыстычная аповесць «І мы засмяяліся» і апавяданні з цыкла «Дагані сваё маленства».

8820600000—038
З————————29—95 ББК 84(4Беи)6
М (307) — 97

